НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS MANAGEMENT
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS

NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

# Archivaryus

*Collection of scholarly papers and articles*

## Volume 20

Minsk
NHAB
2022

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

## Выпуск 20

Мінск
НГАБ
2022

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
*А. Л. Воінаў, Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў* (галоўны рэдактар),
*У. М. Дзянісаў, К. Ю. Ерусалімскі, В. І. Кураш, М. Д. Макараў,*
*Д. Ч. Матвейчык* (адказны рэдактар), *А. Рахуба, А. Я. Рыбакоў,*
*А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі, М. Ф. Шумейка*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук *А. А. Мяцельскі,*
кандыдат гістарычных навук *В. С. Пазднякоў*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2022

# Архівазнаўства

*Р. І. Крыцук*

## Архіўныя матэрыялы Нацыянальнага музея ў Варшаве і іх патэнцыял для правядзення даследаванняў па гісторыі нумізматыкі Беларусі

У Кабінеце манет і медалёў Нацыянальнага музея ў Варшаве (далей – НМВ) сярод разнастайных збораў захоўваюцца разрозненыя дакументы міжваеннага часу (пераважна 1930-х гг.). Яны не з'яўляюцца часткай афіцыйнага архіва НМВ, таму не маюць характэрных архіўных шыфраў. Чым з'яўляецца дадзеная падборка? Гэта – унутраныя дакументы Кабінета манет і медалёў НМВ, перададзеныя ў музейны збор прыватныя спісы архіваў, калекцый і картатэк (самая знакамітая – калекцыя Патоцкіх), рукапісныя працы па нумізматыцы XIX–XX стст., архіў Нумізматычнага кабінета Дзяржаўных фондаў мастацтва (Дзяржаўныя калекцыі мастацтва, якія спачатку падначальваліся Міністэрству грамадскіх работ, а потым Міністэрству рэлігійных вызнанняў і народнай асветы, далей – ДКМ[1]), перапіска прыватных і дзяржаўных установаў з НМВ і ДКМ, а таксама дакументы арганізацый, якія перадавалі свае матэрыялы ў фонды ДКМ, напрыклад, Манетнага двара. Трэба адзначыць, што гэта – толькі фрагмент даваеннага архіва нумізматычных кабінетаў НМВ і ДКМ, які ацалеў пасля Варшаўскага паўстання 1944 г.[2].

---

[1] Больш падрабязна пра дзейнасць ДКМ можна прачытаць у шэрагу артыкулаў [21; 25].

[2] У 1939 г., падчас абароны Варшавы, будынак музея быў пашкоджаны. Нягледзячы на акупацыю, музей працягваў сваю працу. У 1944 г. у будынку музея размяшчаўся гарнізон вермахта, што, з аднаго боку, уратавала яго ад разбурэння падчас Варшаўскага паўстання, а з другога – прывяло да актаў вандалізму, апісаных у дзённіку дырэктара музея Станіслава Лорэнца [14]. Вядома, што гітлераўцы вывезлі ў Сілезію і часткова разрабавалі нумізматычны кабінет, а прадметы з калекцыі баністыкі выка-

Згаданыя архіўныя матэрыялы ўтрымліваюць каштоўную інфармацыю пра знаходкі скарбаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі – ад простых паведамленняў пра факт выяўлення скарбаў да іх дэталёвых вопісаў. Каб зразумець каштоўнасць пададзенай у іх інфармацыі, варта распавесці пра сітуацыю з публікацыямі скарбаў з Заходняй Беларусі і БССР міжваеннага перыяду. У апошняй, дзякуючы намаганням беларускага нумізмата Паўла Харламповіча, на 1927 г. было зафіксавана 165 знаходак скарбаў і асобных манет [9]. У асноўным гэта былі матэрыялы з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея (далей – БДМ), альбо манеты і скарбы, якія дасылалі ў БДМ з мэтай іх атрыбуцыі. Таксама П. Харламповіч правёў працу па фіксацыі знаходак пражскіх грошаў на тэрыторыі Беларусі [10]. Інфармацыя, пададзеная ў яго артыкулах, выкарыстоўвалася савецкім нумізматам Рыхардам Фасмерам, які складаў агульную для СССР тапаграфію новых знаходак скарбаў і асобных манет [11]. На жаль, дагэтуль застаюцца неапублікаванымі некаторыя нумізматычныя працы беларускага мастацтвазнаўцы Мікалая Шчакаціхіна, у тым ліку тапаграфія знаходак скарбаў з тэрыторыі былога ВКЛ. Іх рукапісныя арыгіналы былі адасланы ім у Аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа, а копіі захоўваюцца ў архіве Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь [4; 5; 8]. З пачаткам сталінскіх рэпрэсій у канцы 1920-х гг. нумізматычная праца на тэрыторыі БССР была спынена і не аднаўлялася да 1960-х гг.

Сітуацыя з публікацыямі скарбаў з Заходняй Беларусі была іншай. З аднаго боку, гэты рэгіён пазбег рэпрэсій, якія вынішчылі нумізматычны рух у БССР у міжваенны час, але з другога – на дадзенай тэрыторыі адсутнічаў моцны цэнтралізаваны нумізматычны рух. Пераважна дзейнасць нумізматаў зводзілася да публікацыі адзінкавых скарбаў ці краязнаўчых артыкулаў. Дырэктар Дзяржаўнага музея ў Гродне Юзаф Ядкоўскі ў міжваенны перыяд перыядычна публікаваў інфармацыю пра скарбы і адзінкавыя манеты, перададзеныя ў фонды музея. Пры гэтым у яго працах былі апісаны не толькі матэрыялы з сучаснай тэрыторыі Беларусі [16], але і знаходкі з тэрыторыі Літвы [17] і Польшчы [18].

У пасляваенны перыяд да вывучэння скарбаў з Заходняй Беларусі звярталіся польскія і беларускія даследчыкі. Так, Ганна Кмятовіч, якая даследавала скарбы з арабскімі дзірхамамі на тэрыторыі Польшчы, у 1950–1990-я гг. апублікавала скарб з 63 дзірхамаў, знойдзены ў другой палове XIX ст. у мястэчку Зубкі пад Клецкам[3], што і цяпер захоўваецца ў НМВ [19]. Тры дэпашпартызаваныя скарбы з даваенных фондаў гродзенскага музея былі апублікаваны ў 2004 г. Віктарам Какарэкам [1,

рыстоўвалі як туалетную паперу. Дакументацыя архіва была пашкоджана і часткова знішчана падчас баявых дзеянняў.

[3] Цяпер аграгарадок Зубкі Клецкага раёна Мінскай вобласці.

с. 290–291]. Аднак увагу даследчыкаў прыцягвалі не толькі тыя комплексы, што захаваліся. Выбітны польскі археолаг Ежы Календа падчас працы ў архіве Нацыянальнага інстытута імя Асалінскіх ва Уроцлаве знайшоў і апублікаваў ліст Іаахіма Лялевеля пра знаходку скарбу сасанідскіх манет пад Оршай у 1822 г. [20]. Добрым прыкладам рэканструкцыі скарбаў (на прыкладзе скарбу, знойдзенага ў 1938 г. у вёсцы Тушына Пліскай гміны, сучаснага Глыбоцкага раёна) па газетных публікацыях і мемуарах з'яўляецца артыкул Мікалая Плавінскага і Кастуся Шыталя [6].

Выяўленыя ў архіве НМВ матэрыялы магчыма падзяліць на некалькі частак. Першая – «Вопіс дароў і закупак ад 2 красавіка 1932 г.» Нумізматычнага кабінета ДКМ. У ім падавалася інфармацыя пра прынятыя на захаванне скарбы, асобныя знаходкі манет і нумізматычныя калекцыі. Другая частка ўтрымлівае справаздачы кансерватараў помнікаў ваяводстваў за 1930-я гг. Гэта сціслыя даведкі пра тое, што рабіліся паводле запыту Нумізматычнага кабінета ДКМ, у якіх акрэслівалася колькасць знойдзеных скарбаў, час знаходкі, іх склад і месца захавання. Трэцяя, апошняя, частка – гэта перапіска паміж людзьмі, якія знайшлі скарбы, і музеямі, у тым ліку чарнавыя варыянты адказаў музеяў з вопісамі скарбаў, якія з пэўных прычын (праз стан манет і інш.) не былі прыняты на захаванне.

Інвентарная кніга Нумізматычнага кабінета ДКМ вялася з 2 красавіка 1932 г. па 1 лістапада 1938 г., спачатку – Канстанцінам Змігродскім[4], а пасля яго смерці ў 1936 г. – іншымі супрацоўнікамі ДКМ. У ёй прысутнічаюць некалькі запісаў пра знаходкі скарбаў з тэрыторыі сучасных Беларусі і Украіны. У запісе № 43 (14) ад 19 кастрычніка 1933 г. паведамляецца, што дырэкцыя ДКМ набыла скарб з 662 манет, а менавіта *«літоўскія капейкі Вітаўта з інтэрвальнымі варыяцыямі»*[5]. Скарб быў знойдзены Аляксандрам Гуткоўскім у *«Калоніі Сядліска»*[6] Кастапольскага павета Валынскага ваяводства і набыты ў яго за 150 злотых. У канцы запісу ёсць заўвага: *«рэшту манет з гэтай знаходкі разам з гліняйнай пасудзінай і шкляной "жамчужынай"*[7] *набыў Дзяржаўны манетны двор для свайго нумізматычнага кабінета»*.

---

[4] Польскі нумізмат, мастак, медальер, гісторык і музейшчык. Пэўны час працаваў у Віцебску як сябра Віцебскай навуковай архіўнай камісіі. У 1930-я гг. быў супрацоўнікам ДКМ (больш падрабязна пра яго жыццё гл.: [12]).

[5] Верагодней за ўсё, гэта скарб пенязяў Вітаўта тыпу «Калюмны / Наверша дзіды з крыжам» 1410–1430 гг., адбітых на менніцы ў Вільні. У калекцыі НМВ захоўваецца дэпашпартызаваная і неапублікаваная частка скарбу з 97 манетамі такога тыпу (NPO 45228-45324). Магчыма, яна паходзіць з гэтага скарбу.

[6] Цяпер не існуе, размяшчалася на тэрыторыі сучаснага Сарненскага раёна Ровенскай вобласці (51°18'83» паўноч. шыр., 26°12'17» зах. даўг.). Выказваю падзяку ўкраінскаму гісторыку Зміцеру Дзімідзюку за дапамогу ў геаграфічнай лакалізацыі.

[7] Магчыма, маецца на ўвазе шкляная пацерка.

Наступны запіс датуецца 31 ліпеня 1935 г. У ім паведамляецца, што ў збор музея прыняты дзве манеты, знойдзеныя Лявонам Вайцяхоўскім у вёсцы Гудагай Ашмянскага павета Віленскага ваяводства. Як адзначалася, першая – гэта *«дэнарый імператара Атона»*[8], а другая – *«паўбрактэат з канца X ст. Перайманне шэлягаў імператара Карла Вялікага (тып гасліньскі)»*[9] (у інвентарнай кнізе была змешчана і яе прамалёўка) (іл. 1).

Апошні запіс, што тычыцца Беларусі, зроблены 15 снежня 1937 г. і ўтрымлівае звесткі пра грашова-рэчавы скарб, знойдзены ў вёсцы Вялікая Слабада Стаўбцоўскага павета Навагрудскага ваяводства. Інфармацыя пра гэты комплекс сустракаецца і сярод чарнавікоў ДКМ, таму яго апісанне будзе прыведзена ніжэй у адпаведным раздзеле артыкула.

Удакладняючымі крыніцамі з'яўляюцца справаздачы ваяводскіх кансерватараў помнікаў па колькасці знойдзеных на тэрыторыі іх адказнасці скарбаў у 1935–1937 гг. Гэта – адказы на запыты Нумізматычнага кабінета ДКМ. Супрацоўнікі апошняга, хутчэй за ўсё, вялі ўласную статыстыку і фіксацыю новых знаходак манетных комплексаў. Выкарыстаныя справаздачы валынскага, віленскага, львоўскага і люблінскага кансерватараў пра знаходкі скарбаў і асобных манет за 1935–1937 гг. не змяшчаюць інфармацыі аб складзе скарбаў і выкарыстоўваюцца ў нашым артыкуле як удакладняючы матэрыял, бо ў іх прыведзены дакладныя даты знаходкі скарбаў.

Самай вялікай групай крыніц з'яўляюцца лісты-запыты да нумізматычных кабінетаў НМВ і ДКМ, а таксама чарнавікі адказаў на іх. Як працавала гэтая сістэма? Напрыклад, селянін з вёскі N. Палескага ваяводства знаходзіў скарб і, як сумленны грамадзянін, перадаваў яго ў органы ўлады (старасце ці войту). Тыя складалі запыт і адсылалі яго разам са скарбам у НМВ ці ДКМ. У запыце яны прасілі спецыялістаў растлумачыць, што за манеты знойдзены, ці з'яўляюцца яны каштоўнымі, што са скарбам рабіць далей і ці можа той, хто яго знайшоў, атрымаць узнагароду. Нумізматы з музеяў пасля апрацоўкі комплексу маглі:

1) адзначыць, што ён з'яўляецца цікавым для навукі і музея, прыняць яго на захаванне і ўзнагародзіць таго, хто яго знайшоў;

2) адзначыць, што скарб не цікавы для нумізматычнага кабінета і яго варта перадаць у ваяводскі музей; адпаведна, пытаннем узнагароды павінны былі займацца музей або мясцовыя ўлады;

---

[8] Верагодна, дэнарый 983–1002 гг. імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Атона III і яго бабкі, рэгента Адэльгейды Бургундскай.

[9] Дадзены тып манет быў знойдзены ўпершыню ў 1867 г. у скарбе з фальварка Экстэле (ваколіцы Длугай Гасліны Вялікага Княства Пазнаньскага, цяпер тэрыторыя вёскі Конты гміны Мураванай Гасліны Пазнаньскага павета Велікапольскага ваяводства). Быў вылучаны ў асобны тып у працы Казімежа Страньчынскага [23, s. 10–11].

3) адзначыць, што скарб праз кепскі стан манет ці адсутнасць рэдкіх тыпаў не мае нумізматычнай ці музейнай каштоўнасці; пасля гэтага скарб вярталі таму, хто яго знайшоў, і ён быў вольны рабіць з ім, што заўгодна (прадаць, пакінуць сабе альбо пераплавіць).

У любым з выпадкаў у чарнавіку складаўся больш-менш поўны вопіс манет. У адносінах да скарбаў, вернутых тым, хто іх знайшоў, такі вопіс з'яўляецца адзінай крыніцай для вывучэння скарбаў.



Іл. 1. Прамалёўка манеты з інвентарнай кнігі ДКМ (уверсе) і прамалёўка манеты з працы Казімежа Страньчынскага (унізе)

Адзначым, што ў дадзеным артыкуле выкарыстоўваюцца не ўсе дакументы з выяўленых у фондах НМВ. Матэрыялы, прысвечаныя скарбам, знойдзеным у вёсках Шпакі Дзісенскага павета, Каменка Навагрудскага павета і Барок Стаўбцоўскага павета, маюць дадатковую інфармацыю, таму дадзеным скарбам будзе прысвечана асобная публікацыя.

Некаторыя дакументы ўтрымліваюць толькі ўскосную інфармацыю аб знойдзеным скарбе. Так, 1 жніўня 1930 г. адміністрацыя НМВ атрымала ліст ад павятовага старасты з горада Косава – цэнтра павета Палескага ваяводства. Разам з лістом быў дасланы скарб са 106 манет (малодшая манета датавалася 1570 г.) *«выараны»* работнікам фальварка Чэснікі Пяскаўскай гміны Косаўскага павета[10] Мікалаем Бузюмам. У канцы ліста староста прасіў пры магчымасці ўзнагародзіць апошняга. На жаль, больш падрабязнай інфармацыі аб складзе скарбу і месцы яго перадачы не захавалася ў архіве НМВ.

Другім прыкладам такой фрагментарнай інфармацыі з'яўляецца датаваны снежнем 1937 г. чарнавік адказу дырэкцыі ДКМ уладам Люблінскага ваяводства. У ім паведамляецца пра вяртанне ў ваяводства 17 срэбраных манет, знойдзеных каля дарогі Дзяніскавічы–Яскавічы Круговіцкай гміны Лунінецкага павета[11], для перадачы іх у фонды му-

[10] Цяпер гэта ваколіцы вёскі Альшэва Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, тэрыторыя водаачышчальнай станцыі «КУМПП ЖКГ Белаазёрская ЖКГ» (52°47'82" паўноч. шыр., 25°20'36" зах. даўг.).

[11] У міжваенны перыяд вёскі Дзяніскавічы-II і Яскавічы, на дадзены момант яны аб'яднаны ў адну вёску Дзяніскавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці (52°43'26" паўноч. шыр., 26°40'44" зах. даўг.).

зея ў Любліне. Інфармацыя пра гэты скарб захавалася таксама ў справаздачы галоўнага кансерватара Люблінскага ваяводства дырэкцыі ДКМ «Знаходкі манет у 1935–1937 гг. на тэрыторыі тутэйшай Акругі / ваяводства Люблінскага і ваяводства Палескага». У ёй удакладняецца дата знаходкі скарбу – 30 мая 1936 г. – і адзначаецца, што скарб быў перададзены ў Музей Палесся ў Пінску.

Гэтым жа (1936) годам датуецца чарнавік адказу дырэкцыі ДКМ ваяводскім уладам у Вільні. У ім паведамляецца, што знойдзены ў 1936 г. скарб з вёскі Вялікая Слабада Турэцкай гміны Стаўбцоўскага павета[12] перадаецца ў калекцыю ДКМ. У адказе адзначалася, што ў склад скарбу ўваходзілі *«талеры іспанскія»* 1618, 1632, 1633, 1634, 1636, 1650 і 1654 гг., а таксама два талеры недатаваных часоў – *«Альберта і Лізаветы»* і *«бельгійскі»* 1625 г. Разам з манетамі быў знойдзены срэбраны крыжык, больш дакладна апісаны ў інвентарнай кнізе ДКМ: *«аднабаковы крыжык з вушкам, срэбраны, з выявай сімвалаў пакут Хрыста»*. Недатаваныя талеры адносяцца, магчыма, да выпускаў правінцыі іспанскіх Нідэрландаў Альберта і Ізабэлы (эмісіі 1598–1621 гг.). Пад *«талерамі іспанскімі»* разумеюцца, хутчэй за ўсё, таксама эмісіі правінцый іспанскіх Нідэрландаў. Знаходкі падобных манет і іх фракцый, у адрозненне ад уласна іспанскіх талераў, адбітых на манетных дварах Іспаніі, характэрныя для скарбаў з тэрыторыі Беларусі [3, с. 89, 118; 7, с. 155, № 58; с. 170, № 62; 22, s. 215, № 23]. А вось што ў лісце разумелі пад *«бельгійскім»* талерам, выклікае пытанні. Можна прапанаваць версію, што гэта – талер, адбіты ў епіскапстве Льеж, якое было ў складзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі. Знаходкі такіх манет таксама фіксуюцца на тэрыторыі Беларусі [2, с. 71].

Варта падкрэсліць, што ў згаданых лістах адсутнічае інфармацыя пра скарбы з Віленшчыны і амаль адсутнічае пра скарбы з Заходняй Украіны. Верагодна, гэта звязана з тым, што ў выпадку знаходкі скарбу мясцовыя ўлады звярталіся ў свае навуковыя арганізацыі, адпаведна – Віленскі ўніверсітэт, Асалінэўм (Львоў) і Валынскі музей (Луцк). У апошнім актыўна працаваў выбітны нумізмат і археолаг Ян-Юзаф Фіцке (1909–1940) [13; 15]. Пра вынікі яго працы сведчыць справаздача кансерватара Валынскага ваяводства дырэкцыі ДКМ. Толькі за 1935–1937 гг. там зафіксавана рэкордная лічба ў 31 выяўлены скарб (у тым ліку адзінкавыя манеты), большая частка якіх была перададзена Валынскаму музею (для параўнання: у Віленскім ваяводстве за гэты час было выяўлена 6 скарбаў, у Львоўскім – 7, у Люблінскім і Палескім разам – 13).

---

[12] Цяпер вёска Вялікая Слабада Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці (53°55'43" паўноч. шыр., 26°24'41" зах. даўг.).

Інфармацыя пра адзін скарб з тэрыторыі Украіны ўсё ж фіксуецца ў датаваным студзенем 1938 г. чарнавіку адказу дырэкцыі ДКМ ваяводскім уладам у Любліне. У ім паведамляецца пра вяртанне скарбу з 85 срэбраных манет, знойдзенага ў вёсцы Старое Сяло Бярозаўскай гміны Столінскага павета[13]. Адзначалася, што скарб досыць цікавы, адносіцца да часоў Паўночнай вайны і яго варта перадаць у Палескі музей у Пінску. У канцы ліста алоўкам быў пазначаны склад скарбу: *«76 адзінак капеек Пятра І, талеры іспанскія, 1 злотаўка[14] Яна Казіміра»*. Таксама адзначалася, што дадзены скарб быў знойдзены ў керамічным гаршку, які пакінулі ў калекцыі Нумізматычнага кабінета ДКМ у Варшаве.

Апрача чарнавікоў лістоў ДКМ, у архіве Нумізматычнага кабінета НМВ захаваўся спіс скарбу, апрацаваны ў Нумізматычным кабінеце ДКМ К. Змігродскім. Ён прыцягвае да сабе ўвагу як дакладнасцю афармлення, так і сціпласцю і адначасова прыгажосцю тэксту. Гэты скарб быў знойдзены ў 1931 г. (да 23 красавіка) Марыяй Кавальчук у вёсцы Хмелева Турнаўскай гміны Брэсцкага павета[15]. Агулам у ім было 168 манет, змешчаных у керамічным гаршку. Варта яшчэ раз адзначыць апантанасць К. Змігродскага, які зрабіў археалагічную прамалёўку яго профілю і донца (іл. 2). Дзякуючы гэтаму атрымалася правесці замеры гаршка. Яго вышыня складала 110 мм, шырыня гарлавіны – 27 мм, найшырэйшай часткі – 105 мм, памеры донца – 95×97 мм. Склад скарбу наступны:




Іл. 2. Прамалёўка профілю гаршка (уверсе) і яго донца (унізе) (памеры падаюцца ў сантыметрах)

[13] Цяпер вёска Старое Сяло Сарненскага раёна Ровенскай вобласці Украіны.

[14] Тымф Яна ІІ Казіміра Вазы. Такая крэдытная манета білася ў 1663–1666 гг. наміналам у 30 грошаў (злоты) пры рэальнай колькасці срэбра ў 10–15 грошаў.

[15] Цяпер аграгарадок Хмелева Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

▪ Вялікае Княства Літоўскае: *Аляксандр Ягелончык* (1492–1506) – недатаваныя паўгрошы (24 адз.); *Жыгімонт Стары* (1506–1548) – паўгрошы 1509 (3 адз.), 1510 (4 адз.), 1512 (8 адз.), 1513 (6 адз.), 1514 (4 адз.), 1518 (2 адз.), 1519 (4 адз.), 1520 (3 адз.), 1522 (2 адз.), 1525, 15ZV (1525) гг., дата не захавалася (13 адз.); *Жыгімонт II Аўгуст* (1529–1572) – двайныя пенязі 1569, 1570 гг. (3 адз.), дата не захавалася; паўгрошы 1547, 1548 (2 адз.), 1549 (3 адз.), 1550 (2 адз.), 1551 (3 адз.), 1552, 1553 (2 адз.), 1555 (2 адз.), 1556 (3 адз.), 1557, 1558 (3 адз.), 1559 (8 адз.), 1560 (7 адз.), 1561 (10 адз.), 1562 (7 адз.), 1563 (4 адз.), 1564 (8 адз.), 1565 гг. (6 адз.), дата не захавалася (2 адз.).

▪ Каралеўства Польскае: *Жыгімонт Стары* – паўгрошы 1501, 1507, 1508, 1509, 1510 (2 адз.), 1511 гг.

▪ Гданьск: *Жыгімонт Стары* – шэлягі 1546 і 1547 гг.; *Стэфан Баторый* (1575–1586) – шэлягі 1579 г. і з незахаванай датай.

▪ Рэч Паспалітая: *Стэфан Баторый* – шэляг лмітоўскі 1583 г.; шэляг каронны 1580 г.

Малодшай манетай скарбу з'яўляецца літоўскі шэляг 1583 г. У складзе скарбу адсутнічаюць манеты Жыгімонта III Вазы, які стаў каралём польскім і вялікім князем літоўскім у 1587 г. Адпаведна, найбольш верагодным часам захавання скарбу з'яўляецца перыяд 1583–1587 гг.

Такім чынам, толькі на прыкладзе архіва Кабінета манет і медалёў НМВ магчыма зрабіць рэканструкцыю некалькіх нумізматычных скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі і Украіны, якія не захаваліся да нашага часу. У некаторых выпадках, як са скарбам з Хмелева, архіўных матэрыялаў дастаткова, каб максімальна рэканструяваць скарб. Зразумела, што ў сучасных умовах не кожны даследчык можа дазволіць сабе паездкі за мяжу для апрацоўкі матэрыялаў, але, магчыма, гэты артыкул пакажа пэўны напрамак для далейшага пошуку інфармацыі аб знаходках скарбаў (і не толькі іх) з Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Віленшчыны міжваеннага перыяду. Нагадаем, што Нумізматычны кабінет ДКМ падначальваўся Міністэрству рэлігійных вызнанняў і народнай асветы, архіў якога за 1917–1939 гг. цяпер захоўваецца ў Архіве новых актаў (Archiwum Akt Nowych) у Варшаве пад сігнатурай 2/14/0. Дзякуючы польскаму дзяржаўнаму праекту «Шукай у Архівах» усе справы Міністэрства рэлігійных канфесій і народнай асветы даступныя ў электронным фармаце [24]. Другім, больш складаным, шляхам з'яўляецца пошук інфармацыі пра архівы ваяводскіх кансерватараў помнікаў, якія пісалі свае справаздачы для Нумізматычнага кабінета ДКМ. Да таго ж, апошнія павінны былі фіксаваць не толькі скарбы, але і археалагічныя знаходкі, а таксама апісваць помнікі архітэктуры, што робіць пошук архіўнай інфармацыі цікавым не толькі для нумізматаў, але і для археолагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў і іншых даследчыкаў.

## Крыніцы і літаратура


1. Какареко, В. И. Монетные клады из собрания Гродненского государственного историко-археологического музея // 60-летие образования Гродненской области: Материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 3–4 марта 2004 г. – Гродно : ГрГУ, 2004. – С. 287–297.
2. Каталог выставы “Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля” / Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 106 с. : іл.
3. Крыцук, Р. І. Грашовы скарб 50-х гадоў XVII стагоддзя з вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь // Музейны веснік. – Вып. 6. – Мінск, 2018. – С. 88–92, 118–119.
4. Некоторые варианты литовских монет. 1936 г. (копия) // Архіў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (далей – Архіў НММ РБ). – Ф. 3 (Дакументы і матэрыялы мастакоў, мастацтвазнаўцаў, гістарычна значных асоб). Воп. 1 (Шчакаціхін Мікалай Мікалаевіч). Спр. 81. 40 арк.
5. Очерк истории литовской монеты 16–17 столетий. 1940 г. // Архіў НММ РБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 80. 391 арк.
6. Плавінскі, М., Шыталь К. Дзейнасць Глыбоцкага аддзела Польскага краязнаўчага таварыства па ахове і вывучэнні археалагічнай спадчыны міжваеннай Дзісеншчыны // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 4. – С. 26–30.
7. Рябцевич, В. Н. Монетные клады XVII и первой четверти XVIII в. на территории Чернигово-Северской земли и восточной Белоруссии // Нумизматика и сфрагистика. – Т. 1. – Киев : Наукова думка, 1963. – С. 152–202.
8. Топография кладов с литовскими монетами на территории древнего Литовского государства. 1933–1934 гг. // Архіў НММ РБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 82. 196+62 арк.
9. Харламповіч, П. В. Монэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага Дзяржаўнага музэю // Гістарычна-археолегічны зборнік. – № 1. – Менск, 1927. – С. 303–344.
10. Харламповіч, П. В. Праскія грошы ў беларускіх монэтных скарбах // Гістарычна-археолёгічны зборнік. – № 1. – Менск, 1927. – С. 295–302.
11. Фасмер, Р. Р. Список монетных находок // II Сообщения ГАИМК. – Т. II. – Ленинград, 1929. – С. 281–324.
12. Шишанов, В. А. Константин Змигродский – художник, краевед и музейный деятель // Актуальные проблемы источниковедения: материалы V Междунар. науч.-практ. конф. к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–26 апреля 2019 г. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2019. – С. 375–379.
13. Фітцке, Я. Скарби історичних монет Волинського музею Товариства приятелів науки в Луцьку // Археологічна спадщина Яна Фітцке. – Луцьк : Волинська обл. друкарня, 2005. – С. 44–94.

14. Historia Muzeum Narodowego w Warszawie [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.mnw.art.pl/o-muzeum/historia-mnw/. – Дата доступу: 11.06.2022.
15. Fitzke, J. Skarby monet historycznych Muzeum Wolyńskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Łucku // Monety Muzeum T-wa Przyjaciół Nauk w Łucku. – Kraków, 1939. – S. 9–68.
16. Jodkowski, J. Skarby monet znalezione na terenie województw półn. wsch. w latach 1928–1930 // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. – T. XIV: Rocznik 1931–1932. – Kraków, 1933. – S. 126–130.
17. Jodkowski, J. Sztabki srebrne z Rybiszek pod Wilnem // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. – T. XIV: Rocznik 1931–1932. – Kraków, 1933. – S. 1–9.
18. Jodkowski, J. Wykopalisko monet z Racewoi // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. – T. XVI: Rocznik 1934. – Kraków, 1935. – S. 107–109.
19. Kmietowicz, A. Nieznany skarb dirhemów arabskich z X w. z terenu Białorusi // Wiadomości Numizmatyczne. – T. 18. – № 1(67). – Warszawa, 1974. – S. 30–46.
20. Kolendo, J. Nieznany list J. Lelewela w sprawie odkrytego w 1822 r. koło Orszy skarbu monet sassanidzkich i kufickich // Wiadomości Numizmatyczne. – T. 17. – № 2(64). – Warszawa, 1973. – S. 65–74.
21. Manikowska, E. Państwowe zbiory sztuki. U źródeł pierwszej państwowej kolekcji muzealnej // Cenne, Bezcenne, Utracone. – 2013. – № 1(74)–4(77). – S. 180–184.
22. Ryabtsevich, V. N. Skarby monet z XVI–XVII wieku na terenie obwodu Brzeskiego i Grodzieńskego Białorusskiej SSR // Prace i Materiały Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi. Seria Numizmatyczna i Konserwatorska. – Vol. 6. – Łódź, 1986. – S. 211–239.
23. Stronczyński, K. Dawne monety Polskie dynastyi Piastów i Jagiełłonów. Część I. Monety pierwszych czterech wieków rozbiorem wykopalisk obiaśnione. – Piotrków : W drukarni E. Pańskiego, 1883. – 248 s.
24. Szukaj w Archiwach. Archiwum Akt Nowych. Sygnatura 2/14/0. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.szukajwarchiwach.gov.pl/zespol/-/zespol/49007. – Дата доступу: 11.06.2022.
25. Wojtyńska, W. Działalność Państwowych Zbiorów Sztuki // Kronika Zamkowa. Roczniki. – 2005. – № 1/2(49/50). – S. 193–220.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.06.2022

# Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў

*М. Д. Макараў, А. М. Латушкін*

## Карта Інфлянтаў 1560 г. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

У лістападзе 2022 г. вядучы навуковы супрацоўнік аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) Уладзімір Дзянісаў пры праглядзе матэрыялаў фонду 694 «Радзівілы, князі» выявіў надзвычай цікавы дакумент – схематычную карту Інфлянтаў (тэрыторыя сучасных Латвіі і Эстоніі), складзеную на пачатковым этапе Інфлянцкай вайны (1558–1583 гг.) [3, арк. 237 адв.–238] (іл. 1). Падобныя знаходкі з тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) дастаткова рэдкія, маюць вялікае значэнне для вывучэння развіцця як картаграфіі, так і вайсковай справы, і прыцягваюць пільную ўвагу даследчыкаў. Таму, безумоўна, неабходна ўвесці выяўленую карту ў навуковы ўжытак шляхам публікацыі і выказаць некалькі ўступных заўваг адносна яе зместу, даты і абставін стварэння.

Карта ўключана ў справу, якая ў асноўным складаецца з дакументаў, што маюць непасрэдныя адносіны да гісторыі Прапойскага і Чачэрскага старостваў. Варта нагадаць, што ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. гэтыя адміністрацыйныя адзінкі знаходзіліся ў руках прадстаўнікоў шляхецкага роду Зяновічаў (Дэшпатаў-Зяновічаў). Храналагічныя рамкі справы – 1547–1750 гг. Асаблівасці почырку дазваляюць датаваць час стварэння карты другой паловай XVI ст. У вопісе фонду малюнак названы «Схема асноўных гарадоў і замкаў усходняй Прыбалтыкі, без даты». Карта мае нетыповую для сучаснай картаграфіі арыентацыю – на ўсход.

Выява карты змешчана на аркушы паперы, які на сённяшні момант мае памеры 42×31 см (магчыма, пры выкананні рэстаўрацыйных работ ён быў падрэзаны з бакоў). Дакладна ідэнтыфікаваць вадзяны знак паперы, на вялікі жаль, не ўдаецца. Найбольш верагодна, што ён адносіцца да тыпу «Высокая карона, упрыгожаная крыжам» або «Карона» (падобныя выявы: паводле класіфікацыі Мікалая Ліхачова: №№ 639–647 (1499–1538 гг.), 648 (б/д), 649 (б/д), 650 (1545 г.), 651–653 (1558 г.), 654–657 (1562 г.) [2, табл. 94–97]; паводле класіфікацыі Эдварда Лаўцявічуса, №№ 1554–1598 (1506–1575 гг.) [5, р. 195–196; 6, р. 217–222].

*Змест карты* наступны. У правай (паўднёвай) частцы малюнка прысутнічаюць наступныя аб’екты:

- **рака Дзвіна** (*«tho yesth rzeka Dzwyna»*) – аўтар малюнка спачатку паказаў яе ў выглядзе амаль прамой лініі, але пазней, каб змясціць назвы некалькіх дадатковых аб’ектаў, праз паварот перанёс рэчышча бліжэй да правага краю карты ці, іншымі словамі, далей на поўдзень;
- **левы прыток Дзвіны** («*tha rzeka w Dzwine wpada*»), які зліваецца з ёй непадалёк ад замка Дынамюндэ, і які можна з упэўненасцю атаясамляць з ракой Ліелупэ (латыш. – Lielupe);
- **Курляндыя** (*«tho Kurska ziemia»*), гістарычны рэгіён Латвіі, размешчаны на захад ад згаданага прытока;
- **паўночная мяжа Інфлянтаў з ВКЛ** (*«tho granica lithewska»*) і **частка тэрыторыі ВКЛ** (*«thu zamky I(eg)o K(rólewskiej) M(ości)»*);
- замкі і гарады ўздоўж лініі Дзвіны, некаторыя з якіх фактычна размешчаны на значнай адлегласці ад яе, у паслядоўнасці знізу ўверх (ці з захаду на ўсход): **Дынамюндэ** (*«Dynmon zamek oth Rygy dwie mili»*, латыш. – Daugavgrīva), **Рыга** (*«Ryga»*), **Добель** (*«Doblien»*, латышскае – Dobele), **Баўска** (*«Bolsk»*, латыш. – Bauska), **Кірхгольм** ці Зельбург (*«Zelbork»*, латыш. – Salaspils), **Неўгін** ці Дынабург (*«Nyewhin»*, латыш. – Daugavpils), **Рэжыца** (*«Reziten»*, латыш. – Rēzekne), **Люцын** (*«Livcen»*, латыш. – Ludza), **Марыенгаўзен** (*«Marinhawzen»*, латыш. – Viļaka).

Левая (паўночная) і цэнтральная часткі малюнка падзелены гарызантальнай лініяй, што цягнецца ад яго краю (Фінскі заліў) у раён паміж замкамі Адзель і Неўгін. Ёй абазначана **мяжа прасоўвання войскаў Маскоўскай дзяржавы** (*«po thyth thy wszystky zamky wyssey pysane moskwa pobrala»*) у Інфлянтах на момант стварэння малюнка.

Ніжэй за лінію (на захад ад яе), акрамя Дынамюндэ і Рыгі, пазначаны толькі два значныя эстонскія гарады: **Талін** (*«thu Rewel, zamek y miasto niemieckie»*) і **Пярну** (*«thu Pernuw, zamek niemiecky y miasto, co liezi nad slonym morem»*).

Вышэй за лінію (на ўсход ад яе, у сектары, падкантрольным Маскве) на карце прадстаўлены наступныя аб’екты:



Іл. 1. Карта Інфляндтаў, 1560 г.

▪ **усходняя мяжа Інфлянтаў з Маскоўскай дзяржавай** (*«tho yesth granica moskiewska»*);

▪ **Чудскае возера** (*«tho yesth iezioro, ktore przi granici moskiewskiey lyezi, przezywayą go Theypyss, ktore(g)o yeziora [1]2 mil wdluz, a iz thesz mil poprzek, w tho yezioro byl wstąp niemcom y moskwie»*; эст. – Peipsi järv);

▪ **дзве ракі**, адна з якіх выцякае з Чудскага возера (*«A tho rzeka s te(g) o ieziora wychodzi»*; яе можна ўпэўнена атаясамляць з **ракой Нарвай**), а другая – упадае ў яго (*«tho rzeka w tho yezioro ydzie»*, яе ідэнтыфікаваць пакуль не ўдалося);

▪ маскоўская крэпасць **Івангорад** (*«thu zamek Moskiewsky Iwan Horod»*) на ўсходнім беразе ракі Нарвы;

▪ паміж дзвюма згаданымі рэкамі: замкі **Нейшлос** (*«thu Nowy zamek niemiecky»*, эст. – Vasknarva), **Нарва** (*«thu miedzi rzekami zamek niemiecky Iwan Horod, ktore(g)o Moskwa wziela»*), **Везенбэрг** (*«tho zamek Miezymberk»*, эст. – Rakvere);

▪ замак **Дэрпт** (*«thu zamek Derpth»*, эст. – Tartu) і кляштар **Фалькенаў** (*«thu kliasstor iflianski Falchinof, oth Derptu dwie mili»*, каля сучаснага эстонскага паселішча Kärkna);

▪ замкі дэрпцкіх біскупаў **Кіррумпэ** (*«thu zamek Kirimpi biskupy»*) і **Нэйгаўзен** (*«thu Nowy zamek drugy byskupy»*, эст. – Vastseliina), размешчаныя ў паўднёва-ўсходняй частцы Эстоніі;

▪ замак **Адзель** (*«thu Adziel zamek Moskwa spalila»*, латыш. – Gaujiena);

▪ замак **Марыенбург** (*«A to zamek Marynburk»*, *«tho okolo zamku iezioro»*, *«tho mosth do zamku prez iezioro»*, *«tho yesth granica Maryenburku»*, латыш. – Alūksne).

Кідаецца ў вочы, што ў параўнанні з усімі іншымі аб’ектамі найбольш падрабязна і з яўным парушэннем маштабу (калі ў выпадку схематычнага накіду ўвогуле можна карыстацца гэтым паняццем) на карце паказаны менавіта замак Марыенбург. Тут пазначана возера, на выспе якога ён размешчаны, а таксама мост, што вядзе праз возера да выспы з умацаваннем. Можна меркаваць, што менавіта Марыенбург знаходзіўся ў цэнтры ўвагі аўтара малюнка.

Неабходна адзначыць, што група ўмацаваных пунктаў, паказаных на карце ўздоўж лініі Дзвіны, далёка не ў поўнай меры адпавядае сетцы найважнейшых інфлянцкіх замкаў рэгіёна. Адсутнічаюць такія аб’екты, як Какенгаўзен (латыш. – Koknese), Кройцбург (латыш. – Krustpils) і шэраг іншых. У большай ступені яна нагадвае пералік замкаў (Баўска, Рэжыца, Люцын, Дынабург, Зельбург, Марыенгаўзен, Леневардэн), якія Інфлянцкі ордэн і рыжскі арцыбіскуп паводле ўмоў Віленскай дамовы ад 31 жніўня 1559 г. перадалі пад кантроль ВКЛ [4, с. 38] і якія ў канцы 1559 – пачатку 1560 г. былі заняты найманым кантынгентам ВКЛ пад ка-

мандаваннем кашталяна полацкага, старосты прапойскага і чачэрскага Юрыя Мікалаевіча Зяновіча, а таксама Яна Геранімавіча Хадкевіча [4, с. 159–160]. Увогуле ж, прадстаўленая на карце сітуацыя магла скласціся і некаторы час існаваць толькі пасля захопу ў лютым 1560 г. войскамі Маскоўскай дзяржавы замка Марыенбург [4, с. 160]. Аналіз зместу карты схіляе да высновы, што яна створана ў першай палове 1560 г. – неўзабаве пасля захопу Марыенбурга.

На адваротным баку дакумента [3, арк. 238 адв.] змешчаны дзве адзнакі архіўнага ўліку, напісаныя карычневымі чарнiламі розных адценняў: 1) *«N(umer)o 5 fasc(ykuł) 66 Spraw Smorgonskich»*, закрэслена, XVIII ст.; 2) *«N(umer)o 5 fasc(ykuł) 21 [Spraw] Smorgonskich»*, XVIII ст., пазней за першы запіс. Яны выкананы ў межах адной мадэлі класіфікацыі і адпавядаюць працам па ўпарадкаванні і апісанні дакументаў архіваў роду князёў Радзівілаў, ардынатаў нясвіжскіх, якія праводзіліся ў XVIII – пачатку XIX ст., верагодна, у архівах: Бялай (1706–1742 гг.), Нясвіжа (1742–1793 і 1805–1818 гг.) і Варшавы (1793–1805 гг.).

Гэтыя адзнакі з высокай ступенню верагоднасці ўказваюць на тое, што дакумент паходзіць з архіва роду Зяновічаў (Дэшпатаў-Зяновічаў), якія ў XVI – пачатку XVII ст. валодалі Смаргонню. Час стварэння карты адпавядае храналагічнаму прамежку жыцця і дзейнасці гаспадара Смаргоні, удзельніка Інфлянцкай вайны Юрыя Мікалаевіча Зяновіча (1510–1583). Варта адзначыць, што да Радзівілаў Смаргонь і смаргонскі архіў Зяновічаў перайшлі толькі ў 1628 г. у выніку шлюбу князя Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла (1589–1636) з Ганнай Сафіяй Зяновіч (?–1664) – дачкой апошняга прадстаўніка мужчынскай лініі роду Мікалая Багуслава Зяновіча.

Такім чынам, варта меркаваць, што прадстаўленая карта была створана ў 1560 г. у асяроддзі аднаго з камандуючых найманым кантынгентам ВКЛ у Інфлянтах кашталяна полацкага, старосты прапойскага і чачэрскага (дакумент невыпадкова апынуўся сярод папер Прапойскага і Чачэрскага старостваў!) Юрыя Мікалаевіча Зяновіча. Выяўлены У. Дзянісавым малюнак можа лічыцца, што на першы погляд падаецца неверагодным, самым старым захаваным помнікам вайсковай картаграфіі ВКЛ (раней на гэтую ролю прэтэндаваў план аблогі замка Улы войскам ВКЛ, створаны М. Стрыйкоўскім у 1568 г. [1, с. 161–166, 285]) і, несумненна, патрабуе далейшага вывучэння.

## Крыніцы і літаратура


1. Александровіч, С. Картаграфія Вялікага Княства Літоўскага ад XV да сярэдзіны XVIII стагоддзя. – Мінск : Тэхналогія, 2021. – 304 с.
2. Лихачев, Н. П. Бумага и древнейшие бумажные мельницы в Московском государстве: историко-археографический очерк: С прил. 116 табл. с

изображениями бумажных водяных знаков. – Санкт-Петербург : Тип. Имп. Акад. наук, 1891. – [4], 106 с., 116 л. ил.
3. НГАБ. – Ф. 694 («Радзівілы, князі»). Воп. 4. Спр. 1556. – Каралеўскія лісты падданым Чачэрскай воласці аб нарыхтоўцы, сплаве лесу і адпраўцы людзей у г. Кіеў на пабудову замка, падатковыя спісы і рэестры сялян Чачэрскай і Прапойскай валасцей, іх скаргі на прыгнёт з боку арандатара Ю. Зяновіча, апісанне прапойскага замка, распіска казацкіх атаманаў за атрыманне фуражу, грошай, пораху на службу ў чачэрскім замку. 1547–1750 гг. – 246 арк.
4. Янушкевіч, А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг.: манаграфія. – Мінск : Медисонт, 2007. – 356 с.
5. Laucevičius, E. Popierius Lietuvoje XV–XVIII a. – Vilnius : Mintis, 1967. – 284 p.
6. Laucevičius, E. Popierius Lietuvoje XV–XVIII a.: Atlasas. – Vilnius : Mintis, 1967. – 577 p.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 12.10.2022

# Крыніцазнаўства

*А. М. Сцебурака, Г. Г. Булда*

## Вяртанне ў Беларусь сямейнай карэспандэнцыі Храптовічаў з палаца ў Шчорсах

Легендарная Бібліятэка Храптовічаў у Шчорсах стала неад'емнай часткай беларускай культуры дзякуючы значнасці асобы яе стваральніка – апошняга канцлера Вялікага Княства Літоўскага Іахіма Храптовіча, – унікальнаму зместу і багаццю кнігазбору, асобам вядомых навукоўцаў і пісьменнікаў, якія там працавалі ці былі яе чытачамі (Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот і інш.). У ХІХ ст. бібліятэку папаўняў сын І. Храптовіча Адам, а пасля яго смерці яна разам з маёнткам адышла ў спадчыну яго пляменніку – Міхаілу Храптовічу (1809–1892) [8].

Сёння самая каштоўная частка бібліятэкі захоўваецца ва Украіне (у Кіеве), а аб былой прыгажосці Шчорсаў нагадваюць толькі руіны і рэдкія ацалелыя фрагменты колішняй сядзібы [7]. Вяртанне ў Беларусь збораў бібліятэкі выглядае малаверагодным. Тым большае значэнне набывае знаходка апошніх гадоў – некалькіх кніг і фрагменту сямейнага архіва Храптовічаў у Германіі. Пра вяртанне трох стадрукаў з экслібрысамі шчорсаўскага кнігазбору дастаткова шмат пісалі ў сродках масавай інфармацыі, а вось розгалас аб адшуканых і прывезеных на радзіму фрагментах сямейнай карэспандэнцыі быў значна меншы [4]. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (далей – НББ), куды на дэпазітарнае захоўванне былі перададзены каштоўныя знаходкі, у 2021 г. адбылася выстава «Кнігазбор Храптовічаў: на шляху вяртання», якая суправаджалася прэзентацый гэтых кніг і дакументаў [5; 6].

Дзякуючы намаганням дабрачыннага фонду «Шчорсы і Храптовічы» і спрыянню беларускіх дыпламатаў у Германіі ў пачатку 2020 г. у Беларусь вярнуліся тры кнігі са славутай бібліятэкі ў Шчорсах разам з калекцыяй лістоў на французскай мове першай паловы XIX ст.

Іх добраахвотна перадалі фонду Марыён Швэзінгер і Гельмут Фікель, дачка і ўнук Германа Швэзінгера – чалавека, які захоўваў гэтыя артэфакты[1].

У час Першай сусветнай вайны Герман Швэзінгер служыў у германскім войску і апынуўся ў Шчорсах. Ён схаваўся ад артабстрэлу ва ўжо пацярпелым ад вайны палацы Храптовічаў (непасрэдна перад гэтым у будынку знаходзіўся штаб аднаго з падраздзяленняў расійскай арміі) і там натрапіў на цудам ацалелыя кнігі і дакументы, якія сабраў і адправіў дадому па пошце. Як адукаваны чалавек, Г. Швэзінгер добра зразумеў каштоўнасць сваіх “трафеяў”. У час Другой сусветнай вайны ён заняў антыфашысцкую пазіцыю, за што трапіў у канцэнтрацыйны лагер Бухенвальд. Пасля вайны Г. Швэзінгер апынуўся ва Усходняй Германіі, пакрысе вывучаў шчорсаўскія дакументы, а перад смерцю завяшчаў дзецям перадаць іх тым, каму яны належаць. І вось толькі цяпер нашчадкі змаглі выканаць яго просьбу і перадалі кнігі і дакументы ў Беларусь, даведаўшыся пра пошукі фонду «Шчорсы і Храптовічы». Гэты выпадак рэстытуцыі культурных каштоўнасцей, вывезеных з нашай краіны падчас германскай акупацыі 1915–1918 гг., з’яўляецца ўнікальнай і вартай пільнай увагі падзеяй [4].

Сёння вернутыя фрагменты шчорсаўскай бібліятэкі захоўваюцца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства НББ. Там яны зберагаюцца ў аптымальных умовах і пры гэтым з’яўляюцца дасяжнымі для азнаямлення ўсімі зацікаўленымі на агульных падставах.

Разгледзім змест найбольш каштоўнай часткі гэтых рарытэтаў – часткі сямейнай карэспандэнцыі Храптовічаў. Лісты можна падзяліць на некалькі груп адпаведна іх аўтараў і адрасатаў.

I. Лісты К. В. Несельродэ

Карл Васільевіч Несельродэ (1780–1862), вядомы дзяржаўны дзеяч Расійскай імперыі, займаў пасады канцлера і міністра замежных спраў. Яго старэйшая дачка – Алена Карлаўна Несельродэ (1813–1875) – стала жонкай Міхаіла Храптовіча ў 1832 г.

- лісты К. В. Несельродэ да графа Ірынея Храптовіча (1775–1850) і графіні Караліны Марыі Храптовіч (у дзявоцтве – фон Рэне) (1780–1846) – бацькоў Міхаіла Храптовіча (13 адз., 1836–1847 гг.);
- лісты К. В. Несельродэ да сваёй дачкі А. К. Храптовіч (2 адз., 1842 і 1849 гг.);
- ліст К. В. Несельродэ да неназванага графа (1 адз., 1807 г.).

---

[1] Герман Юліус Швэзінгер (Hermann Julius Schwesinger) – нарадзіўся 02.09.1891 у г. Зонэберг (Sonneberg) у Цюрынгіі. У 1921 г. стаў доктарам філасофіі, абараніў дысертацыю ў Гумбальтаўскім універсітэце ў Берліне. Памёр 08.08.1975 у г. Зондэрсхаўзэн (Sondershausen) у Цюрынгіі.

II. Лісты М. І. Храптовіча

- лісты М. І. Храптовіча да жонкі Алены Карлаўны, адпраўленыя з розных месцаў, дзе ён знаходзіўся на дыпламатычнай службе; змест пераважна прыватны, але прыгадваюцца розныя мясціны, асобы, апісваюцца цікавыя здарэнні і г. д. (146 адз., 1835–1851 гг.);
- лісты барону Уладзіміру Іванавічу Левенштэрну (1776–1858) (2 адз., не датаваны).

Дадаткам да арыгінальных лістоў з архіва Храптовічаў з'яўляецца сшытак з геаграфічным паказальнікам і заўвагамі, якія тычацца перапіскі Храптовічаў, складзенымі на нямецкай мове, відаць, Германам Швэзінгерам. Верагодна, ён жа зрабіў нумарацыю лістоў і выкарыстаў яе для спасылак у згаданым паказальніку.



Іл. 1. Герман Швэзінгер у акопе ў час Першай сусветнай вайны (фотаздымак з архіва нашчадкаў Г. Швэзінгера)

Найбольшай па памеры часткай архіва з'яўляюцца лісты М. Храптовіча да жонкі. Сучаснікі сцвярджалі, што іх шлюб быў шчаслівы. Пра гэта можа сведчыць сяброўскі тон і змест перапіскі паміж імі. Большасць лістоў М. Храптовіча звязана з сямейнымі і службовымі справамі. Даволі часта яны маюць характар займальных дарожных нататак. Напрыклад, граф з іроніяй распавядае жонцы пра прыгоды ў дарозе, адметных спадарожнікаў, цікавыя сустрэчы, перадае ёй вітанні ад агульных знаёмых і сваякоў з розных еўрапейскіх гарадоў, якія ён наведваў па дыпламатычнай службе. У 1830–1850 гг. ён удзельнічаў у розных пасольскіх місіях у Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Турцыі і г. д.

Самыя раннія лісты з калекцыі датуюцца 1835 г., калі М. Храптовіч быў накіраваны ў якасці сакратара дыпламатычнай місіі ў Вялікабрытанію. Першы ліст быў адпраўлены 30 красавіка 1835 г. з Берліна; наступныя: 6 мая – з Гамбурга і 10 мая – з Лондана. Яны напісаны досыць жыва і цікава і, па сутнасці, моцна нагадваюць дыярыуш падарожніка.

У лісце ад 24 чэрвеня 1835 г. М. Храптовіч піша пра наведванне прадмесцяў Лондана, пра планы цесця перавесці яго на сталую службу ў Італію і г. д. Часам скардзіцца на несупынны зубны боль, дарагоўлю ў Лондане (*«амаль нічога не набыў, а выдаткаваў ужо палову сваіх гро-*



Іл. 2. Перадача кніг і ліставання Храптовічаў. Германія, 2019 г. (злева направа: Валерыя Рудзь, Ганна Булда, Марыён Швэзінгер)

*шай»*), наракае на тое, што даўно не наведваў оперу (*«сёння, калі ў мяне не разбаляцца зубы, я адпраўлюся ў оперу, бо ўжо два тыдні я там не быў»*) [10].

Ліст М. Храптовіча ад 20 ліпеня 1835 г. прыцягвае ўвагу сваёй формай. Ён з'яўляецца прыкладам пашыранай некалі практыкі пісання «ўздоўж і ўпоперак», калі тэкст спачатку пісалі па гарызанталі, затым на той жа старонцы перпендыкулярна папярэднім радкам, а затым і па дыяганалі. Такі не вельмі зручны для чытання варыянт пісьма меў адну важную перавагу – дазваляў змясціць утрая больш тэксту! Пераважная большасць лістоў М. Храптовіча, аднак, мае звычайны выгляд і пазнаку адрасата з месцам і датай напісання. Частка з іх захавала фрагменты сургучных пячатак аўтара, паштовыя штампы з датамі і г. д. [11].

Якім чалавекам быў аўтар ліставання? Граф меў рэпутацыю кансерватара і вернага служакі інтарэсам імперыі. Часам у еўрапейскай прэсе яго папракалі здрадай інтарэсам польскага народа і ідэалаў яго славутага дзеда-асветніка І. Храптовіча. Не супадалі яго погляды з поглядамі яго роднага дзядзькі Адама Храптовіча, гаспадара Шчорсаў і Вішнева, былога паўстанца 1794 г., які ў час вайны 1812 г. уваходзіў у Часовы ўрад ВКЛ, займаў пасаду ў Камісіі па адукацыі [1, с. 48]. Вось як пра М. Храптовіча пісалі ў 1868 г. у французскай прэсе, калі ён, паводле чу-





Іл. 4. Караліна Храптовіч (алейны партрэт)

Іл. 3. Міхаіл Храптовіч (фотаздымак)

так, мусіў выканаць у Ватыкане далікатную місію, звязаную са станам касцёла ў Расійскай імперыі: *«Спадар Храптовіч – каталік і паляк; ён належыць да аднаго з самых старых родаў Літвы, парodнeных з Радзівіламі, Чартарыйскімі, Сангушкамі, і які займаў найвышэйшыя пасады сваёй краіны; але ён цалкам адданы інтарэсам маскавітаў»* [2].

У некаторых лістах М. Храптовіча прыгадваюцца беларускія мясціны. На жаль, іх зусім няшмат, што тлумачыцца амаль несупыннымі яго паездкамі па Еўропе. Так, маецца адзін ліст з Вільні, куды граф прыехаў з Мітавы 20 снежня 1837 г., адолеўшы шлях на санях у кампаніі палкоўніка Дзюамэля. Ён быў напісаны ўначы, бо а пятай гадзіне раніцы аўтар планаваў выехаць у Вішнева, уладанне Храптовічаў: *«Мая дарагая і добрая Алена! Ліхтугі Дон Кіхота і скокі Арлекіна сапраўды нішто ў параўнанні з тым, што чакала мяне пасля прыбыцця ў Вільню. Уяві сабе, што мой дзядзька* [Адам – **А. С.**] *паспяшаўся з'ехаць у Вішнева літаральна за паўгадзіны да майго прыезду. Таму я буду вымушаны праехаць яшчэ вельмі шмат лішніх вёрст яму наўздагон. Такія вандроўкі мне зараз зусім не падыходзяць, хаця крыху раней я пераносіў іх значна лепш. Ужо ў другі раз я так няўдала прыехаў у Вільню, бо ты, безумоўна, не забыла пра наш мінулы візіт у гэты чароўны горад, які таксама быў не дужа добрым. Тады мы былі вымушаны спыніцца ў тым жу-*



Іл. 5. Алена Храптовіч
(алейны партрэт)



Іл. 6. Капліца Храптовічаў
на могілках у Бешанковічах
(фота А. Сцебуракі, 2021 г.)

*дасным гатэлі. Ты памятаеш аб маім подзвігу – двубоі з цэлай хеўрай габрэяў, якіх я мусіў спусціць уніз па лесвіцы…»* [12].

Часцей за ўсё ў Беларусі М. Храптовіч бываў у бацькоўскай сядзібе ў Бешанковічах. Яго бацькі жылі там шмат дзесяцігоддзяў, абсталяваўшы палац у англійскім стылі і старанна даглядаючы шыкоўны парк. У лісце ад 28 жніўня 1839 г. граф звяртаецца да жонкі: *«… я ад'язджаю з Бешанковічаў праз некалькі гадзін, але перш чым адправіцца ў дарогу, я хацеў табе сказаць яшчэ раз, што кахаю цябе, і як мне шкада, што не магу табе гэта вымавіць уголас. Тут усё мне нагадвае пра дні, якія мы правялі разам, і пра экскурсію, што я зладзіў табе аднойчы па супрацьлеглым беразе ракі, мне згадалася наша конная прагулка па лесе, якая табе так спадабалася. Ты гэта памятаеш яшчэ, мая добрая Алена?»* [13]. Граф дзеліцца з жонкай шкадаваннем аб тым, што пакідае ў Бешанковічах сваю маці, якая вырашыла застацца ў палацы на ўсю зіму, а вясной збіралася адведаць сваіх замужніх дачок за мяжой (Марыю Буцянёву і Алену Цітову). Гэтыя абставіны азмрочвалі побыт маладога графа ў Бешанковічах, да чаго дадавалася бачаная ім *«на кожным кроку беднасць і незадаволенасць у кожнай постаці»*. І ён параўноўвае родныя мясціны з еўрапейскімі абшарамі, дзе, паводле яго словаў, цыві-


N° 31.

Londres ce 20 Juillet 1835.

Іл. 7. Ліст Міхаіла Храптовіча да жонкі з Лондана ад 20 ліпеня 1835 г.


86.

Bieschenkowitch ce 16/28 Juillet 1846.

Ma bien chère Hélène.

Arrivé depuis hier après un voyage de 5 jours à travers un pays dans lequel on ne voit que misère et désolation, j'ai aperçu hier vers les 12 midi pour la première fois cette maison de Bieschenkowitch abandonnée à jamais de l'ange qui avait répandu autour d'elle pendant tant d'années les consolations, dont son âme était si riche quand il s'agissait de les prodiguer aux autres, et j'ai vû ou plutôt crus voir, parceque un voile de larmes m'empêchait de voir, un groupe d'arbres touffus sous lesquels reposent les restes mortels de ma mère bienaimée. Dispense moi de te dépeindre mes sensations, qu'il te suffise seulement de savoir, que devant la perfection de ma mère, tout sentiment étranger à la douleur s'est effacé dans ce triste pays, devant celle qu'ont éprouvé, ceux qui l'ont conduit à sa dernière demeure.

8 jours tu auras de nouveau de mes nouvelles, je emporte ... bonheur et je remercie Dieu de te m'avoir donné —

Mimi.

Іл. 8. Ліст Міхаіла Храптовіча да жонкі з Бешанковічаў ад 16 ліпеня 1846 г.




Іл. 9. Фрагмент ліста Міхаіла Храптовіча да жонкі з адрасам

лізацыя і рэлігія прывілі добрыя норавы ўсім, незалежна ад таго, багаты гэта чалавек ці жабрак.

Наступны раз пра Бешанковічы магчыма прачытаць у лісце М. Храптовіча да жонкі, датаваным ліпенем 1846 г. На той момант яго дзядзька Адам ужо памёр, і Шчорсы перайшлі ў спадчыну да бацькі Міхаіла – Ірынея. У 1846 г. новы гаспадар праводзіць палову года там. У гэты час у Бешанковічах памірае яго жонка Караліна. Адпаведна, прыезд Міхаіла ў гэты маёнтак на ўсходзе Беларусі быў абумоўлены смерцю маці. Адолеўшы доўгі шлях з Пецярбурга да сямейнага котлішча па *«благіх дарогах Белай Русі»*, граф апісаў у чарговым лісце свае ўражанні аб пахаванні маці Караліны Храптовіч: *«Я ўчора прыехаў у Бешанковічы пасля пяці дзён паездкі праз краіну, дзе нябачна нічога, апроч беднасці ды гора. Учора апоўдні я пабачыў упершыню сядзібу ў Бешанковічах, пакінутую назаўсёды гэтым анёлам, які на працягу столькіх гадоў так шчодра сеяў вакол сябе суцяшэнне…»*. Верагодна, граф меў на ўвазе актыўную дабрачыннасць сваёй маці, якая заснавала ў мястэчку прытулак для жабракоў і бясплатны шпіталь [9, с. 40]. Пра нябожчыцу, яе сяброўскія стасункі і дабрачыннасць можна даведацца падрабязней з выдадзенай у Лазане ў 1910 г. кнігі карэспандэнцыі з сямейнага архіва «Лісты вядомых людзей, адрасаваныя мадам Мары Рэне і Караліне Храптовіч» [3]. *«Усе рэлігіі працягнулі рукі адна адной у гэты дзень. Падчас жалобнай цырымоніі аб'ядналіся пратэстанцкі пастыр з каталіцкім і грэчаскім святарамі ва ўрачыстым убранні. І што адметна, габрэйскае насельніцтва далучылася да хрысціянскай працэсіі развітання з нябожчыцай і суправаджала труну аж да местачковых могілак. Навакольныя жы-*

*хары не засталіся ў баку: доўгая дэлегацыя мясцовай дробнай шляхты замыкала гэты пахавальны картэж. Толькі са смерцю маці мы зразумелі ўсю паўнату яе мудрай дабрачыннасці, якая заключаецца не ў тым, каб раскідаць грошы налева ды направа, а ў той дабрачыннасці, што адчыняе дзверы ў нябёсы»* [14]. Побач з Каралінай пазней быў пахаваны яе муж Ірыней і іх дачка Марыя. У 1881 г. над іх магіламі была ўзведзена цагляная неагатычная каплічка, якая захавалася да сённяшняга дня [9, с. 41].

У 1850 г. памёр Ірыней Храптовіч, і з таго моманту Шчорсы, Вішнева і Бешанковічы сталі ўласнасцю Міхаіла. Новыя абставіны адлюстраваліся ў сямейнай перапісцы. У канцы чэрвеня 1851 г. граф піша сваёй жонцы са Шчорсаў, дзе згадвае пра юрыдычныя дэталі перадачы яму спадчыны, што вымагалі ад яго наведвання дзяржаўных устаноў у Мінску і Навагрудку. Міхаіл пісаў, што ён *«вельмі рады, бо не давядзецца вяртацца ў Бешаковічы»*, і адзначаў што ўлагодзіць там справы ён зможа праз сваіх аканомаў. У іранічным стылі Храптовіч заўважае, што на працягу двух тыдняў у Шчорсах ён не атрымліваў газет: *«... не ведаю, ці знаходзіцца Еўропа яшчэ на сваім звыклым месцы. У мяне тут столькі спраў, што гэта мяне зусім не хвалюе, яшчэ будзе дастаткова часу каб гэтым заняцца»*. Відавочна, што графу падабалася быць гаспадаром Шчорсаў: *«Я вельмі цешуся жыццём у Шчорсах. Калі б ты тут была са мной! Бо тут так прыемна бавіць час. Спадзяюся, што гэта апошні раз, калі я сюды прыехаў адзін. Дарэчы, з Варшавы сюды вельмі зручны шлях»* [15]. Вядома, што толькі праз два з паловай дзесяцігоддзі, ужо пасля смерці жонкі, М. Храптовіч вернецца з Заходняй Еўропы і будзе праводзіць значную частку свайго часу ў Шчорсах. Тут ён будзе кіраваць маёнткам, працаваць у фамільнай бібліятэцы і бавіць час на паляванні [9, с. 44].

Ужо цяпер каштоўнасць вернутага ў Беларусь фрагмента архіва сям'і Храптовічаў відавочная. Далейшая праца з ім дазволіць удакладніць храналогію і адрасатаў некаторых недатаваных і ананімных лістоў. Змест дадзенага эпісталярнага комплексу будзе цікавы гісторыкам і краязнаўцам. Шматлікія лісты Міхаіла Храптовіча могуць быць важнымі не толькі для ўдакладнення дэталяў яго біяграфіі, але і для паглыбленага вывучэння падзей еўрапейскай дыпламатыі 1830–1840 гг.

## Крыніцы і літаратура

1. En marge de la correspondance de Napoléon I. Pièces inédites concernant la Pologne (1801–1815) / A. Skalkowski. – Varsovie : Gebethner et Wolff, 1911. – 99 p.
2. L'Opinion du Midi: journal politique, religieux, littéraire et d'économie sociale. – Nîmes. – 19.02.1868. – № 2436. – P. 1.

3. Lettres d'augustes personnages adressées à Madame Marie de Roenne et à sa fille la comtesse Caroline Chreptowitch. 1798–1845. – Lausanne : Impr. réunies, 1910. – 295 p.
4. Свірын, І. Не "проста старыя кнігі"… // Культура. – 22.02.2020. – № 8 (1447).
5. Выстава «Кнігазбор Храптовічаў: на шляху вяртання» // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: www.nlb.by/by/events/378230/. – Дата доступу: 25.03.2022.
6. Вяртанне кнігазбору Храптовічаў // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Рэжым доступу: www.nlb.by/by/news/knizhnyja-vystawki/vyartanne-knigazboru-khraptovicha. – Дата доступу: 25.03.2022.
7. Рошчына, Т., Фурс, А. Бібліятэка Храптовіча // Спадчына. – 1992. – № 3. – С. 57–60.
8. Библиотека Хрептовичей [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси, Национальная библиотека Украины им. В.И. Вернадского. – 2-е изд. – Минск: НББ, 2010. (DVD-ROM).
9. Буценеў, М. А. Хронікі сям'і Храптовічаў-Буценевых. – Мінск : Галіяфы, 2018. – 202 с.
10. Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (далей – НДАК НББ). – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 24.06.1837.
11. НДАК НББ. – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 20.07.1835.
12. НДАК НББ. – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 20.01.1837.
13. НДАК НББ. – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 28.08.1839.
14. НДАК НББ. – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 16.07.1846.
15. НДАК НББ. – Ліст М. І. Храптовіча да жонкі. 27.06.1851.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.04.2022

*В. И. Елётнов*

# Установление исполнителей рукописных записей коллекции черновиков рисунков XVII века из фонда «Радзивиллы, князья» путём комплексного использования исторических и криминалистических знаний

Для каждого народа и государства важнейшей задачей должно быть сохранение своей истории, недопущение искажения событий прошлого. Поэтому далеко не случайно, что 2022 год был объявлен в Беларуси Годом исторической памяти. Это обстоятельство не носит символический характер, а подразумевает проведение значительного комплекса мероприятий, направленных на популяризацию становления и развития белорусской государственности, сохранение памяти об исторических событиях и государственных деятелях и др. [1].

Обозначенные направления деятельности требуют кропотливой и слаженной работы не только организаций страны, вовлеченных в сферу исторических исследований, но и других государственных органов, предполагают комплексное использование ресурсов и возможностей из различных отраслей знаний и сфер деятельности.

В этой связи показательным является пример взаимодействия Национального исторического архива Беларуси (далее – НИАБ) и Института повышения квалификации и переподготовки Следственного комитета Республики Беларусь (далее – Институт СК), специалисты которых в рамках заключенного соглашения о сотрудничестве провели совместное исследование по установлению исполнителя (исполнителей) рукописных записей, содержащихся в коллекции черновиков рисунков из фонда «Радзивиллы, князья», сформированной на основе датируемых серединой XVII в. документов из Несвижского архива князей Радзивиллов (далее – Коллекции).

Необходимость проведения исследования обусловлена тем, что по настоящее время отсутствует точная атрибуция документов Коллекции. Ввиду их чернового характера и нечитаемости многих надписей долгое время считалось, что их исполнителем является конюший ВКЛ Богуслав Радзивилл (1620–1669). Вместе с тем этому противоречит множество обстоятельств и исторических фактов, в том числе анализ зафиксированных на документах записей и изображений. Содержание документов, манера выполнения рисунков и записей косвенно свидетельствуют, что их исполнителем является двоюродный брат Б. Радзивилла гетман ВКЛ Януш Радзивилл (1612–1655). По мнению

историков Николая Волкова и Кирилла Карлюка, в пользу данного предположения говорит то, что бумага документов Коллекции по своей структуре и характеристикам водяных знаков идентична бумаге, использовавшейся Я. Радзивиллом. Кроме того, сама биография гетмана доказывает, что он видел все объекты, зафиксированные на документах [2, с. 95].

Для подтверждения обозначенных предположений НИАБ обратился в Институт СК с просьбой проведения соответствующего почерковедческого исследования. Следует сразу оговориться, что хотя автор статьи и имеет практику производства почерковедческих экспертиз, ввиду того что Институт СК не является судебно-экспертной организацией, данное исследование не носит статус экспертного заключения. Вместе с тем, стоит отметить, что исследование проводилось в соответствии с действующими методиками проведения судебных почерковедческих экспертиз [3; 4; 5; 6].

Суть исследования состояла в сравнении рукописных записей, имеющихся на отдельных листах Коллекции, с образцами почерка, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл.

В частности, непосредственному исследованию подлежали рукописные записи, расположенные на титульном листе, листе 1 с изображением иконостаса Воскресенской церкви в Борисове[1] и герба кухмистра ВКЛ Павла Печигойского (далее – лист 1), части листа 30 с изображением плана военного лагеря около Германовки и верхнего этажа Бышевской церкви (далее – лист 30), части листа 42 со списком зданий в Шклове, Копыси и Головчине (далее – лист 42). Все листы – светло-желтого цвета, нелинованные (без линий графления), имеют следы загибов (см. ил. 1–5).

Все исследуемые записи представляют собой выполненные на польском языке краткие рукописные тексты (перечни фамилий, наименований зданий и сооружений) и начертания отдельных букв и чисел. Записи исполнены красящими веществами черного (чернилом) и серого цвета (вероятно, графитом). Отдельные фрагменты графитных надписей обведены чернилом.

В качестве сравнительных образцов сотрудниками НИАБ были предоставлены датируемые 1629–1654 гг. рукописные записи, исполнителем которых достоверно считается Я. Радзивилл, выполненные также, как и исследуемые объекты, на светло-желтой нелинованной бумаге черным красящим веществом.

---

[1] На рисунке иконостаса нет указания на место его размещения. Предположение о его размещении в Воскресенской церкви в Борисове было высказано Николаем Волковым [2, с. 34].



Ил. 1. Титульный лист Коллекции



Ил. 2. Левая часть листа 1 Коллекции



Ил. 3. Правая часть листа 1 Коллекции



Ил. 4. Часть листа 30 Коллекции



Ил. 5. Часть листа 42 Коллекции

Методика проведения многообъектного почерковедческого исследования предполагала изначальное сравнение записей, имеющихся на листах Коллекции, между собой. В результате этого было установлено, что на изучаемых листах Коллекции имеются три группы записей, отличающихся друг от друга по общим и частным признакам (условно данные записи были обозначены как записи группы 1, группы 2 и группы 3).

К группе 1 были отнесены все записи, выполненные на листе 1, на листе 30 (за исключением записей в двух обособленных таблицах, расположенных в центральной части листа и немного выше её – выделены на ил. 4 пунктирной линией), а также записи на листе 42. Характерно, что всем данным записям присущи одни и те же общие признаки, а именно:

- степень выработанности движений – высокая, темп выполнения – от быстрого до среднего (с преобладанием быстрого);
- положение продольных осей письменных знаков – от вертикального до правонаклонного, с преобладанием последнего;
- размер букв – от малого до большого с преобладанием среднего;



Ил. 6–7. Рукописные записи группы 2, выполненные на части листа 30

▪ разгон (преобладающая протяженность движений по горизонтали) – от малого до большого, с преобладанием среднего;

▪ связность (слитное начертание) букв – от малой (до 2–3 букв) до средней (4–5 букв);

▪ положение строк относительно среза листа бумаги – преобладает горизонтальное, в отдельных случаях проявляется поднимающееся, крайне редко – опускающееся;

▪ форма линии письма в строке – от прямой до извилистой;

▪ размер интервалов между строками – от малого до большого с преобладанием среднего (в пределах от одной до полутора высот строчных букв);

▪ размер интервалов между словами – преобладает средний (примерно равный ширине одной строчной буквы);

▪ размер интервалов между предшествующими словами и знаками препинания – от малого до среднего (равного ширине строчной буквы);

▪ размещение знаков препинания относительно линии письма – на линии письма либо выше.

Последующим сравнительным исследованием вышеописанных записей между ними была установлена индивидуальная совокупность общих и частных признаков, свидетельствующая, что они выполнены одним лицом.

К группе 2 были отнесены записи, выполненные в двух обособленных таблицах, расположенных в центральной части листа 30 и немного выше её (см. ил. 6–7). Данные записи по многим общим признакам почерка совпадают с записями группы 1 и представляют собой начертания различных фамилий.

Вместе с тем, записи группы 2 выглядят более аккуратно, в них преобладает средний темп выполнения, размер букв – от малого до среднего с доминированием среднего, большинство слов исполнено несвязными одиночными буквами (связность – малая). При сравнении записей данной группы между ними было установлено совпадение всех общих и частных признаков, свидетельствующее об их выполнении одним лицом.

К группе 3 были отнесены записи, расположенные на титульном листе (см. ил. 8–9). Почерки, которыми исполнены рукописные записи группы 3, характеризуются не ниже средней степенью выработанности движений, от среднего до быстрого темпом выполнения, наклоном письменных знаков в пределах правого, размером – от среднего до большого, разгоном – от малого до среднего, расстановкой – от узкой до средней, связностью – от малой до средней.

При сравнении данных записей между собой было установлено, что по каждому сопоставлению ни совпадающие, ни различающиеся признаки не образуют совокупностей, достаточных для формулирования какого-либо определенного вывода об исполнителе. Это объясняется прежде всего краткостью и простотой строения данных записей.

Следует также отметить, что как записи группы 1, так и записи групп 2 и 3, имеют признаки снижения координации движений, проявляющиеся в разной степени наклона письменных знаков, неустойчивых размере и расстановке букв и элементов, их разгоне и связности. Наличие в исследуемых записях указанных признаков, имеющиеся зачеркивания и исправления свидетельствуют о необычности условий процесса письма в момент их выполнения.

Далее рукописные записи всех трех групп сравнивались между собой, а также с образцами почерка, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл.

При этом между записями группы 1 и образцами почерка, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл, были установлены совпадения по всем общим, а также следующим наиболее информативным вариантам частных признаков (см. ил. 10–12, отметки 1–18):

- форма движений при выполнении верхней части первого элемента заглавной буквы «А» – дуговая;
- форма движений при соединении первого и второго элементов заглавной буквы «К» – возвратно-прямолинейная;



Ил. 8–9. Рукописные записи группы 3, выполненные на титульном листе

- форма движений при выполнении верхней части первого элемента заглавной буквы «K» – дуговая;
- строение по степени сложности движений при выполнении строчной буквы «в» – упрощено за счет утраты верхней части овала;
- форма движений при выполнении верхней части заглавной буквы «S» – выпрямленная дуга;
- направление движений при выполнении верхней части третьего элемента заглавной буквы «В» – сверху вниз вправо;
- протяженность движений по горизонтали при выполнении заключительной части второго элемента строчной буквы «а» – значительно больше первого элемента;
- форма движений при соединении первого и второго элементов строчной буквы «w» – возвратно-прямолинейная;
- форма движений при выполнении верхней части первого элемента строчной буквы «w» – дуговая;
- форма движений при соединении первого и второго элементов строчной буквы «r» – возвратно-прямолинейная;
- относительное направление сгибательных движений при выполнении первого и второго элементов строчной буквы «h» – соответственно правонаклонное и левонаклонное;
- форма движений при соединении первого и второго, второго и третьего элементов заглавной буквы «Z» – дуговая;
- форма движений при выполнении первого элемента заглавной буквы «L» – дуговая;
- направление движений при выполнении второго элемента заглавной буквы «L» – сверху вниз вправо;




Ил. 10. Исследуемые записи, содержащиеся на части листа 42 Коллекции




Ил. 11. Фрагменты записей на левой части листа 1



Ил. 12. Фрагменты изображения почеркового материала, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл

- относительное направление сгибательных движений при выполнении первого и третьего элементов строчной буквы «м» – соответственно правонаклонное и левонаклонное;
- размещение движений по вертикали при выполнении верхней части третьего элемента заглавной буквы «М» – значительно ниже верхней части второго элемента;
- размещение точки окончания движения при выполнении второго элемента заглавной буквы «Р» – значительно ниже точки начала данного элемента;
- количество движений при выполнении заглавной буквы «Р» – увеличено за счет наличия начального рефлекторного штриха.

Перечисленные совпадающие признаки устойчивы, однако большая их часть имеет невысокую идентификационную значимость, в связи с чем данные признаки не достаточны для образования индивидуальной совокупности признаков и категорического вывода. В свою очередь, выявленная совокупность признаков близка к индивидуальной и дает основания для утверждения, что все записи на листе 1 с изображением иконостаса Воскресенской церкви в Борисове и герба кухмистра ВКЛ П. Печигойского, на части листа 30 с изображением плана военного лагеря около Германовки и верхнего этажа Бышевской церкви (за ис-

ключением записей в двух обособленных таблицах, расположенных в центральной части листа и немного выше её), а также список зданий в Шклове, Копыси и Головчине на части листа 42 Коллекции выполнены, вероятнее всего, лицом, являющимся исполнителем почеркового материала, представленного как образцы почерка Я. Радзивилла.

Выявить большее количество совпадающих признаков, значимых в идентификационном плане, и ответить на вопрос в категорической форме, не удалось по причинам краткости и простоты строения исследуемых записей, наличия в них признаков выполнения в необычных условиях, ограничивших объем графической информации, необходимой для идентификации.

При сравнении записей, выполненных в двух обособленных таблицах, расположенных в центральной части листа 30 и немного выше её, с записями на титульном листе, а также с образцами почерка, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл, установить выполнены они одним или разными лицами, не представилось возможным. Объясняется это тем, что совпадающие признаки не образуют совокупностей, достаточных для формулирования категорического положительного вывода об исполнителе, так как не являются редкими и встречаются в почерках многих лиц. В свою очередь различающиеся признаки не могут служить основанием для отрицательного вывода, так как не удалось установить: являются ли они вариантами признаков почерка, исполнителем которого достоверно считается Я. Радзивилл, не проявившимися в представленных образцах, или же эти признаки являются признаками почерка другого лица (лиц). Выявить большее количество идентификационных признаков в процессе сравнения и оценить их по существу не удалось из-за малого объема содержащейся в указанных записях почерковой информации, обусловленного их краткостью и простотой строения, наличием признаков выполнения в необычных условиях.

Таким образом, в результате проведенного почерковедческого исследования подтверждается с высокой степенью вероятности версия сотрудников НИАБ о том, что исполнителем ряда записей, содержащихся на листах Коллекции, является Я. Радзивилл. Это, в частности, касается исследованных листа 1 с изображением иконостаса Воскресенской церкви в Борисове и герба кухмистра ВКЛ П. Печигойского, части листа 30 с изображением плана военного лагеря около Германовки и верхнего этажа Бышевской церкви (за исключением записей в двух обособленных таблицах, расположенных в центральной части листа и немного выше её), части листа 42 Коллекции.

Вместе с тем, стоит учитывать, что многие записи коллекции выполнены в необычных условиях, содержат зачеркивания и исправления, зачастую не связаны между собой содержательно, что безусловно затруд-

няет процесс их верификации. Именно поэтому не представилось возможным ответить, выполнены ли записи на титульном листе и записи, расположенные в двух обособленных таблицах на листе 30 Коллекции, лицом, являющимся исполнителем почеркового материала, представленного как образцы почерка Я. Радзивилла, или иным лицом (лицами).

Несмотря на отсутствие категоричности в выводах, в целом стоит отметить важность и особенность проведенного исследования, поскольку в его рамках реализован комплексный, многосторонний подход в решении важной исторической задачи, основанный на взаимодействии организаций разных сфер деятельности, привлечении ресурсов как документально-архивного толка, так и криминалистической направленности. Надеемся, что подобный опыт получит свое закрепление и распространение, ибо, полагаем, только так возможно расставлять точки над «i» в тех сложных вопросах, которые не могут быть однозначно решены лишь на основе исторического анализа.

## Источники и литература

1. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 27 января 2022 г. № 50 «О республиканском плане мероприятий по проведению в 2022 году Года исторической памяти» // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=c22200050&q_id=6044558. – Дата доступа: 15.08.2022.
2. Волкаў, М. А., Карлюк, К. І. Абрысы розныя: малюнкі і чарцяжы гетмана Януша Радзівіла. – Мінск : Беларусь, 2020. – 159 с.
3. Подполухо, М. М., Романова, Л. Н., Сысоева, Е. П. Рекомендации по составлению заключения эксперта и оформлению иллюстративного материала по результатам проведения почерковедческих экспертиз при решении идентификационных задач : справочно-методическое пособие / Гос. ком. судебных экспертиз Респ. Беларусь. – Минск, 2019. – 85 с.
4. Судебно-почерковедческая экспертиза: особенная часть: исследование рукописных текстов. – Изд. 2-е, перераб. и доп. / Гос. учреждение «Рос. федер. центр судебной экспертизы при Минюсте России». – Москва : Наука, 2007. – 341 с.
5. Судебно-почерковедческая экспертиза: общая часть: теор. и метод. основы / [под науч. ред. В. Ф. Орловой]; Гос. учреждение «Рос. федер. центр судеб. экспертизы при Минюсте России». – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : Наука, 2006. – 544 с.
6. Куприянова, А. А. Методика решения судебно-почерковедческих диагностических задач / Гос. учреждение «Рос. федер. центр судебной экспертизы при Минюсте России». – Москва : Наука, 2006. – 64 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.07.2022

*А. У. Ерашэвіч*

# Пенсійныя выплаты ў Мінскай губерні ў канцы XVIII ст. – пачатку 1860-х гг. (паводле дакументаў Мінскай казённай палаты)

У беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць грунтоўныя навуковыя даследаванні, прысвечаныя працэсу налічэння і выдачы грашовых пенсій (як аднаго з відаў сацыяльнай абароны) службоўцам Расійскай імперыі ў дарэформенную эпоху. Эканамісты, правазнаўцы, гісторыкі надавалі ўвагу толькі прававому рэгуляванню пенсійнага забеспячэння ў гэтай дзяржаве. Таму ў дадзеным артыкуле, пераважна на базе рэпрэзентатыўных архіўных крыніц Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ), характарызуецца фінансавы бок дэцэнтралізаванай сістэмы пенсійнага забеспячэння службоўцаў у ходзе адміністрацыйнай практыкі на тэрыторыі Мінскай губерні з канца XVIII ст. да пачатку 1860-х гг., вызначаюцца ў дынаміцы крыніцы, віды, склад і структура пенсійных выплат, выяўляецца іх удзельная вага ў сістэме казённых выдаткаў.

Адзначым, што ў фінансава-справаздачнай дакументацыі дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі канца XVIII – першай паловы XIX ст. усе казённыя выдаткі размяркоўваліся па ведамствах. Агульныя губернскія расходы падзяляліся на штатныя, асігнаваныя паводле роспісу казённай палаты, і звышштатныя ці выпадковыя, якія выдаткоўваліся на рахунак Галоўнага казначэйства паводле асобных распараджэнняў вышэйшых улад. Для размеркавання сум штатных выдаткаў папярэдне складаўся асобны роспіс, які пасля разгляду ў ведамстве Міністэрства фінансаў дасылаўся для выканання ў казённую палату перад наступным годам [2, с. 585]. У НГАБ захаваліся штогадавыя роспісы аб мяркуемых даходах і расходах па Мінскай губерні за 1797–1864 гг. (за выключэннем асобных гадоў), а таксама змешчаныя ў іх спісы пенсіянераў. Аналіз гэтых дакументаў дазваляе скласці пэўнае ўяўленне аб эвалюцыі грашовых выплат у сістэме пенсійнага забеспячэння на тэрыторыі Мінскай губерні напярэдадні буржуазных рэформ.

Паводле правілаў, дзяржаўныя службоўцы Расійскай імперыі пасля выхаду ў адстаўку маглі свабодна выбраць месца пражывання на яе тэрыторыі і, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, атрымлівалі пенсіі, як правіла, з мясцовых павятовых казначэйстваў (пасля кожнага месяца ці пасля 1-й і 2-й трацей і ў канцы 3-й трэці кожнага года). Так, прызначаная 25 чэрвеня 1823 г. пенсія службоўцу ведамства Калегіі замежных спраў калежскаму радцу Канстанцінаву памерам у 1485 руб. асігнацыямі выдавалася з Мазырскага павятовага казначэйства [10, арк. 72].

Павелічэнне агульнай колькасці дзяржаўных службоўцаў (ваенных, грамадзянскіх ці стацкіх, прыдворных) у выніку бюракратызацыі дзяржаўнага апарату, асабліва ў перыяд кіравання імператара Мікалая І, абумовіла рост адноснай колькасці пенсіянераў розных ведамстваў. Калі ў Расійскай імперыі ў 1828 г. 1 пенсіянер прыпадаў на 4,5 службоўцаў, то ў 1843 г. – ужо на 2,5, а ў 1868 г. – на 1.

У першай палове XIX ст. у Расійскай імперыі пастаянна павялічвалася колькасць пенсіянераў і, адпаведна, агульная сума выплат ім. У 1842 г. сярэдні памер пенсіі складаў каля 33 % ад агульнага ўзроўню грашовага ўтрымання службоўцаў і 41 % ад памераў іх жалавання, у 1867 г. – адпаведна 17 % грашовага ўтрымання і толькі 29 % ад сумы жалавання.

Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя рэарганізацыі на беларускіх землях у часы Кацярыны ІІ і Паўла І змянілі склад уладных структур. У выніку частка службоўцаў пазбавілася пасад, аказалася па-за штатам, выйшла ў адстаўку і была пераведзена на пенсійнае ўтрыманне.

У Мінскай губерні грашовыя кампенсацыі выплачваліся ў тым ліку ўніяцкім іерархам і святарам. У адпаведнасці з рэскрыптам мінскага генерал-губернатара Цімафея Туталміна ад 6 верасня 1795 г. былы пінска-тураўскі епіскап Іосіф Гарбацкі атрымаў 3000 руб. пенсіі, пазней такая ж пенсія была налічана быламу епіскапу тураўскаму, каад’ютару Пінскай епархіі Іасафату Булгаку (указ ад 28 красавіка 1798 г.). У 1799 г. паводле асобных указаў прадугледжваліся штогадовыя пенсійныя выдачы агулам у 6297 руб. для ўтрымання ўніяцкага намінальнага кананічнага мітрапаліта кіеўскага і галіцкага Феадосія Растоцкага, І. Булгака, гаспадарчага дзеяча Мацея Бутрымовіча, у 1800 г. – 3825 руб. па асобных указах для Ф. Растоцкага, І. Гарбацкага, І. Булгака з часовых штогадовых сум [5, арк. 87–95; 6, арк. 9–18]. Да таго ж, паводле ўказа ад 6 верасня 1795 г. выдаваліся 2575 руб. на пенсіі для 31 уніяцкага святара, якія засталіся без пасад: 12 у Пінскім павеце – 1000 руб., 6 у Мазырскім павеце – 400 руб., 5 у Рэчыцкім павеце – 450 руб., 3 у Бабруйскім павеце – 200 руб., 5 у Слуцкім павеце – 525 руб. У 1803 г. для выдачы пенсій уніяцкім святарам была вызначана сума ў 3725 руб., у тым ліку ў Пінскім павеце – 1450 руб., у Мазырскім – 975 руб., у Рэчыцкім – 525 руб., у Бабруйскім – 200 руб., у Слуцкім – 575 руб. [7, арк. 42–48]; а ў 1806 г. – 2425 руб. У канцы 1801 г. да выдачы пенсіянерам і пакінутым на інвалідным утрыманні чыноўнікам, якія жылі ў Мінскай губерні, прызначалася 940,89 руб. жалавання [4, арк. 582 адв.].

Характэрнай рысай пенсійнай сістэмы Расійскай імперыі канца XVIII – першай паловы XIX ст. з’ўлялася ведамасная дэцэнтралізацыя пенсійных выплат. У прыватнасці, у Мінскай губерні выдача розных відаў пенсій і аднаразовай дапамогі ажыццяўлялася з крыніц розных ве-

дамстваў. Так, грошы на імянныя пенсіі асігнаваліся ў лік фінансавых сродкаў устаноў Найвышэйшага двара і Міністэрства імператарскага двара (з 22 жніўня 1826 г.) па ведамстве Кабінета Яго Імператарскай Вялікасці. Выдача ордэнскіх пенсіёнаў здзяйснялася на рахунак Капітула імператарскіх (з 2 красавіка 1842 г.; ранейшыя назвы: Ордэнскі капітул (04.10.1798–05.06.1801), Капітул расійскіх імператарскіх кавалерскіх ордэнаў (05.06.1801–21.01.1832), Капітул расійскіх імператарскіх і царскіх ордэнаў (21.01.1832–02.04.1842). Да 1842 г. гэтая пазаведамасная ўстанова, якая падпарадкоўвалася непасрэдна імператару, а потым знаходзілася ў складзе Міністэрства імператарскага двара, займалася ўзнагародамі асоб ордэнамі, медалямі, знакамі адзнакі беззаганнай службы, залатой халоднай зброяй) [1, с. 170]. Ваеннае міністэрства распараджалася інвалідным утрыманнем адстаўных ваенных чыноў. Па Міністэрстве фінансаў маглі вылучацца фінансавыя сродкі як на агульныя губернскія пенсіі (паводле агульных пенсійных статутаў), так і сумы на аднаразовыя грашовыя дапамогі, імянныя пенсіі паводле найвышэйшых прызначэнняў і іншыя выдачы. Бедныя стацкія чыноўнікі забяспечваліся за кошт грашовых паступленняў так званага Камітэта апекі заслужаных грамадзянскіх чыноўнікаў.

***Табліца 1.* Сумы прызначаных да выдачы пенсіёнаў, пенсій і дапамогі звольненым са службы чыноўнікам Мінскай губерні ў 1857–1860 гг. (паводле звестак казённай палаты)** [2, с. 511]

| **Ведамства** | **Колькасць пенсіёнаў, пенсій і дапамог** | **Удзельная вага, %** | **Сума, руб. срэбрам** | **Адносны паказчык, %** |
|---|---|---|---|---|
| Роспіс Мінскай казённай палаты | 3035 | 73,3 | 354 952,36 | 74,5 |
| На кошт дзяржаўнага казначэйства | 760 | 18,4 | 92 232,87 | 19,3 |
| Камітэт аб параненых | 327 | 7,9 | 28 757,78 | 6 |
| Камітэт апекі заслужаных грамадзянскіх чыноўнікаў | 17 | 0,4 | 514,88 | 0,1 |
| Усяго | 4139 | 100 | 476 457,89 | 100 |

Розныя віды грашовых пенсій, так званых пенсіёнаў, і аднаразовай дапамогі паступалі за кошт губернскіх даходаў, сродкаў дзяржаўнага казначэйства, з Аляксандраўскага камітэта аб параненых, заснаванага

18 жніўня 1814 г. (19 сакавіка 1858 г. быў перайменаваны ў Камітэт аб параненых), Камітэта апекі заслужаных грамадзянскіх чыноўнікаў і іншых крыніц. Ва ўсялякім разе, большасць атрымальнікаў пенсій і грашовых дапамог (у 1857– 1860 гг. 73,3 %) і грашовых сум выдач (74,5 %) прыпадала на асоб, якія ўлічваліся роспісам Мінскай казённай палаты (гл. табл. 1).

Пэўнае ўяўленне аб катэгорыях пенсіянераў і памерах пенсійных выплат даюць матэрыялы роспісу дзяржаўных выдаткаў у Мінскай губерні на 1805 г. [8, арк. 34д–34о]. Так, быламу канцылярысту Мінскага земскага суда Андрэю Саўнапекаву паводле ўказа ад 6 сакавіка 1804 г. належала выплаціць (за вылікам на шпіталь 25 кап.) 25,75 руб. пенсіі, удаве ліфляндскага (інфлянцкага) ваяводы Станіслава Брастоўскага, якая затым была замужам за генерал-паручнікам Іванам Ферзенам – 2600 руб. (указ ад 10 ліпеня 1773 г.), жонцы былога кіраўніка эканамічных маёнткаў Дварэцкага Разаліі – 1000 злотых (150 руб. срэбрам, а за вылікам на шпіталь 1,5 руб. належала выдаць 148,5 руб. серабром ці 185,62 руб. асігнацыямі) (рэскрыпт на імя Мікалая Рапніна ад 15 кастрычніка 1796 г.), быламу дырэктару дамаводства Мінскай казённай палаты стацкаму радцу Вільгельму Тызенгаўзену – 495 руб. (за вылікам на шпіталь 5 руб., указы ад 13 жніўня 1798 г. і 22 чэрвеня 1804 г.), быламу мінскаму губернскаму пракурору калежскаму радцу Івану Шыцу – 297 руб. (за вылікам на шпіталь 3 руб., указ ад 7 лістапада 1801 г.), быламу земскаму камісару Мазырскага павета падпаручніку Пятру Устаўшчыкову – 123,75 руб. (за вылікам на шпіталь 1,25 руб., указ ад 28 верасня 1802 г.). Адпаведна вышэй канфірмаванага 15 ліпеня 1799 г. даклада Сената звольненым са службы са штатных каманд у Мінскай губернскай роце належала выплаціць 24,85 руб. інваліднага ўтрымання (шарагоўцу 10 руб., унтэр-афіцэру – 14,85 руб.), у 1806 г. – 44,85 руб.). За кошт Кабінета Яго Імператарскай Вялікасці тайнаму радцу, быламу мінскаму губернатару Захару Карнееву прызначалася да выдачы 1000 руб. Таксама прадугледжваліся пенсійныя выплаты памерам у 2795 руб. за кошт Ордэнскага капітула (камандору ордэна Св. Аляксандра Неўскага архіепіскапу мінскаму і літоўскаму Іову 900 руб., мінскаму рымска-каталіцкаму афіцыялу, радашковіцкаму пробашчу Антону Букатаму, старэйшаму брату жмудскага суфрагана Тадэвуша Букатага, 270 руб., стацкаму радцу, кавалеру ордэна Св. Ганны 2-й ступені, прэзідэнту 2-га дэпартамента Мінскага Галоўнага суда Яцэку-Антонію Путкамеру 225 руб., мінскаму маршалку Юзафу Ваньковічу 200 руб., вілейскаму маршалку Яну-Людвіку Валадковічу 175 руб., бабруйскаму маршалку Яну-Антонію Кялчэўскаму 175 руб., барысаўскаму маршалку Станіславу Ваньковічу 250 руб., палкоўніку Пятру Ламбу 600 руб.).

Захаваныя архіўныя крыніцы дазваляюць вызначыць змены ў дынаміцы пенсійных выплат па ведамстве Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства Міністэрства фінансаў па Мінскай губерні за большасць гадоў з 1816 да 1861 г. (да 1840 г. улічваліся ў асігнацыйных рублях, пазней – у срэбраных; да 1826 г. не ўлічаны сумы на рахунак Ордэнскага капітула ведамству Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства) [11; 18; 19; 21, арк. 324–355; 22, арк. 53–64 адв.].

Паводле гэтых звестак, колькасць пенсіянераў у Мінскай губерні вырасла з 94 у 1816 г. да 623 (у 6,6 разоў) у 1856 г. і 905 (прыблізна ў 1,5 раза) у 1861 г. Толькі за 7 гадоў (з 1856 да 1863 г.) колькасць атрымальнікаў пенсій у Мінскай губерні павялічылася з 623 да 986, ці амаль у 1,6 раза. У час праўлення імператара Аляксандра I агульная сума пенсійных выплат павялічылася з 8953,28 руб. у 1816 г. да 39 407,06 руб. асігнацыямі ў 1825 г., альбо ў 4,4 разы, а іх удзельная вага ў сістэме дзяржаўных губернскіх выдаткаў – у 3,6 раза з 2,8 да 10,1 %. Пры імператары Мікалаі I гэтая сума вырасла з 36 973,67 руб. у 1826 г. (9,1 % агульнагубернскіх расходаў) да 137 177,14 руб. (13,4 %) асігнацыямі ў 1839 г., ці ў 3,7 раза, а срэбранай манетай – з 42 566,1 руб. (12,6 %) у 1841 г. да 77 191,63 руб. (15,4 %) у 1855 г., альбо ў 1,8 раза. За першыя 5 гадоў праўлення імператара Аляксандра II пенсійная сума вырасла з 74 911,82 руб. (15 %) у 1856 г. да 103 838,12 руб. (18 %) у 1861 г., ці прыкладна ў 1,4 раза. У цэлым з 1844 да 1860 г. сума выдаваемых пенсій і аднаразовай дапамогі ў Мінскай губерні вырасла больш чым у 2 разы.

У структуры пенсійных выдаткаў адносны паказчык грашовых выдач для чыноў грамадзянскага ведамства ў 1816 г. складаў 53,5 %, ваеннага ведамства (былым вайскоўцам сухапутных узброеных сіл, іх удовам і сіротам, у лік дадатковага жалавання па адзнаках ваеннага ордэна, у нязначным памеры марскім чынам) – 46,5 %, у 1825 г. – адпаведна 26,9 % і 73,1 %, у 1826 г. – 17,5 % і 82,5 %, у 1855 г. – 40,2 % і 59,8 %, у 1861 г. – 41,4 % і 58,6 %. Найменшая доля пенсійных выплат грамадзянскім службоўцам адзначана ў 1826 г. (17,5 %), найбольшая – у 1817 г. (55,4 %). За ўвесь час чынам ваеннага ведамства выдавалася (у сярэднім) каля 68,1 % пенсійных сум, грамадзянскага – 31,9 %. Частка асоб магла разлічваць на пенсійнае ўтрыманне ў адпаведнасці з асобнымі імператарскімі ўказамі. Так, 986 пенсіянерам у 1863 г. планавалася выдаць па грамадзянскім ведамстве 49 355,06 руб., у тым ліку 9 чынам паводле імператарскіх загадаў 2777,12 руб. (5,6 %), 8 удовам – 423,8 руб. (0,9 %), 300 адстаўным службоўцам – 46 154,14 руб. (93,5 %), а пенсіянерам ваенна-сухапутнага ведамства – 62 580,71 руб., у тым ліку 660 асобам – 59 127,11 руб. (94,5 %), 5 чынам паводле найвышэйшых загадаў – 1920,64 руб. (3,1 %), 2 удовам – 1532,96 руб. (2,4 %) і 2 чынам ваенна-марскога ведамства – 47,06 руб. З 111 982,83 руб. агульнай сумы

пенсійных грашовых выплат на долю чыноў грамадзянскага ведамства прыпадала 44,1 %, ваеннага – 55,9 % [20, арк. 100–214].

За перыяд з 1816 да 1861 г., па якім маюцца архіўныя даведкі, колькасць пенсіянераў у Мінскай губерні вырасла ў 9,6 раза, агульная сума пенсійных выдаткаў у пераразліку на срэбраную манету павялічылася прыкладна ў 41,8 раза, іх удзельная вага ў губернскіх выдатках – у 6,5 раза. Іншымі словамі, пенсійныя сумы павялічваліся большымі тэмпамі, чым колькасць пенсіянераў. У сярэднім налічаная пенсійная сума на аднаго пенсіянера грамадзянскага ведамства складала ў 1816 г. 319,49 руб. асігнацыямі, ваеннага – 52,66 руб. асігнацыямі (розніца ў 6,1 раза), у 1861 г. – адпаведна 150,74 і 98 руб. срэбрам (розніца ў 1,5 разы). Адрозненні ў пенсійных выплатах чынам грамадзянскага і ваеннага ведамстваў тлумачацца тым, што існавала значная колькасць унтэр-, штаб- і обер-афіцэраў, іх удоў і дзяцей, якія атрымлівалі адносна невялікія пенсіі. Сярэдні ўзровень пенсійных сум грамадзянскіх службоўцаў з 1816 да 1861 г. вырас у 1,65 раза, звязаных з ваенным ведамствам – у 6,5 раза. Сродкі з пенсійнага фонду пераважна ішлі на забеспячэнне вайскоўцаў і членаў іх сямей пасля адстаўкі, раненняў, хвароб, смерці і іншых выпадкаў.

Цікавыя звесткі аб парадку прызначэння пенсійнага ўтрымання ваенным чынам можна знайсці ва ўспамінах мінскага жандарскага штаб-афіцэра і старшыні (з 1850 г.) Мінскай казённай палаты Асінкрыта Ламачэўскага, які згадвае два характэрныя выпадкі. Так, законныя патрабаванні аб прызначэнні пенсіі ўдавы з 6 дзецьмі былога мінскага паліцмайстра ведамства Міністэрства ўнутраных спраў маёра Вікенція Казакевіча, які тры разы знаходзіўся пад следствам (два разы за выдадзеныя ім дакументы на высокія даведачныя цэны шпітальным прыпасам, а таксама за цяганіну ў спагнанні грошай па пазыковым лісце, быў памілаваны паводле маніфеста ад 22 жніўня 1826 г.) і памёр па-за службай, не былі прыняты як віленскім генерал-губернатарам князем Мікалаем Далгарукавым, так і Камісіяй прашэнняў і шэфам Корпуса жандараў. Толькі пасля таго, як А. Ламачэўскі знайшоў пасведчанне, выдадзенае дывізійным генералам Лонгінам Ротам В. Казакевічу, што той падчас Барадзінскай бітвы 1812 г. быў паранены, знявечаны і знойдзены выпадкова сярод забітых, Камітэт міністраў прызначыў удаве і дзецям 712 руб. пажыццёвай пенсіі са дня смерці мужа. Другі выпадак тычыўся адстаўнога палкоўніка Івана Андрэевіча фон Тальздорфа, кавалера ордэна св. Георгія 4-й ступені (17.08.1813), які жыў у вёсцы Брылевічы, у 5 вярстах ад Мінска. У 1792 г. ён адным з першых паступіў на службу кадэтам у Кіеўскі драгунскі полк і з прычыны хваробы быў звольнены 1 сакавіка 1816 г. з ваеннай службы са стажам 24 гады і шматлікімі ўзнагародамі ў чыне палкоўніка з інвалідным утрыманнем. Заслужаны афіцэр меў закладзеную ў крэдытных установах вёску Брылевічы

з 37 душамі сялян мужчынскага полу і штомесячна атрымліваў пенсію памерам у 4,39 руб. У той жа час звольнены па хваробе штабс-капітан Вінцэнт Вярыга пасля 10 гадоў службы, які не «нюхаў пораху», атрымліваў 102 руб. гадавой пенсіі. Толькі ў 1851 г. паводле даклада ваеннага міністра І. фон Тальздорфу было выдаткавана 1000 руб. срэбрам дапамогі [3, с. 28–30, 31–32].

Ваенныя пенсіі выдаваліся афіцэрам і ніжнім вайсковым чынам з ліку інвалідаў, іх удовам і сіротам адпаведна пенсійнага статута ад 6 снежня 1827 г. з так званага інваліднага капіталу Камітэта 18 жніўня 1814 г. Так, у 1827 г. 24 ніжнім чынам-інвалідам у Мінскай губерні было накіравана 1535 руб. з мэтай выплаты кожнаму ад 30 да 90 руб. на рахунак інваліднага капіталу [12, арк. 888–888 адв.]. У 1831 г. 12 афіцэрам выдаткоўвалася 7350 руб., 45 ніжнім ваенным чынам – 3170 руб., удовам і дзецям вайскоўцаў – 3676,02 руб. [13, арк. 416–416 адв., 640–641, 660–660 адв., 822–822 адв.]. Паводле інфармацыі са штогадовых спісаў асоб, якім дасылаліся пенсіі з інваліднага капіталу ў Мінскай губерні за 1827–1842 гг., колькасць афіцэраў вагалася ад 11 (1832, 1833 гг.) да 19 (1841 г.) з агульнай сумай пенсійных выплат ад 7050 (1827 г.) да 11 211,33 руб. (1839 г.) асігнацыямі, а ніжніх вайсковых чыноў – ад 24 (1827 г.) да 81 (1835 г.), ім было выдаткавана ад 1515 руб. (1828 г.) да 6378,3 руб. (1834 г.) асігнацыямі. У цэлым сярэднегадавы памер пенсійных выплат да 1839 г. для афіцэраў складаў 8321,61 руб., а для ніжніх вайсковых чыноў – 3833,58 руб. асігнацыямі [17].

Як сведчаць архіўныя дакументы, пенсіі з Камітэта апекі заслужаных грамадзянскіх чыноўнікаў у 1820–1850-я гг. атрымлівалі штогод у Мінскай губерні не больш за дзесяць чалавек. Так, са згаданага Камітэта на рахунак Галоўнага казначэйства ў 1833 г. паступіла 2 пенсіянерам 200 руб. [14, арк. 316, 578–578 адв., 598–598 адв., 822–823 адв.], у 1836 і 1837 гг. – 5 асобам па 558 руб. [15, арк. 407; 21, арк. 420, 422], у 1842 г. – 5 асобам 126,35 руб. [16, арк. 249].

Зразумела, што памер пенсіі чыноўніка залежаў ад набытага ім чыну адпаведна чыноўніцкай табелі аб рангах, займаемай апошняй пасады, тэрміну выслугі, наяўнасці ўзнагарод, манаршых міласцей, колькасці членаў сям'і і іншых абставін. Аднолькавы чын пры адстаўцы яшчэ не гарантаваў адзіны ўзровень пенсіі. Паводле падлікаў аўтара, у Мінскай губерні да 1860 г. пенсію велічынёй больш за 1000 руб. асігнацыямі ці 300 руб. срэбрам мелі не менш за 170 чалавек. Большасць пенсій выдавалася былым вайскоўцам і членам іх сямей, чыноўнікам вучылішчаў, у тым ліку ў якасці дадатку да жалавання. Адныя з найбольшых пенсій мелі прадстаўнікі генералітэту (пералічаны ўсе з улікам членаў іх сямей) і вышэйшых грамадзянскіх чыноўнікаў (сумы пададзены да 1839 г. у асігнацыях, пазней – срэбрам): удава былога камандзіра Шлісельбург-

скага пяхотнага палка генерал-маёра Івана Рэрэна – 1782 руб. (указ аб прызначэнні выдадзены 31 студзеня 1814 г.), брыгадны камандзір 11-й пяхотнай дывізіі генерал-маёр Іван Капусцін – 2609,64 руб. (указ ад 28 снежня 1816 г.), удава і двое дзяцей кішынёўскага каменданта генерал-маёра Аляксея Сцяпанава – 2500 руб. (указ ад 20 жніўня 1830 г.), былы мінскі віцэ-губернатар стацкі радца Іван Малафееў – 1960 руб. (указ ад 28 чэрвеня 1832 г.), удава генерал-лейтэнанта Берга (імя не ўказана) з дзецьмі – 4160 руб. (указ ад 11 кастрычніка 1832 г.), генерал-маёр Густаў Ігельстром – 2940 руб. (указ ад 24 снежня 1833 г., яго ўдаве і дзецям выплачвалася 571,42 руб. срэбрам паводле ўказа ад 17 снежня 1846 г.), генерал-маёр Антон Арцішэўскі –1411,2 руб. (указ ад 28 сакавіка 1834 г.), дырэктар вучылішчаў Мінскай губерні калежскі радца Герасім Кутневіч – 3951,36 руб. (указ ад 20 снежня 1834 г., з 19 красавіка 1835 г. – 1097,6 руб. срэбрам, удаве 1120 руб. срэбрам паводле ўказа ад 23 верасня 1852 г.), генерал-маёр 2-й брыгады 5-й пяхотнай дывізіі Мікалай Буйвід – 2940 руб. (указ ад 3 сакавіка 1835 г., яго дачцэ выплачвалася 428,57 руб. срэбрам паводле ўказа ад 18 жніўня 1850 г.), генерал-маёр Сямён Гатоўскі – 1764 руб. (указ ад 19 кастрычніка 1835 г.), удава генерал-маёра Мікалая Антропава з дзецьмі – 3000 руб. (указ ад 11 лютага 1836 г.), удава генерал-маёра ад артылерыі Яўграфа Высоцкага – 430 руб. (указ ад 27 лютага 1845 г.), генерал-маёр Гектар Прашынскі – 840,63 руб. (указ ад 22 чэрвеня 1845 г.), генерал-маёр корпуса жандараў Карл Камаеўскі – 842,8 руб. (указ ад 19 чэрвеня 1848 г.), дачка генерала ад кавалерыі графа Іосіфа О'Рурка Эмелія – 1430 руб. (указ ад 19 жніўня 1849 г.), удава начальніка Аўгустоўскай губерні генерал-маёра Іосіфа Смоляка Кацярына – 430 руб. (указ ад 8 лістапада 1849 г.), дачка каменданта Бендэраў генерал-лейтэнанта Аляксея Эмме Ганна – 571,42 руб. (указ ад 12 студзеня 1851 г.), дачка начальніка 22-й пяхотнай дывізіі генерал-маёра Аляксея Эйсманта – 428,57 руб. (указ ад 14 жніўня 1851 г.), камандзір Мінскага ўнутранага гарнізоннага батальёна генерал-маёр Мікалай Рэйхнау (Рэйнгардт) – 560,46 руб. (указ ад 20 мая 1852 г.), удава генерал-маёра Аляксандра Брэверна Шарлота – 428,57 руб. (указ ад 19 снежня 1852 г.), удава начальніка ваеннай здымкі Маскоўскай губерні генерал-лейтэнанта Андрэя Фіцінгофа Лізавета – 572,5 руб. (указ ад 5 студзеня 1854 г.), генерал-маёр палявой артылерыі Канстанцін Дэнфер – 504,7 руб. (указ ад 24 ліпеня 1856 г.), удава і дзеці сапраўднага стацкага радцы, дырэктара канцылярыі міністра дзяржмаёмасцей Кірыла Халадоўскага – 857,7 руб. (указ ад 24 снежня 1856 г.), удава і дачка генерал-маёра ад кавалерыі Казіміра Гедройц-Юрагі (абедзвюх звалі Ганнамі) – 573,33 руб. (указ ад 1 мая 1857 г.), камандзір 1-й пешай брыгады Забайкальскага казацкага войска генерал-маёр Праспер Салагуб – 504,7 руб. (указ ад 31 студзеня 1858 г.), начальнік артылерыі правага крыла Каўказскай лініі генерал-маёр (про-

звішча не пазначана) – 560,4 руб. (указ ад 27 студзеня 1859 г.). Узровень пенсійнага забеспячэння генералаў, штаб- і обер-афіцэраў рэзка кантраставаў з пенсіямі адстаўных параненых і знявечаных ніжніх чыноў: так, у 1807 г. унтэр-афіцэры мелі ад 13,57 да 21,8 руб., а шарагоўцы – 9,4–9,5 руб. інваліднага дзяржаўнага ўтрымання [9, арк. 44 адв.–49].

Адзначым, што з прычыны змяншэння (з розных прычын) колькасці пенсіянераў звычайна рэальна выдаваемая ім сума была меншай за плануемую. Так, за 1857–1860 гг. у Мінскай губерні пенсіянеры атрымалі на 11,8 % менш за мяркуемыя да выдачы сумы (гл. табл. 2).

***Табліца 2.*** **Розніца плануемых і сапраўды выдадзеных пенсійных выплат у Мінскай губерні ў 1857–1860 гг.** [2, с. 512]

| Год | Колькасць пенсіёнаў, пенсій, аднаразовай дапамогі і інш. | Да выдачы, руб. | Сапраўды выдана, руб. | Розніца, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1857 | 876 | 109 634,63 | 95 518,69 | -14 115,94 |
| 1858 | 1035 | 117 621,65 | 104 703,81 | -12 917,84 |
| 1859 | 1139 | 122 516,01 | 107 195,88 | -15 320,13 |
| 1860 | 1089 | 126 685,6 | 113 047,39 | -13 638,21 |
| Усяго | 4139 | 476 457,89 | 420 465,77 | -55 992,12 |

Частка пенсійных сум выключалася з рахункаў. Так, у 1844 г. з 50 066,73 руб. было выплачана 38 286,25 руб. (76,5 %), а ў 1860 г. са 118 756,04 руб. толькі 87 845,41 руб. (амаль 74 %) [2, с. 512–513].

Адносны паказчык усіх відаў ведамасных пенсійных выплат вызначыць складана праз адсутнасць сістэматызаваных даных. Існуючыя звесткі няпэўныя і супярэчлівыя. Паводле нашых падлікаў, у 1805–1807 гг. у Мінскай губерні пенсіёны, інвалідныя і іншыя падобныя грашовыя выдачы разам складалі прыкладна 8–10 % агульнагубернскіх выдаткаў. За 1843–1845 гг. пенсійныя выдаткі за кошт дзяржаўнай казны па роспісах і прадпісаннях Міністэрства фінансаў дасягалі ў Мінскай губерні 180 912,82 руб., ці 4,2 % агульных расходаў (4 249 087,39 руб.) [23, арк. 17; 24, арк. 15–16]. У канцы 1850-х гг. пенсійныя адлічэнні па Мінскай губерні запісваліся выдаткамі па Міністэрстве фінансаў як сумы, асігнаваныя па роспісах казённай палаты і выдаваемыя на кошт Галоўнага казначэйства з усіх ведамстваў. Іх удзельная вага ў 1857–1860 гг. вагалася, паводле звестак Іларыёна Зяленскага, ад 14,6 да 19,1 % [2, с. 592–593].

Такім чынам, нягледзячы на паступовы і ўстойлівы рост абсалютных паказчыкаў пенсійных грашовых асігнаванняў у Мінскай губерні ў

1820-я – пачатку 1860-х гг., іх удзельная вага ў адносінах да агульнагубернскіх выдаткаў вагалася ў розныя гады ў шырокіх межах. У цэлым у Мінскай губерні, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, да пачатку 1860-х гг. захоўваўся дэцэнтралізаваны характар пенсійных выплат асобным катэгорыям службоўцаў з розных грашовых фондаў, але ўсё ж такі большасць іх ажыццяўлялася паводле роспісаў пенсіянераў, якія ўлічваліся ў казённай палаце; у большай ступені гэта былі вайскоўцы і члены іх сямей.

## Крыніцы і літаратура


1. Высшие и центральные государственные учреждения России 1801–1917 гг.: в 4 т. / ответ. сост. Д. И. Раскин. –Т. 3. – Санкт-Петербург : Наука, 2002. – 228 с.
2. Зеленский, И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния. – Ч. 2. – Санкт-Петербург : Военная тип., 1864. – VIII, IV, V, 701 с., 17 табл., карта.
3. Ломачевский, А. И. Из воспоминаний жандарма 30 и 40 годов : в 2 ч. – Ч. 2. – Санкт-Петербург : Тип. В. Грацианского, 1880. – 227 с.
4. НГАБ. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). Воп. 1. Спр. 27. – Журналы пасяджэнняў казённай палаты за верасень-снежань 1801 г. – 242 арк.
5. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 679. – Прапановы дзяржаўнага казначэя Сената за 1799 г. – 101 арк.
6. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 680. – Прапановы Беларускай казённай палаты, дзяржаўнага казначэя Сената, мінскага губернатара, ваеннага генерал-губернатара за 1800 г. – 190 арк.
7. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 682. – Прапановы дзяржаўнага казначэя Сената за 1803 г. – 223 арк.
8. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 684. – Прапановы дзяржаўнага казначэя Сената за 1805 г. – 240 арк.
9. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 695. – Прапановы Міністэрства фінансаў за 1816 г. – 240 арк.
10. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 704. – Прапановы міністра фінансаў за 1826 г. – 262 арк.
11. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 695–711. – Прапановы Міністэрства фінансаў за 1816–1818, 1820–1833 гг.
12. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 735. – Прапановы, распараджэнні і адносіны дэпартаментаў Міністэрства фінансаў (рэвізская частка) за 1827 г. – 1206 арк.
13. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 739. – Прапановы дэпартаментаў Міністэрства фінансаў за 1831 г. – 1289 арк.
14. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 741. – Прапановы дэпартаментаў Міністэрства фінансаў за 1833 г. – 1416 арк.
15. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 744. – Прапановы дэпартаментаў Міністэрства фінансаў за 1836 г. – 1852 арк.

16. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 749. – Прадпісанні дэпартаментаў Міністэрства фінансаў за 1842 г. – 616 арк.
17. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 735–747, 749, 751. – Прапановы, распараджэнні і адносіны дэпартаментаў Міністэрства фінансаў (рэвізская частка) за 1827–1839, 1841–1842 гг.
18. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 742–751. – Прапановы дэпартаментаў Міністэрства фінансаў за 1834–1843 гг.
19. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3322–3334, 3825–3826. – Роспіс расходаў і даходаў па Мінскай губерні на 1844, 1846–1847, 1849–1851, 1853–1861 гг.
20. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 3828. – Роспіс расходаў і даходаў па Мінскай губерні за 1863 г. – 214 арк.
21. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 5. Спр. 5. – Перапіска Мінскай казённай палаты з Дэпартаментам розных падаткаў і збораў, дзяржмаёмасцей, дзяржаўнага казначэйства Міністэрства фінансаў па фінансавых пытаннях. Роспіс даходаў і расходаў па Мінскай губерні на 1837 г. 21.12.1836–27.03.1837 г. – 747 арк.
22. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 25. Спр. 29. – Прапановы і інструкцыі міністра фінансаў за 1819 г. – 272 арк.
23. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 25. Спр. 111. – Справаздача старшыні казённай палаты за 1843–1845 гг. – 27 арк.
24. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 25. Спр. 122. – Справаздача старшыні казённай палаты за 1845 г. – 19 арк.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.06.2022

*Ю. М. Лаўрык*

# Кірылічныя манускрыпты XV – першай паловы XVI ст. у калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

Прапанаваны артыкул працягвае цыкл публікацый, прысвечаных кадыкалагічнаму апісанню прадметаў калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей – НГМ РБ). У перспектыве на аснове гэтага цыкла можа быць складзены каталог калекцыі.

У год, калі адзначаецца 500-годдзе выдання Францыскам Скарынам «Малой падарожнай кніжкі» ў Вільні (1522), варта звярнуць увагу на рукапісныя кнігі, якія бытавалі на беларускіх землях у часы нашага пер-

шадрукара. Бо калі заходзіць гаворка пра пачаткі кнігадрукавання на беларускіх землях, звычайна застаецца ў цені, што на той час тут ужо мелася багатая кніжная культура, на працягу соцень гадоў да Скарыны існавала развітая кніжная традыцыя.

Таму варта засяродзіцца на манускрыптах XV – першай паловы XVI ст., якія маюцца ў калекцыі «Рукапісныя кнігі» НГМ РБ. Два рукапісы першай чвэрці XVI ст. – так званыя «Тураўская мінея» і «Слуцкі службоўнік» – ужо разглядаліся ў першай публікацыі цыкла [3, с. 48–62]. Да гэтага шэрагу ніжэй будзе дададзена яшчэ шэсць: два Евангеллі, Апостал, два Тыпіконы і зборнік жыццяў святых. За выключэннем апошняга, усе рукапісы паходзяць з ранейшых збораў Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта (далей – МЦГАК).

Неабходна нагадаць, што папярэднік сённяшняга НГМ РБ – Беларускі дзяржаўны музей (далей – БДМ) – быў створаны ў 1923 г. на базе Мінскага абласнога музея (далей – МАМ), які ў сваю чаргу ўвабраў у сябе частку былых калекцый МЦГАК. Таму на шэрагу рукапісаў можна ўбачыць пячаткі МАМ, а нярэдка і МЦГАК (на жаль, кнігі, што належалі камітэту, не заўсёды пазначаліся, і звесткі пра іх прыналежнасць да гэтай установы часам варта шукаць у іншых крыніцах). Падчас Другой сусветнай вайны калекцыі кніг БДМ былі вывезены нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў Германію. Пасля заканчэння вайны іх вярнулі, аднак зборы былі часткова расцярушаны. У сувязі з гэтым колішнія музейныя манускрыпты сёння можна сустрэць у кнігасховішчах шэрагу беларускіх і замежных устаноў, што адзначалася ў першым артыкуле цыкла [3].

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі кіраўніцтва БССР прыняло рашэнне заснаваць Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (далей – ДМГВАВ). Прадметы мінскіх музейных калекцый, вернутыя з Германіі, асядалі ў яго запасніках з пазнакай «ГИМ», якая азначала Дзяржаўны гістарычны музей БССР (далей – ДГМ). Такую назву атрымаў былы БДМ перад вайной. Новае яго жыццё пачалося толькі ў 1956 г., калі была ўтворана камісія па стварэнні Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея. Паколькі назва музея як у пасляваенны, так і ў міжваенны час некалькі разоў мянялася, то для яго азначэння ў міжваенны перыяд ніжэй будзе ўжывацца абрэвіятура БДМ, а ў пасляваенны – ДМ БССР.

Варта адзначыць, што частка разгледжаных у артыкуле манускрыптаў вывучалася Андрэем Сніткам пасля паступлення іх у фонды музея пры МЦГАК [8; 9], а адзін (праўда, у меншай ступені) – падчас паездкі апошняга ў Слуцк [6; 7]. У 1930-я гг. кірылічныя кніжныя рукапісы мінскіх музейных і бібліятэчных збораў былі апісаны Уладзімірам Перятцам [5]. Правесці дэталёвае даследаванне ён не мог з-за недахопу часу (за 6 дзён апрацаваў 182 рукапісы [5, с. 176]), таму ў сваім каталогу на-

вуковец змог даць толькі вельмі кароткую і часам даволі суб’ектыўную характарыстыку манускрыптаў.

Апісанні рукапісаў у названых публікацыях патрабуюць грунтоўнага перагляду з пункту гледжання сучаснага стану ведаў: у прыватнасці, неабходна высветліць час і, па магчымасці, месца іх стварэння, правесці больш шырокую расчытку правененцый, уважліва вывучыць вадзяныя знакі ў суаднясенні са складзенымі ў XX ст. альбомамі філіграней і г. д. У святле вышэйсказанага з’явілася неабходнасць зрабіць кадыкалагічнае апісанне гэтых кніг, якое адпавядала б сучасным патрабаванням.

## Частка I. Рукапісы літургічныя

**1) КП 510. Евангелле-тэтр. Б. м., канец XV – пачатак XVI ст. 2°. [1], 108 нн, [1] л.**

*Агульныя звесткі*. Паводле зместу гэта – літургічны варыянт Евангелля-тэтр; арыгінальны загаловак адсутнічае. Рукапіс быў інвентарызаваны ў МЦГАК пад № 110, а ў фондах МАМ – пад № 3927. Адзнакі БДМ не выяўлены. Пры вяртанні ў Мінск пасля Другой сусветнай вайны рукапісу быў нададзены № 3736, а ў фонды ДГМ ён быў залічаны пад № 844. Манускрыпт быў прадстаўлены А. Сніткам у працы «Описание рукописного отдела и старопечатных книг библиотеки Минского Церковного Историко-Археологического Комитета» [9, с. 31–36], але ў каталогу У. Ператца не згадваецца. Такім чынам, яго месцазнаходжанне ў міжваенны перыяд яшчэ патрабуе ўдакладнення.

*Апісанне знешняга выгляду*. Манускрыпт мае фармат у ½ долю аркуша (32,5×22,5 см). Ён узяты ў скураную на кардоне аправу XVIII ст. карычневага колеру, з блінтавым лінейным цісненнем на вечках. Аправа паходзіць з іншай кнігі, далучана да Евангелля ў 1960–1980-я гг. (што, магчыма, указвае на яе паходжанне з Будслава). Форзац і нахзац, а таксама лісты пры іх зроблены з паперы XX ст. Евангелле напісана паўуставам, вышыня літар у сярэднім 3 мм; памер тэкставага блока 260–300×160 мм. Блок складаецца са 108 лістоў, арыгінальная нумарацыя палос адсутнічае. Сучасная фаліяцыя (ДМ БССР?) зроблена простым алоўкам у правым полі ўнізе старонкі. Парадак лістоў напачатку блока зменены, што адлюстравана ў згаданай фаліяцыі. Арганізацыя старонкі безрамачная. Тэкст размешчаны ў два слупкі па 34–37 радкоў у слупку; 10 радкоў – каля 80 мм. Кніга мае кінаварную рубрыкацыю (калантытулы, загалоўкі, ініцыялы і ламбарды, зачала і інш.). Частка загалоўкаў зроблена вяззю, застаўкі адсутнічаюць (але пад іх пакінута месца); ініцыялы простыя, з аздабленнем у раслінным стылі ( 11, 13, 33, 36, 81). Калантытулы з’яўляюцца скарочаным напісаннем назвы адпаведнага Евангелля ў левым верхнім куце адварота ліста (мѳ, м*р*к, лѹ, іѡ).

*Папера і філіграні.* У рукапісе прысутнічаюць вадзяныя знакі «Галава быка з крыжом, абвітым змяёй» і «Тыяра». Сшыткі складаюцца з 6 лістоў (3 сфальцаваныя аркушы).

1. Часцей за ўсё ў рукапісе сустракаецца філігрань «Галава быка з крыжом, абвітым змяёй» ( 3, 6, 7, 9, 10, 11, 13, 15–18, 23, 26–28, 30, 31, 35, 38–40, 42, 49–54, 56, 57, 60, 62, 64, 65, 68, 71, 72, 74, 77, 79, 80, 82, 85, 96, 97, 100, 103, 105, 107, 108). Дакладнага адпаведніка гэтага знака ў альбомах філіграней не выяўлена. Найбольш блізкія, але адрозныя паводле некаторых дэталяў вадзяныя знакі паказаны ў працы Мікалая Ліхачова пад №№ 1365 і 2674; першы з іх датуецца 1508 г., другі без даты [4].

2. Філігрань «Тыяра» прысутнічае ў рукапісе толькі ў двух сшытках (на 87–89, 93, 94). Найбольш блізкі паводле дэталяў варыянт (магчыма, нават тоесны нашаму знаку[1]) паказаны ў альбоме Шарля-Маіза Брыке пад № 4895 і датуецца 1498 г. [10].

3. Фрагмент неідэнтыфікаванай філіграні прысутнічае ў падклеенай знізу частцы ліста 35.

Такім чынам, зыходзячы з атрыманых на падставе аналізу дадзеных, варта лічыць слушным адносіць час яго стварэння да канца XV – пачатку XVI ст.

*Змест* рукапісу наступны:

- [«ѾМАТѲЕА, С[ВЯ]Т҇ОЄ, БЛ[А]Г҇ОВѢСТВО|вание. матѳей»];[2]
  4–4 адв.: [Мц 24:10–24:45];
  2–2 адв.: [Мц 22:21–23:16];
  3–3 адв.: [Мц 23:17–24:9];
  5–5 адв.: [Мц 24:45–25:28];
  6–6 адв.: [Мц 25:29–26:17];
  7–7 адв.: [Мц 26:18–26:51];
  8–8 адв.: [Мц 26:51–27:9];
  9–9 адв.: [Мц 27:9–27:46];
  10–10 адв.: [Мц 27:46–28:14];
  л. 11: [Мц 28:14–28:20];
- 11–11 адв.: «предсловие еже ѿмаръка, | с[вѧ]т҇[ѡ]гѡ еуглиѧ,»;
- 11 адв.–12 адв.: «еже ѿмаръка, | с[вѧ]т҇[ѡ]гѡ еуглиѧ, главы»;
  1–1 адв.: [Мц 21:32–22:21];
- 13–33: «ѾМАРъКА, С[ВЯ]Т҇ОЕ, БЛ[А]Г҇ОВѢСТВО[3]|вание. маръко»;

---

[1] Малая колькасць аркушаў з гэтай філігранню і запоўненасць іх з абодвух бакоў тэкстам не дазваляе выказацца больш упэўнена.

[2] Загаловак на страчаным лісце рэканструяваны паводле мадэлі, агульнай для іншых Евангелляў.

[3] Тут і далей: у арыгінале маюскульная частка загалоўка напісана вяззю.

- 33–34: «пре*д*словие еже ѿлꙋкы, | с[вѧ]т҃[о]го еу*г*лїѧ,»;
- 34–35: «ЕЖЕ ѾЛꙊКЫ С[ВѦ]Т҃[О]ГО ЕУ*г*ЛЇѦ, | главы»;
- 36–36 адв.: «ѾЛꙊКЫ С[ВЯ]Т҃ОЕ, БЛ[А]Г҃О|вѣствование ∴»;
- л. 78 адв.: «ЕЖЕ ѾІѠАН҃НА. С[ВѦ]Т҃[О]ГО, | еу*г*лїѧ, главы ∴»;
- лл. 78 адв.–80: «пре*д*словие еже ѿіѡан҃на | с[вѧ]т[о]го, еу*г*лїѧ, главы ∴»;
- 81–108 адв.: «ѾІѠАН҃НА С[ВЯ]Т҃ОЕ, БЛ[А]Г҃ОВѢ*с*ТВО|вание» [заканчваецца на: Ян 19:29].

Такім чынам, паводле зместу манускрыпт з'яўляецца Евангеллем-тэтр.

*Надпісы і цэтлікі*. На 7 і 12 адв. ёсць музейныя адзнакі, якія сведчаць пра прыналежнасць рукапісу да фондаў МАМ (сінім алоўкам «3927»), пра вываз манускрыпта ў Германію і вяртанне яго пасля Другой сусветнай вайны (фіялетавым атрамантам: «3736 27/II–48 г.»). На 7, 108 адв. пасляваенны інвентарны нумар ДГМ («инв. ~~844~~ гим»).

На л. 4 у правым полі карычневым атрамантам спробы пяра.

На л. 12 у ніжнім полі напаўвыцвілы надпіс карычневым атрамантам, почырк XVI ст.: «Сия книга ӕ [зверху надпісана: ѥ] нарицае*т*са Ева*н*гелие».

На л. 35 справа ад тэксту надпісы і спробы пяра чорным атрамантам, розныя почыркі XVI ст.: 1) «Евангелие Во | на престолъное [sic!]»; 2) бессэнсоўны набор літар; 3) «Еванкгелие на престо [sic!] | на пре*с*то*л*ное [sic!] Беше ника лени*нъ*ского». Апошні надпіс указвае на прыналежнасць кнігі да колішняй царквы Святога Мікалая ў мястэчку Ленін (сёння – аграгарадок Ленін Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці), што пацвярджаецца і паходжаннем кнігі, зафіксаваным А. Сніткам: *«Из Ленинской церкви Мозырского уезда»* [9, с. 36]. Мястэчка было заснавана ў 1568 г. Юрыем Алелькавічам, таму, магчыма, Евангелле знаходзілася там ужо ў другой палове XVI ст. і было ўкладзена ў царкву самім фундатарам.

*Штампы і пячаткі*. На л. 7 ёсць простакутны штамп: «БДМ | Инв. № 510 | гор. Минск», а на л. 12 адв. – круглая пячатка: «Комиссариат Просвещения Белорусск. Республики | Областной музей».

*Захаванасць*. Арыгінальная аправа страчана, цяперашняя была выраблена ў XVIII ст. і належала кнізе большага аб'ёму і фармату. Да рукапісу КП 510 гэтая аправа была далучана, відаць, у працэсе рэстаўрацыі падчас знаходжання ў фондах ДМ БССР – гэта значыць, у 1960–1980-я гг.; яна, верагодна, паходзіць з будслаўскага кнігазбору. Аправа моцна пацёртая і месцамі пашкоджаная, рэстаўравалася. Кніжны блок быў падмочаны па верхнім краі, у выніку чаго ў першых і апошніх сшытках верхняя частка лістоў знішчана. Старонкі пажоўклыя і забруджаныя (у тым ліку воскам); лісты з пачатку (больш за 20) і з канца кнігі (не менш за 3) страчаны.

*Гісторыя прадмета*. Рукапіс быў створаны невядомым пісарам на мяжы XV–XVI стст. Не выяўлена звестак адносна таго, для якой царк-

вы ён перапісваўся. Верагодна, у другой палове XVI ст. Евангелле знаходзілася ў царкве Святога Мікалая ў ранейшым мястэчку Ленін. Можна меркаваць, што кніга знаходзілася ў гэтай царкве да пачатку XX ст., калі была перададзена адтуль у зборы МЦГАК. Пазней яна паступіла ў фонды МАМ. Падчас Другой сусветнай вайны рукапіс быў вывезены ў Германію, а ў 1948 г. рэвіндыкаваны.

*Бібліяграфія*: 9, № 8, с. 31–36.

**2) КП 452. Евангелле-апракас. Б. м., сярэдзіна XVI ст. 2°. [1], 120 нн, [1] л.**

*Агульныя звесткі*. Паводле зместу гэты рукапіс з'яўляецца Евангеллем-апракасам. Ён быў інвентарызаваны ў МЦГАК пад № 20, а ў фондах МАМ пад № 3924. Адзнакі БДМ на яго старонках адсутнічаюць. Пры вяртанні ў Мінск пасля Другой сусветнай вайны рукапісу быў нададзены № 3739, а ў фонды ДГМ ён быў залічаны пад № 775. Рукапіс быў прадстаўлены А. Сніткам у першым выпуску «Описания рукописного отдела» [9, б. н., с. 14–18], а пазней коратка апісаны У. Ператцам у яго каталогу пад № 113 [5, с. 187].

*Апісанне знешняга выгляду*. Манускрыпт мае фармат у ½ долю аркуша (29,5×19,5 см). Ён узяты ў скураную на кардоне аправу канца XVII – першай паловы XVIII ст. з 4-ма завязкамі; аправа карычневага колеру, з блінтавым лінейным цісненнем на вечках. Форзац і нахзац, а таксама лісты пры іх зроблены са шчыльнай паперы кепскай якасці, якая мае сетку вержэраў і панцюзо, але без філіграней. Арыгінальны загаловак на л. 1: «Єѵа[н]г[є]льє | съб҃гмъпочина|єтсѧ.». Евангелле напісана паўуставам, вышыня літар каля 4 мм; памер тэкставага блока ў сярэднім 258×145 мм. Блок складаецца са 120 лістоў; арыгінальная нумарацыя палос адсутнічае. Сучасная фаліяцыя зроблена простым алоўкам у правым ніжнім куце (НГМ РБ); на асобных лістах сустракаецца больш даўняя фаліяцыя карычневым атрамантам пасярэдзіне ніжняга поля (МЦГАК?). Тэкст размешчаны ў два слупкі па 34 радкі ў кожным; 10 радкоў – каля 74 мм. Кніга мае кінаварную рубрыкацыю і больш ці менш складаныя графічныя ініцыялы, якія ў шэрагу выпадкаў хутчэй варта трактаваць як ламбарды. Ініцыялы / ламбарды прысутнічаюць практычна на кожнай старонцы (найбольш характэрныя – на 4, 4 адв., 5, 5 адв., 6 і інш.).

На падставе палеаграфічных прыкмет У. Ператц адносіў манускрыпт да канца XV ці пачатку XVI ст. [5, с. 187], аднак у спісе калекцыі, які складаўся падчас перадачы прадметаў з фондаў ДМГВАВ у зборы новастворанага Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея ў 1957 г., манускрыпт датаваны сярэдзінай XVI ст.

*Папера і філіграні*. Удакладніць час стварэння рукапісу дапамагаюць філіграні на паперы. На ёй выяўлены наступныя вадзяныя знакі: «Дзік»,

«Герб Гданьска» (у двух варыянтах) і «Мядзведзь». Сшыткі маюць нерэгулярны колькасны склад – магчыма, іх структура была зменена падчас рэстаўрацыі; некалькі лістоў першага і апошняга сшыткаў страчаны.

1. Філігрань «Дзік» прысутнічае на паперы першых сшыткаў рукапісу ( 2, 6, 7, 14). Дакладнага адпаведніка гэтага знака ў альбомах філіграней не выяўлена. Найбольш падобныя, але адрозныя паводле шэрагу дэталяў вадзяныя знакі паказаны ў працы М. Ліхачова пад №№ 1866 і 1867 з датай 1567 г. [4].

2. Часцей за ўсё ў рукапісе сустракаецца філігрань «Герб Гданьска» (займае да 90% паперы) у двух варыянтах: а) два крыжа пад каронай на гербавым шчыце; б) тое ж без шчыта.

а) Першы варыянт прысутнічае на 10, 11, 15, 16, 18, 22–24, 26, 30, 32, 33, 36, 38, 40, 42, 44. Найбольш блізкія паводле дэталяў варыянты паказаны ў альбоме Ш.-М. Брыке пад № 1256 з датай 1551 г.; у працы Эдмундаса Лаўцявічуса – пад № 754 з датай 1550 г., і ў альбоме Ядвігі Сінярскай-Чапліцкай – пад № 173 з датай 1546 г. [10; 11; 12].

б) Другі варыянт прысутнічае на 46, 49, 57, 59–61, 66–70, 73, 75, 76, 78, 80–82, 86, 89, 90, 94–96, 99–105, 116, 118–120. Найбліжэйшы варыянт гэтага вадзянога знака змешчаны ў альбоме Я. Сінярскай-Чапліцкай пад № 171 і датуецца 1546 г. [12].

3. Філігрань «Мядзведзь» сустракаецца ў рукапісе толькі два разы ( 47, 51). Верагодна, менавіта гэты варыянт вадзянога знака паказаны ў працы М. Ліхачова пад № 3713 і датуецца 1539 г.[4] (але паколькі гэта відавочныя рэшткі раней выкарыстанай паперы, то з прычыны заляжаласці філігрань указвае хутчэй на стварэнне рукапісу ў 1540-я ці нават у пачатку 1550-х гг.).

Такім чынам, найбольш паказальнымі для высвятлення часу напісання манускрыпта бачацца філіграні «Герб Гданьска» і «Мядзведзь», на падставе якіх яго магчыма датаваць сярэдзінай XVI ст.

*Змест* рукапісу наступны:

▪ л. 1: «ЄVА[Н]ꙁ[Є]ЛЬЄ | съ бг҃мъ почина|єтсѧ. наст҃ѫѫ па|схѫ. єѵ[ан]ꙁ[є]льє : ѿі[ѡа]н҃ца [sic!] ∵»[5];

▪ л. 90 адв.: «М[Є]С[Ѧ]ЦЬ СЄНТѦБРѦ. рекомый рюенъ. начатокъ индиктоу нового лета»[6].

Такім чынам, рукапіс складаецца з евангельскіх чытанняў і Месяцаслова. Евангельскія чытанні на Вялікодны перыяд прадстаўлены

---

[4] Гэтыя аркушы былі некалі моцна заліты вадой, таму пярэдняя частка філіграні кепска праглядаецца.

[5] У арыгінале слова “Єѵа[н]ꙁ[є]льє” напісана вяззю, загаловак тут і далей – без разбіўкі на словы.

[6] У арыгінале загаловак – без разбіўкі на словы.

для кожнага дня: як суботы і нядзелі, так і будзённых; астатнія перыяды літургічнага года ўключаюць толькі чытанні на суботу і нядзелю. У літаратуры прадмета такі тып лекцыянара атрымаў назву «кароткі апракас».

*Надпісы і цэтлікі*. На спінцы аправы 8-кутны цэтлік з сіняй рамкай па абводзе з надпісам: «инв. ~~775~~ 452 ГИМ». На форзацы і форзацным лісце музейныя адзнакі, якія сведчаць пра прыналежнасць рукапісу да фондаў МАМ (сінім алоўкам «3924»), пра вываз манускрыпта ў Германію і вяртанне яго пасля Другой сусветнай вайны (чырвоным алоўкам «97»; фіялетавым атрамантам «3739 27/ІІ–48 г.»), а таксама інвентарны нумар ДГМ («инв. ~~775~~ гим»).

На л. 1 у верхнім полі напаўвыцвілы надпіс почыркам XVII ст.: «Panie [?] wisluchay [?] …». Праз моцную забруджанасць старонкі другая частка надпісу не чытаецца.

На 2–8 у ніжнім полі змешчаны паўвыцвілы і амаль нечытэльны атрамантавы палістравы запіс почыркам XVII ст.: «Takso[n]szka Naleza [=Ta książka należy] || nacerkiew Ostrowyske || Odego moscy Pana || Bazylego || Bakanowskego || Podstolego Smolenskego || Wycznymy Czasy»[7]. Ключ да атрыбуцыі надпісу дае імя данатара – Васіля Баканоўскага, смаленскага падстолія (1654–1686 гг.) і войскага (1676–1686 гг.) [13, s. 339], які ў 1655 г. займаў таксама пасаду каменданта Нясвіжа [1, с. 56]. В. Баканоўскі спрычыніўся да фундавання цэркваў у Востраве і Мілавідах, а таксама дамініканскага касцёла ў Нясвіжы[8].

Як бачна, В. Баканоўскі ўклаў рукапіснае Евангелле ў царкву ў мясцовасці, назва якой у надпісе перададзена няясна: суаднесці яе наўпрост з пэўным населеным пунктам складана з-за нехарактэрнага суфікса. Найбольш рэальнай мясцовасцю бачыцца храм у мястэчку Востраў Наваградскага павета (у цяперашні час – вёска Востраў, цэнтр сельсавета Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці). У Востраве мелася царква Святога Іллі, фундаваная князямі Радзівіламі. У 1670–1680 гг. яна знаходзілася *«w dobrach y dzierzeniu j(ego) m(iło)sci pana Bazylego Bakanowskego, woyskiego smolenskiego»* [2, с. 130], які належаў да кліентэлы гетмана польнага літоўскага Міхала Казіміра Радзівіла (1625–1680). Згодна з матэрыяламі візітацый, у 1680 г. у царкве захоўвалася «Ewangelia pisana, Słuzebnik y Trebnik drukowane, Apostoł y Jermałeyczyk» [2, с. 130]. Такім чынам, з вялікай ступенню верагоднасці магчыма меркаваць, што рукапіс КП 452 і ёсць згаданы ў візіце манускрыпт. Згаданая ў інскрыпцыі пасада В. Баканоўскага («падстолі

---

[7] «Цёмныя» месцы інскрыпцыі ўзноўлены дзякуючы захаванаму ў лепшым стане аналагічнаму надпісу на Апостале са збораў НГМ РБ (КП 492).

[8] За інфармацыю шчыра дзякую **Дзянісу Лісейчыкаву**.

смаленскі») указвае, што ўклад у царкву адбыўся не пазней за 1676 г., калі ён атрымаў пасаду войскага.

На 20 адв., 24 адв., 26 адв., 39, 40, 41, 42, 45 адв., 46, 47, 48, 49, 50 адв.–51 адв., 53, 58, 79 адв., 80 адв., 82 адв., 84, 86, 100, 105, 116–116 адв., 118–119 адв. на бакавых палях і паміж слупкамі зроблены кароткія літургічныя маргіналіі паўуставам XVII ст., карычневым або чорным атрамантам.

На верхніх (радзей ніжніх ці бакавых) палях шэрагу старонак прысутнічаюць запісы некалькімі почыркамі, хуткапісам ці змяшаныя – з рысамі хуткапісу і паўуставу, зробленыя чорным або карычневым атрамантам. Усе гэтыя надпісы варта аднесці да XVII ст., паколькі пры рэстаўрацыі і перашытаванні рукапісу ў канцы XVII – у першай палове XVIII ст. яны былі абрэзаны часткова ці амаль цалкам. Найчасцей такія надпісы з’яўляюцца своеасаблівымі калафонамі з указаннем пэўных чытанняў, адзначаных уладальнікам для зручнасці пошуку ( 22, 24 адв., 26, 29, 30 адв., 32, 39, 42, 43, 49, 53, 55, 56, 61, 73, 80 адв., 82); іншыя паказаны ніжэй.

На л. 13 у верхнім полі накрэслена часткова абрэзанае слова: «СІА», якое магло быць пачаткам паліставога ўладальніцкага надпісу, аднак на наступных лістах слядоў працягу інскрыпцыі не выяўлена (магчыма, яна была абрэзана).

На л. 29 у ніжнім полі надпіс: «[…] [нрзб] до ма*р*[и]инског[о] монасъ-т[ы]ра».

На л. 50 у ніжнім полі надпіс: «рокꙋ тысеча шесоть петъдесѧтъ о*с*мего М[е]*с*[о]нца […]».

На л. 53 адв. у верхнім полі нечытэльныя рэшткі абрэзанага надпісу.

На л. 54 у ніжнім полі надпіс: «[…] [нрзб] до марка | свещ*ч*ен[…] [нрзб]».

На л. 69 у ніжнім полі часткова абрэзаны памінальны надпіс: «Помяни Го*с*поди дꙋшꙋ рода Своего младенца І҃Ина Пре*с*тавилс [ѧ?] [… Рокꙋ?] | S*с*мого [sic!][9] Ме*с*[ѧ]ца Дека*в*ра з҃ [sic!] Дна [sic!] похова*л* і ꙋпо[ко]ой вѡ*с*пѡмѧнул [?] […] | […]».

На лл. 92–92 адв. у верхнім і ніжнім палях нечытэльныя рэшткі надпісаў.

На л. 120 адв. у вольным месцы пасля тэксту – спробы пяра і напаўвыцвілы надпіс: «и цесара рим҇ского иул|иа, которого пн҃ъ начал […] [нрзб]».

*Штампы і пячаткі*. На форзацным лісце прысутнічаюць простакутны штамп «БДМ | Інв. № 452 | гор. Минск» і круглая пячатка: «Комис-

[9] Тут і далей памылкі нумарацыі. Відаць, інскрыптар кепска арыентаваўся ў лічбавых значэннях кірылічных літар.

сариат Просвещения Белорусск. Республики | Областной музей». Апошняя таксама прысутнічае на л. 120 адв.

*Захаванасць*. Аправа месцамі пашкоджана, ніжняя завязка на верхнім вечку часткова страчана. Старонкі пажоўклыя і забруджаныя (у тым ліку воскам), некаторыя пашкоджаны, некалькі лістоў першага і апошняга сшыткаў страчаны. Мяркуючы па характары падклеек, рукапіс некалькі разоў рэстаўраваўся. У канцы XVII – першай палове XVIII ст. яго ўзялі ў новую аправу, а пашкоджаныя па згібе аркушы былі падклеены фрагментамі старонак старадрукаў XVII ст.: 1) малафарматнага кірылічнага малітоўніка віленскага або куцеінскага друку («Малітвы штодзённыя»?) ( 1 і 4, 9 і 10, 17 і 18, 88 і 99, 89 і 98, 90 і 97, 91 і 96); 2) неідэнтыфікаванай лацінскай граматыкі ( 92, 95, 112, 114 і 119, 113 і 120).

*Гісторыя прадмета*. Манускрыпт быў створаны невядомым пісарам у сярэдзіне XVI ст., першае месца бытавання невядома. У трэцяй чвэрці XVII ст. кніга была ўкладзена В. Баканоўскім у царкву Святога Іллі ў мястэчку Востраў. У канцы XVII ці ў першай палове XVIII ст. рукапіс быў рэстаўраваны з выкарыстаннем старонак друкаваных выданняў і ўзяты ў новую аправу. У 1907 г. Евангелле належала краязнаўцу і аднаму з ініцыятараў стварэння МЦГАК Аляксандру Смародскаму, які і ахвяраваў яго згаданаму камітэту. Пазней кніга паступіла ў фонды МАМ. Падчас Другой сусветнай вайны рукапіс быў вывезены ў Германію, а ў 1948 г. рэвіндыкаваны.

*Бібліяграфія*: 9, [№ 3], с. 14–18; 5, № 113, с. 187.

**3) КП 492. Апостал: Дзеі і лісты святых апосталаў. Б. м., 1-я чвэрць XVI ст. (узнаўленні: пачатак XVII ст.). 4°. [1], 267 нн, [1] л.**

*Агульныя звесткі*. Паводле зместу гэты рукапіс з'яўляецца Апосталам. Ён быў інвентарызаваны ў МЦГАК пад № 19, а ў фондах МАМ пад № 3923. Пры вяртанні ў Мінск пасля Другой сусветнай вайны рукапісу быў нададзены № 3779, а ў фонды ДГМ ён быў залічаны пад № 804. Рукапіс быў прадстаўлены А. Сніткам у першым выпуску «Описания рукописного отдела и старопечатных книг библиотеки Минского Церковного Историко-Археологического Комитета» [9, № 2, с. 7–14], а пазней коратка апісаны У. Ператцам у яго каталогу пад № 119 [5, с. 188].

*Апісанне знешняга выгляду*. Манускрыпт мае фармат у ¼ долю аркуша (20×16 см). Рукапіс узяты ў паўскураную на кардоне аправу другой паловы XVIII ст. (?) з чатырма завязкамі, з якіх захаваліся фрагментарна толькі верхнія. Папяровае пакрыццё аправы страчана. Спінка карычневага колеру з блінтавым лінейным цісненнем. Форзац і нахзац, а таксама лісты пры іх зроблены са шчыльнай паперы кепскай якасці, якая мае сетку вержэраў і панцюзо, але без філіграней. Арыгінальная нумарацыя

палос адсутнічае, тэкставы блок складаецца з 267 ненумараваных лістоў, сучасная фаліяцыя зроблена простым алоўкам у правым ніжнім куце (ДМ БССР?).

Арыгінальны загаловак на л. 1: «ДѢꙗНІꙗ С[ВꙗТ]ТЫ*х* АП[О]*с*[ТО]ЛЪ ИСТИН[Н]АА С[ВꙗТ]ТЫМ*ъ*| / ап[о]*с*[то]ломъ и єѵ[ан]*г*[є]листомъ лоукою». Апостал напісаны паўуставам, двума почыркамі: 1) 1–10, 233, 263–267; 2) 11–232, 234–262. Вышыня літар каля 4 мм; памер тэкставага блока ў сярэднім 155×95 мм. Тэкст у 21 радок; 10 радкоў – каля 74 мм. Кніга мае кінаварную рубрыкацыю і больш ці менш складаныя графічныя ініцыялы, якія ў шэрагу выпадкаў варта трактаваць як ламбарды. Ініцыялы / ламбарды прысутнічаюць амаль на кожнай старонцы (найбольш характэрныя – на 1, 54 адв., 61, 62, 69, 70, 75 адв., 83 адв., 84 адв., 86 і інш.).

На падставе палеаграфічных прыкмет У. Ператц аднёс рукапіс да сярэдзіны XVI ст., адзначыўшы, аднак, што першыя 10 лістоў напісаны новым почыркам [5, с. 188]. У спісе калекцыі, які складаўся падчас перадачы прадметаў з ДМГВАВ (фонды ДГМ) у зборы новастворанага ДМ БССР у 1957 г., манускрыпт датаваны сярэдзінай XVI ст.

*Папера і філіграні*. Удакладніць час стварэння рукапісу дапамагаюць філіграні на паперы. У разгледжаным манускрыпце прысутнічае папера з вадзянымі знакамі «Леў на ўкаранаваным шчыце» і «Тыяра з зоркай на стрыжні». Прычым першы сустракаецца толькі ў сшытках з пачатку і канца кнігі, запісаных іншай рукой. Несумненна, гэта сведчыць пра ўзнаўленне страчаных у працэсе выкарыстання кнігі лістоў. З прычыны рэстаўрацыі і перашытавання блока складана выказацца адназначна адносна колькасці лістоў у сшытку. Аднак, наколькі магчыма меркаваць, сшыткі маюць звычайна па 8 лістоў (2 аркушы).

1. Філігрань «Леў на ўкаранаваным шчыце» прысутнічае на паперы першага і апошняга сшыткаў рукапісу (1, 4, 7, 10, 265, 266). Найбольш блізкія паводле дэталяў варыянты паказаны ў працы Э. Лаўцявічуса пад № 979 з датай 1616 г. [11].

2. Філігрань «Тыяра з зоркай на стрыжні» ў рукапісе прысутнічае на 13, 14, 16, 18–19, 21, 24, 25, 28, 29, 31, 34–35, 42, 43, 45, 48, 50, 51, 53, 55, 58–59, 62, 64, 66–67, 69, 71, 74–75, 78, 80, 82–83, 85, 88, 90–91, 93, 95, 97, 100, 102, 103, 105, 108, 110, 112, 113, 116, 117, 119, 124, 126, 128–129, 131, 133, 136–137, 140, 142, 144–145, 147, 149, 151, 154, 156, 159–160, 163, 164, 167–168, 171, 172, 174, 177, 179, 181, 184, 187, 188, 191, 192, 195, 196, 199, 200, 202, 204, 207, 209, 211, 213–214, 216, 218, 221–222, 225, 226, 229–230, 235, 238, 240, 241, 242, 245, 246, 250, 253, 255–257). Такая філігрань паказана толькі ў альбоме Ш.-М. Брыке пад № 4963 (1521 г.) [10].

Такім чынам, на падставе філіграней асноўную частку манускрыпта магчыма датаваць першай чвэрцю XVI ст. (больш вузка: каля 1521 г.), а ўзнаўленні – першай чвэрцю XVII ст.

*Змест* рукапісу наступны:

- 1–53 адв.: «ДѢИНІИ С[ВИ]ТЫ*х* АП[О]*с*[ТО]ЛЪ ИСТИН[Н]АА С[ВИ]ТЫМ*ъ*[10] | ап[о]*с*[то]ломъ и єѵ[ан]*г*[є]листомъ лоукою гл[а]*в*а а | зач[а-ло]. а»;

  1–10: Дзеі 1:1–5:1;

  11–53 адв.: Дзеі 10:30–28:31;
- 53 адв.–54: «Сказанїе їаковле соборнаго посланїꙗ»[11];
- лл. 54 адв.–61: «СОБОРНОЕ ПОСЛАНЇЕ ІАКОВЛѢ АЕ [=ПРЪВОЕ]»;
- 61–61 адв.: «Сказанїе събор҄номоу посланїю пръвомꙋ петровоу:»;
- 61 адв.–69: «С[ВИ]ТО*го* АП[О]*с*[ТО]ЛА ПЕТРА ПОСЛАНЇЕ СОБОРЪНОЕ»;
- 69–70: «Сказанїе петровꙗ второмоу по|сланию. Собор҄номоу.»;
- 70–74 адв.: «ТОГО *ж* АП[О]*с*[ТО]ЛА ПЕТ҄РА ПОСЛАНЇЕ В»;
- 74 адв.–75 адв.: «Сказанїе їѡа*н*[но]воу посланїю прьво*м*[оу]»;
- 75 адв.–82 адв.: «С[ВИ]ТО*г*[О] АП[О]*с*[ТО]ЛА ЇѠ[А]*н*Н[А] СОБОРЪНОЕ ПОСЛАНЇЕ»;
- 82 адв.–83: «Сказанїе їѡ*н*ава посланїꙗ в҄торого»;
- 83–84: «С[ВИ]Т[О]ГО АП[О]*с*[ТО]ЛА ЇѠА*н*НОВА [sic!] СОБОР҄НОЕ ПОСЛАНЇЕ ⁖»;
- л. 84: «Сказанїе їѡан[н]ова третїаго посланїꙗ.»;
- 84–85: «с[вꙗ]того їѡанна бг[о]слова посланїе, соборное» [sic!];
- 85–86: «Сказанїе їоудиноу собо*р*номꙋ посланїю.»;
- 86–87 адв.: «Соборное посланїе їоудино.» [sic!];
- 87 адв.–90: «Сказанїе иже къ римлꙗномъ по|сланїю с[вꙗ]т[о]го. ап[о]*с*[то]ла. павла»;
- 90–116 адв.: «С[ВИ]Т[О]ГО АП[О]*с*[ТО]ЛА ПАВ҄ЛА ПОС҄ЛА*н*[Ї]Е К҄РИ*м*ЛАНО*м*»;
- 116 адв.–118: «Сказа|нїе еже ко кълри*м*ѳо*м*ъ [sic!] аг[о=пръвого] послa*н*[ї]а с[вꙗ]т[о]го. ап[о]*с*[то]ла. па*в*[ла]»;
- 118–142 адв.: «К҄КОРИ*н*ѲѢНО*м* [sic!] ПОС҄ЛА*н*[Ї]Е С[ВИ]Т[О]ГО АП[О]*с*[ТО]ЛА ПА*в*ЛА»;
- 142 адв.–143 адв.: «Сказанїе. е*ж*[е] | къ коринѳо*м* вмоу [=въторомоу] посла*н*[ї]ю с[вꙗ]т[о]го. ап[о]*с*[то]ла. *п*[а]в*л*а»;

[10] У арыгінале пачатковая частка загалоўка напісана вяззю і без разбіўкі на словы.

[11] Тут і далей загалоўкі раздзелаў пададзены без разбіўкі на словы, часам – з элементамі вязі.

▪ 143 адв.–159: «К҅КОРИнѲОМЪ ПОС҅ЛАн[Ї]Е В҃Е [=ВЪТОРОЕ], | с[вѧ]т҃[ог]ѡ. ап[о]с[то]ла. пав҅ла»;

▪ 159–159 адв.: «Сказанїе. еж[е] къ галатом | послан[ї]ю с[вѧ]т҃[о]го ап[о]с[то]ла павла ⁖»;

▪ 159 адв.–168: «К҅ГАЛАТОм ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]ГО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА»;

▪ 168 адв.–169 адв.: «Сказанїе. еже къ ефе|сѣѡм посланїе. [sic!] с[вѧ]т҃[о]го ап[о]с[то]ла павла ⁖»;

▪ 169 адв.–178: «КО ЕѲЕСЕОм ПОСЛАНЇЕ С[ВѦ]Т҃[О]ГО АП[О]с[ТО]ЛА. | павла»;

▪ 178–179: «Сказание [sic!]. иже къ фили|п҅исїѡм послание. [sic!] с[вѧ]т҃[о]го ап[о]с[то]ла павла.»;

▪ 179–183: «К҅ ѲЇЛИП҅ПИСЇЕм ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]ГО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА»;

▪ 183 нн–184 нн: «Сказание. колосайско|моу посланию с[вѧ]т҃[о]го ап[о]с[то]ла павла.»;

▪ 184 нн–189 нн адв.: «КЪ КОЛОСАЕм ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]гО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА»;

▪ 189 адв.–190 адв.: «Сказанїе иже къ со|лоунѧном. первомȣ посланїю с[вѧ]т҃[о]го. ап[о]с[то]ла. павла»;

▪ 190 адв.–195 адв.: «К[Ъ] СОЛȢНАНОм А҃ ПОС҅ЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]ГО АП[О]с[ТО]ЛА ПАВ҅ЛА»;

▪ 195 адв.–196 адв.: «Сказание к҅ селȣном. второмоу | посланию. с[вѧ]т҃[о]го ап[о]с[то]ла. павла.»;

▪ 196 адв.–199: «К[Ъ] СОЛȢНѦНОм В҃Е [=ВЪТОРОЕ] ПОС҅ЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]ГО | ап[о]с[то]ла пав҅ла:-»;

▪ 199–200: «Сказание еже к҅ тимоѳею. пръваго | послание [sic!] с[вѧ]т҃[о]го. ап[о]с[то]лъ. павла.»;

▪ 200–207: «К[Ъ] ТИМОѲ[Е]Ю ПРЬВОЕ [sic!] ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]гО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА»;

▪ 207–207 адв.: «Сказание иже к[ъ] тимоѳею. второ|моу посланию с[вѧ]т҃[о]го. ап[о]с[то]ла павла.»;

▪ 207 адв.–212: «К[Ъ] ТИМОѲ[Е]Ю ВТОр[О]Е ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]гО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА ⁖»;

▪ 212–213: «Сказание иже к[ъ] титȣ | посланию [sic!] с[вѧ]т҃[о]го. ап[о]с[то]ла павла.»;

▪ 213 нн–215 нн: «К[Ъ] ТИТȢ ПОСЛАн[Ї]Е С[ВѦ]Т҃ОГО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА ⁖»;

▪ л. 216: «Сказание, иже къ филимоноу. послание. с[вѧ]т҃[о]го. ап[о]с[то]ла павла.»;

▪ 216–217 адв.: «КЪ ФИЛИМОНȢ ПО[СЛА]НЇЕ С[ВѦ]Т҃ОГО АП[О]с[ТО]ЛА. ПАвЛА.»;

- 217 адв.–218: «Сказание. еврейско|моу посланию. с[вѧ]т҃[о]го ап[о]*с*[то]ла павла.»;
- 218–236 адв.: «КО ЕВРЕѠМЪ ПОСЛА*н*[Ї]Е С[ВѦ]Т҃[О]ГО АП[О]*с*[ТО]ЛА. ПАВЛА»;
- 236 адв.–248: «СКАЗАНИЕ ИЗВЕСТНО ИЖЕ ПО ВСѦ | дн҃и [sic!] глава*м*. деаний ап[ѡстѡ]лѡ*м*. [sic!]»;
- 248–267 адв.: «НА*ч*[А]ЛО ВЕЛИЦЕЙ ЧЕТВЕРОДЕСѦТНИЦИ | соуботамъ. ине*д*[е]ламъ.».

*Надпісы і цэтлікі.* На спінцы аправы чатырохкутны зубчасты цэтлік з сіняй рамкай (стылізаваны меандр) па абводзе з паўвыцвілым надпісам: «3923[?]». На форзацы і форзацным лісце музейныя адзнакі, якія сведчаць пра прыналежнасць рукапісу да міжваенных фондаў БДМ (сінім алоўкам «3923»), пра вываз манускрыпта ў Германію і вяртанне яго пасля Другой сусветнай вайны (чырвоным алоўкам «44»; фіялетавым атрамантам «3779 28/II–48»), а таксама інвентарны нумар ДГМ («инв. ~~804~~ гим»).

На 1 адв.–8 у ніжнім полі змешчаны атрамантавы паліставы запіс почыркам XVII ст.: «Taia kso[n]szka || nadana || Odego moscy Pana || Bazylego Bakanowskego || Bazylego Bakanowskego [sic!] || Podstolego Smolenskego || nacerkiew ostrowyske || Wycznymy Czasy». Гэтая інскрыпцыя (паводле почырку, атраманту і пабудовы) аналагічная надпісу на Евангеллі КП 452 са збораў НГМ РБ, што сведчыць пра адначасовае паступленне гэтых кніг у пэўную царкву.

На л. 60 адв. у бакавым полі пры дапамозе чорнага сажавага атраманту змешчаны запіс почыркам XVII ст.: «Roku 1694 m[ie]sią[ca] Febr[uara] | Dnia 16 Okszyscilem bez [?] | … zojca Jaczka | zmilej Kacierynki Kumaczki Tacianu».

На л. 98 у бакавым полі змешчаны запіс, зроблены пры дапамозе светла-цынамонавага атраманту, хуткапісам, почыркам XVII ст.: «Кпе Кондратъ | mościz pane kondracze».

На л. 134 у бакавым полі змешчаны запіс, зроблены пры дапамозе чорнага сажавага атраманту почыркам XVII ст.: «Ро*д* [sic!] Homoliecki|ch uspomieni Hospody Duszu | Raba swoie | Daniła Jana | Jereia swie|sz[cz]enyka | Kosowkie|go Rodica mego Daniła | Ja Tez | Stefan Homole|czky praezbjt*r* | Os[t]r[o]wesky prosze krewni|ch ... | pominac | mnie sługie | swego».

Як было высветлена вышэй, пры разглядзе Евангелля КП 452 падстолі смаленскі В. Баканоўскі зрабіў уклад у царкву, што знаходзілася, хутчэй за ўсё, у мястэчку Востраў, дзе мелася царква Святога Іллі, фундаваная Радзівіламі. У 1670–1680 гг. яна знаходзілася *«w dobrach y dzierzeniu j(ego) m(iło)sci pana Bazylego Bakanowskego, woyskiego smolenskiego»* [2, с. 130]. Згодна з матэрыяламі візітацый, у 1680 г. у царкве захоўвалася «Ewangelia pisana, Słuzebnik y Trebnik drukowane,

Apostoł y Jermałeyczyk» [2, с. 130]. Паколькі пры апісанні Апостала не ўказана, што ён з'яўляецца друкаваным выданнем (як гэта адзначана, між іншым, у шэрагу іншых візітацый, сабраных у цытаваным выданні), можна меркаваць, што мы маем справу з рукапісам. Такім чынам, Апостал КП 492 з вялікай ступенню верагоднасці з'яўляецца апісаным у візіце манускрыптам. Згаданая ў інскрыпцыі пасада В. Баканоўскага («падстолі смаленскі») указвае, што ўклад, верагодна, адбыўся не пазней за 1676 г., калі ён атрымаў пасаду войскага.

Паміж лістамі кнігі ўкладзены фрагмент аркушыка паперы ў клетку з надпісам пачатку XX ст.: «IV/18 1907 г. | отъ А. П. Смородскаго | въ даръ Церк.-археологич. | Комитету.», зробленым чорным атрамантам. Ніжэй надпіс простым алоўкам «2й», які, верагодна, сведчыць пра колькасць перададзеных кніг. З улікам укладных надпісаў В. Баканоўскага на разгледжаных Апостале і Евангеллі КП 510 магчыма выказаць меркаванне, што абодва манускрыпты паходзяць з адной царквы. Выкладчык Мінскай мужчынскай гімназіі А. Смародскі быў краязнаўцам і адным з ініцыятараў стварэння МЦГАК, а пазней – актыўным яго сябрам. Верагодна, рукапісы былі набыты ім падчас адной з экспедыцый.

*Штампы і пячаткі*. На форзацным лісце прысутнічаюць прастакутны штамп «БДМ | Инв. № 452 | гор. Минск», а таксама круглая пячатка «Комиссариат Просвещения Белорусск. Республики | Областной музей». Апошняя ёсць і на л. 120 адв., а таксама фрагментарна – на адвароце вышэй апісанага фрагмента аркушыка паперы ў клетку з надпісам пачатку XX ст.

*Захаванасць*. Аправа месцамі пашкоджана, ніжнія завязкі (як на ніжнім, так і на верхнім вечку) часткова страчаны, як і верхняя завязка на ніжнім вечку. Папяровае пакрыццё аправы страчана (абдзёрта). Старонкі пажоўклыя і забруджаныя (у тым ліку воскам), некаторыя пашкоджаны, некалькі лістоў напрыканцы кнігі страчаны. Верагодна, у XVIII ст. манускрыпт быў адрэстаўраваны і ўзяты ў новую аправу.

*Гісторыя прадмета*. Манускрыпт быў створаны невядомым пісарам у сярэдзіне XVI ст. Першае месца бытавання невядома. У трэцяй чвэрці XVII ст. кніга была ўкладзена В. Баканоўскім у царкву Святога Іллі ў мястэчку Востраў. Напрыканцы XVII ці ў першай палове XVIII ст. рукапіс быў адрэстаўраваны з выкарыстаннем старонак друкаваных выданняў і ўзяты ў новую аправу. У 1907 г. Апостал належаў краязнаўцу і аднаму з ініцыятараў стварэння МЦГАК А. Смародскаму, які і ахвяраваў яго згаданаму камітэту. Пазней кніга паступіла ў фонды МАМ. Падчас Другой сусветнай вайны рукапіс быў вывезены ў Германію, а ў 1948 г. рэвіндыкаваны.

*Бібліяграфія:* 9, № 2, с. 7–14; 5, № 119, с. 188.

*(працяг у наступным выпуску)*

Крыніцы і літаратура

1. Бабятыньскі, К. Выдаткі М. К. Радзівіла на абарону Нясвіжа ў 1655–1660 г. // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 18, сш. 1–2 (34–35). – 2011. – С. 43–60.
2. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг. : зборнік дакументаў / уклад. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 268 с. : іл., партр., факсім., табл.
3. Лаўрык, Ю. М. Манускрыпты са слуцкімі правененцыямі ў калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 16. – Мінск : НГАБ, 2019. – С. 44–65.
4. Лихачев, Н. П. Палеографическое значение бумажных водяных знаков : [в 3 ч.]. – Санкт-Петербург : ОЛДП, 1899. – Ч. 1–3. – (ОЛДП: Общество любителей древней письменности; 116).
5. Перетц, В. Н. Рукописи библиотеки Московского университета, самарских библиотеки и музея и минских собраний. – Ленинград : Издательство АН СССР, 1934. – 193 с. – (Описания рукописных собраний; вып. 3).
6. Снитко, А. К. Описание рукописей и старопечатных книг в Слуцком (Минской губ.) Тройчанском монастыре. – Санкт-Петербург : Типография Императорской Академии наук, 1911. – [2], 22 с. : ил.
7. Снитко, А. К. Описание рукописей и старопечатных книг в Слуцком (Минской губ.) Тройчанском монастыре // Минская старина. Труды Минского Церковного Историко-Археологического Комитета / Под заведыванием Хранителя Музея Д. Скрынченко. – Вып. 2. – Минск : Электро-типогр. С. А. Некрасова, 1911. – С. 159–175.
8. Снитко, А. К. Описание рукописей и старопечатных книг Минского Церковного Историко-Археологического Комитета : [Продолжение] // Минская старина. Труды Минского Церковного Историко-Археологического Комитета / Под заведыванием Хранителя Музея Д. Скрынченко. – Вып. 2. – Минск : Электро-типогр. С. А. Некрасова, 1911. – С. 175–213.
9. Снитко, А. К. Описание рукописного отдела и старопечатных книг библиотеки Минского Церковного Историко-Археологического Комитета : [Приложение к первому выпуску ежегодника «Минская старина»]. – Вып. 1. – Минск : Электро-типогр. Н. М. Нахимова, 1909. – 74, [1] с.
10. Briquet, C.-M. Les filigranes: dictionnaire historique des marques du papier dès leur apparition vers 1282 jusqu’en 1600: [у 4 т.]. – Deuxième édition. – Leipzig : Verlag von Karl W. Hiersemann, 1923. – T. 3: L–O: avec 39 figures dans le texte et 16,112 fac-similés de filigranes. – P. 427–620, il. 7878–12395.
11. Laucevičius, E. Popierius Lietuvoje XV–XVIII a. [su 2 t.]. – Vilnius : Mintis, 1961.
12. Siniarska-Czaplicka, J. Filigrany papierni położonych na obszarze Rzeczypospolitej Polskiej od początku XVI do połowy XVIII wieku. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1969. – XV, [1], 41, [3] s., [228] s. tabl. : il., mapa.
13. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego : spisy / pod redakcją Andrzeja Rachuby ; opracowali: Henryk Lulewicz [et al.]. – T. 4 : Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie, XIV–XVIII wiek. – Warszawa : DiG, 2003. – 412 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 02.03.2022

*А. М. Лукашевич*

# Военно-административная деятельность витебского гражданского губернатора Карла Лешерна в июле 1812 – феврале 1813 г. (по материалам Российского государственного военно-исторического архива)

Надвигавшаяся война 1812 г. с Францией потребовала со стороны российской администрации в белорусско-литовских губерниях чрезвычайных усилий по мобилизации ресурсов. В феврале 1812 г. император Александр I сменил могилевского (вместо Петра Ивановича фон Берга эту должность занял граф Дмитрий Александрович Толстой), а в мае – витебского (Карл Карлович Лешерн фон Герцфельд вместо Павла Ивановича Сумарокова) и минского (Павел Михайлович Добринский вместо Германа Ивановича фон Радинга) гражданских губернаторов. Насколько удачным был этот выбор рассматривается в данной статье на примере К. К. Лешерна фон Герцфельда.

До апреля 1812 г. уроженец Ревеля генерал-майор Карл Карлович Лешерн фон Герцфельд (Герцфельдт, Karl Johann Löschern von Herzfeld, 1761–1818; далее – К. Лешерн) уже четыре года как находился в отставке [2, с. 7–8]. Однако 21 апреля 1812 г.[12] он был зачислен состоящим по армии при главнокомандующем 3-й Обсервационной (резервной) армией генерале от кавалерии Александре Петровиче Тормасове. Вероятно, зачисление на военную службу объяснялось ходатайствами родственников отставного генерала по линии супруги (Меллер-Закомельской) и наличием вакансий в формировавшейся армии.

Впрочем, уже 25 мая 1812 г. К. Лешерн, имевший некоторый опыт в провиантском обеспечении (в 1807–1808 гг. возглавлял Рижскую провиантскую комиссию [6, с. 202–207]), был определен в статскую службу. Александр I назначил его витебским («белорусско-витебским») гражданским губернатором с повышением в чине до действительного статского советника [12, л. 1–3; 15, с. 46].

Впоследствии, в 1817 г., свою миссию на этой должности К. Лешерн описывал так: *«быв определен в Витебск гражданским губернатором в 1812 году, имел ввиду одну ту цель, чтобы оправдать доверенность Его Императорского Величества возложением на него сего звания, столь важного по тогдашнему времени, и доказать самыми опытами всегдашнее свое усердие к престолу и отечеству»* [14, л. 23].

---

[12] Все даты приводятся по старому (Юлианскому) стилю.

В Витебск К. Лешерн прибыл уже в начале войны 1812 г. По сохранившимся свидетельствам современников, он вступил в должность губернатора 1 июля 1812 г. [10, л. 101–102] и сразу же занялся решением многочисленных проблем.

В условиях отступления 1-й и 2-й Западных армий от гражданских властей требовалось, в первую очередь, организовать бесперебойное обеспечение российских войск всем необходимым (провиантом, фуражом, подводами и т. д.). Однако до момента соединения этих армий одним из важных аспектов деятельности К. Лешерна стал сбор разведывательных данных о местонахождении и движении войск противника.

Подобные поручения от главнокомандующего 1-й Западной армией и военного министра генерала от инфантерии Михаила Богдановича Барклая де Толли губернатор получил 1 июля через следовавшего из Борисова адъютанта министра Павла Кромина [10, л. 82]. Впоследствии об этом К. Лешерн вспоминал: *«В 1812 г., когда армия российская расположена была около Дриссы, я узнавал чрез посыланых мною шпионов о движениях неприятеля, ежедневно доставлял о том сведения главнокомандовавшему армиями»* [14, л. 5 об.–6].

С этой целью К. Лешерн использовал двух *«верных»* евреев. 4 июля они вернулись и сообщили: *«вчерашнего дня* [3 июля – А. Л.] *неприятель в количестве 200–300 человек вступил в Лепель в 6 часу пополудне»* [10, л. 82]. При этом *«поляки <...> о сем вступлении имели известия через сношение, и что оне встретили французов с хлебом и солью»*. Также сообщалось: *«неприятель был прежде в местечке Глубоком, где требовал провианта и фуража. Здесь был с ними кн[язь] Радзивилл»* [10, л. 82]. Написав об этом 4 июля М. Барклаю де Толли, губернатор обращал его внимание на то, что прямая дорога от Лепеля до Витебска проходит через местечко Бешенковичи, *«где есть провиантские запасы»* (около 15 тыс. четвертей), которые не охранялись [10, л. 82].

Следуя субординации, о том же К. Лешерн 5 июля написал (прилагая рапорты подчиненных ему чиновников) белорусскому военному губернатору герцогу Александру Вюртембергскому (находился при Императорской квартире в Полоцке). В частности, подсудок Лепельского поветового суда М. Ф. Хрептович [7, с. 429], который вышел из Лепеля *«тайно по приказанию тамошнего маршала Гребницкого»* [7, с. 430], сообщил, что *«французы вступили в Лепель 3-го числа, в 3-м часу пополудни»*. Вокруг города они поставили пикеты и *«ожидают к себе из Борисова еще 3-х полков»* [10, л. 91]. В связи с этим, 6 июля 1812 г. герцог А. Вюртембергский предложил военному министру направить в Бешенковичи *«одного офицера с малым отрядом для сожжения сего магазейна, если неприятель, может быть, снял уже свои пикеты, которые были назад тому несколько дней в Лепеле»* [10, л. 90].

Однако М. Барклай де Толли поручил решить вопрос генерал-интенданту Ефиму Францевичу Канкрину. Тот 6 июля отдал распоряжение полоцкому земскому исправнику о перевозке находящихся в Бешенковичах *«на левом берегу не маловажных частичных запасов, на правый берег»* [10, л. 116–117]. Исправник доехал только до первой станции, где встретил повытчика Лепельского нижнего земского суда Степана Никоновича и дьякона *«местной благочестивой церкви»* Николая Отрошкевича. Они сообщили, что *«неприятель уже вступил в Бешенковичи и расположился там»*. Поэтому исправник вернулся в Витебск и представил информаторов К. Лешерну [10, л. 116–117].

В ходе расспросов С. Никонович и Н. Отрошкевич показали, что вышли из Лепеля вечером 5 июля, а французы вступили туда 3 июля, *«до 40 гусар под командой двух поручиков (один поляк, второй – француз)»* [10, л. 116]. Офицеры запросили у местного казначея отчет о сумме, а поскольку ее не оказалось в наличии – потребовали *«восполнить ее из собственных денег»*. Кроме того, у поветовых маршалов они потребовали списки дворян 1795 г. [10, л. 116].

5 июля 1812 г. наполеоновские офицеры выслали из Лепеля на Витебский тракт разведчиков. Двое из них в 15.00 прибыли в Бешенковичи, *«отобрали магазин и велели печь хлеб (так, чтобы мука была просеяна через тонкое сито), и чтобы хлеб был готов к 4 часам»* [10, л. 116]. Сами же офицеры отправились в местечко Бочейково, якобы для встречи эскадронов, которые должны были прибыть к ночи в Бешенковичи. По слухам, в ночь на 6 июля планировалась разведка далее за Бешенковичи к Витебску [10, л. 116–117].

Для проверки этих сведений К. Лешерн направил на разведку майора Витебского внутреннего гарнизонного батальона. 7 июля тот вернулся в Витебск и сообщил губернатору, что *«французы действительно вступили в Бешенковичи, куда ожидается прибытие двух эскадронов»* [10, л. 117].

Учитывая нависшую угрозу городу, Витебск стал готовиться к эвакуации. В первую очередь, необходимо было сохранить провиантские запасы для российских войск. Поэтому герцог А. Вюртембергский отправил курьера к витебскому гражданскому губернатору со срочным предписанием: всю муку, которая находилась в провиантском магазине в Витебске, *«в три дня непременно»* перепечь в сухари [10, л. 89].

Кроме того, как впоследствии вспоминал К. Лешерн: *«В Витебске в один день приготовлено на порции 4 тыс. ведер вина и 600 штук рогатого скота, в чем армия нуждалась. В двои сутки отправлено в Поречье некоторое количество продовольствия, сколько оного с Суражского и Велижского поветов по краткости времени собрать было возможно»* [14, л. 6].

Еще ранее, 3 июля, А. Вюртембергский предписал К. Лешерну, чтобы архивные дела *«были в совершенной готовности, дабы при приближающейся опасности могли быть тотчас перевезены в Новгород»*. Поэтому гражданский губернатор приказал *«дела все укладывать»* в ожидании приказа *«отправлять ли оные и куда именно, равно выезжать ли с сими делами чиновникам и в какое место»* [10, л. 91]. Кроме того, К. Лешерн дал распоряжения Витебской казенной палате *«об отсылке казны в С.-Петербург, а прочим присутственным местам о приготовлении дел»* [10, л. 104], о чем 4 июля 1812 г. рапортовал герцогу А. Вюртембергскому.

Уже после занятия Лепеля, поскольку дорога от этого города до Витебска не охранялась российскими войсками и противник мог легко пробраться к губернскому центру, К. Лешерн *«предложил»* Витебской почтовой конторе прекратить с Лепелем *«корреспонденцию»* [10, л. 92].

В целом подготовка Витебска к эвакуации приобрела почти открытый характер, поэтому в городе начался и обратный процесс – подготовка к встрече наполеоновской армии профранцузски настроенной частью горожан, преимущественно шляхтой. Учитывая, что в Витебске, кроме губернского гарнизонного батальона, не было войск, среди пророссийски настроенной части общества начали проявляться панические настроения.

6 июля 1812 г. в Витебск прибыл сотрудник Особенной канцелярии военного министра подполковник Петр Андреевич Чуйкевич (вместе с морским офицером лейтенантом Матвеем Николаевичем Чихачевым) [10, л. 101–103]. Губернатор сообщил, что *«умы жителей в Витебске волнуются от страху, что нет совершенно здесь войск, кроме 50-ти солдат внутреннего гарнизонного батальона, который находится в раскомандировке, конвоируя пять партий рекрут в Динабург и одну в Калугу»* [10, л. 102]. Поэтому П. Чуйкевич оставил в Витебске резервные батальоны, *«как для успокоения жителей, так и для истребления неприятельских партий»* (7 июля это распоряжение одобрил военный министр) [10, л. 98]. Кроме того, чтобы *«охладить пыл»* пронаполеоновски настроенной части горожан, сотрудник Особенной канцелярии принял ряд упреждающих мер.

Во-первых, поскольку в Витебске в наличии было *«весьма много <...> пик»*, оставшихся после расформирования в 1807 г. ополчения (хранились в домах *«собственно у поляков»*), и в городе пошел слух, что *«многие поляки приготовляются к вооружению оными»*, П. Чуйкевич запросил у военного министра разрешения *«оные отобрать»* [10, л. 98].

Во-вторых, проанализировав поступившие сведения, он предположил, что *«неприятель стремится с силами между 1-й и 2-й армией на Слоним»* [10, л. 103]. Поэтому для получения в дальнейшем разведыва-

тельной информации, П. Чуйкевич просил К. Лешерна убедить *«двух здешних жидов, по имени Иоаким Абрамович и Иосель Давидович, людей проворных, доставить г-ну Санглену* [руководителю Высшей воинской полиции Якову Ивановичу де Санглену. – А. Л.] *сведения, хотя бы Витебск и занят был неприятелем»* [10, л. 103].

В-третьих, П. Чуйкевич постарался выявить в городе *«наиболее отчаянных»* сторонников Наполеона и публично их покарать. *«В Витебске отыскан Минской губернии поляк Свенцицкий, откупщик здешнего города*, – сообщал офицер М. Барклаю де Толли, – *который приготовляясь принять в город французов, заказал маляру сделать вывески на всех питейных домах с французским орлом с тем, чтобы тотчас по вступлении неприятеля оные всюду поставить»* [10, л. 98]. *«Гербы сии приготовляются и будут готовы 8 числа, нимало не подозревая; начальство дает время окончить сию работу, чтобы более открыть злой умысел»*, – резюмировал П. Чуйкевич [10, л. 98].

Перед отъездом офицер оставил «злоумышленника» у губернатора в ожидании приказа, что с ним делать. Получив это сообщение, 7 июля М. Барклай де Толли *«шляхтича в Витебске, который заказал сделать французских гербов»*, приказал гражданскому губернатору *«расстрелять, при собрании народа, в пример другим»* [9, л. 254] (неизвестно, был ли выполнен данный приказ).

В целом П. Чуйкевич в своем донесении военному министру дал достаточно высокую оценку новому начальнику Витебской губернии. *«Переговоры с г-м губернатором Лешерном*, – говорилось в письме от 6 июля, – *который, не взирая, что весьма нов в сем месте, ибо приехал для управления губернией только шестой день, оказывает деятельность и распоряжения, достойные занимаемого им места»* [10, л. 101].

10 июля 1812 г. по предписанию военного министра К. Лешерн организовал перевозку провианта и фуража из Невеля в Велиж [10, л. 126; 14, л. 6]. При этом в провиантском магазине в Витебске находилось 3010 четвертей муки, 377 четвертей круп, 2148 четвертей овса и 4000 пудов сена. Из этих запасов для изготовления сухарей (готовность – 11 июля) было выдано 1600 четвертей муки. Кроме того, комиссия Витебского провиантского депо ожидала закупленный хлеб от поставщиков – 2173 четверти муки, 2299 четвертей овса и до 10 000 пудов сена. Губернатор отмечал, что *«войско в продовольствии недостатка иметь не будет»* [10, л. 126].

В тот же день К. Лешерн сообщил М. Барклаю де Толли сведения о положении в тылу 1-й Западной армии (о том, что 10 июля в Могилеве ожидают прибытие корпуса генерал-лейтенанта Николая Николаевича Раевского, а в Витебск перевезен архив присутственных мест из Бабиновичей). О противнике витебский губернатор писал, что 8 тыс. человек

Адным з найбольш значных дакументаў у дзейнасці каталіцкай царквы з'яўляўся Канкардат 27 ліпеня (3 жніўня) 1847 г. – дамова паміж Святым Прастолам і Расійскай імперыяй, якая ўтрымлівала 31 артыкул на французскай мове, прысвечаны адміністрацыйнаму ладу і тэрытарыяльнаму падзелу царквы. Асаблівая ўвага надавалася Херсонскай дыяцэзіі, што толькі ўтваралася. Былі вызначаны справы, якія належалі папярэдняму разгляду дыяцэзіяльных кансісторый: па спагнаннях і скаргах на духавенства, узаемаадносінах з насельніцтвам, размеркаванні фінансавання прадстаўніцтваў царквы ў дыяцэзіі, распарадчай дакументацыі, за выключэннем адміністрацыйных спраў. Замацоўвалася права дарадчага голасу кансісторыі і вырашальнага – біскупа. Шэрагам артыкулаў разглядалася сфера паўнамоцтваў і спецыфіка дзейнасці членаў кансісторый, адукацыйных устаноў для духавенства. Апошнім артыкулам дазваляўся рамонт пабудоў прадстаўніцтваў за прыватныя сродкі і з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі [1, с. 193–207].

Органам канфесійнага кіравання для каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі з 1801 г. з'ўлялася Рымска-каталіцкая духоўная калегія (РКДК). Яе функцыі ахоплівалі апеляцыі на рашэнні вышэйшага кліру і кансісторый, скаргі на іх, скасаванне шлюбаў, міжканфесійныя пераходы (хрышчэнне), узгадненне правінцыялаў ордэнаў і вышэйшага кліру, разгляд прапаноў дыяцэзіяльнага кіраўніцтва, збор статыстычных звестак праз кансісторыі і інш. [36, т. 26, арт. 20053]. Адпаведна, распараджэнні маглі тычыцца асобных спраў або дзейнасці ўсёй кансісторыі. Так, указ калегіі ад 16 лютага 1803 г. аб падачы ведамасцей аб народжаных, узяўшых шлюб і памерлых з кансісторый насіў агульнадзяржаўны характар [20, арк. 437–437 адв.]. У каталіцкіх кансісторыях распарадчыя дакументы РКДК далучаліся да спраў, якіх тычыліся, пераважна ў копіях, а арыгіналы сшываліся па гадах. Напрыклад, указ 1840 г. аб спагнанні на карысць Магілёўскага бернардзінскага кляштара 300 руб., запісаных тастаментам Тадэвуша Чудоўскага [17, арк. 1–2], быў далучаны да справы, дзе змяшчаўся таксама дакумент аб выдачы сродкаў для пакрыцця выдаткаў на перамяшчэнні з Пскова прызначанага візітатара кляштараў Магілёўскай архідыяцэзіі Тамаша Сідаровіча [18, арк. 9]. Да судовых спраў маглі падшывацца копіі ўказаў, як у справе аб сепарацыі Юзафа і Ганны Сліжаноўскіх, што магло быць звязана з перспектывай выкарыстання арыгіналаў у

якасці прэцэдэнтаў і, адпаведна, фарміравання іх у асобныя справы [16, арк. 51–52]. У Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі захаваліся ўказы Калегіі за 1797–1869, 1875, 1887–1892 гг. [15, воп. 26, спр. 1–159].

Фарміраванне ўказаў у справы магло ажыццяўляцца па сферы функцыянальнасці сталоў, відавочна для зручнасці выкарыстання. Так сфарміраваны 30 указаў па сферы паўнамоцтваў другога стала за 1840–1859 гг. Яны тычыліся арганізацыі разгляду спраў па выдачы выпісаў з метрычных кніг і канверсій. Папярэднічаў дакументам рэестр у выглядзе табліцы з пазначэннем нумару ўказа, загалоўка і аркушаў, на якіх змешчаны дакумент [19, арк. I–III]. Так, сярод дакументаў маецца ўказ ад 8 чэрвеня 1836 г. аб недапушчэнні ў якасці сведак асоб старэйшых за 80 гадоў без метрычных пасведчанняў. Паводле яго, сведкамі не маглі быць аднагодкі асобы, нараджэнне якой усталёўвалася [19, арк. I, 6а]. Указам ад 26 кастрычніка 1836 г. удакладнялася магчымасць выдачы выпісаў з метрычных кніг, калі неабходнасці ў правядзенні следства не было, а ўказам ад 29 снежня 1839 г. адзначалася, што неабходна пры выдачы выпісу пазначаць сумнеўны элемент запісаў [19, арк. I].

У архіве Мінскай кансісторыі маюцца ўказы Калегіі за 1810, 1811, 1815–1836 гг. [15, воп. 27, спр. 613–616]. Адзначым, што падчас фарміравання спраў у ХІХ ст. было змяшана справаводства капітулы і кансісторыі. У справаводстве капітулы Рэестр прапаноў дыяцэзіяльнага кіраўніцтва па ўказах Калегіі за 1819–1824, 1836 гг. складзены на польскай мове ў выглядзе табліцы, як і ў Магілёўскай кансісторыі, але не пазначаны аркушы. Пры гэтым у шэрагу выпадкаў пазначана, на якой мове складзены арыгіналы ўказаў РКДК, напрыклад, указ ад 16 кастрычніка 1817 г., які тычыўся галоўнай семінарыі пры Віленскім універсітэце, быў на польскай мове [21, арк. 3]. У табліцы маецца толькі парадкавы нумар, год, месяц і дата. Апрача копій указаў, у справу былі ўключаны і суправаджальныя дакументы да іх [21, арк. 3–6]. Пераважная большасць указаў была накіравана з РКДК у Мінскую капітулу праз кансісторыю, напрыклад, указам ад 21 ліпеня 1824 г. патрабавалася даставіць паслужны спіс абранага канонікам Мацея Капалінскага і яго атэстаты [21, арк. 176].

У архіве Віленскай кансісторыі ўказы калегіі пераважна сшыты разам з указамі Сената, дзяржаўных органаў кіравання канфесіямі, якія маглі перасылацца з дадатковымі распараджэннямі з РКДК, а таксама з указамі, атрыманымі на імя біскупа [48, ар. 3, b. 4–48, 50, 52–74, 76–77, 619]. У гэтай кансісторыі захаваліся таксама кнігі (журналы) рэгістрацыі ўказаў РКДК у 1845–1853, 1877–1881, 1899–1915 гг. [48, ар. 3, b. 45, 75, 79].

**Уніяцкая царква** карысталася праваслаўнай абраднасцю, таму ў архівах органаў кіравання ёю захоўваліся ўказы Сінода, напрыклад,

за 1798 г. аб унясенні свята Казанскай Божай Маці 22 кастрычніка ў штогадовы табель святочных дзён [29, арк. 37], а разам з тым у 1800 г. вызначаўся ўзор прысягі на лацінскай мове для выкарыстання ў следчых справах [29, арк. 112–112 адв.]. Тым не менш, адміністрацыйныя і судовыя пытанні вырашаліся на падставе распарадчых дакументаў Папы Рымскага. Так, булай папы Льва X яшчэ ў 1521 г. размяжоўваліся сферы паўнамоцтваў каталіцкага і ўніяцкага кліру ў дачыненні да ўніяцкай царквы пад пагрозай пазбаўлення пасад і бенефіцый духавенства лацінскага абраду ў выпадку іх умяшальніцтва ў справы ўніяцкай царквы, што не раз пацвярджалася іншымі дакументамі, напрыклад, брэве і дэкрэтам Бенядыкта XIV у 1742 г. [46, s. 9–15, 67–78]. У брэве Папы Паўла V разглядаліся пытанні абраднасці і магчымасцей захавання ўніяцкай царквы [46, s. 15–19]. З 1801 г., як і каталіцкая, яна мела падвойнае падпарадкаванне – Папе Рымскаму і РКДК, – што абумовіла аналагічны падыход да фарміравання распарадчых дакументаў канфесійнага кіравання ў справы, напрыклад, у 1824 г. былі сістэматызаваны паводле храналагічнай прыкметы ўказы РКДК за 1810–1823 гг. са складаннем рэестру на польскай мове. Пры гэтым адзначалася адсутнасць указаў за 1812 г., а іх колькасць вырасла з 14 за 1810 г. да 33 за 1823 г., што таксама можа тлумачыцца іх захаванасцю [31, арк. 1–14]. Напрамкі рэгулявання калегіяй таксама супадалі з каталіцкай царквой. Так, указам РКДК былі вызначаны штаты і ўтрыманне Брэсцкай уніяцкай кансісторыі ў 1809 г., а таксама збіраліся звесткі для адрас-календара [31, арк. 22–23, 42], забаранялася перахоўваць памерлых [32, арк. 420–420 адв.]. Падпарадкаванне Папе працягвалася аж да ліквідацыі ўніяцкай царквы, але з 1828 г. была ўтворана Грэка-ўніяцкая духоўная калегія (ГУДК) з атрыманнем функцый ад РКДК. Ёй было аддадзена адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўдакладненне межаў уніяцкіх прыходаў, не аднесеных да Беларускай і Літоўскай епархій [37, т. 3, арт. 1977, 2086]. Падчас прызначэнняў на пасады, пры неабходнасці высвятлення абставін нараджэння і паходжання, ГУДК таксама збірала звесткі з метрычных кніг (напрыклад, пра Антона Мацкевіча) [30, арк. 2–2 адв.]. З 1837 г. у канфесійным кіраўніцтве ўніяцкай царквой з’явілася яшчэ адна інстанцыя – обер-пракурор Сінода [37, т. 12, арт. 9825], а ў 1839 г. ГУДК была падпарадкавана Сіноду [37, т. 14, арт. 12133], аднак яе статус на ўзроўні яго структурных адзінак быў акрэслены толькі асобным указам у снежні 1839 г. [37, т. 14, арт. 14009]. Пры гэтым у матэрыялах Беларускай уніяцкай кансісторыі ўказы РКДК і ГУДК, сфарміраваныя часам разам з указамі імператара і вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, захаваліся за 1810–1824, 1835 гг. [28, воп. 2, спр. 291; воп. 5, спр. 10, 12, 15, 18, 22, 26, 34, 38, 39, 43], а Брэсцкай уніяцкай кансісторыі – за 1818–1829 гг. [33].

Органам канфесійнага кіравання **евангелічна-рэфарматарскай царквы** з’яўляўся Літоўскі сінод. У 1824 г. яму была падпарадкавана Капыская абшчына, аднак, як і іншыя, яна мела пэўную аўтаномнасць [36, арт. 29868]. Апрача кананічных пытанняў, узаемаадносіны абшчын з Літоўскім сінодам тычыліся ўзгаднення адміністрацыйна-гаспадарчага ўладкавання і фінансавання, напрыклад, арэнды памяшканняў для цэркваў [50, b. VII], прызначэння пробстаў, калі разглядаліся тэксты прамоў [50, b. XII], і справаздачнасці па асноўных напрамках іх дзейнасці [50, b. VI]. Пры гэтым унутраныя дакументы складаліся пераважна на польскай мове, а распарадчая дзейнасць пратакаліравалася. У архіў Сінода ўключаліся не толькі дакументы ўласнага справаводства, але і матэрыялы па дыстрыктах, у прыватнасці, Мінскім (Беларускім, Рускім), Навагрудскім, Падляшскім (Занёманскім) [47, s. 10; 52]. Як выканаўчы орган з 1831 г. пачала дзейнічаць Віленская рэфарматарская калегія, якая таксама пратакаліравала свае пасяджэнні [6, с. 180–181; 45, с. 38–39], аднак матэрыялы яе дзейнасці, як і Літоўскага сінода, за перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі захаваліся фрагментарна, а іх распарадчая дакументацыя ў выглядзе асобных спраў не была выяўлена [50; 51].

Кіраўніцтва **лютэранскай царквой** на беларускіх землях ажыццяўляла Віленская кансісторыя [29, арт. 21450; 49], якая адносілася да епархіяльнага ўзроўню кіравання да аб’яднання ў 1818 г. у «евангелічную царкву» [36, арт. 27217], а ў наступным годзе была ўтворана Дзяржаўная евангелічная генеральная кансісторыя (ДЕГК) як орган канфесійнага кіравання для рэфарматарскай і лютэранскай цэркваў [36, арт. 27897], што было таксама адлюстравана ў Статуце 1832 г. [45, с. 55]. Распарадчая дзейнасць ДЕГК афармлялася на нямецкай мове. Пры фарміраванні ў асобныя справы па відавай прыкмеце (напрыклад, у Мінскай кірсе) мог дадавацца пераклад на рускую мову. Распарадчыя дакументы выдаваліся ёю ад імя імператара, мелі лаканічны характар, уключалі кароткія звесткі пра сутнасць пытання і прынятае рашэнне, падпісваліся прэзідэнтам (віцэ-прэзідэнтам) і сакратаром, напрыклад, дазвол на продаж пляца зямлі Мінскай кірхі [24, арк. 2–2 адв., 17] або ўзяцце крэдыту на яе будаўніцтва [25, арк. 15–15 адв.]. Апрача гаспадарчых пытанняў, ДЕГК ажыццяўляла кантроль за разглядам спраў у грамадзянскіх судовых органах, напрыклад, спрэчкі паміж Слуцкай кірхай і яўрэямі [26, арк. 33 адв.]. Безумоўным з’яўлялася забеспячэнне дзейнасці цэркваў і аб’яднанняў пры іх, напрыклад, вызначэнне фінансавання брацтваў за кошт абшчын, функцыянаванне школ і інш. [23, арк. 8]. Улічваючы пэўную аўтаномнасць абшчын, распарадчыя дакументы ДЕГК шырока распаўсюджваліся паміж імі і маглі фарміравацца ў асобныя справы або падшывацца да спраў, якіх тычыліся. Напрыклад,

асобныя справы за 1834, 1837, 1839, 1840–1846, 1850, 1853–1917 гг. захаваліся сярод калекцыі дакументаў евангелічна-лютэранскіх цэркваў Беларусі [22, спр. 21, 27, 37, 41, 73, 79, 84, 88, 94, 97, 142, 146, 184, 191, 214].

Такім чынам, распарадчая дзейнасць на канфесійным узроўні кіравання хрысціянскімі цэрквамі ў Расійскай імперыі мела выразную спецыфіку для кожнай з канфесій. У праваслаўнай і рэфарматарскай цэрквах гэтыя органы кіравання (Сінод, Літоўскі сінод) існавалі яшчэ да падзелаў Рэчы Паспалітай, а для іншых хрысціянскіх канфесій былі ўтвораны ў пачатку XIX ст. Калі ў праваслаўнай і з 1837 г. уніяцкай цэрквах ключавыя пазіцыі ў канфесійным кіраванні займаў Сінод, то ў каталіцкай і ўніяцкай ажыццяўлялася падвойнае канфесійнае кіраванне: з Рыма (апасродкавана) і з утворанай у Расійскай імперыі ў 1801 г. Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі (непасрэдна). Для ўніяцкай царквы гэты перыяд працягнуўся да 1828 г., калі была ўтворана асобная ГУДК. У 1818 г. была ўтворана, а з 1832 г. пачала фактычнае функцыянаванне ДЕГК. Пры гэтым уплывовасць органаў канфесійнага кіравання адрознівалася. У прыватнасці, у пратэстанцкіх цэрквах яна была ніжэйшай, што было абумоўлена іх кананічнай спецыфікай. Аднак напрамкі рэгулявання фактычна захоўваліся ў межах, вызначаных заканадаўствам Расійскай імперыі (збор статыстычных звестак, фінансавыя і адміністрацыйныя пытанні і інш.), а ўплыў Рыма абмяжоўваўся кананічнымі пытаннямі і ўзгадненнем адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, які вызначаўся на перамовах Папы Рымскага і яго прадстаўнікоў з прадстаўнікамі расійскіх улад. Значная ўвага ў евангелічна-рэфарматарскай царкве надавалася арганізацыі дзейнасці навучальных устаноў.

Яшчэ адна ўласцівасць заключаецца ў выкарыстанні відавай разнастайнасці дакументаў. Органы канфесійнага кіравання праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай і лютэранскай цэркваў, карыстаючыся нарматыўнымі дакументамі Расійскай імперыі ў арганізацыі справаводства, выдавалі пераважна ўказы і прапановы, а Літоўскі сінод пратакаліраваў рашэнні. Пры гэтым у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. назіралася моўная разнастайнасць у афармленні распарадчых дакументаў: Сінод і ГУДК карысталіся пераважна рускай мовай, РКДК і Літоўскі сінод – польскай і рускай мовамі, а ДЕГК – нямецкай мовай. Да дакументаў на замежных мовах часта дадаваліся пераклады, а з сярэдзіны XIX ст. усе органы канфесійнага кіравання ў распарадчай дзейнасці перайшлі на рускую мову. Выключэнне складае ДЕГК, якая працягвала карыстацца нямецкай мовай. Распарадчыя дакументы фарміраваліся ў справы з рэестрамі ў справаводстве органаў епархіяльнага кіравання хрысціянскіх канфесій, а таксама падшываліся да спраў, якіх тычыліся. Пры гэтым з сярэдзіны XIX ст. Сінодам дакументы агульнадзяржаўнага характару

публікаваліся ў перыядычных выданнях, практыка чаго адсутнічала ў органах епархіяльнага кіравання іншаслаўных канфесій.

## Крыніцы і літаратура


1. Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкови в империи Российской и царстве Польском. – Санкт-Петербург : Типография второго отделения Е.И.В. канцелярии, 1849. – 240 с.
2. Алфавитно-предметный указатель к официальной части «Церковных ведомостей» за 1888–1897 годы. – Санкт-Петербург : Синодальная типография, 1899. – 168 с.
3. Алфавитно-предметный указатель к официальной части «Церковных ведомостей» за 1898–1910 годы. – Санкт-Петербург : Синодальная типография, 1911. – 336 с.
4. Духовный регламент всепресветлейшего, державнейшего государя Петра Первого, императора и самодержца всероссийского. – Санкт-Петербург : [б/и], 1721. – 65 с.
5. Могилевские епархиальные ведомости. – 1903. – № 3.
6. Назаров, А. А. Основные принципы конфессиональной политики правительства Российской империи в отношении инославных исповеданий // Вестник исторического общества Санкт-Петербургской духовной академии. –2021. – № 1(6). – С. 171–186.
7. НГАБ. – Ф. 136. Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя. 1724–1951 гг.
8. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 65. – Справа аб перадачы з Магілёўскай духоўнай кансісторыі спраў цэркваў і манастыроў, якія перайшлі ў загадванне епіскапа пераяслаўскага і барыспальскага Віктара. 1786 г. – 21 арк.
9. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 200. – Указ Сінода ад 10 снежня 1792 г. аб дазволе епіскапу Віктару ўзначаліць епархію пасля вызвалення з-пад арышту. 1792 г. – 2 арк.
10. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 525. – Справа аб атрыманні кансісторыяй указаў Сінода, Маскоўскай сінадальнай канторы, лістоў і рапартаў ад розных асоб на імя епіскапа Віктара падчас яго знаходжання ва Украіне. 1795 г. – 27 арк.
11. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 976. – Ведамасці кансісторыі са звесткамі аб атрыманні і выкананні ўказаў Сінода за 1798 г. – 51 арк.
12. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 13979. – Справа аб скасаванні шлюбу генерал-маёра Л. В. Дубельта с жонкай, дачкой памешчыка Віленскага пав. К. Замаскага. 1839 г. – 85 арк.
13. НГАБ. – Ф. 136. Воп 1. Спр. 27305. – Справа паводле прашэння двараніна ваколіцы Плотніца Пінскага пав. С. Радцэвіча аб дазволе яму ўступіць у другі шлюб у сувязі са ссылкай у Сібір першай жонкі. 1856–1857 гг. – 12 арк.
14. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41736. – Ведамасці кансісторыі аб выкананні ўказаў Сінода за 1817–1819, 1822, 1824–1825 гг. – 33 арк.

15. НГАБ. – Ф. 1781. Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя. 1573–1950 гг.
16. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 2. – Справа аб скасаванні шлюбу Ганіпроўскіх. 1791–1799 г. – 156 арк.
17. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 8551. – Справа аб спагнанні з маёнтка Ігнашчэвіч 300 руб. паводле тастамента памешчыка Тадэвуша Чудоўскага Магілёўскаму бернардынскаму кляштару і 628 руб. 86¼ кап. Варадзькоўскаму касцёлу. 21.10.1840–22.05.1878. – 128 арк.
18. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 4. Спр. 98. – Справа аб прызначэнні візітатарам кляштараў Магілёўскай архідыяцэзіі пскоўскага курата Тамаша Сідаровіча. 1885 г. – 106 арк.
19. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 303. – Указы Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі, распараджэнні мітрапаліта і іншыя дырэктыўныя дакументы для кіраўніцтва ў рабоце кансісторыі. 1840–1859 гг. – 160 арк.
20. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1507. – Указы і прапановы Магілёўскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі за 1811–1813 гг. – 805 арк.
21. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 615. – Указы Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі за 1815–1836 гг. – 183 арк.
22. НГАБ. – Ф. 1952. Калекцыя дакументаў пратэстанцкіх абшчын. 1648–1969 гг.
23. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 1. Спр. 21. – Распараджэнні Галоўнай (Пецярбургскай) і Курляндскай лютэранскіх кансісторый, адносіны Віленскага благачыння. 1834 г. – 43 арк.
24. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 1. Спр. 27. – Цыркуляры Пецярбургскай лютэранскай кансісторыі. 1837–1877 гг. – 24 арк.
25. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 1. Спр. 41. – Распараджэнні Галоўнай (Пецярбургскай) лютэранскай кансісторыі; справаздачы Мінскага савета. 1840–1846 гг. – 19 арк.
26. НГАБ. – Ф. 1952. Воп. 1. Спр. 97. – Распараджэнні Галоўнай (Пецярбургскай) лютэранскай кансісторыі. 1861–1870 гг. – 54 арк.
27. НГАБ. – Ф. 2301. Магілёўская духоўная праваслаўная кансісторыя. 1765–1946 гг.
28. НГАБ. – Ф. 3245. Беларуская грэка-ўніяцкая кансісторыя. 1745–1892 гг.
29. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 1. Спр. 121. – Указы Сената, Рымска-каталіцкага дэпартамента, Дзяржаўнай юстыц-калегіі аб парадку падачы апеляцыйных скаргаў, вызваленні дамоў службоўцаў ад падатку, пераводзе ўніяцкіх цэркваў у праваслаўнае ведамства і інш. 1792, 1797–1800 гг. – 156 арк.
30. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 2. Спр. 184. – Указы Грэка-ўніяцкай духоўнай калегіі за 1832 г. – 13 арк.
31. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 5. Спр. 10. – Указы Аляксандра I і духоўнай калегіі за 1810–1824 гг. – 738 арк.
32. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 5. Спр. 18. – Указы Другога дэпартамента Рымска-каталіцкай калегіі, рапарты дэканаў, прашэнні розных асоб. 1816 г. – 951 арк.

33. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 1621 (Брэсцкая ўніяцкая кансісторыя). Воп. 1. Спр. 17. – Указы Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі Брэсцкай уніяцкай кансісторыі. 1818–1829 гг. – 68 арк.
34. Нетужилов, К. Е. Периодические издания Св. Синода в XIX – начале XX в.: церковный официоз // Вестник Санкт-Петербургского университета. – Сер. 9. – 2007. – Вып. 4, ч. II. – С. 47–52.
35. Нетужилов, К. Е. Епархиальная периодическая печать в дореволюционной России // Известия Российского государственного педагогического университета им. А. И. Герцена. Общественные и гуманитарные науки. – 2006. – № 7(21). – С. 174–182.
36. Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое: в 45 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1649–1825.
37. Полное собрание законов Российской империи. Собрание вторoе: в 55 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884.
38. Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье : в 33 т. – Санкт-Петербург : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1884–1913.
39. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1329 (Именные указы и Высочайшие повеления Сенату). Оп. 1. Д. 19. Л. 692–712 об. – Генеральный регламент. 1720 г.
40. Русанов, Ф. Канцелярский самоучитель, или краткое руководство к познанию делопроизводства присутственных мест, с прибавлением форм переписки и канцелярских документов. – Москва: тип. Н. Степанова, 1839. – 186 с.
41. Седано, М. Бреве // Католическая энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://xn--j1al4b.xn--p1acf/page/604. – Дата доступа: 01.06.2022.
42. Седано, М. Булла // Католическая энциклопедия [Электронный ресурс].– Режим доступа: http://xn--j1al4b.xn--p1acf/page/631. – Дата доступа: 01.06.2022.
43. Устав духовных консисторий. – Санкт-Петербург : Синодальная типография, 1843. – 193 с.
44. Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего Синода и правительствующего Сената / Сост. М. Н. Палибин. – Санкт-Петербург : Юридический книжный магазин Н. К. Мартынова, 1900. – 232 с.
45. Филатова, Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. – Минск : Белорусская наука, 2006. – 192 с.
46. Bullae, brevia, y liste okolne papieski, tudzież kongregacyi dekreta, obrządkowi Greckiemu ziednoczonemu służące: z różnych xiążek, tudzeż bullariuszu Benedukta XIV zebrane, z łacińskiego języka na polski przełożone. – Suprasl : drukarnia XX Bazylianow, 1799. – 143 s.
47. Katalog pokazu zabytków ze zbiorów Synodu ewang.-reformowanego w Wilnie : pamiątka zjazdu ewangelickiego w Wilnie / oprac. W. Studnicki. – [Wilno : s. n], 1926 (Drukarnia «Lux»). – 23 s.

48. Lietuvos valstybes istorios archivas (далей – LVIA). – F. 604. Vilniaus romos katalikų vyskupijos dwasine konsistorija. 1471–1938 m.
49. LVIA. – F. 606. Ap. 1. – Vilniaus evangelikų ferormatų konsistorija. 1620–1940 m.
50. Lietuvos nacionaline Martyno Mažvydo biblioteka. – F. 93. Lietuvos evangelikų reformatų sinodas. 1413–1938 m.
51. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. – F. 40. Lietuvos evangelikų reformatų sinodas. 1429–1944 m.
52. Saks W. Zbiory rękopiśmienne Synodu Ewangelicko-reformowanego w Wilnie // Reformacja w Polsce. – R. 5. – № 17/18. – Warszawa, 1928. – S. 151–155.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.06.2022

*В. У. Галубовіч*

# Тэхнічны персанал канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага і крыніцы яго ўтрымання ў час праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.)

Персанальны склад кіраўніцтва канцылярыі ВКЛ (канцлеры, падканцлеры, вялікія пісары) за ўвесь перыяд яе існавання вядомы з часу выдання фундаментальнай працы Юзафа Вольфа [34, s. 159–162, 163–166, 251–283]. У пачатку 1990-х гг. польскія даследчыкі склалі даведнік, у якім сабралі інфармацыю ў тым ліку і пра такіх супрацоўнікаў канцылярыі, як рэгенты і дэкрэтавыя пісары [31, s. 175–179, 105–107]. Адпаведна, вызначыць асоб, якія ўваходзілі ў вышэйшую бюракратыю ВКЛ у час праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.) не складана. Больш за тое, даследчыкамі напісаны грунтоўныя біяграмы не толькі нязменнага кіраўніка канцылярскай службы ВКЛ у 1623–1656 гг. Альбрыхта Станіслава Радзівіла [27], але і падканцлераў, і нават некаторых пісараў згаданага перыяду [22; 24; 25; 26; 28; 32]. Інакш справа выглядае з так званым тэхнічным персаналам канцылярыі, пра які вядома, бадай, толькі тое, што ён быў і нёс асноўны цяжар справаводчай працы. Між тым ёсць магчымасць часткова запоўніць і гэты прабел дзякуючы матэрыялам, створаным у самой канцылярыі – Метрыцы ВКЛ. Крыніцавай базай для дадзенага артыкула сталі звесткі пра супрацоўнікаў канцылярыі ВКЛ, выяўленыя ў кнігах запісаў Метрыкі ВКЛ за 1633–1648 гг. [4–18].

***Канцылярыя ВКЛ: вялікая і меншая.*** Фактычна адзінай стала дзеючай дзяржаўнай установай ВКЛ была канцылярыя, ці дакладней канцылярыі (вялікая і меншая), якія падпарадкоўваліся адпаведна канцле-

ру і падканцлеру, так званым пячатарам. Гэты падзел, які ўзнік пасля ўвядзення ў 1566 г. пасады падканцлера [31, s. 146–147], уплываў на арганізацыю працы ўстановы, якая мела дзве дубліруючыя свае функцыі часткі. Вынікам чаго стала фарміраванне асобных канцлерскіх і падканцлерскіх кніг Метрыкі, хаця часам яны аб'ядноўваліся [20, с. 87–108, 118–146]. Па логіцы, існаванне дзвюх канцылярый з фармальна роўнымі па паўнамоцтвах кіраўнікамі патрабавала наяўнасці двух штатаў тэхнічных супрацоўнікаў, але на практыцы ўсё выглядала інакш. Падпарадкаванне не азначала, што канцылярыі былі там, дзе знаходзіліся пячатары. Канцылярыя ВКЛ, якая дэ-факта была часткай «*канцылярыі Яго Каралеўскай Міласці*», абслугоўвала, у першую чаргу, кіраўніка дзяржавы, і яе месцазнаходжанне супадала з маршрутам перасоўвання манарха па краіне. Верагодна, з гэтай прычыны амаль немагчыма вызначыць прыналежнасць супрацоўнікаў да канкрэтнай канцылярыі, а ў матэрыялах Метрыкі яны не дыферэнцуюцца.

***Наменклатура пасад: праблемы арыгінальнай тэрміналогіі.*** Кіраўніцтва і вышэйшыя штатныя супрацоўнікі канцылярыі мелі вызначаную наменклатуру пасад, замацаваную ў адпаведных намінацыйных распараджэннях (прывілеях) манарха. Аднак далёка не ўсе асобы пры двары, якія мелі адносіны да справаводства, атрымлівалі адпаведныя намінацыі: так, даволі рэдка ў Метрыцы фіксаваліся прывілеі на сакратарства, як гэта мела месца 21 чэрвеня 1639 г., калі з падачы полацкага ваяводы Януша Кішкі манарх выдаў прывілей Станіславу Жуку на права афіцыйна насіць тытул «*sekretarz rękodajny*» [10, арк. 281 адв.–282]. Адносна супрацоўнікаў канцылярый ніжняга ўзроўню такой дакладна прапісанай тэрміналогіі, як і адпаведных прывілеяў, не было, паколькі фармальна іх службовае становішча прынята прывязваць не столькі да дзяржавы ў асобе яе кіраўніка, колькі персанальна да пячатараў, якія вырашалі кадравыя пытанні. Тым не менш, манарх разглядаў (прынамсі, так вынікае з некаторых распараджэнняў) нават ніжэйшы персанал канцылярыі як сваіх непасрэдных падначаленых, якія служаць, найперш, яму і толькі потым Рэчы Паспалітай. Гэта магчыма акрэсліць тагачаснай фразай *«да паслуг нашых і Рэчы Паспалітай»* (пол. – *«do usług naszych y Rzeczypospolitey»*) [8, арк. 728 адв.].

Пры згадванні асоб, якія адносіліся да тэхнічнага персаналу канцылярый, выкарыстоўваўся абмежаваны набор назваў пасад і шаблонаў, якія не заўсёды дазваляюць акрэсліць іх функцыянальныя абавязкі. Да ліку такіх агульных тэрмінаў адносяцца *«канцылярыст»* і *«слуга канцылярыі»*. Аднак яны выкарыстоўваліся даволі рэдка, і ў большасці выпадкаў супрацоўнікі канцылярыі называліся *«пісарамі канцылярыі нашай ВКЛ»*, радзей – *«пісарамі канцылярыі Я(го) К(аралеўскай) М(іласці)»*, альбо проста *«пісарамі канцылярыі нашай»*, як у польскай –

*«pisarz»*, так і ў лацінскай – *«notarius»* формулах. У адносінах да некаторых супрацоўнікаў ужываўся інтэграваны наменклатурны выраз *«слуга і пісар»*, што, відавочна, сведчыла пра сумяшчэнне імі розных функцый у межах працы канцылярый.

***Звесткі пра тэхнічны персанал канцылярыі ВКЛ: 1633–1647 гг.*** У кнігах запісаў Метрыкі ВКЛ нам удалося выявіць інфармацыю пра больш за дзясятак прадстаўнікоў тэхнічнага персаналу канцылярыі часу праўлення Уладзіслава Вазы.

**1. Банажэўскі Самуэль**, пісар (1633–1636 гг.).

14.02.1633 атрымаў дазвол на адсуджванне шэрагу ўладанняў у Віленскім ваяводстве [4, арк. 40 адв.–41].

08.09.1636 разам з Янам Тарасовічам атрымаў дазвол адсуджваць у бяспраўных уласнікаў шэраг уладанняў у Крычаўскім старостве Мсціслаўскага ваяводства [8, арк. 728–729].

**2. Кратовіч Стэфан**, пісар (1633 г.).

26.04.1633 атрымаў дазвол адсуджваць маёмасць у розных асоб у Берасцейскім, Навагрудскім, Троцкім і Віленскім (у Віленскім і Лідскім паветах) ваяводствах [4, арк. 50–50 адв.].

**3. Кісарэўскі Міхал**, слуга (1633 г.).

28.05.1633 атрымаў дазвол на адсуджванне спадчыннай і набытай маёмасці ў Грыгора Пукеня [7, арк. 52 адв.–53].

**4. Т(Ф)уйніцкі Ян**, пісар (1633 г.).

20.07.1633 атрымаў дазвол праз суд прэтэндаваць на два млыны пад *«местам»* Ламазамі [7, арк. 114]. (Магчыма меўся на ўвазе **Ян Таніцкі**, гл. ніжэй).

**5. Таніцкі Ян**, пісар, пазней слуга і пісар (1633–1636 гг.).

05.09.1633 разам з Тэафілам Кендзерскім атрымаў дазвол на падставе кадуковага права на атрыманне маёмасці пасля смерці Паўла Данбровы [7, арк. 184 адв.–185].

13.10.1633 атрымаў ад манарха права на ўласнасць Станіслава Узянецкага ў Віцебскім ваяводстве [7, арк. 207 адв.–208].

07.01.1634 атрымаў дазвол на адсуджванне і пажыццёвае трыманне засценка і абруба лесу ў Гадынскім цівунстве [7, арк. 297–297 адв.].

12.06.1634 паводле кадуковага права атрымаў уласнасць смаленскага *«абывацеля»* Давіда Абрамовіча [7, арк. 389–389 адв.].

27.01.1635 атрымаў дазвол на перадачу Аршанскаму магістрату і *«паспольству»* дзвюх валок зямлі аршанскага *«месцкага»* пісара Фёдара Каладзяжынскага і пляцаў Мікалая Тыдыкуса, якія перайшлі да яго пасля іх смерці [8, арк. 193 адв.].

30.01.1635 атрымаў дазвол на адсуджванне пляца ў Гродна і атрыманне *«заручных»* грошай у справе паміж татарамі Кульзымановічамі [8, арк. 199 адв.].

04.04.1635 атрымаў дазвол на перадачу Магілёўскаму магістрату дзвюх валок зямлі [5, арк. 81 адв.–82].

08.04.1635 атрымаў правы на дзве валокі зямлі пад Оршай пасля смерці аршанскага *«месцкага»* пісара Ф. Каладзяжынскага [8, арк. 386 адв.–387].

07.05.1636 актыкавана прызнанне Яна Таніцкага аб адрачэнні на карысць Стэфана Гікевіча ад кадуковага права на маёмасць смаленскага *«абываценя»* Д. Абрамовіча [9, арк. 35 адв.–36 адв.].

**6. Тарасовіч Ян**, слуга і пісар, пазней толькі пісар (1634–1636 гг.).

09.01.1634 атрымаў дазвол на шэраг валок у Крычаўскай воласці пасля смерці Аляксандра Гарабурды [7, арк. 302–302 адв.].

23.02.1635 атрымаў дазвол на адсуджванне правоў у Яна Шыманоўскага на вёску Нацэвічы Радуньскай дзяржавы Лідскага павета [8, арк. 246–246 адв.].

08.09.1636 разам з С. Банажэўскім атрымаў дазвол адсуджваць у бяспраўных уласнікаў шэраг уладанняў у Крычаўскім старостве Мсціслаўскага ваяводства [8, арк. 728–729].

**7. Шпакоўскі Даніэль**, пісар (1634–1636 гг.).

07.08.1634 атрымаў дазвол на адсуджванне ўладанняў у асоб нешляхецкага стану Пылінскага і Шустрынскага ў Полацкім ваяводстве і любой уласнасці некалькіх абываценяў Мсціслаўскага ваяводства, аб'яўленых «банітамі» (выгнанцамі, пазбаўленымі правоў) [8, арк. 138 адв.–139].

20.10.1634 атрымаў дазвол на адсуджванне ўладання Шыпава Полацкага ваяводства [8, арк. 172 адв.–173].

30.06.1636 атрымаў дазвол праз суд прэтэндаваць на ўсю маёмасць Станіслава Шырвінскага (у тытуле – у Полацкім ваяводстве, а ў тэксце дакумента – па ўсёй дзяржаве) [8, арк. 651 адв.–652].

**8. Кендзерскі Тэафіл**, пісар (1633 г.).

05.09.1633 разам з Я. Таніцкім атрымаў дазвол на падставе кадуковага права на атрыманне маёмасці пасля смерці П. Данбровы [7, арк. 184 адв.–185].

**9. Пашкевіч Ежы**, пісар (1640–1641 гг.).

29.12.1640 атрымаў дазвол на адсуджванне ў Юрыя і Рыгора Астроўскіх у Гарадзенскай эканоміі дзвюх валок зямлі Кавалі, якія належалі *«месту»* Крынскаму [10, арк. 568 адв.].

12.10.1641 атрымаў «лібертацыю» (вызваленне) ад «стацый» (размяшчэння) і шэрагу падаткаў для ўласнага дома ў Мінску [15, арк. 169].

**10. Страхоцкі Стэфан**, пісар (1642 г.).

25.02.1642 атрымаў дазвол на вольную перадачу права на сваё пажыццёвае ўладанне Галубоўскае Віцебскага ваяводства [15, арк. 257 адв.–258].

28.03.1642 атрымаў *«за заслугі перад манархам і Рэччу Паспалітай»* дазвол на дзве валокі зямлі ў Пінскім старостве [15, арк. 336 адв.]. (У дакуменце не пазначана, што Страхоцкі пісар!).

**11. Мантрымовіч Абрам Казімір**, пісар (1641–1647 гг.).

26.02.1641 атрымаў дазвол на перадачу некалькім шляхціцам уладанняў Мянайці, Сартупі і Ядопі, якімі Мантрымовіч карыстаўся пажыццёва ў Палангаўскай воласці на Жамойці [10, арк. 612 адв.–613]. (У дакуменце не пазначана, што Мантрымовіч пісар!).

26.02.1641 атрымаў дазвол на перадачу некалькім шляхціцам уладання Акмелі, якім пажыццёва карыстаўся ў Палангаўскай воласці на Жамойці [10, арк. 613 адв.–614].

26.02.1641 атрымаў дазвол на перадачу некалькім шляхціцам уладання Манцэвічы, якім пажыццёва карыстаўся ў Палангаўскай воласці на Жамойці [10, арк. 614–614 адв.].

26.02.1641 атрымаў дазвол на перадачу некалькім шляхціцам уладання Рубайці, якім пажыццёва карыстаўся ў Палангаўскай воласці на Жамойці [10, арк. 614 адв.–615].

27.03.1643 атрымаў дазвол на адсуджванне 5000 злотых *«зарукі»* ў Маісея Казлакоўскага [11, арк. 200–200 адв.].

05.03.1645 атрымаў шэраг уладанняў, якія знаходзіліся ў бяспраўных трымальнікаў у Віцебскім ваяводстве [16, арк. 162].

06.12.1646 атрымаў правы на ўласнасць Быковічы Мсціслаўскага ваяводства пасля смерці Станіслава Багушэўскага [16, арк. 569–569 адв.].

26.05.1647 атрымаў дазвол на перадачу Ярашу Даніловічу і яго жонцы шэрагу вёсак у Мсціслаўскім ваяводстве, якім пажыццёва карыстаўся пасля смерці Гераніма Станкевіча [18, арк. 84–84 адв.].

**12. Хатольскі-Шапка Казімір**, пісар (1645 г.).

13.09.1645 атрымаў права на *«ўладанні Астроўскія і сяло»* ў Віцебскім ваяводстве пасля смерці Рамана Марцішэвіча [174, арк. 7 адв.].

**13. Некрашэвіч Габрыэль**, пісар (1647 г.).

05.09.1647 атрымаў дазвол на перадачу *«каму пажадае»* маёмасці Галубоўшчына Віцебскага ваяводства, якой пажыццёва карыстаўся [16, арк. 1014–1014 адв.].

**14. Кандратовіч Самуэль**, канцылярыст (1647 г.).

30.05.1647 полацкі харужы Рыгор Корсак Галубіцкі атрымаў ад манарха згоду на перадачу сваіх правоў на пажыццёвае карыстанне шэрагам уладанняў у Троцкім цівунстве і Сумілішскай дзяржаве С. Кандратовічу [16, арк. 906–906 адв.].

Таксама згадваецца, што намінацыю на берасцейскае падстольства **Станіслаў Альбрыхт Садоўскі** атрымаў за паслугі, аказаныя *«на працягу некалькі гадоў у нашай канцылярыі»* [10, арк. 577 адв.–578].

Усе згаданыя супрацоўнікі канцылярыі мелі шляхецкае паходжанне, што адмыслова зафіксавана ў дакументах. Паводле веравызнання, калі зыходзіць з іх імёнаў і прозвішчаў, яны былі каталікамі. Значная іх частка мела карані ў «беларускіх» паветах ВКЛ. З упэўненасцю гэта магчыма сцвярджаць адносна К. Хатольскага-Шапкі, бацька якога Базыль яшчэ 7 лютага 1641 г. быў віцебскім гродскім пісарам [10, арк. 588–588 адв.], а маёмасць, якую ён атрымаў ад манарха ў 1645 г., знаходзілася якраз у Віцебскім ваяводстве [17, арк. 7 адв.]. Пазней, у 1648 г., К. Хатольскі-Шапка падпісаў элекцыю Яна Казіміра ад Віцебскага павета [33, s. 108]. Іншы службовец канцылярыі, *«шляхетны»* Д. Шпакоўскі, настойліва збіраў маёмасць у Полацкім ваяводстве, што відаць па трох выдадзеных яму ў 1634–1636 гг. дакументах. Магчыма, невыпадкова Я. Тарасовіч два разы атрымаў *«добры»* ў Мсціслаўскім ваяводстве – у Крычаве і Крычаўскім старостве ў 1634–1636 гг. [7, арк. 302–302 адв.; 8, арк. 728–729], хаця значна раней (25 красавіка 1625 г.) ён, як слуга канцылярыі, атрымаў маёмасць у Полацкім і Гродзенскім паветах [2, арк. 363–363 адв.]. Яшчэ адзін супрацоўнік канцылярыі, Е. Пашкевіч, меў ад свайго бацькі дом у Мінску і адбудаваў яго пасля пажару [15, арк. 169]. Вызначыць паходжанне астатніх пісараў канцылярыі ВКЛ, за выключэннем жамойта А.К. Мантрымовіча, вельмі цяжка. Той жа Я. Таніцкі, напрыклад, атрымліваў маёмасць ледзь не па ўсёй тэрыторыі ВКЛ: у Оршы, Гродне, Віцебскім ваяводстве, Лідскім павеце і г. д.

Неабходна таксама звярнуць увагу на той факт, што яшчэ ў кнігах запісаў Метрыкі за 1623–1632 гг. фіксуецца значная колькасць разнастайных пажалаванняў менавіта супрацоўнікам канцылярыі ВКЛ ці ёсць згадкі пра іх. Амаль ва ўсіх гэтых дакументах яны называліся слугамі, у адрозненне ад часу Уладзіслава Вазы, калі пажалаванні атрымлівалі, паводле крыніц, пісары ці, радзей, слугі і пісары ў адной асобе. Так, толькі ў кнігах запісаў №№ 100 і 102, адпаведна за 1623–1627 і 1627–1631 гг., маецца больш за два дзясяткі дакументаў, дзе згадваюцца слугі і асобы, якія працавалі ў канцылярыі ВКЛ [2; 3]. З тых супрацоўнікаў канцылярыі, якія атрымалі дакументы на маёмасць ад Жыгімонта Вазы ў 1623–1632 гг., ніводзін, акрамя Я. Тарасовіча, пачынаючы з 1633 г. не меў новай маёмасці ад Уладзіслава Вазы.

У Метрыцы ВКЛ захаваліся таксама звесткі пра наданне маёмасці службоўцам канцылярыі Каралеўства Польскага. Так, 8 мая 1633 г. пісару кароннай канцылярыі Станіславу Данбовічу была пацверджана даніна на сёлы ў Кобрынскім старостве, атрыманая яшчэ 7 лютага 1632 г. [4, арк. 165–165 адв.], а 1 ліпеня 1633 г. манарх дазволіў Ваўрынцу Мантрымовічу, слугу кароннай канцылярыі, *«даходзіць правам»* маёмасць у Жамойці [4, арк. 455 адв.–456]. Такія пажалаванні не з’яўляюцца выпадковасцю і хутчэй за ўсё сведчаць аб паходжанні гэтых пісараў, тым

больш, што вядома пра шматэтнічны склад супрацоўнікаў кароннай канцылярыі, ніжэйшы персанал якой мог пераходзіць у канцылярыю ВКЛ [23, s. 151]. Пра інтэгральны характар канцылярскага абслугоўвання кіраўніка Рэчы Паспалітай сведчыць распараджэнне ад 7 снежня 1633 г. аб выплаце менавіта са скарбу ВКЛ пажыццёвага ўтрымання памерам 200 злотых *«перакладчыку і пісару нашаму арабскаму»* Сулейману Рубаю [7, арк. 274].

Як сведчаць дакументы, супрацоўнікі канцылярыі выконвалі не толькі свае непасрэдныя (мірныя) абавязкі. Яшчэ ў час Жыгімонта Вазы слугі канцылярыі ВКЛ Ян Цівінскі і Ян Дукшта былі адзначаны наданнямі за ўдзел у ваенных экспедыцыях [2, арк. 361–361 адв.; 3, арк. 174]. Сярод пісараў канцылярыі ВКЛ, згаданых у кнігах запісаў у час праўлення Уладзіслава Вазы, толькі адносна Д. Шпакоўскага агаворваецца ў лісце ад 30 чэрвеня 1636 г. на *«даходжанне правам»* маёмасці ў Полацкім ваяводстве, што ён у мірны час служыў у канцылярыі, а ў Інфлянцкую кампанію ваяваў у харугве віцебскага ваяводзіча Яна Уладзіслава Сангушкі [8, арк. 651 адв.–652].

***Канцылярская служба як крыніца прыбытку.*** Праца ў канцылярыі ВКЛ – установе, якая сачыла за цыркуляцыяй уласнасці і займалася афармленнем дакументаў на яе, – давала як пэўны заробак, так і адносна надзейныя гарантыі яго павялічыць. Зарабіць магчыма было рознымі спосабамі, у тым ліку несумленна. Цікавым сведчаннем грашовых адносін у канцылярыях ВКЛ з'яўляецца датаваны 7 лютага 1646 г. ліст да віцебскага ваяводы Крыштафа Кішкі ад яго слугі Базыля Хатольскага-Шапкі, віцебскага гродскага пісара, дзе апошні, са словаў свайго сына, паведамляў, што віцебскія мяшчане давалі немалую суму метрыканту падканцлера, каб той не пячатаў прывілея для К. Кішкі на маставое ў Віцебску [21, s. 42].

Валоданне інфармацыяй было галоўным козырам канцылярыстаў. Яны былі бліжэй да манарха і паспявалі выпрасіць у яго нейкую маёмасць ці крыніцу прыбытку. Нават шараговы пісар канцылярыі меў шанец палепшыць свой дабрабыт. Адным з найбольш папулярных спосабаў з'яўляліся просьбы аб атрыманні ці адсуджванні ўласнасці. Самай простай была сітуацыя з вымарачанай маёмасцю, на якую не было прэтэндэнтаў, але такія выпадкі былі рэдкасцю, і амаль заўсёды права ўласнасці належала адсуджваць у адпаведнасці з неабходнымі працэдурамі, а часам і адмаўляцца ад сваіх прэтэнзій, як гэта мела месца з уласнасцю армяніна Давідовіча, якую спрабаваў адсудзіць Ян Таніцкі [9, арк. 35 адв.–36 адв.]. Супрацоўнікі канцылярыі ў гэтым сэнсе былі даволі ардынарнымі асобамі, якія карысталіся агульнадаступнымі спосабамі падзарабіць і не грэбавалі ўсімі магчымымі пралікамі сваіх суграмадзян, нават самага высокароднага паходжання. Так, слуга кан-

цылярыі ВКЛ М. Кісарэўскі падчас знаходжання 28 мая 1633 г. Уладзіслава Вазы ў Гродна выпрасіў дазвол праз суд забраць у свае рукі земскую маёмасць шляхціца Грыгора Пукеня на той падставе, што той парушыў *«даўняе паспалітае права»* і, пераехаўшы ў Вільню, пачаў займацца гандлем нароўні з мясцовымі мяшчанамі і купцамі, што шляхціцу было катэгарычна забаронена [7, арк. 52 адв.–53]. Маштабы і геаграфія такіх судовых прэтэнзій часам былі дастаткова паказальнымі. Так, пісар С. Банажэўскі сабраў звесткі пра ўладанні розных асоб у трох паветах Віленскага ваяводства, каб выпрасіць у 1633 г. у манарха дазвол на юрыдычнае пераафармленне гэтай маёмасці на сваё імя [4, арк. 40 адв.–41], а С. Кратовіч, *«пісар канцылярыі нашай ВКЛ»*, атрымаў на падставе аднаго прывілея ў 1633 г. права адсуджваць розныя ўладанні ажно ў чатырох ваяводствах [7, арк. 50–50 адв.]. На акумуляцыю такой інфармацыі патрабаваўся час, а на рэалізацыю – значныя сродкі. У своеасаблівы бізнес ператварыў працу ў канцылярыі яе супрацоўнік Я. Таніцкі. Яму ўдалося ў розны час атрымаць ад Уладзіслава Вазы каля дзясятка разнастайных дазволаў, якія можна было канвертаваць у даволі значныя сумы. Адбывалася гэта не ў абыход, а пры спрыянні манарха, які такім чынам стымуляваў сваіх найбольш адданых супрацоўнікаў, што нават спецыяльна падкрэслівалася ў дакументах выразам *«жадаючы яшчэ больш узнагародзіць»*. Менавіта так была сфармулявана матывіроўка ў дазволе Я. Таніцкаму ад 30 студзеня 1635 г. на адсуджванне пляца Шафараўшчына ў самым цэнтры Гродна ля Фарнага касцёла і атрыманне так званай «віны» памерам у 5000 коп літоўскіх грошаў у судовым працэсе паміж гродзенскімі татарамі [8, арк. 199 адв.].

Праца ў канцылярыі сама па сабе аўтаматычна не азначала, што яе супрацоўнік абавязкова атрымае значнае наданне ад манарха. Падставамі для матэрыяльнай падтрымкі канцылярыстаў былі якасць і працягласць працы, што спецыяльна адзначалася ў манаршых распараджэннях. Менавіта за доўгую працу атрымалі наданні С. Банажэўскі ў 1633 г., Д. Шпакоўскі ў 1634 г., Я. Тарасовіч у 1636 г., Е. Пашкевіч у 1640 г., К. Хатольскі-Шапка ў 1645 г. Найбольш красамоўна гэта формула адлюстравана ў дакуменце, выдадзеным Я. Таніцкаму 7 студзеня 1634 г., дзе адзначалася, што ён *«паспяхова ў нашых канцылярыях з даўніх часоў з выключнай вернасцю, працавітасцю і нястомнасцю служыў і зараз не спыняе працу пры нашай асобе падчас гэтай Маскоўскай экспедыцыі»* [7, арк. 297–297 адв.]. Не апошнюю ролю адыгрывалі і рэкамендацыі кіраўніка канцылярыі, але гэта даволі рэдка фіксавалася ў дакументах. Бадай, выключэннем стала адзнака аб асабістай рэкамендацыі вялікага канцлера ВКЛ Альбрыхта Станіслава Радзівіла для выдачы прывілея С. Банажэўскаму ў лютым 1633 г. [4, арк. 40 адв.–41].

Цяжка сказаць, наколькі такі спосаб матэрыяльнага забеспячэння канцылярыстаў адпавядаў іх выдаткам: знаходжанне пры каралеўскім двары, які працяглы час знаходзіўся ў Варшаве, само па сабе патрабавала значных сродкаў.

Апрача матэрыяльных прыбыткаў, праца ў канцылярыі давала пэўныя кар'ерныя перспектывы, але для большасці звычайных пісараў такі сацыяльны ліфт быў маладаступным. Магчымым варыянтам была кар'ера ў павеце, але вядомы толькі адзін выпадак, калі павятовы ўрад быў дадзены з улікам заслуг у канцылярыі: берасцейскае падстольства было нададзена С.А. Садоўскаму [10, арк. 577 адв.–578]. Відавочна, што здолеў прайсці вышэй па службовай лесвіцы і К. Хатольскі-Шапка, які ў 1650 г. атрымаў урад войскага Віцебскага павета [19, арк. 319–320]. Некаторым супрацоўнікам канцылярыі ўдавалася дасягаць пэўнага росту ў іншых дзяржаўных установах, у тым ліку ў Скарбе, як гэта атрымалася ў Я.К. Пашкевіча, першапачаткова слугі канцылярыі ВКЛ [1, с. 150–152].

Здзяйсненні вялікіх немагчымыя без працы шараговых працаўнікоў, памяць пра якіх доўга не захоўваецца, але часам самі вынікі іх дзейнасці дазваляюць аднавіць забытыя імёны. Так, толькі матэрыялы кніг запісаў Метрыкі ВКЛ за 1633–1648 гг. захоўваюць разнастайныя звесткі пра паўтара дзясятка канцылярыстаў, якія выконвалі чарнавую працу для забеспячэння функцыянавання дзяржавы. Асобна варта адзначыць, што нават у надзвычай падрабязным паводле свайго зместу дзённіку канцлера ВКЛ А.С. Радзівіла не згадваюцца імёны яго падначаленых, якія сустракаюцца ў Метрыцы ВКЛ [29; 30]. Ніжэйшы штат супрацоўнікаў папаўняўся з дробнай шляхты, у тым ліку з беларускіх паветаў ВКЛ. У час праўлення Уладзіслава Вазы матэрыяльную падтрымку атрымалі як пісары, якія служылі яшчэ пры Жыгімонце Вазе, так і новыя. Узнагарода манарха за дзяржаўную службу – галоўным чынам, гэта былі зямельныя ўладанні і рухомая маёмасць – грунтавалася на якаснай і адданай працы супрацоўнікаў на працягу доўгіх гадоў.

## Крыніцы і літаратура

1. Галубовіч, В. Ян Казімір Пашкевіч: Паэт на мяжы культур // Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.). – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 149–153.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 100. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1623–1627 гг. – 512 арк.
3. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 102. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1627–1631 гг. – 497 арк.

4. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 106. – Прывілеі, пажалаванні і дэкрэты Уладзіслава IV. 1633 г. – 646 арк.
5. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 107. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1633–1641 гг. – 393 арк.
6. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 109. – Кніга запісаў меншай канцылярыі. 1633 г. – 47 арк.
7. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 110. – Кніга запісаў меншай канцылярыі. 1634–1635 гг. – 539 арк.
8. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 111. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1634–1636 гг. – 737 арк.
9. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 112. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1635–1639 гг. – 194 арк.
10. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 113. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1637–1641 гг. – 683 арк.
11. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 114. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1640–1645 гг. – 847 арк.
12. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 115. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1641–1645. – 415 арк.
13. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 116. – Прывілеі і дэкрэты інфлянцкія і курляндскія. 1643–1644 гг. – 49 арк.
14. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 117. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1641–1643 гг. – 104 арк.
15. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 118. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1638–1643 гг. – 528 арк.
16. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 119. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1645–1647 гг. – 1004 арк.
17. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 121. – Прывілеі, пажалаванні і пацвярджэнні. 1645–1648 гг. – 271 арк.
18. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 122. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. 1646–1648 гг. – 158 арк.
19. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 124. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. 1649–1650 гг. – 326 с.
20. Описание книг и актов литовской метрики / Сост. С. Пташицкий. – Санкт-Петербург : Типография Правительствующего Сената, 1887. – 288 с.
21. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dział V. Sygn. 2141. – Лісты Базыля Хатольскага Шапкі за 1639–1646 гг. – 43 арк.
22. Czapliński, W. Pac Stefan // Polski słownik biograficzny. –T. XXIV. – Wrocław etc. : Ossolineum, 1979. – S. 748–749.
23. Krawczuk, W. Pisarze kancelarii koronnych Zygmunta III Wazy // Studia Historyczne. – 1993. – R. XXXVI. – Z. 2 (141). – S. 149–164.
24. Lulewicz, H. Pac Jan Kazimierz // Polski słownik biograficzny. – Wrocław etc. : Ossolineum, 1979. – T. XXIV. – S. 699–701.

25. Nagielski, M. Sapieha Paweł Stefan // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa–Kraków : Ossolineum, 1994. – S. 133–138.
26. Perdenia, J. Gosiewski Krzysztof Korwin // Polski słownik biograficzny. – T. VIII. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1959–1960. – S. 342–343.
27. Przyboś, A. Radziwiłł Albrycht Stanisław // Polski słownik biograficzny. – T. XXX. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1987. – S. 143–148.
28. Rachuba, A. Sapieha Kazimierz Leon // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa–Kraków : Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk; Fundacja na rzecz Nauki Polskiej 1994. – S. 31–37.
29. Radziwiłł, A.S. Pamiętniki o dziejach w Polsce. – T. 1. – Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1980. – 572 s.
30. Radziwiłł, A.S. Pamiętniki o dziejach w Polsce. – T. 2. – Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1980. – 555 s.
31. Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. – Kórnik : Biblioteka Kórnicka, 1994. – 255 s.
32. Wasilewski, T. Isajkowski Dolmat Franciszek // Polski słownik biograficzny. – T. X. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1962–1964. – S. 170.
33. Volumina Legum. – T. IV. – Petersburg : Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – 520 s.
34. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Ksęstwa Litewskiego 1386–1795. – Kraków : Druk. Wł. Anczyca i Spółki, 1885. – 351 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.06.2022

*Я. С. Глінскі*

## Пераход баяр на зямянскую службу ў Слуцкім і Капыльскім княствах у канцы XVI – XVII ст.

У канцы XVI – пачатку XVII ст. структура служылага насельніцтва ў Слуцкім і Капыльскім княствах заставалася традыцыйнай – дзве яго асноўныя групы складалі зямяне (ваенныя службоўцы) і баяры (асобы, адказныя за транспартаванне грузаў і карэспандэнцыі) [6, с. 48–51; 24, арк. 6–7 адв.; 47, k. 64–67][1]. У гістарыяграфіі зямяне

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку генеалогу і нашчадку слуцкіх зямян Івану Зяневічу (г. Кіеў, Украіна) за зварот увагі на асобныя важныя дакументы па тэме, а таксама

лічацца залежнай ад землеўласнікаў шляхтай, а баяры – як путныя, так і панцырныя[2] – разглядаюцца як прадстаўнікі сялянскага саслоўя [6, с. 31–32]. Пры гэтым ужо ў апошняй чвэрці XVI ст. на Случчыне і Капыльшчыне частка баяр дасягнула зямянскага статусу. Даследаванне працэсу пераводу баяр на зямянскія павіннасці ў гэты перыяд мае істотнае значэнне для вывучэння структуры насельніцтва буйных магнацкіх (княжацкіх і панскіх) латыфундый, адлюстравання асаблівасцей фарміравання зямянскай супольнасці ў іх.

Так, у 1578 г. згадваліся панцырныя баяры сяла Прошчыцы[3] Багдан Сіткевіч, Лукаш Казаковіч, Леў Федаровіч і Ян Янкоўскі, пры гэтым яны мелі ўласных падданых. Паводле інвентара Слуцкага княства ад 1600 г., прадстаўнікі гэтых родаў ужо лічыліся зямянамі, падобны статус іх нашчадкі захавалі і надалей [24, арк. 6–7; 27, арк. 505 адв.; 48, k. 239–242, 244–247]. Верагодна, у канцы XVI ст. статус прошчыцкіх баяр быў павышаны да зямянскага. Магчыма, на гэта паўплывала наяўнасць у іх падданых. Аднак змяненне статусу баяр, якія мелі падначаленых сабе сялян, у гэты час не было паўсюдным. Машчыцы (Машчыцкія) у 1566 г. трымалі некалькі службаў сялян, але ў 1600 г. Сямён Машчыц па-ранейшаму адносіўся да баяр Іванскага двара [24, арк. 7 адв.; 47, k. 64].

Фактычная адсутнасць выразнага адрознення зямян ад баяр (як прадстаўнікоў сялянскага стану) у Слуцкім і Капыльскім княствах праяўлялася і ў тым, што на службе ў якасці панцырных баяр аказваліся асобы, якія мелі шляхецкае паходжанне. Па стане на 1565 г. панцырнымі баярамі ў сяле Вужа былі шматлікія Карбутовічы (Корбуты) [48, k. 324–325], якія несумненна паходзілі са слонімскай шляхты[4]. У 1532 г. Пётр Корбут атрымаў прывілей караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога на пустаўшчыну Брыкаўскую з адным падданым, у 1538 г. той самы Пётр паступіў на службу да князя Юрыя I Сямёнавіча Алелькавіча і атрымаў зямлю на рацэ Вужа (пазней аднайменны засценак). Корбутаў няма ў пераліках зямян ні ў 1566, ні ў 1600 гг. Тым не менш, пэўная супярэчнасць паміж іх статусам панцырных баяр і паходжаннем з павятовай шляхты адчувалася ўжо ў XVI ст. У 1548 г. слуцкі князь Юрый II Юр'евіч Алелькавіч накіраваў ліст баславіцкаму на-

карысныя парады і заўвагі.

[2] За перавозку грузаў адказвалі менавіта путныя (інакш лістоўныя) баяры, панцырныя баяры прыцягваліся да павіннасцей ваеннага характару, што набліжала іх да зямян. Але ў Слуцкім і Капыльскім княствах напрыканцы XVI ст. паміж панцырнымі і путнымі баярамі фактычна не было істотнай розніцы, баяры на Случчыне ў гэты час выконвалі, перш за ўсё, лагістычныя абавязкі.

[3] Прошчыцы лічыліся сялом путных баяр і раней [47, k. 65].

[4] У Слонімскім павеце шляхціцы Корбуты валодалі зямлёй у маёнтку Вішава [34, арк. 52–52 адв.].

месніку аб непрымушэнні Карбутовічаў да выканання лістоўнай павіннасці, бо яны належаць да шляхты [35, арк. 351–352 адв., 473–473 адв.]. Аднак, відавочна, што яго загад не даў трывалага эфекту, Корбуты яшчэ працяглы час не лічыліся зямянамі-шляхтай.

Калі для больш ранняга перыяду зафіксавана няшмат прыкладаў дасягнення баярамі зямянскага статусу, то ў XVII ст. працэс іх пераводу на становішча зямяне стаў даволі інтэнсіўным. Ужо адзначалася, што ў XVI ст. жыхары засценка Вужа (маёнтак Грозаў) фігуравалі як панцырныя баяры. Маёнтак Грозаў на працягу доўгага часу знаходзіўся ў застаўным валоданні прадстаўнікоў роду Валадковічаў[5]. У 1648 г. мясцовыя баяры звярнуліся да адміністратара Слуцкага княства, віленскага падстолія Яна Сасноўскага з просьбай вывесці іх з-пад падпарадкавання Валадковічам. Хадайніцтва было задаволена, баяры ўнеслі 1500 злотых у якасці кампенсацыі іх павіннасцей і былі пераведзены на зямянскую службу. Нягледзячы на гэта, баярамі жыхары Вужы называліся яшчэ ў пачатку 1660-х гг. – у інвентары маёнтка Грозаў, датаваным 1663 г. [36, арк. 3 адв. –4, 48, k. 323–324]. Падобная сітуацыя назіралася ў сяле Млынка, якое адносілася да двара Прусы. У 1644 г. той жа Ян Сасноўскі выдаў ліст мясцовым жыхарам з вызваленнем ад усіх павіннасцей, апрача паконшчыны (грашовага эквіваленту зямянскай ваеннай службы). Тым не менш, у першым пасляваенным інвентары яны фігуравалі як баяры [29, арк. 558–559 адв.; 39, арк. 21–24]. Што датычыцца Вужы, то тут назіралася своеасаблівая тэрміналагічная «інерцыя», калі папярэдняе сацыяльнае найменне захоўвалася яшчэ пэўны час. У млынкаўскіх баяр сітуацыя была складаней. У інвентары ад 1667 г. адзначалася, што яны як баяры павінны плаціць большы чынш (трыццаць злотых супраць шасці для зямян). Гэта тлумачылася тым, што на той момант яны па нейкіх прычынах не прад'явілі ліст Яна Сасноўскага аб пераводзе іх на зямянскую службу, таксама сцвярджалася, што сярод жыхароў сяла няма асоб, здатных да выканання ваеннай службы [39, арк. 21]. Відавочна, што Млынка істотна пацярпела падчас вайны 1654–1667 гг. Але ў далейшым за жыхарамі і Вужы, і Млынкі стала замацаваўся статус зямян. Больш за тое, былыя грозаўскія баяры (Грынцэвічы, Жоўрыды, Асяеўскія) пазначалі сябе зямянамі ўжо ў канцы 1640-х – пачатку 1650-х гг. [17, арк. 50–51, 78–79].

У выпадку баяр Вужы і Млынкі адбыўся калектыўны перавод жыхароў на зямянскую службу. Маглі назірацца і індывідуальныя варыянты

[5] Валадковічы самі ў XVI ст. належалі да зямян князёў Алелькавічаў. Уваходзячы ў вярхі іх служэбнікаў, яны паступова замацаваліся ў шэрагах трымальнікаў (застаўных і пажыццёвых) асобных маёнткаў і фальваркаў Слуцкага і Капыльскага княстваў (пра Валадковічаў гл.: [42, с. 316, 323, 329]).

такіх пераходаў. У 1611 г. Нерановічы (напэўна, баяры з Вужы) атрымалі ўрочышча Селішча Зажэўскае (маёнтак Пагост). У 1615 г. жыхару сяла Машчыцы Івану Машчыцу была нададзена пустаўшчына Цыганоўшчына ў тым жа маёнтку Пагост. У дакументах іх адрасаты выступалі як зямяне, але адзначалася, што яны вызваляюцца ад лістоўнай павіннасці [48, k. 276, 286–287; 49, k. 37–39, 43–44]. Перад намі прыклады таго, як былыя баяры ператвараліся ў зямян пасля атрымання зямлі, з якой прадугледжвалася нясенне менавіта зямянскай службы.

Верагодна, баярамі ў больш ранні перыяд з'яўляліся жыхары засценка Клешаў (Баславіцкі двор). Іх пераход на выключна зямянскую службу быў расцягнуты ў часе. У 1607 г. яны былі выведзены Янушам Радзівілам з-пад юрысдыкцыі застаўных трымальнікаў Баславічаў – згаданых вышэй Валадковічаў. Пры гэтым адзначалася, што клешаўскія зямяне вызваляліся ад неўласцівых павіннасцей, накладзеных на іх Валадковічамі. Тым не менш, у 1654 г. клешаўцы вымушаны былі звярнуцца да сына Януша Багуслава Радзівіла са скаргамі, што адміністрацыя прымушае іх не толькі да выплаты паконшчыны, але і да дастаўкі грузаў, а таксама карэспандэнцыі. Гэта пацвярджаецца інвентаром ад 1642 г., у якім паказана, што жыхары засценка *«з лістамі ездзіць павінны»*. У выніку Багуслаў Радзівіл яшчэ раз дакументальна замацаваў іх перавод выключна на паконшчыну [7, арк. 309 адв.; 48, k. 309; 49, k. 101–102]. Згадванне лістоўнай службы ў дадзеным выпадку даволі характэрна. Хутчэй за ўсё, Валадковічы, сярод іншага, прыцягвалі клешаўцаў менавіта да яе. Такім чынам, дастаўка карэспандэнцыі, якая з'яўлялася «памяццю» пра іх баярскія карані, была актуальнай для жыхароў Клешава нават у сярэдзіне XVII ст. Сярод іншага, баярамі жыхары Клешава называліся і ў недатаваным спісе мясцовасцей Слуцкага княства, які, верагодна, быў складзены ў 1640-я гг. [46, k. 265][6].

Яшчэ адным сведчаннем баярскага паходжання была амаль поўная адсутнасць у клешаўскіх зямян ранніх (да часу пераводу на зямянскую службу) дакументаў на зямельныя трыманні. З улікам таго, што зямяне нярэдка аказваліся ўцягнутымі ў працэсы аб «нагане» (прысвойванні) шляхецтва, а таксама з-за неабходнасці падаваць доказы свайго паходжання падчас рэвізій, што ладзіліся радзівілаўскай адміністрацыяй, былым баярам прыходзілася выкарыстоўваць фальсіфікаты. У 1696 г. прадстаўнікі роду клешаўскіх зямян Самуэль, Андрэй і Матэвуш Сыцькі падалі ў Слуцкі замкавы суд прывілей, нібыта выдадзены[7] князем

---

[6] Пры гэтым у іншым дакуменце сярэдзіны 1640-х гг. яны ўжо называліся зямянамі [25, арк. 5].

[7] Дакумент быў пададзены ў выглядзе выпісу з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ, у ім гадавая дата прастаўлена не была.

Юрыем Алелькавічам іх продку Самойлу Васільевічу Сыцьку, а таксама Паўлу Сенькавічу на два «кані» (каля 10 валок) на наступных умовах: *«онъ, Самоило, не мает нияких служобъ служыти и мостовъ не мостить, а замковых роботъ не робити, одъно конемъ земяньскимъ ку посполитое потребе моее служыти маетъ ы могъчы будет»* [32, арк. 31–32 адв.]. Дадзены прывілей павінен быў пацвярджаць не толькі зямянскі характар павіннасцей Сыцькаў, але і іх шляхецкі радавод – Самойла ў ім называўся *«зямянінам гаспадарскім»* Навагрудскага ваяводства[8]. Дакумент не фігураваў у матэрыялах больш ранніх зямянскіх рэвізій, апрача таго, князь Юрый пазначаны ў ім як «Юрый Алелька», у той час як у рэчаіснасці слуцкія князі карысталіся патранімічнай адсылкай у іншай форме – «Алелькавіч». Нарэшце, у інвентары ад 1642 г. клешаўскія Сыцькі яшчэ паказаны як Сідзькевічы (Сіткевічы) [7, арк. 309 адв.], такім чынам, яны былі родзічамі згаданых вышэй прошчыцкіх панцырных баяр, а ў XVI ст. прозвішча ў форме «Сыцька» наогул не выкарыстоўвалі.

Яшчэ адныя карэнныя жыхары Клешава[9] – Карповічы – таксама не маглі пахваліцца старадаўнімі родавымі прывілеямі, таму вымушаны былі звяртацца да сумнеўнага «радаводу», з якога вынікала, што яны былі паўнапраўнай шляхтай, а перад тым, як стаць зямянамі ў Баславічах і суседнім маёнтку Старыца, паспелі пажыць на тэрыторыі Нясвіжскай ардынацыі [18, арк. 1–2 адв.][10]. Усё гэта малаверагодныя звесткі.

У выпадку Яльніцкіх працэс атаясамлівання са шляхтай прайшоў два этапы. Спачатку, у 1661 г., яны падалі скаргу аб страце падчас ваенных дзеянняў сямейных папер, але сярод іх згадвалі толькі дакументы, звязаныя з засценкам Клешаў (сярод іншага, на наданне зямлі ў ім князямі Алелькавічамі). У 1666 г., відавочна, з мэтай пацвярджэння свайго шляхецтва, падчас зямянскай рэвізіі Яльніцкія ўжо не рабілі акцэнт на сваіх мясцовых каранях, а апелявалі да сумнеўнага паходжання з рэчыцкай павятовай шляхты [16, арк. 12 адв.–13; 32, арк. 40–40 адв.].

У Капыльскім княстве інвентар ад 1638 г. зафіксаваў не толькі зямян, але і баяр, пры гэтым не падзяляў іх паміж сабой. Гіпатэтычна вылучыць баяр з агульнага спіса магчыма на падставе таго, што ў дачыненні да некаторых людзей у інвентары не выкарыстана слова «пан». Верагодна, менавіта яны паходзілі з баярскага асяроддзя. Затым, аднак,

---

[8] Гэта значыць прадстаўніком паўнапраўнай павятовай шляхты.

[9] Марцін Карповіч названы жыхаром Клешава ўжо ў 1623 г. [1, с. 266].

[10] Вітальд Сянкевіч меркаваў, што ў Баславічы Карповічы маглі прыбыць з Койданаўскага маёнтка, дзе пражываў аднайменны зямянскі род [53, s. 124–125]. Такі варыянт выключаць нельга, але больш верагодна, што гэта два не звязаныя паміж сабой роды, у выпадку якіх назіралася простае супадзенне распаўсюджанага прозвішча, утворанага ад імені.

даўнія капыльскія зямяне і баяры зліліся ў адну павіннасную групу [8, арк. 122–123, 205 адв.–206 адв.][11].

Некалькі больш рэльефна адрозненні паміж зямянамі і баярамі ў сярэдзіне XVII ст. былі выражаны ў асобнай частцы Капыльскага княства – маёнтку Старыца. У адпаведнасці з інвентаром ад 1646 г. старыцкія зямяне жылі ў сёлах Кандратавічы і Грывец. Баяры ж пераважна ў шэрагу невялікіх населеных пунктаў – засценках. Асноўнай павіннасцю зямян з'яўлялася ваенная служба, пры адсутнасці неабходнасці ў ёй яны выплочвалі паконшчыну. Ваеннай службы тутэйшыя баяры не адбывалі, але плацілі такі ж грашовы збор, як і зямяне. Абавязкам, які аддзяляў іх як ад зямян, так і ад сялян, была выдача мёду [10, арк. 329, 331–332, 332 адв.–333 адв., 335–335 адв.]. У пасляваенных інвентарах падзел на зямян і баяр ужо не прасочваўся, аднак асаблівасці павіннаснага статусу былых баяр захоўваліся, перадусім, яны па-ранейшаму выдавалі мядовую даніну («палавінны мёд»). Гэта баярскае «адрозненне» захоўвалася да пачатку XVIII ст., затым зямяне і былыя баяры канчаткова зраўнаваліся ў сваіх абавязках.

Асобна спынімся на гісторыі яшчэ некалькіх паселішчаў, якія ў першай палове XVII ст. працягвалі пэўны час лічыцца баярскімі – Машчыцы (Іванскі двор) і Касынічы (Старчыцкі двор). Адносна Машчыцаў сведчанні супярэчлівыя. У 1600 г. вядомыя па больш позніх інвентарах яго жыхары Машчыцкія і Свінкі (Свінчычы) пазначаны баярамі, таксама баярамі названы некаторыя жыхары сяла Машчыцы (Іван Лобак-Бараноўскі, Логвін Пятровіч, Яцук Свінка) у судовым працэсе ад 1644 г. У той жа час інвентар ад 1654 г. называе ўсіх жыхароў сяла зямянамі [1, с. 337–338; 24, арк. 7 адв.; 37, арк. 36 адв.–37][12]. Верагодна, сяло Машчыцы, як і згаданыя вышэй Вужа і Млынка, было пераведзена на зямянскую павіннасць у 1640-я гг. Цікава, аднак, што ў 1654 г. у ім пражывалі прадстаўнікі несумненна зямянскіх сямей, перш за ўсё, Вечары і Хаўстовічы [12, арк. 548 адв.; 21, арк. 12–12 адв., 15, 21 адв.; 37, арк. 36 адв.–37][13]. Не выключана, што ў больш ранні перыяд частка сяла знаходзілася на зямянскай, а частка – на баярскай павіннасці. Пры гэтым у інвентары ад 1669 г. за машчыцкімі зямянамі захаваўся абавязак

---

[11] Але падзел на «паноў» і тых, хто так не называўся, існаваў у Капыльскім маёнтку нават у 1660-я гг. [9, арк. 60–64 адв.].

[12] Пры гэтым, калі ў 1689 г. у Слуцкі замкавы суд было ўнесена рашэнне Іванскага дворнага суда ад 1626 г., жыхары Машчыцаў былі ў ім названы зямянамі [26, арк. 148–149 адв.]. Верагодна, гэта прыклад мэтанакіраванай праўкі тэксту дакумента з мэтай «устаражытніць» зямянскі радавод нашчадкаў машчыцкіх баяр.

[13] Абодва роды пазначаны ў інвентары ад 1600 г. як зямяне. Вечары належалі да даўніх слуг князёў Алелькавічаў [4, с. 292–298; 24, арк. 6 адв.; 42, с. 323; 47, k. 165].

дастаўкі карэспандэнцыі, г. зн. перажыткі баярскага статусу яшчэ прысутнічалі [38, арк. 24][14].

Сяло Касынічы было пераведзена з лістоўнай павіннасці на зямянскую службу ў 1626 г.[15] У адпаведным дакуменце, выдадзеным радзівілаўскімі камісарамі, перавод быў матываваны адсутнасцю неабходнасці ў вялікай колькасці путных (лістоўных) баяр у Старчыцкім маёнтку. Замест абавязку дастаўляць карэспандэнцыю мясцовыя жыхары пераводзіліся на паншчыну, таксама яны маглі прыцягвацца да выканання ваеннай павіннасці [48, k. 301; 49, k. 4].

Спісы насельніцтва Касынічаў на момант іх пераводу з лістоўнай на зямянскую павіннасць не захаваліся. Але роды, якія адносіліся да найбольш старажытнай, несумненна баярскай яго часткі, высвятляюцца рэтраспектыўна: на падставе назваў пяцівалочных частак сяла – «коней», якія вядомы з больш позніх інвентароў, калі Касынічы ўжо фігуравалі як зямянскае паселішча. Назвы «коней» утвараліся ад прозвішчаў (або патронімаў) асоб, якім некалі гэтыя надзелы былі нададзены. У інвентары маёнтка Старчыцы ад 1666 г. у Касынічах фіксаваліся «коні» Шчацінаў, Сеўрукаў, Кунцэвічаў, Бялькевічаў, Корзунаў, Смолічаў, Чарнышэвічаў, Ральцэвічаў, Наскоўскіх, Брадкоўскіх (Браткоўскіх), Яроцкіх і Клячанінаў [41, арк. 82–85].

Як і ў выпадку клешаўскіх баяр-зямян, колішнія баярскія роды з Касынічаў ужо ў XVII–XVIII стст. адчувалі неабходнасць у дакументальным пацвярджэнні свайго нядаўна набытага зямянскага статусу. Напрыклад, Сеўрукі мелі ў распараджэнні глейт Жыгімонта III Вазы ад 1588 г., нібыта выдадзены ўладальніку (!) маёнтка Касынічы Якаву Сеўруку [11, арк. 472 адв.–473; 13, арк. 310 адв.–311]. Натуральна, што гэта падробка. Большую цікавасць выклікае ліст князя Юрыя II Алелькавіча ад 1575 г. аб накіраванні да ўрадніка Яна Бачкоўскага слугі Якава Сеўрука [29, арк. 343–343 адв.]. У пэўнай ступені дадзены дакумент пацвярджае характар іх службы ў гэты перыяд – яны былі лістоўнымі баярамі.

Чарнышэвічы апелявалі да надання іх продку Івану Чарнышу князем Юрыем II Алелькавічам пустаўшчыны ў Касынічах з умовай нясення зямянскай службы. У канцы XVIII ст. на руках у прадстаўнікоў роду мелася недакладная копія дакумента, у якой ён датаваўся 1540 г. Гэта немагчыма. У 1540 г. слуцкім князем яшчэ быў Юрый I Сямёнавіч (†1542). Апрача таго, у дакуменце згадваўся брацлаўскі ваявода князь Андрэй Вішнявецкі, які заняў гэты ўрад толькі ў 1576 г. Аднак

---

[14] У іншых былых баярскіх сёлах сітуацыя магла быць адрознай. У Клешаве ў 1662 г. зямяне ўносілі толькі грашовую плату [50, k. 10]. Да пачатку XVIII ст. лістоўная павіннасць перастала быць характэрнай і для жыхароў Машчыцаў [28, арк. 48 адв.].

[15] На дадзены факт звярталася ўвага ў навуковай літаратуры [53, s. 64].

у матэрыялах судовага працэсу, што адбываўся ў 1668 г. у Слуцкім замкавым судзе па справе аб абвінавачанні Янам Казарынам Чарнышэвічаў у прысвойванні шляхецкай годнасці, пазначана больш дакладная дата выдання прывілея – 7 лютага 1576 г. [23, арк. 21–26 адв.; 33, арк. 755– 755 адв.]. Сумнеўна, аднак, каб Чарнышэвічы сапраўды былі зямянамі ў часы Алелькавічаў – у той жа спіс ад 1600 г. яны не ўключаны. Зрэшты, у пачатку XVII ст. зямянін Міхайла Стафанавіч Воўк[16] перадаў свайму зяцю Прохару Пятровічу Чарнышэвічу зямлю ў сяле Сорагі (Урэцкі двор). У дадзеным дакуменце Чарнышэвіч названы выхадцам з Касынічаў і «зямянінам» [23, арк. 27–28 адв.]. Хутчэй за ўсё, тут адлюстраваны фактычны статус Чарнышэвіча – пасля атрымання зямлі ў зямянскім сяле Сорагі ён аўтаматычна аказваўся на зямянскай службе.

Яшчэ адныя даўнія жыхары Касынічаў Бялькевічы выводзілі сябе з Кіеўскага ваяводства [30, арк. 253–253 адв.], што сумнеўна. Іх прозвішча складае займальную анамастычную пару з разгледжанымі вышэй Чарнышэвічамі. Нельга выключаць магчымасць таго, што гіпатэтычныя продкі гэтых родаў Чарныш і Белік (?) былі родзічамі, якія атрымалі свае мянушкі з-за нейкіх асаблівасцей знешнасці.

Адзін з прадстаўнікоў роду Наскоўскіх – Базыль, які ў апошняй чвэрці XVII ст. жыў ужо не ў Касынічах, а ў зямянскай вёсцы Меляшковічы[17] – у 1680 г. падаў у Слуцкі замкавы суд маніфестацыю наконт таго, што ён выпадкова згубіў родавыя дакументы, у тым ліку прывілей князя Юрыя ІІІ Юр’евіча Алелькавіча ад 1581 г. аб перадачы яго дзеду Радзьку Наскоўскаму зямлі ў Касынічах з умовай нясення ваеннай службы як *«і іншыя баяры-шляхта»* [20, арк. 2–2 адв.; 29, арк. 660–661]. З улікам таго, што да 1626 г. Касынічы былі вёскай путных баяр, пазнака аб нясенні ваеннай службы выглядае малапераканаўчай.

Некалькі больш складаным уяўляецца вызначэнне паходжання Шчацінаў, якія ў сярэдзіне XVII ст. масава пражывалі ў Касынічах. На мяжы 1570–1580-х гг. Шчаціны (Шчацінічы) былі баярамі сяла Кандратавічы (маёнтак Старыца) [27, арк. 507; 51, k. 76; 52, l. 9–14 v.]. У першай палове XVII ст. жыхары Кандратавічаў адносіліся да старыцкіх зямян (мясцовыя баяры пражывалі ў іншых паселішчах). Верагодна, у дадзеным выпадку азначэнне «баяры» тоесна зямянскаму становішчу[18]. Не вы-

---

[16] Верагодна, Міхайла тоесны не названаму па імені Ваўковічу, паказанаму ў інвентары ад 1600 г. [24, арк. 7].

[17] У сярэдзіне XVI ст. Меляшковічы, як і Касынічы, з’яўляліся паселішчам путных баяр і адносіліся да Слуцкага княства [47, k. 65]. Затым яны былі запісаны як фундуш на карысць Слуцкага кальвініісцкага збора.

[18] У адным з дакументаў старыцкія Шчаціны называюцца наўпрост зямянамі [52, l. 11].

ключана, што пасля перасялення ў Касынічы частка роду прыняла на сябе абавязкі лістоўных баяр.

Пры гэтым адзін з прадстаўнікоў касыніцкага баярскага роду Корзунаў ужо ў 1600 г. быў запісаны сярод зямян Слуцкага княства [24, арк. 6 адв.][19]. У XVIII ст. Корзуны, якія ў той час не толькі з'яўляліся радзівілаўскімі зямянамі, але і адносіліся да паўнапраўнай шляхты (і пераважна пражывалі ў Рэчыцкім павеце [2, с. 85–86]), валодалі дастаткова развітой родавай легендай. У адпаведнасці з ёй яны паходзілі ад кіеўскага ваяводзіча Ерамея Стрыкініча-Корзуна, які жыў у другой чвэрці XV ст., у 1532 г. атрымалі прывілей Жыгімонта I Старога на маёнтак у Навагрудскім ваяводстве, а затым Алелькавічы надалі ім зямлю на зямянскай павіннасці ў сяле Касынічы [14, арк. 719 адв.–720; 19, арк. 146–159 адв.; 35, арк. 323–332 адв.; 45, с. 274–275][20]. Не кажучы ўжо аб анахранічнасці звестак аб існаванні ў першай палове XV ст. урада кіеўскага ваяводы, выклікае сумненні факт атрымання Корзунамі надзела ў Касынічах менавіта на зямянскай павіннасці, таму што да 1626 г. Касынічы з'яўляліся вёскай путных (лістоўных) баяр. Сам факт пражывання Корзунаў у Касынічах у апошняй чвэрці XVI ст. пацвярджаецца незалежнымі ад іх крыніцамі – у 1584 г. з Агеем Казарыным судзіўся Даніла Карзуновіч з Касынічаў [48, k. 259, 301; 49, k. 4]. Паказальна, што ў дакуменце ён названы «баярынам». Верагодна, у дадзеным выпадку гаворка ішла якраз аб яго прыналежнасці да лістоўных баяр. Апрача таго, Корзуны зафіксаваны на баярскіх павіннасцях у іншых частках Слуцкага і Капыльскага княстваў. Яшчэ ў інвентары ад 1646 г. яны запісаны баярамі маёнтка Старыца [10, арк. 332, 333]. Тым не менш, згадванне аднаго з Корзунаў у інвентары ад 1600 г. як зямяніна (а не баярына) сведчыць пра тое, што частка гэтага касыніцкага роду ўжо напрыканцы XVI ст. перайшла на зямянскую службу.

Як вынікае з прыведзеных прыкладаў, адзіным выразным адрозненнем паміж зямянамі і баярамі (путнымі і панцырнымі) у Слуцкім і Капыльскім княствах у канцы XVI – першай палове XVII ст. з'яўлялася не паходжанне (шляхецкае або сялянскае) ці наяўнасць падданых-сялян[21],

---

[19] У крыніцы яго прозвішча перададзена скажона – «Кірзун» («Kirzun»).

[20] Існуе два варыянты прывілея Сямёна Юр'евіча Алелькавіча Корзунам. У 1751 г. у Оўруцкі гродскі суд быў унесены прывілей ад 8 мая 1555 г., якім Сямён Алелькавіч перадаў зямянам Брацлаўскага павета Івашку, Марціну, Сцяпану, Дарафею і Іванцу Корзунам урочышча Жукаў Востраў [3, с. 211–212]. Корзуны, якія засталіся ў Слуцкім княстве, карысталіся іншым дакументам ад князя Сямёна: нібыта выдадзеным 6 ліпеня 1578 г. «высакародным» Стафану і Яну Корзунам на пяць валок ва ўрочышчы Касынічы [35, арк. 329–329 адв.]. Калі першы з дакументаў мог мець пэўную рэальную аснову, то другі – грубы фальсіфікат, князь Сямён памёр у 1560 г.

[21] Менавіта такія крытэрыі прапаноўваў, напрыклад, Анатоль Грыцкевіч [5, с. 244].

а характар павіннасцей. Зямяне неслі толькі ваенную службу, у той час як баяры замест яе ці ў сукупнасці з ёй дастаўлялі грузы і карэспандэнцыю (у большасці выпадкаў) або выконвалі мядовую павіннасць (маёнтак Старыца).

На прычыны пераводу путных і панцырных баяр на зямянскую службу ў канцы XVI – XVII ст. звярталася ўвага ў гістарыяграфіі. Анатоль Грыцкевіч звязваў гэты працэс, як і павелічэнне колькасці зямян у Слуцкім і Капыльскім княствах у дадзены перыяд увогуле, з памкненнямі Радзівілаў ператварыць Слуцк у важную і добра абароненую фартэцыю [5, с. 244–245]. У пэўнай ступені гэта справядліва, хаця б таму што першаснай павіннасцю зямян з'яўлялася менавіта ваенная служба. Аднак важным, а ў шэрагу выпадкаў галоўным фактарам павелічэння колькасці зямян, як адзначаў Вітальд Сянкевіч, былі гаспадарчыя патрэбы [53, s. 62–64]. Акурат зямяне выкарыстоўваліся ў якасці ўнутраных каланізатараў, людзей, якія распрацоўвалі і ўводзілі ў сельскагаспадарчы абарот участкі лесу і пусташы. Часам былыя баяры засялялі новыя засценкі разам са старадаўнімі зямянамі. Аснову насельніцтва засценка Іздрашава (Старчыцкі двор) складалі выхадцы з былога сяла панцырных баяр Вужы (Грозаўскі двор) – Корбуты, Муравіцкія (Муровічы), Казлоўскія (Казловічы). Але ў 1633 г. тыя ж Корбуты падзялілі землі ў Іздрашаве з Дубкоўскімі, Цішкевічамі і Свідамі. Цішкевічы былі зямянамі з засценка Радкава, а Свіды пераважна пражывалі ў сяле Балотчыцы і фігуравалі як зямяне ў інвентары ад 1600 г. [15, арк. 350–350 адв.; 22, арк. 13–13 адв., 16–16 адв., 19; 24, арк. 6 адв.; 40, арк. 23; 43, с. 505; 49, k. 22–24; 53, s. 117–118].

Яшчэ адным фактарам, якім абумоўлівалася неабходнасць пераводу баяр на зямянскія павіннасці, з'яўлялася тое, што частка даўніх зямян спыняла службу Алелькавічам і Радзівілам, многія з іх ператвараліся ў паўнапраўную павятовую шляхту (як, напрыклад, згаданыя вышэй Валадковічы). Іх месца і займалі колішнія баяры.

На працягу XVII ст. ваенна-служылае насельніцтва Слуцкага і Капыльскага княстваў станавілася больш аднастайным. З аднаго боку, вярхі зямян, якія, як правіла, служылі яшчэ князям Алелькавічам, паступова ўваходзілі ў лік павятовай шляхты і пакідалі слуцка-капыльскую зямянскую карпарацыю. З іншага боку, зямянамі рабіліся былыя панцырныя і путныя баяры. З цягам часу адрозненні паміж старадаўнімі зямянамі і баярамі фактычна зніклі. У былых баярскіх сёлах Касынічы і Машчыцы ў другой палове XVII ст. жылі як баяры, так і прадстаўнікі старога зямянства (Загароўскія, Казарыны, Крукоўскія, Вечары, Хаўстовічы). Таксама нашчадкі панцырных баяр займалі пасады як у ваеннай, так і ў цывільнай урадніцкай іерархіі Слуцкага княства. Напрыклад, у 1661 г. зямянскім харужым засценка Чайчыцы (Іванскі двор) з'яўляўся

нашчадак баяр Фёдар Бялькевіч. У другой палове XVII ст. высокую пасаду рэвізора Слуцкага княства займаў выхадзец з баярска-зямянскага засценка Клешаў Яраш Сыцька [31, арк. 63–64 адв.; 44, с. 43; 53, s. 152]. Такім чынам, у канцы XVI – XVII ст. зямянская супольнасць Слуцкага і Капыльскага княстваў увабрала ў сябе істотную частку ранейшых панцырных і путных баяр. Асноўным абавязкам зямян, як старадаўніх, так і былых баяр, з'яўлялася ваенная служба, таксама яны былі ўцягнуты ў працэс унутранай каланізацыі – засялення пустаўшчын і лясных тэрыторый Случчыны і Капыльшчыны.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 18: Акты о копных судах. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1891. – LXI, 577 с.
2. Анищенко, Е. К. Шляхта Речицкого повета: Список XVIII ст. – Минск : Изд. В. Хурсик, 2015. – 316 с.
3. Архив Юго-Западной России. – Ч. 7. – Т. 1: Акты о заселении Юго-Западной России. – Киев : Типография Г. Т. Корчак-Новицкого, 1886. – 85, 647, XII с.
4. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 3: В / Д. Ч. Матвейчык і інш.; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2014. – 647 с.
5. Грицкевич, А. П. Хозяйственное и правовое положение военно-служилого населения в Слуцком княжестве в XVI–XVIII вв. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г. – Минск : Наука и техника, 1964. – С. 242–253.
6. Доўнар, А. Б. Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 193 с.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 146 (Мінская палата грамадзянскага суда). Воп. 3. Спр. 24. – Справа Слуцкай камісіі для разбору правоў і абавязкаў жыхароў г. Слуцка і вотчынных уладальнікаў князёў Радзівілаў. Ч. 7: Інвентары г. Слуцка, прывілеі, позвы і іншыя дакументы. 1557–1827 гг. – 729 арк.
8. НГАБ. – Ф. 160 (Ігуменскі павятовы суд). Воп. 1. Спр. 15. – Справа аб адшуканні волі ад прыгоннай залежнасці жыхароў мястэчка Пясочнае Ігуменскага павета з-пад валодання памешчыкаў Ёдкаў. Інвентары Капыльскага княства 1638 і 1642 гг. – 217 арк.
9. НГАБ. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 16. – Справа аб адшуканні волі ад прыгоннай залежнасці жыхароў мястэчка Пясочнае Ігуменскага павета з-пад валодання памешчыкаў Ёдкаў. Інвентары Капыльскага княства 1665, 1734, 1780, 1781 гг. – 238 арк.
10. НГАБ. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 23. – Справа аб адшуканні волі ад прыгоннай залежнасці жыхароў вёскі Пырашаўская Слабада Ігуменскага павета з-пад валодання памешчыкаў Ёдкаў. 1831–1853 гг. – 1007 арк.

11. НГАБ. – Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). Воп. 1. Спр. 32а. – Пастановы аб дваранстве розных асоб. 1802 г. – 829 арк.
12. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 71. – Пастановы аб дваранскім паходжанні родаў. 1816 г. – 772 арк.
13. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 82. – Пастановы аб дваранскім паходжанні родаў. 1817 г. – 988 арк.
14. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 130. – Пастановы аб дваранскім паходжанні родаў. 1825 г. – 759 арк.
15. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 152. – Пастановы аб дваранскім паходжанні родаў. 1826 г. – 767 арк.
16. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1032. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Яльніцкіх. – 255 арк.
17. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1049. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Жаўрыдаў. – 257 арк.
18. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1311. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Карповічаў. – 326 арк.
19. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1475. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Корзунаў. – 880 арк.
20. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2276. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Наскоўскіх. – 65 арк.
21. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3386. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Хаўстовічаў. – 56 арк.
22. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3470. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Цішкевічаў. – 395 арк.
23. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3611. – Справа аб дваранскім паходжанні роду Чарнышэвічаў. – 864 арк.
24. НГАБ. – Ф. 694 (Радзівілы, князі). Воп. 2. Спр. 7381. – Інвентар Слуцкага княства. 1600 г. – 8 арк.
25. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 7384. – Землеўпарадкавальная кніга Слуцкага княства. 1645 г. – 99 арк.
26. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 1239. – Актавая кніга Слуцкага замкавага суда. 1686–1689 гг. – 456 арк.
27. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 6029. – Матэрыялы аб маёнтках Біржанскага і Капыльскага княстваў, Койданаўскага графства і іншых; рэестры дакументаў; попіс зямян Слуцкага і Капыльскага княстваў. 1526–1830 гг. – 585 арк.
28. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 7. Спр. 947. – Інвентар маёнтка Івань Слуцкага княства. 1704 г. – 55 арк.
29. НГАБ. – Ф. 1730 (Навагрудскі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 11. – Актавая кніга Навагрудскага гродскага суда. 1732–1733 гг. – 801 арк.
30. НГАБ. – Ф. 1738 (Случарэскі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 1. – Актавая кніга Случарэскага гродскага суда. 1793–1794 гг. – 751 арк.
31. НГАБ. – Ф. 1739 (Слуцкі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Слуцкага замкавага суда. 1661–1666 гг. – 1325 арк.

32. НГАБ. – Ф. 1739. Воп. 1. Спр. 5. – Актавая кніга Слуцкага замкавага суда. 1695–1732 гг. – 671 арк.
33. НГАБ. – Ф. 1774 (Навагрудскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 15. – Актавая кніга Навагрудскага земскага суда. 1784 г. – 1053 арк.
34. НГАБ. – Ф. 1785 (Слонімскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 16. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 1598 г. – 276 арк.
35. НГАБ. – Ф. 1787 (Случарэскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Случарэскага земскага суда. 1793–1795 гг. – 1039 арк.
36. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 1310. – Інвентар маёнтка Грозаў Слуцкага княства. 1663 г. – 12 арк.
37. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 1417. – Інвентар маёнтка Івань Слуцкага княства. 1654 г. – 76 арк.
38. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 1418. – Інвентар маёнтка Івань Слуцкага княства. 1668 г. – 50 арк.
39. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 3356/1. – Інвентар маёнтка Прусы Слуцкага княства. 1667 г. – 27 арк.
40. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 3357. – Інвентар маёнтка Прусы Слуцкага княства. 1671 г. – 29 арк.
41. НГАБ. – КМФ 5. Воп. 1. Спр. 4019. – Інвентар маёнтка Старчыцы Слуцкага княства. 1666 г. – 93 арк.
42. Скеп'ян, А. А. Двор і слугі князёў Слуцкіх у канцы XV – 80-х гг. XVI ст. // Arche. – 2014. – № 6. – С. 305–339.
43. Статкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Корбуты герба «Корчак». – Мінск : Роднае слова, 2011. – 589 с.
44. Стецкевич-Чебоганов, А. В. Я – сын Ваш: Сыцько герба «Остоя». Ждановичи-Гуриновичи герба «Любич». Мещанские роды Казанкины и Чебогановы. Арцишевские герба «Роля». Забелло герба «Топор». – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2013. – 576 с.
45. Яцкевіч, З. Л. Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты // Архіварыус. – Вып. 7. – 2009. – С. 267–281.
46. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów (далей – AR). – Dz. 23. Teka. 131. Plik. 1. – Rejestry aktów i dokumentów księstwa słuckiego. 1624–1706. – 449 k.
47. AGAD. – AR. – Dz. 23. Teka. 137. Plik. 4. – Rejestry, rachunki, sumariusze intrat, przychodu i rozchodu z miasta Słucka. 1566–1810. – 546 k.
48. AGAD. – AR. – Dz. 23. Teka. 159. Plik. 2. – Akta tyczące się szlachty, ziemian i bojar osiadłych na gruntach w księstwach słuckim i kopylskim. – 381 k.
49. AGAD. – AR. – Dz. 23. Teka. 160. Plik. 1. – Prawa ziemian księstwa słuckiego. – 283 k.
50. AGAD. – AR. – Dz. 25. Sygn. 50. – Inwentarz majętności Basławce. R. 1662. – 17 k.
51. AGAD. – AR. – Dz. 25. Sygn. 4069. – Inwentarz majętności Starzyca. R. 1686. – 63 k.

52. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1280. Ap. 1. B. 575. – Документы на имения Велешино, Душево, Греск Новогрудского воеводства. 1571–1583 гг. – 41 l.
53. Sienkiewicz, W. Ziemianie zależni w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego: maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – 460 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 19.10.2022

*А. А. Любая*

## Духовенство мечетей Минской губернии в конце XVIII – начале XX в.: попытка реконструкции персонального состава

История ислама на землях Великого Княжества Литовского (далее – ВКЛ) – сложная проблема для исследователя. В первую очередь это связано с плохой сохранностью исторических источников, утратой архивов мечетей, личных и семейных архивов в татарском сообществе. До сих пор остается неизвестен и персональный состав мусульманского духовенства, служившего в мечетях Минской губернии. Впрочем, как и в любой другой из белорусско-литовских губерний.

Следует объяснить разницу в категориях мусульманского духовенства, которые встречаются в источниках. В ВКЛ предводитель молитвы, а также лицо, которое отвечало за порядок в мечети получил особое название – «молна/molna». После подчинения мусульман Таврическому магометанскому духовному правлению (далее – ТМДП) примерно в середине XIX в. этот термин заменяется на общепринятый в Российской империи «имам», но практически до конца обозначенного периода два этих определения существовали параллельно. В исламе нет строгой иерархии, которую можно наблюдать в других религиях, но отдельно стоит упомянуть термин «хатиб» (в источниках «хотыб», «хотип» и т. п.), поскольку некоторые имамы подписывали метрики и подавали сведения о себе, используя это духовное звание. Хатибом называют духовное лицо, которое читает пятничную молитву (обязательная коллективная молитва, на которую собирается община). Перед молитвой хатиб читает специальную проповедь – хутбу. Но поскольку ситуация, когда в мечети было больше одного имама встречалась редко, все они могли называть себя хатиб.

Во времена Российской империи в Минской губернии существовало 11 мечетей и молелен. На момент присоединения территорий бывшего

ВКЛ по второму разделу Речи Посполитой мечети уже существовали в Минске, Новогрудке и Ловчицах.

Первое упоминание мечети в Минске относится к 1599 г. В последующие столетия деревянная мечеть многократно перестраивалась, а каменное здание было введено в эксплуатацию в 1902 г. [3, с. 29] (ил. 1 и 2).

Основание мечети в Ловчицах, вероятнее всего, относится к началу XVI в. В документе 1627 г. Юсуп Ловчицкий писал, что его покойный дед, князь Муртуза Мурза Бахатыревич Ловчицкий, выделил землю *«по своей доброй воле, мечеть в своих Ловчицах, для службы в этих имениях, своим [потомкам] из Ловчицких в разных местах»* [1, с. 12–15]. Таким образом, часть земли Ловчицкого поместья была выделена под мечеть: не только на само здание, но и на содержание муллы.




Ил. 1. Печать муллы Минской мечети Якуба Ждановича. 1820 г.




Ил. 2. Печать Минской мечети (муллы Ибрагима Раецкого). 1851 г.

Не совсем ясно, когда именно мусульманская община Новогрудка отделилась от общины в Ловчицах. Мечеть в Новогрудке упоминается в «Рисалей-и-татар-и-лех» – рукописи трактата, якобы написанной татарином из ВКЛ для визиря султана Сулеймана Великолепного и опубликованной в XIX в. профессором Санкт-Петербургского университета Антоном Осиповичем Мухлинским [29]. Однако подлинность этого источника вызывает серьёзные сомнения, так как разрешение на строительство здания татары получили от короля польского и великого князя литовского Станислава Августа Понятовского в 1792 г. [27, s. 154].

С вхождением земель ВКЛ в Российскую империю правовая ситуация относительно строительства новых мечетей изменилась. Как отмечает Зорина Канапацкая, *«после присоединения Речи Посполитой к России строительство и ремонт мечетей находились под строгим кон-*

*тролем российских властей […]»*. К этому времени строительство мечетей регламентировал комплекс указов. В 1829 г. появляется циркулярный лист Департамента государственного хозяйства и общественных построений Министерства внутренних дел «О правилах постройки татарских мечетей». Позже все требования по поводу строительства мечетей были объединены в «Уставе строительном» (1857 г.). В нём имеется отдельный раздел, который так и называется «О построении магометанских мечетей». Согласно статьям 260–265 «Устава» мечети разрешалось строить *«не иначе, как по представлениям от приходов и приходских чинов магометанскому духовному начальству… и с утверждением начальства губернского»* (статья 260); построить мечеть могли только те общины, где было не менее, чем 200 мужчин-мусульман, а мечеть и мулла находились на содержании у общины (статья 261) [2, с. 138].

В XIX в. две мечети были построены в Игуменском уезде: в местечках Узда и Смиловичи [9, с. 68]. В Слуцком уезде продолжала функционировать старая мечеть в Осмолово, позже были построены мечети в Ляховичах [9, с. 69], Клецке и Копыле. В Новогрудском уезде было две мечети: в Мире [9, с. 72] и Ловчицах, а также одна в уездном городе Новогрудке (была возведена в 1855 г. на месте старой, существовавшей с XVIII в.) [9, с. 72]. Все они были деревянными. Первая каменная мечеть в Минске была построена и введена в эксплуатацию только в 1901–1902 гг.

В соответствии с первым параграфом «Положения о Таврическом магометанском духовенстве и правах оного» от 23 декабря 1831 г. [24, с. 337–345] таврическое духовенство было уполномочено рассматривать все дела духовного характера касательно мусульман, проживающих в *«Западных, возвращённых от Польши, губерниях»*. Таврический муфтий признавался духовным главой мусульман и имел исключительное право выносить фетвы в их отношении (п. 15). При этом для западных губерний не предусматривалось назначение высшего мусульманского духовенства, например, уездных кади, которые были уполномочены решать дела в рамках своих уездов (п. 14, 17). Соответственно, мусульмане “западных губерний” не имели своего представительства в ТМДП (п. 53). Они были ограничены в своем представительстве при выборе муфтия и кади-эскера, поскольку согласно «Положению» в выборах могли участвовать высшее духовенство, а также хатыпы, имамы и муллы губернского и уездных городов, а также главы мусульманских волостей или замещающие их депутаты (п. 24). Правда, случаи участия представителей “западных губерний” в таких выборах не известны.

Этим же документом определялся порядок выборов приходского духовенства. В качестве критериев для кандидатов на занятие таких должностей выступали насущная необходимость, обладание кандида-

том необходимым уровнем знаний и высокая нравственность (п. 71). Кроме того, в случае рассмотрения нескольких кандидатов, преимущество следовало отдать тому, кто владел русским языком. Для получения духовного звания хатиба, имама и муллы кандидату необходимо было получить согласие прихода на предмет соответствия вышеизложенным критериям и утверждение губернским начальством (п. 42). Особо оговаривалось, что на эти должности могут избираться люди, по рождению принадлежащие к таврическому мусульманскому духовенству (п. 41). Естественно, что имамы и муэдзины, избираемые из татар бывшей Речи Посполитой, происходили из иной социальной категории – т. н. «польского дворянства из татар». Таким образом, возник юридический казус, усугублявшийся ещё и тем, что всё мусульманское духовенство, происходившее из татар бывшей Речи Посполитой, добивалось признания своего дворянства, чего не требовали мусульманские духовные лица в Таврической губернии.

В этой связи в 1848 г. Таврическое губернское правление обратилось к Министерству внутренних дел с просьбой разрешить избирать духовенство в этих губерниях из людей всех сословий. Сбор сведений в Минской губернии, инициированный виленским губернатором по ходатайству Таврического губернского правления, подтвердил, что в существующих в Новогрудском уезде мусульманских приходах *«избираются муллы из сословия дворян прихожанами дворянами по общему всех добровольному согласию»*. Минская полиция доносила, *что «все Литовские татары защищаются Привилегиями Дворянства, и каковые принадлежащие Минской мечети татары суть Дворяне – то муллы избираются из сего же сословия, т. е. из Литовских татар»* [6, л. 1–2, 19, 24].

Кроме того, недопонимание возникало и в повседневной практике. Согласно законам Российской империи ТМДП должно было ежегодно присылать в мечети “западных губерний” шнурованные книги для ведения метрических записей. По окончании каждого года копии книг должны были возвращаться в ТМДП, и именно по ним происходила сверка записей о рождении, необходимых для подтверждения дворянского происхождения и принадлежности к конкретному роду. Но так было далеко не всегда.

Можно предположить, что нововведения, в том числе и относительно нового порядка ведения книг, приживались крайне медленно. До 1834 г. не было установленной формы метрических книг, поэтому молны вели метрические записи согласно установленной традиции или, возможно, в некоторых случаях не вели вовсе. В 1851 г. имам Осмоловской мечети Иосиф Богданович Байрашевский в ответ на просьбу Асана Ильясевича выдать ему копию метрической записи о рождении сына утверждал, что до 1834 г. не было установленной формы метрических книг, поэтому он

может определить возраст интересующего лица только по приходским спискам [7, л. 25].

В 1859 г. ТМДП направило в Минское дворянское депутатское собрание (далее – МДДС) письмо о том, что для подтверждения десяти записей о рождении представителей татарского дворянского рода Смольских ТМДП было вынуждено обратиться в минскую полицию, чтобы та в свою очередь произвела расследование по вопросу о происхождении этих людей. Такая процедура проводилась в тех случаях, когда метрические записи по каким-либо причинам не сохранились. Однако в этом случае ТМДП ссылалось на ненадлежащее ведение книг в Минской соборной мечети: *«…из препровождённых муллою Минской соборной мечети метрических книг с 1843 по 1855 год, ведённых им как черновых, невозможно ничего понять. Записки актов, потому что в оных черновые заметки родившихся, умерших и браком сочетавшихся, записывались в одно место, да при том и самые книги незашнурованы, неприпечатаны и нескреплены сим духовным правлением, то духовное правление не может положиться в действительности записок актов»* [8, л. 267].

При этом численность духовенства мечетей в Минской губернии не была такой уж значительной. В 1861 г. согласно сведениям из отчёта Минского губернского статистического комитета в Центральный статистический комитет в Минской губернии в 1860 г. проживало магометанское духовенство в количестве 51 души (21 – мужского пола и 30 – женского) [10, с. 176]. Подобные сведения печатались достаточно регулярно и численность духовенства колебалась незначительно. За 1863 г. статистический комитет сведений по количеству мусульманского духовенства не представил, но указал общее количество мечетей – 8 (две в городах и шесть в уездах) [11, с. 44]. С 1869 г. Минский губернский статистический комитет начал публиковать актуальные списки мусульманского духовенства в губернии наряду с духовенством христианских конфессий (православного, римско-католического, евангелическо-лютеранского и евангелическо-реформаторского) и иудейским с указанием государственных наград и даты вступления в должность (в случае вакантного места делалась соответствующая пометка) [12, с. 175].

Однако эти сведения, к сожалению, не отличаются точностью то ли вследствие небрежности чиновников самого статистического комитета, то ли из-за заблуждений самих общин, их представлявших. Например, согласно сведениям 1869 г. хатиб Новогрудской соборной мечети, дворянин Александр Османович Богданович, имеющий серебряную медаль «За усердие», вступил в должность 10 марта 1849 г. [13, с. 176], а согласно сведениям, опубликованным в 1870 г., хатиб Новогрудской мечети дворянин Александр Осипович Богданович, имеющий серебряную медаль на Анненской ленте «За усердие» и медаль «В память об усмире-

нии польского мятежа 1863–1864 годов», вступил в должность в 1829 г. [14, с. 137]. И если разночтения в отчестве хатиба Османович/Осипович можно объяснить традицией – преобразованием мусульманских имён в более общепринятые и близкие по звучанию христианские имена (Али в Александра, Мустафу в Стефана и т. д.), то двадцатилетнюю разбежку в дате вступления в должность объяснить не так просто. При том, что в 1877 г. его вступление в должность отнесено к 1823 г., кроме того, отмечено, что он закончил курс в Минском магометанском мектеве, о котором ранее вообще ничего не было известно, а в 1878 г. утверждалось, что он «в службе» – с 1823 г., а в должности состоит только с 1838 г. [16, с. 299]. Существенные расхождения по времени вступления в должность встречаются и в отношении других имамов.

Еще более странные превращения произошли в 1880-е и 1890-е гг. в Ляховичской и Осмоловской мечетях. Продолжительное время должность хатиба в Ляховичской мечети занимал Сюлейман Бекирович Воронович, но в 1887–1888, а затем в 1891–1892 гг. на этом месте, по мнению статистического комитета, оказался *«Хотибъ Самуиловичъ Вороновичъ»* [22, с. 112; 23, с. 112].

В Осмоловской мечети часто печатали вместо имени слово «имам». В 1875 г. в ней служил Имам Степанович Якубовский, заместивший реального молну Якуба Мустафовича Якубовского [15, с. 111], а в 1887 г. в ней числился Имам Яковлевич Ясинский, хотя на самом деле молной был Яков Сюлейманович Ясинский [21, с. 318]. Очевидно, что собиравшие сведения чиновники в обоих случаях смешали имена, отчества и духовные звания, оставив нетронутыми только фамилии.

При этом каких-либо общих списков служителей мечетей, чего-либо наподобие клировых ведомостей или списков мусульманского духовенства источники не сохранили. Впервые общий свод мусульманского духовенства в XIX в. на территории бывшего ВКЛ и Польского Королевства составила литовский историк Тамара Байрашаускайте [26, p. 260–264]. Однако её списки не имеют ссылок и не всегда возможно найти источники, на которые опирался автор, соединяя разрозненные сведения относительно деятельности имамов. Памятные книжки Минской губернии, как и других «западных губерний», могут помочь восстановить списки мусульманского духовенства со второй половины XIX в. При этом, хотя они и являются источником вполне официальным, содержат большое количество ошибок и неточностей.

В отдельных случаях для уточнения хронологии смены имамов в данной статье привлечены и другие источники, например, тестаменты и судебные дела из фонда Минской соединенной палаты уголовного и гражданского суда [4; 5], а также метрики, подписанные имамами Минской губернии, хранящиеся в одном из дворянских выводов татарских

родов в фондах Литовского государственного исторического архива (лит. – Lietuvos valstybės istorijos archyvas; далее – LVIA) [28].

Восстановить хронологию смены духовенства в мечетях Минской губернии и даже Минского воеводства во времена Речи Посполитой могут помочь метрические выписки, которые представлялись в МДДС для подтверждения родственных отношений. В них практически всегда указывалось имя молны, который заверял документ, и чаще всего имя молны, который совершал обряд имянаречения. Относительно информативных возможностей такого вида источников могут возникать сомнения. Прежде всего связанные с сомнениями относительно подлинности подобных выписок. Поскольку сами метрические книги из мечетей, за исключением единичных экземпляров за очень ограниченный период, практически не сохранились, то проверить, существовала ли оригинальная запись, невозможно. Некоторые исследователи высказывают предположения о том, что до первой трети XIX в. подобные книги в мечетях «западных губерний» Российской империи и вовсе не велись. Кроме того, существовал достаточно активный рынок услуг по изготовлению фальсификатов старых документов для доказательства благородного происхождения. Возможно ли, что метрические выписки из татарских дел также являются фальсификатом?

Против этой версии существует несколько аргументов. Во-первых, выписки из метрических книг мечетей – массовый источник. Они встречаются практически в каждом деле о дворянском происхождении татарских фамилий. В некоторых из них, например, в деле минского татарского рода Смольских, можно насчитать десятки или даже сотни подобных выписок. При этом нам не известно о каких-либо подозрениях властей относительно законного происхождения документов, выдаваемых мечетями. Во-вторых, подобные документы выдавались на протяжении долгого времени, в разных мусульманских общинах, разными молнами. И в общем, выданные ими документы согласуются друг с другом: совпадают имена имамов, согласуется хронология их смены. Если даже предположить, что существовал некий заговор мусульманских общин, то согласовывать такой объем информации на протяжении продолжительного времени было бы затруднительно.

В фонде МДДС отложились метрики главным образом тех общин, которые входили в состав Минской губернии. В случае Осмоловской мечети в метрических выписках сохранилась информация о молне, который служил в этой общине в XVII в. В отношении духовенства Ловчицкой мечети возможно восстановить относительную хронологию начиная с первой четверти XVIII в., а в отношении Минской мечети с середины этого века. Однако встречаются записи из метрических книг и мечетей других губерний, в которых проживали татары бывшего ВКЛ.

Часто – из книг Слонимской, Крушинянской, Видзской и Винкшупской мечетей. Наиболее древние записи со второй половины XVII в. встречаются из книг общины в Довбутишках – старого религиозного центра татар Виленщины.

Подобные записи в отношении рассматриваемых нами мечетей будут встречаться и в дворянских выводах татарских родов других губерний, в первую очередь, Виленской и, возможно, Волынской. В Гродненской губернии вследствие пожара фонд дворянского собрания был практически полностью уничтожен, и в настоящее время метрические выписки по книгам из мечетей Слонима, Лососны и других можно искать только в копиях выводов, сохранившихся в архиве Герольдии Сената. Однако на данном этапе такая масштабная цель не ставится. Основная задача данной статьи – доказать обоснованность использования разного рода источников для восстановления персонального состава мусульманского духовенства на землях ВКЛ в XVIII–XIX вв.

В нижеприведенной таблице представлены сведения о персональном составе мусульманского духовенства, служившего в мечетях, которые в период вхождения Беларуси в состав Российской империи находились на территории Минской губернии. Хотя, собственно, периодом Российской империи эти сведения не ограничиваются, в некоторых случаях (например, в отношении Осмоловской, Минской и других мечетей) затрагивая период Речи Посполитой. Они структурированы по каждой из мечетей в хронологическом порядке. Указываются фамилия, имя и отчество имама, даты его вступления в должность и увольнения с неё, источники, в которых выявлена информация, и дополнительные сведения (если таковые известны).

Нередко даты указываются с оговоркой «не позднее» или «не ранее» (обозначаются соответственно условными знаками < (перед датой) и > (после даты)), если более конкретных сведений нет. В некоторых случаях, когда в источниках указываются разные даты, более поздние из них указываются после более ранней со знаком вопроса, означающем разночтение. К тому же очевидно, что даты в отношении имамов некоторых мечетей взаимопротиворечивы и требуют своего уточнения или объяснения, а это возможно сделать только при обнаружении новых источников, что также может существенно влиять на построенную хронологию.

Источники представлены в таблице в сокращенной форме: аббревиатура архива (НИАБ и LVIA) и указанные через дефис номера фонда, описи и дела. Выпуски «Памятных книжек Минской губернии» обозначены аббревиатурой (ПКМГ) и датами тех годов, на которые выпускались. Название книги Т. Байрашаускайте сокращено до фамилии автора в оригинале (Bairašauskaitė) и номера страницы, где содержатся указанные сведения.

**Персональный состав**

| Место нахождения мечети (населённый пункт) | Фамилия, имя, отчество | Дата вступления в должность |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **Осмолово** | Мусич,<br>Ян | <21.10.1699 |
| | Муха,<br>Давид (Богдан) | <04.05.1721 |
| | Халембек,<br>Ян | <20.10.1769 |
| | Смольский,<br>Алей (Александр) Якубович | <03.01.1815 |
| | Халембек,<br>Якуб Иванович | <20.09.1830 |
| | Богушевич,<br>Мустафа Сюлейманович | 1846 |
| | Байрашевский,<br>Иосиф Богданович | <18.04.1851 |
| | Якубовский,<br>Якуб Мустафович | 01.04.1861<br>(1868?) |
| | Жданович,<br>Мустафа (Стефан) | 1881 |
| | Ясинский,<br>Якуб Сюлейманович | 1884 |
| | Халембек,<br>Юнус Адамович (Доминикович) | 1910 |
| | Ясинский,<br>Якуб Сюлейманович | <1915 |
| **Копыль** | Мискевич,<br>Сюлейман Александрович | 1891 |
| **Клецк** | Жданович,<br>Мустафа (Стефан, Степан, Степанин) Яковлевич | 1861 |
| | Жданович,<br>Якуб Мустафович | 1895 |
| **Ловчицы** | Асанович,<br>Богдан | <1725 |
| | Янушевич,<br>Мустафа | <1740 |

**духовенства мечетей Минской губернии**

| Дата увольнения с должности | Источник | Дополнительные сведения |
|---|---|---|
| **4** | **5** | **6** |
| 12.03.1723> | НИАБ 319-2-1950 | |
| 24.07.1764> | НИАБ 319-2-9;<br>НИАБ 319-2-214;<br>НИАБ 319-2-527 | |
| 10.06.1816> | НИАБ 319-2-527;<br>НИАБ 319-2-3024 | |
| 23.04.1826> | НИАБ 319-2-3024;<br>НИАБ 319-2-3385 | |
| 1845 | НИАБ 319-2-2168;<br>Bairašauskaitė, 262 | |
| 1849 | Bairašauskaitė, 262 | |
| 04.09.1859><br>(1860?) | НИАБ 319-2-1272;<br>НИАБ 319-2-2168;<br>Bairašauskaitė, 262 | |
| 1880 | Bairašauskaitė, 262;<br>ПКМГ за 1869–1871, 1873–1875, 1877, 1878 гг. | отрёкся по возрасту,<br>умер в 1885 г. |
| 1883 | Bairašauskaitė, 262 | |
| 1907> | ПКМГ за 1885–1890, 1892–1898, 1900, 1902–1904, 1907 гг. | был имамом дважды |
| 1914 | Bairašauskaitė, 262; ПКМГ за 1914 г. | |
| 1917> | ПКМГ за 1917 г. | |
| | | |
| 1914> | ПКМГ за 1892–1894, 1895–1898, 1900, 1902–1904, 1907, 1910, 1914 гг. | |
| | | |
| 1893<br>(1895?) | Bairašauskaitė, 261; ПКМГ за 1878, 1887–1889, 1890, 1892–1894 гг. | |
| 1917 | ПКМГ за 1895, 1897 (и.д), 1898, 1900, 1902–1904, 1907, 1917 гг. | |
| | | |
| 11.09.1750> | НИАБ 319-2-3021 | |
| 03.03.1759> | LVIA 319-1-278 | |

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| | Асанович, Иосиф | <1773 |
| | Асанович, Ахмет | < 25.04.1790 |
| | Тупальский, Иосиф | < 31.05.1835 |
| | Якубовский, Якуб Давидович | 15.02.1837 (1840?, 1849?) |
| | Шегидевич, Ян Александрович | 1896 |
| | Александрович, Мустафа Якубович | 1911 |
| **Ляховичи** | Богушевич, Мустафа | 1815 |
| | Мурзич, Бекир | 1835 |
| | Мурзич, Якуб | <03.12.1843 |
| | Якубовский, Иосиф Ибрагимович (Бекирович, Аврамович, Константинович) | 01.01.1868 |
| | Воронович, Сюлейман (Самуил) Бекирович | <21.06.1879 |
| | Мурзич, Давид Османович | 1900 |
| **Минск** (в 1902 г. построено каменное здание) | Полторжицкий, Самуил | <15.01.1751 |
| | Полторжицкий, Сапар | <24.06.1769 |
| | Смольский, Самуил | <15.03.1774 |
| | Полторжицкий, Мустафа (Стефан) | <19.02.1778 |
| | Ламинский, Мустафа (Стефан) | <12.10.1796 |
| | Жданович из Мурзов, Якуб Александрович | <10.03.1809 |
| | Раецкий, Ибрагим Шабанович | <12.10.1832 |
| | Битютко, Сюлейман Александрович | и. д. хатиба 27.05.1851 (01.01.1853?, 10.08.1855?) |

| 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|
| 10.05.1804> | НИАБ 319-2-3021 | |
| 08.03.1801> (1826?) | LVIA 319-1-278; Bairašauskaitė, 261 | после увольнения служил в Новогрудке |
| 25.04.1846> | LVIA 319-1-278 | |
| 1895 | ПКМГ за 1869–1871, 1873–1875, 1881–1890, 1892, 1894, 1895, 1896 гг. | |
| 1912 | Bairašauskaitė, 261; ПКМГ за 1897, 1898, 1900, 1903–1905, 1907–1909 гг. | |
| 1915 | ПКМГ за 1911 (и. д.), 1914–1915 гг. | |
| | | |
| 1834 | Bairašauskaitė, 261 | |
| 1842 | Bairašauskaitė, 261 | |
| 21.06.1866> | НИАБ 147-3-23285; НИАБ 319-2-1062; НИАБ 319-2-2866 | |
| 11.12.1878> | НИАБ 147-3-28223; ПКМГ за 1869–1871, 1873–1875, 1878 гг. | |
| 1898 | НИАБ 147-3-28223; ПКМГ 1885–1888, 1892, 1893, 1894, 1895–1898 гг. | |
| 1917> | ПКМГ за 1900–1904, 1907, 1910, 1914, 1917 гг. | |
| | | |
| 01.05.1778> | НИАБ 319-2-1272; НИАБ 319-2-3384 | |
| 18.05.1780> | НИАБ 319-2-527 | |
| ? | НИАБ 319-2-1272 | |
| 03.12.1794> | НИАБ 319-2-1272; НИАБ 319-2-3384 | |
| 01.05.1809> | НИАБ 319-2-3024 | |
| 08.06.1823> | НИАБ 319-2-3024; НИАБ 319-2-3384 | |
| 06.09.1855> | НИАБ 319-2-1272; НИАБ 319-2-3384 | |
| 06.01.1896> (1897?) | НИАБ 319-2-1272; НИАБ 319-2-3024; ПКМГ за 1869–1871, 1873, 1874–1878 гг. | |

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| | Жданович,<br>Адам | и. д.<br>21.12.1896 |
| | Смайкевич,<br>Мустафа Александрович | 1898 |
| **Мир**<br>(в 1809 г. получено разрешение на строительство) | Яхия Халембек | <16.12.1774 |
| | Сафаревич,<br>Мустафа | 1809 |
| | Мискевич,<br>Ибрагим Самуйлович | ? |
| | Шумкевич (Шымкевич, Шункевич),<br>Яков Самуилович (Мустафович) | 28.01.1866<br>(29.05.1867?) |
| | Лиськевич,<br>Яков | 1872 |
| | Шункевич,<br>Якуб Мустафович | 1882 |
| | Шункевич,<br>Адам Якубович | 1895 |
| **Новогрудок**<br>(в 1792 г. получен привилей на строительство, в 1796 г. построена, в 1855 г. возведено новое здание) | Лебедь,<br>Самуэль Иосифович | <03.08.1794 |
| | Канапацкий,<br>Сюлейман Александрович | 1814 |
| | Мухля,<br>Мустафа Богданович | 1818 |
| | Богданович,<br>Алей Османович | На службе с 1823,<br>в должности с 1829<br>(1838?, 10.03.1849?)<br>(переизбран?) |
| | Шегидевич,<br>Бекир Мустафович | 1880–1881 (и. д.) |
| | Сафаревич,<br>Селим | 1915 |
| **Смиловичи** | Полторжицкий,<br>Асан Азюлевич | <25.05.1852 |
| | Канапацкий,<br>Ибрагим Сюлейманович | 01.01.1869 |
| | Канапацкий,<br>Сюлейман Иванович | 1875 (1876?) |
| | Хасеневич,<br>Ибрагим Сапарович | 1890 |

| 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|
| 1898 | НИАБ 319-2-3384;<br>Bairašauskaitė, 262 | |
| 1914 | Bairašauskaitė, 262 | до этого служил в мечети в д. Довбучки Ошмянского уезда |
| | | |
| 16.12.1795> | НИАБ 319-2-3583 | |
| 22.10.1832> | НИАБ 319-2-3583;<br>Bairašauskaitė, 262 | |
| 1866 | Bairašauskaitė, 262 | |
| 1875 | ПКМГ за 1869–1871, 1873–1875 гг. | |
| 1881 | ПКМГ за 1881–1882 гг. | |
| 1894 | ПКМГ за 1883–1884, 1889, 1890, 1892, 1894 гг. | |
| 1917> | ПКМГ за 1895–1898, 1900, 1901, 1903–1905, 1907–1910, 1912, 1914, 1915, 1917 гг. | |
| | | |
| 12.04.1811> | НИАБ 319-2-1062 | |
| 1821 | Bairašauskaitė, 263 | |
| 1821 | Bairašauskaitė, 262 | оспаривал должность |
| 1878> – <1880 | ПКМГ за 1869–1875, 1878 гг. | |
| 1915 | ПКМГ за 1881–1890, 1892, 1894, 1895–1898, 1900, 1901–1905, 1907–1912, 1914, 1915 гг. | |
| ? | Bairašauskaitė, 262 | |
| | | |
| 25.05.1866> | НИАБ 319-2-517;<br>НИАБ 319-2-3384 | |
| 1876 | ПКМГ за 1870, 1871, 1873–1875 гг. | |
| 1895 | ПКМГ за 1878, 1881–1890, 1892, 1893, 1895, 1896 гг. | |
| 1914> | ПКМГ 1897–1898, 1900, 1901, 1903–1908, 1910–1912, 1914 гг. | |
| | | |

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| **Узда** | Александрович, Сюлейман Александрович | <10.04.1836 |
| | Мискевич, Мустафа Александрович | 1865 (1867?, 01.01.1868?) |
| | Якубовский, Магамет Якубович | 1891 |
| | Александрович, Магамет Амуратович | 1914 |

## Источники и литература


1. Думин, С. В. К истории мечети в Ловчицах // Мечети и мизары татар Беларуси, Литвы и Польши. К 100-летию второй Минской мечети: Материалы VIII Международной научно-практической конференции. – Новогрудок : [б/и], 2003. – С. 12–15.
2. Канапацкая, З. И. Мечети как центры сохранения этноконфессиональной культуры татар Беларуси, Литвы и Польши // Іслам і мусульмане Беларусі ў XIX стагоддзі: Матэрыялы VII міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (27–28 ліпеня 2001 г., г. Мінск) / пад рэд. І. Канапацкага. – Мінск : [б/в], 2002. – С. 137–151.
3. Канапацкая, З. И. Мечети татар-мусульман в Беларуси // Гасырлар авазы = Эхо веков. – 2004. – № 1(35). – С. 27–31.
4. Национальный исторический архив Беларуси (далее – НИАБ). – Ф. 147 (минская соединенная палата уголовного и гражданского суда). Оп. 3. Д. 23285. – Дело об утверждении прав дворян Сафаревичей на наследство в Слуцком уезде. 23.02.1882–03.03.1882. – 11 арк.
5. НИАБ. – Ф. 147. Оп. 3. Д. 28223. – О предоставлении минским дворянином С. Сафаревичем завещания матери для засвидетельствования. 27.05.1880–11.07.1880. – 15 арк.
6. НИАБ. – Ф. 299 (Минское губернское правление). Оп. 2. Д. 3520. – О предоставлении сведений каким порядком избираются и утверждаются муллы в существующих в сей губернии магометанских приходах из каких сословий. 24.01.1849–15.05.1849. – 28 арк.
7. НИАБ. – Ф. 319 (Минское дворянское депутатское собрание). Оп. 2. Д. 1271. – Дело о дворянском происхождении рода Ильясевичей. – 223 арк.
8. НИАБ. – Ф. 319. Оп. 2. Д. 3024. – Дело о дворянском происхождении рода Смольских. – 629 арк.
9. Памятная книжка Минской губернии и календарь (далее – ПКМГ) на 1860 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1860. – 4, 155, 111 с.
10. ПКМГ на 1861 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1861. – 229, 54 с.
11. ПКМГ на 1865 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1864. – 4, 232, 55 с.

| 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|
| 04.02.1852> | НИАБ 319-2-2866 | |
| 1891 | ПКМГ за 1869–1871, 1873–1875, 1878, 1881–1889, 1892 гг. | |
| 1912 | ПКМГ за 1893, 1895–1898, 1900–1901, 1903–1908, 1910–1912 гг. | |
| ? | ПКМГ за 1914 г. | |

12. ПКМГ на 1867 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1867. – XIX, 102 с.
13. ПКМГ на 1869 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1868. – 341, 6 с.
14. ПКМГ на 1870 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1870. – 315 с.
15. ПКМГ на 1875 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1875. – 192, 47 с.
16. ПКМГ на 1878 год. Ч. 1. – Минск : Тип. Губернского правления, 1878. – 714 с.
17. ПКМГ на 1878 год. Ч. 2. – Минск : Тип. Губернского правления, 1878. – VII, 122, 111 с.
18. ПКМГ на 1883 год. – Минск : Тип.-литограф. Р. Дворжец, 1882. – 335, XXII с.
19. ПКМГ на 1884 год. – Минск : Тип.-литограф. Р. Дворжец, 1883. – 333, XXI с.
20. ПКМГ на 1885 год. – Минск : Тип.-литограф. Р. Дворжец, 1884. – 327, XXI с.
21. ПКМГ на 1888 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1887. – 345, V с.
22. ПКМГ на 1892 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1891. – 408 с.
23. ПКМГ на 1893 год. – Минск : Тип. Губернского правления, 1892. – XLIV, 222, 40 с.
24. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2-е. – Санкт-Петербург : Тип. 2-го Отд-ния Собств. ее императ. величества канцелярии, 1830–1885. – Т. 6: 1831: [В 2-х отд-ниях]. – 1832. – 746 с.
25. Столетие Минской губернии / сост. А. П. Смородский. – Минск : Тип. Дворжец, 1893. – 90 с.
26. Bairašauskaitė, T. Lietuvos totoriai XIX amžiuje. – Vilnius : Mintis, 1996. – 331 p.
27. Brykowski, R. Tatarskie meczety w Rzeczypospolitej // Ochrona zabytków. – 1988. – T. 41. – № 3(162). – S. 153–172.
28. LVIA. – F. 391. Ap. 1. B. 278. – Дело о происхождении рода татар Байрулевичей. Герб Доленга. 1819–1844 гг.
29. Muchliński, A. Zdanie sprawy o tatarach litewskich // Teka Wileńska. – 1858. – T 4. – S. 241–272; T. 5. – S. 121–179; T. 6. – S. 139–183.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.11.2022

*М. Д. Макараў*

# Рынкавая плошча Віцебска ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.[1]

Паводле трапнага выразу Л. Хмяльніцкай, для Віцебска ансамбль Ратушнай (або Рынкавай) плошчы ў тым выглядзе, у якім ён склаўся ў другой палове XVIII ст. і існаваў да сярэдзіны 1930-х гг., з'яўляецца *«візітнай карткай горада»* [31, с. 24–25]. Яго сілуэт фарміраваўся трыма мураванымі дамінантамі – ратушай (1775 г.), касцёлам Святога Антонія (1740–1760-я гг.) і Васкрасенскай царквой (1772 г.). Гэтыя манументальныя пабудовы ў стылі позняга барока, знешні выгляд якіх да таго ж добра дакументуецца значнай колькасцю старых малюнкаў, фотаздымкаў і планаў, прыцягваюць пільную ўвагу гісторыкаў архітэктуры і краязнаўцаў [10, с. 136–149; 9, с. 8–19; 34, с. 31–37; 33, с. 141, 142, 144; 32, с. 54–56; 28, с. 58–63; 29, с. 91–96, 253–257; 31, с. 24–32; 41, с. 793–838; 1, с. 4–43; 38, с. 110–121]. Аднак Рынкавая плошча на Узгорскім пасадзе адыгрывала выключна важную ролю ў грамадскім і эканамічным жыцці горада задоўга да ўзвядзення тут у другой палове XVIII ст. мураваных будынкаў. На вялікі жаль, пра планіроўку і забудову віцебскага рынка (на той час пераважна драўляную) ранейшага перыяду вядома няшмат. Навуковыя працы, прысвечаныя менавіта ім, адзінкавыя [35, с. 17–20; 36, с. 33–35; 1, с. 7–11; 16, с. 70–74], а ранейшыя спробы апісання плошчы ці асобных яе аб'ектаў, зробленыя пераважна на падставе інвентароў горада 1638–1641 гг. і «Чарцяжа горада Віцебска 1664 г.» (далей – «Чарцёж 1664 г.»), нельга прызнаць дастаткова поўнымі ці ўдалымі [34, с. 24; 11, с. 16–17; 37, с. 63, 69, 70, 73, 74; 9, с. 8–9]. У дадзеным артыкуле паспрабуем у пэўнай ступені выправіць сітуацыю з вывучэннем планіроўкі і забудовы галоўнага рынка Віцебска эпохі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Спачатку сцісла ахарактарызуем сам Узгорскі пасад, цэнтрам прыцягнення і камунікацыі якога ў XVI–XVIII стст. з'яўлялася Рынкавая плошча. Ён займаў тэрыторыю ў міжрэччы Дзвіны і Віцьбы, што з паўночнага боку прылягала да Верхняга і Ніжняга замкаў Віцебска. Саму назву мясцовасці – Узгор'е – варта, па ўсёй верагоднасці, звязваць з рэзкім і значным павышэннем яе рэльефа ад Віцьбы ля замкаў у кірунку на поўнач. Паводле археалагічных даных, паўднёвая частка Узгор'я пачала засяляцца яшчэ ў X ст., а пра фарміраванне тут гандлёва-рамес-

[1] Даследаванне выканана ў рамках рэалізацыі навуковага праекта «Антрапалогія дарогі: камунікацыя руска-беларускага паграніčча ў XIV–XVIII стст.» (Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, № Г20Р-166).

ніцкага пасада можна ўпэўнена казаць з XII–XIII стст. [11, с. 80, 82; 3, с. 31]. Значэнне гэтай пляцоўкі, аточанай з трох бакоў стромкімі схіламі ўзвышшаў і рэкамі, у прасторавай структуры горада значна павысілася ў XVI ст., калі частымі сталі войны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. У сярэдзіне 1560-х гг. існавалі нават праекты перасялення «за раку Віцьбу» ўсіх жыхароў перыферыйнай (задзвінскай) часткі Віцебска, а таксама часткова насельніцтва замкаў, з мэтай стварэння на Узгор'і адзінага, кампактнага і надзейна абароненага прыродай і фартыфікацыямі гарадскога паселішча [24, арк. 59–59 адв.; 11, с. 84]. Аднак манаршыя распараджэнні на гэты конт, па ўсёй верагоднасці, так і не дачакаліся рэалізацыі на практыцы.

У XVI–XVII стст. Узгорскі пасад амаль заўсёды меў дадатковыя штучныя ўмацаванні (асабліва з найбольш небяспечнага паўночнага боку). За гэты час іх лінія некалькі разоў мяняла свой абрыс, а ахопленая імі тэрыторыя, у залежнасці ад канкрэтных гістарычных абставінаў, павялічвалася ці памяншалася. У першыя дзесяцігоддзі XVI ст. «астрог», які ў дакуменце 1522 г. названы «старым», перасякаў Узгор'е ад Віцьбы да Дзвіны такім чынам, што пакідаў царкву Іаана Багаслова (знаходзілася на сучаснай вуліцы Камуністычнай непадалёку ад яе скрыжавання з вул. Савецкай) *«на полі [...] за горадам»* [4, с. 43]. У 1630–1640-я гг. умацаванні Узгор'я (земляны вал) праходзілі на поўнач ад лініі сучаснай вуліцы Савецкай, абапіраліся на *«горы»* Вострую Магілу і Плоскую, а сваім усходнім краем падыходзілі да Віцьбы так, што згаданая царква знаходзілася пад іх абаронай – *«у астрозе»* [17, с. 37–38; 5, с. 40]. Пасля захопу Віцебска 2 снежня 1654 г. войскамі Маскоўскай дзяржавы плошча ўмацаванай часткі Узгор'я была радыкальна зменшана новымі ўладамі ў адпаведнасці з іх патрэбамі. Роў і напольная сцяна так званага «Узгорскага замка» прайшлі з паўночнага боку ад трасы сучаснай вуліцы Я. Купалы (рэшткі гэтых умацаванняў выяўлены ў ходзе археалагічных раскопак) [11, с. 19–20].

Цяжка вызначыць дакладна, калі тэрыторыя будучай Рынкавай плошчы пачала ператварацца ў гандлёва-эканамічны цэнтр Віцебска. У працах археолагаў можна сустрэць меркаванне, што ён быў перанесены сюды з усходняй часткі Ніжняга замка ў самым канцы XVI ст. [11, с. 15–16; 12, с. 100]. Аднак пэўная канцэнтрацыя гандлёвых аб'ектаў, несумненна, назіралася тут і раней. Так, прывілей караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста віцебскім мяшчанам на гасціны двор ад 23 лістапада 1551 г. сведчыць, што да ўзвядзення гэтага комплексу ў 6 мяшчанскіх сядзібах на яго тэрыторыі было ажно 4 *«лавачныя месцы»* [23, арк. 64–64 адв.; 18, с. 113–114]. Таму можна дапусціць, што цэнтр гаспадарчага жыцця мяшчанскай абшчыны на Узгор'і пачаў фарміравацца яшчэ ў першай палове XVI ст.

Рынкавая плошча сваім паўднёва-ўсходнім краем прылягала да маста праз Віцьбу, які вёў на Узгор'е ад Завіцебнай брамы Ніжняга замка. З поўначы і захаду да рынка сыходзіліся ўсе тры асноўныя камунікацыйныя восі Узгорскага пасада, на скрыжаванні якіх і ўзнікла гандлёвая пляцоўка: вуліцы Вялікая (у канцы XVII – першай палове XVIII ст. выступае таксама пад назвамі Большая Рынкавая, Старасуражская, Вялікая Суражская, Смаленская) [40, s. 373; 8, с. 305, 321; 21, арк. 9 адв.], Багародзіцкая (у першай палове XVIII ст. вядома таксама як Суражская) [15, с. 283–288] і Падзвінская (гл. іл. 3). З іх найбольшае значэнне традыцыйна мела вуліца Вялікая, якая быццам працягвала вуліцу пад той жа назвай на Ніжнім замку. Яна пачыналася ад маста ля Завіцебнай брамы і ішла на поўнач (з лёгкім ухілам: да сучаснай ратушы – на захад, ад сучаснай вуліцы Я. Купалы – на ўсход) па высокім правым беразе Віцьбы на пэўнай адлегласці ад ракі. Паводле даных інвентара 1638 г., за царквой Іаана Багаслова (прыблізна ў цэнтры квартала, утворанага сучаснымі вуліцамі Леніна, Урыцкага, Камуністычнай і Савецкай), на трасе вуліцы Вялікай знаходзілася адзіная на той момант у сістэме ўмацаванняў Узгорскага пасада брама [17, с. 37–38]. За ёй вуліца Вялікая пераходзіла ў дарогу, што вяла да велікакняжацкага двара Ілемніцы і горада Суража; другі значны шлях ішоў адсюль на мясцовасць Барвін, дзе функцыянаваў перавоз праз Дзвіну, і далей на горад Усвяты. Вуліца Багародзіцкая (назва паходзіць ад царквы Прачыстай Багародзіцы на Успенскай гары) пачыналася ад Васкрасенскай (Рынкавай) царквы, яе паўднёвы адрэзак адпавядаў фрагменту сучаснай вуліцы Суворава паміж вуліцамі Талстога і Крылова. Далей, як сведчыць інвентар 1638 г., ад вуліцы Багародзіцкай адыходзіў вялікі завулак (сучасная вуліца Крылова) у кірунку саборнай Прачысценскай царквы, а сама Багародзіцкая вуліца дастаткова блізка падыходзіла да згаданай царквы і двара архіепіскапа з іншага, паўночна-ўсходняга, боку [17, с. 40], пасля чаго, па ўсёй верагоднасці, ішла далей у кірунку «гары» Вострая Магіла. Вуліца Падзвінская звязвала рынак з берагам Дзвіны, дзе былі прыстані, і ў агульных рысах адпавядала сучаснай вуліцы Талстога. На самім рынку яе трасу працягваў папярэчны рад крам, што даходзіў да вуліцы Вялікай.

Пасля захопу Віцебска войскамі Маскоўскай дзяржавы ў 1654 г. вуліца Вялікая на некаторы час саступіла Багародзіцкай сваю вядучую ролю ў камунікацыйнай сістэме Узгорскага пасада. Як добра бачна на «Чарцяжы 1664 г.» [26] (гл. іл. 1), новая лінія ўмацаванняў, якая прайшла ўздоўж паўночнага краю сучаснай вуліцы Я. Купалы, перарэзала вуліцу Вялікую і фактычна зрабіла яе частку ў межах «астрога» другаснай. Новую браму – Суражскія вароты – маскоўскія ваяводы размясцілі ў цэнтры напольнай сцяны ўмацаванняў Узгор'я насупраць вуліцы Багародзіцкай. Апошняя ў сувязі з гэтым крыху змяніла сваю трасу, прайшла

праз браму і стала выконваць неўласцівыя ёй раней функцыі асноўнай камунікацыйнай восі пасада. На штучнасць такой сітуацыі ўказвае наступнае: адразу за Суражскімі варотамі (гл. іл. 1) гэтая новая вось рэзка паварочвала на ўсход і выходзіла на старую лінію Вялікай. Не пазней за першую палову XVIII ст., калі ўмацаванні так званага «Узгорскага замка» перасталі існаваць, вуліца Вялікая зноў стала галоўнай камунікацыйнай артэрыяй гэтай часткі горада.

У XVII ст. непасрэдна да Рынкавай плошчы прылягалі таксама дзве менш значныя вуліцы (ці завулкі). Першая з іх адыходзіла ад Вялікай на ўсход у самым яе пачатку амаль адразу за мастом праз Віцьбу. У сучаснай гарадской забудове ёй адпавядае праход паміж дамамі 33 і 35 па вуліцы Леніна. Інвентар 1638 г. называе гэтую тупіковую вуліцу завулкам [17, с. 36], што падаецца абгрунтаваным. Аднак у дакументах другой паловы XVII ст. яна не раз выступае менавіта як «вуліца» з уласнай назвай – Гавейная ці Гавейніца (Hawieyna, Howieynica, Howiennica) [7, л. 411 об.; 20, арк. 616 адв., 620 адв.]. Прыблізна на такой жа адлегласці ад маста ад вуліцы Вялікай у заходнім кірунку ішла яшчэ адна вулачка – уздоўж Віцьбы да Васкрасенскай (Рынкавай) царквы, – але праз тое, што была невялікай, у дакументах заўсёды называлася завулкам [17, с. 39].

За апошнія тры стагоддзі забудова Рынкавай плошчы і тапаграфічная сітуацыя вакол яе некалькі разоў мяняліся кардынальна. Аднак і цяпер, дзякуючы рэшткам планіроўкі, асобным пабудовам і захаваным пісьмовым крыніцам, можна дастаткова дакладна прывязаць да мясцовасці тыя аб'екты, што існавалі тут да сярэдзіны XVIII ст.

Разгляд забудовы Рынкавай плошчы другой паловы XVI – пачатку XVIII ст. лагічна пачаць з комплексу гасцінага двара і ратушы (праўда, пра апошнюю можна весці размову не раней чым з 1597 г.). Гэты комплекс займаў значную тэрыторыю на паўночным высокім баку рынка і адыгрываў выключна важную ролю ў эканамічным і грамадскім жыцці горада. Гасціны двор, што выконваў ролю гатэля і склада тавараў для прыезджых купцоў, стаў першым камунальным аб'ектам, прыбыткі з якога мяшчанская абшчына атрымлівала ў сваё распараджэнне. Апрача таго, да 1597 г. віцебскія мяшчане менавіта тут збіраліся на свае сходы, каб вырашаць актуальныя пытанні жыцця горада [16, с. 70].

Час узнікнення комплексу віцебскага гасцінага двара можна вызначыць дастаткова дакладна. У кнізе запісаў 35 Метрыкі ВКЛ захаваўся прывілей Жыгімонта Аўгуста *«войту і ўсім мяшчанам віцебскім пацвярджэнне ім некаторых пляцаў з харомамі ў горадзе Віцебску набытых і дазвол ім на тых пляцах дом гасціны збудаваць і з гэтага прыбытак на патрэбы гарадскія мець»*, які датуецца 23 лістапада 1551 г. [23, арк. 63 адв.–64 адв.; 18, с. 113–114]. Прычыны ўзвядзення гасцінага дома (двара) у гэтым дакуменце акрэслены наступным чынам. Войт і

мяшчане, якія прыбылі да манарха, паведамілі яму, *«што ў той горад наш Віцебск»* прыязджаюць *«шматлікія іншаземцы, як масква, так і немцы»*. Замежныя купцы *«спыняюцца ў розных дамах і там у тых гасподах сваіх невядома чым займаюцца»* і *«ўсю справу таго горада нашага ў свае землі выносяць»*. Мяшчане, асцерагаючыся, *«каб у будучыні ад такіх прыезджых гасцей іншаземцаў большая здрада і шкода таму гораду […] Віцебску памежнаму не сталася»*, білі вялікаму князю чалом, *«каб ім дазволілі некалькі дамоў і пляцаў за ракой Віцьбай за гарадскія грошы набыць і на тых пляцах адзін дом гасціны збудаваць»*. У гэтым гасціным доме, на думку віцяблян, у будучыні мусілі спыняцца са сваімі таварамі *«іншаземцы […] і ўсе іншыя госці прыезджыя»*, *«каб кожная справа іх, што б яны там у тым горадзе нашым знаходзячыся рабілі, каб і ўраду замкаваму, і ўраду гарадскому віцебскаму таемнай не была»* [23, арк. 63 адв.–64].

На момант прыбыцця віцебскай дэлегацыі да манарха ў Вільню ўсе неабходныя зямельныя ўчасткі *«за ракой Віцьбай»* ужо былі выкуплены ў ранейшых гаспадароў і пераведзены ў камунальную ўласнасць. Мяшчанская абшчына набыла: 1) у Івашкі Іванавіча Грабеньчыча – пляц *«з харомамі і з месцам лавачным»* за 50 коп грошаў; 2) у Косткі Грабеньчыча – пляц *«з харомамі і з месцам лавачным»*, а таксама частку іншага пляца за 90 коп грошаў; 3) у Марыны Пашкавай Гарасімовічавай і яе дзяцей Багдана, Іллі і Косткі – пляц *«з харомамі і з лавачным месцам»* за 70 коп грошаў; 4) у Хамы Сцяпанавіча Бібліна – пляц *«з харомамі»* за 100 коп грошаў; 5) у Марыі Маркіянавай, яе сына Паўла, дачок Крысціны, Ганны і Фядоры – пляц *«з харомамі і з месцам лавачным»* за 50 коп грошаў; 6) у Карпа Ігнатавіча Каваля – пляц *«з харомамі»* за 20 коп грошаў [23, арк. 64–64 адв.]. На выкуп зямлі была выдаткавана дастаткова значная для сярэдзіны XVI ст. сума – 380 коп літоўскіх грошаў.

Жыгімонт Аўгуст прыхільна паставіўся да просьбы падданых. 23 лістапада 1551 г. ён пацвердзіў набыццё горадам згаданых аб'ектаў нерухомасці, а таксама дазволіў мяшчанам *«на тых пляцах набытых […] дом гасціны збудаваць»*, і ўсе прыбыткі ад яго эксплуатацыі накіроўваць *«на патрэбы гарадскія»* [23, арк. 64 адв.]. Нягледзячы на наяўнасць дакладна датаванага манаршага дазволу, цяжка сказаць, калі ж на самой справе быў узведзены гасціны двор. Магчыма, у лістападзе 1551 г. ён ужо існаваў, але не выключана, што яго будынкі былі ўзведзены пазней. У любым выпадку, сімвалічнай датай пачаткаў комплексу ратушы і гасцінага двара ў Віцебску можна лічыць дзень падпісання манаршага прывілея – 23 лістапада 1551 г.

Пасля надання гораду 17 сакавіка 1597 г. магдэбургскага права на тэрыторыі гасцінага двара паўстала першая віцебская ратуша. Аднак неабходна разумець, што, па меншай меры, да сярэдзіны 1640-х гг. ні-



Іл. 1. «Чарцёж горада Віцебска 1664 г.» (фрагмент)

кай манументальнай рэзідэнцыі гарадскіх улад тут не існавала. Як сведчаць дакументы, упісаныя ў кнігі віцебскага земскага суда, у маі 1598 г. пасяджэнні магістрата адбываліся ў *«ізбе судовай гарадской»* (магчыма, часова прыстасаваным пад патрэбы органаў самакіравання памяшканні), што размяшчалася на гасціным двары [19, арк. 156–157]. Насуперак цвёрда замацаванаму ў гістарычнай навуцы перакананню, гэта «ратуша» не была разбурана пасля забойства ў 1623 г. віцебскімі мяшчанамі полацкага ўніяцкага архіепіскапа Ясафата Кунцэвіча і звязанага з гэтымі

падзеямі часовага пазбаўлення горада ўсіх правоў. У верасні 1638 г. тая *«ізба белая, у якой падчас права магдэбургскага суды адбываліся»*, усё яшчэ стаяла на сваім месцы ў паўночна-ўсходняй частцы комплексу [17, с. 36–37].

На сёння вядомыя тры адносна падрабязныя апісанні віцебскага гасцінага двара першай паловы XVII ст. Яны паходзяць з інвентароў горада 1638, 1639 і 1641 гг. У першым з іх (1638 г.) пра забудову комплексу гаворыцца наступнае: *«Каля той каморы вароты ўязныя да дому гасцінага. На тых варотах ганак, а наверсе гадзіннік гарадскі добры. Увайшоўшы ў дом гасціны, налева павярнуўшы, важніца, у якой шалі адны меншыя, а другія большыя. [...] Каля важніцы сем камор для гасцей. Ідучы ўлева, на другім баку дзве ізбы чорныя для гасцей. Побач ізба белая, у якой падчас права магдэбургскага суды адбываліся. На трэцім баку павець для коней. На чацвёртым – камора гасцінная вялікая»* [17, с. 36–37]. У інвентары 1639 г. будынкі віцебскага гасцінага двара апісваюцца так: *«У тым пасадзе Узгорскім найперш дом гасціны на рынку горада Віцебска насупраць царквы размешчаны, да якога вароты вялікія ўязныя. А на версе тых варот пакойчык. На тым пакойчыку гадзіннік з вялікім звонам гадзіннікавым знаходзіцца. А ў самім доме гасціным пякарня з сянямі і насупраць святліца маленькая старая, ужо заняпалая. Да таго, дзе госці прыехаўшы склад тавараў маюць, на тое свіранаў сем, да таго і спіхлер вялікі [...]. У тым жа доме гасціным важніца, ці спіхлер стары заняпалы»* [39, k. 4 v.]. Адпаведны фрагмент інвентара 1641 г. фактычна слова ў слова паўтарае цытаваны вышэй урывак дакумента 1639 г. і не дадае да двух больш ранніх апісанняў нічога новага [43, l. 302v.–303; 4, с. 353]. Звесткі інвентара 1638 г. маюць сістэмны характар: яго складальнік перамяшчаўся па перыметры гасцінага двара і па чарзе пералічыў наяўныя будынкі на ўсіх чатырох лініях комплексу. Апісанні 1639 і 1641 гг. не могуць адзначыцца падобным, але яны не супярэчаць першаму і ўтрымліваюць шэраг цікавых дэталяў.

На падставе прыведзеных дадзеных можна зрабіць выснову, што ў першай палове XVII ст. гасціны двор займаў пляцоўку ў форме прамавугольніка ці вельмі высокай трапецыі паміж вуліцамі Вялікай і Багародзіцкай, меў унутраны двор і дастаткова шчыльную забудову па перыметры. Яго тэрыторыя пачыналася насупраць на той час яшчэ драўлянай Васкрасенскай (Рынкавай) царквы (размяшчалася на месцы паўднёвай ніжняй часткі мураванага храма XVIII ст.) ці крыху вышэй ад яе і цягнулася на поўнач. На заходняй лініі комплексу, уздоўж вуліцы Багародзіцкай, у напрамку ад рынка размяшчаліся: двухпавярховая брама з гарадскім гадзіннікам, кухня з сянямі, важніца і сем свіранаў для захоўвання купецкіх тавараў. Паўночны бок з захаду на ўсход фарміравалі два простыя дамы, дзе прыезджыя купцы спыняліся на пастой, і больш прад-




Іл. 2. План горада Віцебска 1774–1775 гг. (фрагмент)

стаўнічая пабудова, што да 1624 г. (а магчыма, і пасля 1641 г.) служыла месцам правядзення пасяджэнняў віцебскага магістрата. Усходні бок гасцінага двара ўздоўж вуліцы Вялікай займала павець ці «шопа», пад дах якой купцы ставілі сваіх коней і вазы. На паўднёвай лініі комплексу, што непасрэдна прымыкала да рынка, размяшчаўся яшчэ адзін вялікі свіран для захоўвання тавараў.

Варта звярнуць увагу на тое, што *«ізба белая, у якой падчас права магдэбургскага суды адбываліся»*, знаходзілася ў паўночна-ўсходняй і найбольш аддаленай ад Васкрасенскай (Рынкавай) царквы частцы гасцінага двара бліжэй да вуліцы Вялікай. Калі накласці ўмоўны прамавугольнік комплексу на сучасны план плошчы (гл. іл. 3), можна заўважыць, што рэшткі сцен мураванай ратушы другой паловы XVII ст. таксама адпавядаюць паўночна-ўсходняму сектару перыметра гэтай фігуры. Таму можна выказаць здагадку пра пераемнасць месца паміж «ізбой белай» інвентара 1638 г. і пазнейшай мураванай ратушай. І калі гэта так, то гасціны двор у першай палове XVII ст. мог ахопліваць на поўначы ўсю пляцоўку пад корпусам ратушы 1775 г. і мець агульныя памеры каля 60×30 м.

Крыху інакш комплекс гасцінага двара і ратушы выглядае на «Чарцяжы 1664 г.» [26]. Нягледзячы на тое, што ён не заўсёды дакладна

перадае асаблівасці тапаграфіі, маштаб і форму аб'ектаў (чаму варта было б прысвяціць асобнае даследаванне), выява забудовы рынка на ім заслугоўвае самай пільнай увагі. Гасціны двор паказаны ў выглядзе прамавугольніка, што пачынаецца непасрэдна ад «папярэчнага» рада крам (а значыць, бліжэй да Віцьбы, чым у першай палове XVII ст.) і цягнецца на поўнач паміж вуліцамі Багародзіцкай і Вялікай (прычым, на пэўным аддаленні ад апошняй). Па перыметры ён шчыльна забудаваны дробнымі гандлёвымі аб'ектамі, побач з якімі двойчы змешчаны подпіс *«лаўкі»*, і толькі ў паўночна-заходняй частцы комплексу прысутнічаюць больш маштабныя будынкі. Брама гасцінага двара, пазбаўленая ранейшай дамінантнай функцыі (без другога паверха і гарадскога гадзінніка), змешчана прыблізна там, дзе знаходзілася раней. Найбольшую цікавасць выклікае драўляны (пазначаны характэрнай гарызантальнай штрыхоўкай) двухпавярховы будынак ратушы, завершаны высокім шатровым дахам з галерэяй і бельведэрам над яго ўсечанай верхняй часткай. На «Чарцяжы 1664 г.» ён намаляваны на іншым, чым у ранейшай сядзібы магістрата, месцы: у заходняй лініі комплексу, амаль насупраць Васкрасенскай царквы. Нельга цалкам выключаць, што гэты будынак быў узведзены пасля 1641 г., калі Віцебск паўторна атрымаў магдэбургскае права. Аднак хутчэй за ўсё, адлюстраваная ратуша паўстала ўжо ў перыяд знаходжання горада пад уладай Маскоўскай дзяржавы. У адрозненне ад «ізбы белай» інвентара 1638 г. яна адным з фасадаў выходзіць на вуліцу Багародзіцкую, а апошняя, як ужо адзначалася вышэй, часова стала галоўнай камунікацыйнай воссю Узгор'я толькі пасля 1654 г.

Цяжка сказаць, да якога часу комплекс гасцінага двара праіснаваў у такім выглядзе, як мы яго бачым на «Чарцяжы 1664 г.». Верагодна, ён быў знішчаны моцным пажарам 6 (16) верасня 1680 г., пра які ў «Летапісе Панцырнага і Аверкі» згадваецца нават двойчы: 1) *«выгарэў Віцебск, сам горад, чатыры царквы, ратуша і крамы»*; 2) *«горад згарэў, ратуша, крамы і касцёлы»* [25, с. 196, 200]. Пасля гэтага ён, несумненна, аднаўляўся (прынамсі, яго інфраструктура, непасрэдна звязаная з гандлем), бо ў 1733 г. гарадская важніца знаходзілася на сваім старым месцы пры вуліцы Суражскай (былой Багародзіцкай) [15, с. 284, 286], а на плане Віцебска 1774–1775 гг. (варта адзначыць, што ён не вызначаецца асаблівай дакладнасцю) гэты абшар усё яшчэ займаюць некалькі паралельных радоў «лавак» (пазначаны пад № 26) [27]. Канчаткова тэрыторыя былога гасцінага двара на поўдзень ад ратушы была ачышчана ад невялікіх драўляных будынкаў у першыя гады пасля ўключэння горада ў склад Расійскай імперыі.

У другой палове XVII ст. (магчыма, пасля пажару 1680 г.) на тэрыторыі гасцінага двара была збудавана першая мураваная ратуша. Рэшткі яе канструкцый выяўлены ў ходзе даследаванняў 1980-х гг. у сутарэн-




Іл. 3. Прыблізны план Рынкавай плошчы па стане на сярэдзіну XVII ст., накладзены на сучасны спадарожнікавы здымак

нях усходняй часткі пазнейшай познебарочнай пабудовы [36, с. 33–35]. Гэтая мураваная ратуша прысутнічае на плане Віцебска 1774–1775 гг. (гл. іл. 2; № 25), дзе паказана як невялікі квадратны ў плане будынак, які знаходзіцца на значнай адлегласці на паўночны ўсход ад Васкрасенскай (Рынкавай) царквы і выразна бліжэй да трасы вуліцы Вялікай [27]. Падобнае яе размяшчэнне, у адпаведнай частцы ўмоўнага прамавугольніка былога гасцінага двара, дазваляе сцвярджаць, што яна магла быць збудавана на месцы «ізбы белай» першай паловы XVII ст. Цікава, што 11 верасня 1749 г. у ходзе канфлікту за віцебскае войтаўства паміж Марцыянам Міхалам Агінскім і Юзафам Сасноўскім мураваны і атынкаваны будынак ратушы вытрымаў нават сапраўдны штурм [14, с. 94–99].

5(16) сакавіка 1775 г. паміж віцебскім магістратам і мясцовымі дойлідамі Грыгорыем Коткам і Аляксандрам Лісінскім быў заключаны кантракт на ўзвядзенне той ратушы, якая і цяпер узвышаецца на плошчы. Паводле яго ўмоў, згаданыя майстры абавязваліся за адзін будаўнічы сезон спачатку разабраць старую ратушу да падмуркаў, а пасля ўзвесці новую на тым жа месцы з выкарыстаннем атрыманых пры зносе

папярэдняй матэрыялаў. Неўзабаве гэта было зроблена, і да пачатку мая 1775 г. мураваная ратуша другой паловы XVII ст. спыніла сваё існаванне [22, арк. 264–264 адв., 271].

Цяпер звернем увагу на забудову ўсходняга боку рынка, якая ў XVII – першай палове XVIII ст. складалася ў асноўным з крам, і разгледзім пытанне размяшчэння іншых радоў крам на Рынкавай плошчы. Варта адразу адзначыць, што ўсходняя лінія тагачаснага віцебскага рынка і сёння часткова чытаецца на мясцовасці: ёй адпавядаюць галоўныя фасады захаваных гістарычных дамоў 33 і 35 (адпаведна канец XVIII і пачатак XX ст.) па сучаснай вуліцы Леніна.

Паводле звестак інвентара 1638 г., на ўсходнім баку вуліцы Вялікай суцэльны рад крам пачынаўся ад яе скрыжавання з першым буйным завулкам (вуліцай Гавейнай). Тут адпаведна з поўдня на поўнач размяшчаліся: 22 крамы, комплекс гарадскіх хлебных *«лавак»* (па ўсёй верагоднасці, ён выходзіў на Вялікую толькі тарцом, бо складальнік дакумента мусіў «вярнуцца» на асноўную «лінію»), а за ім яшчэ 4 крамныя «каморы». Насупраць – на заходнім баку вуліцы – стаялі 22 крамы. Прыблізна пасярэдзіне іх шэрагу да Вялікай з захаду падыходзіў «папярэчны» гандлёвы рад (пачынаўся насупраць Васкрасенскай царквы і фактычна з'яўляўся працягам вуліцы Падзвінскай), на абодвух баках якога знаходзілася 21 крама. Яшчэ дзве гандлёвыя кропкі – *«паўкаморак»* і *«камора»* – займалі самы пачатак усходняга боку вуліцы Багародзіцкай ад яе вугла з «папярэчным» радам да брамы гасцінага двара [17, с. 36]. Усяго складальнік інвентара 1638 г. налічыў на віцебскім рынку 70 крам (ці камор) і адзін больш дробны гандлёвы аб'ект – паўкаморак.

Крыху іншыя, але ў суме вельмі падобныя лічбы прадстаўлены ў інвентарах 1639 і 1641 гг. У першым з гэтых дакументаў згадваюцца: *«каля таго дому гасцінага»* – 36 крам і два *«прыкрамкі»*; ганчарскіх і саляных – 14 крам і прыкрамак; рэзніцкіх – 24 крамы і прыкрамак (разам 74 крамы і чатыры прыкрамкі); а таксама комплекс хлебных *«лавак»*. Істотна, што пры гэтым, паводле інвентара 1639 г., 8 ганчарскіх крам знаходзіліся *«ў завулку»*, першыя дзве рэзніцкія (Івана Чорнага і Фёдара Луніна) – на заходнім, а астатнія 22 (пачынаючы з ажно 7 крам Сцяпана Пятровіча) – на ўсходнім баку вуліцы Вялікай [39, k. 5–6]. У інвентары 1641 г. названы: *«рынкавыя»* – 35 крам і два прыкрамкі; ганчарскія і саляныя – 14 крам і прыкрамак; рэзніцкія – 23 крамы і прыкрамак (разам – 72 крамы і чатыры прыкрамкі); а таксама комплекс хлебных *«лавак»* (на тым жа баку, што і рэзніцкія крамы) [43, l. 196–197v.; 6, арк. 69–69 адв.].

Такім чынам, у першай палове XVII ст. гандлёвыя кропкі на віцебскім рынку размяшчаліся ў асноўным уздоўж дзвюх ліній: адрэзка вуліцы Вялікай і працяга вуліцы Падзвінскай, што сыходзіліся пад блізкім да прамога вуглом і ўтваралі Т-падобную ў плане фігуру. Першая з гэ-

тых ліній у дакументах 1740-х гг. дастаткова часта называецца «вялікім» радам [8, с. 308–319]. Пра ўстойлівую назву другой нічога не вядома, але для зручнасці яе можна ўмоўна называць «папярэчным» радам. Крыху адасоблена, у завулку, які ішоў ад маста да Васкрасенскай царквы ўздоўж Віцьбы, па суседстве з жылымі дамамі, размяшчалася толькі група ганчарскіх крам.

Паспрабуем прыблізна вызначыць даўжыню асноўных крамных радоў. Каб зрабіць гэта, неабходна ведаць сярэднія памеры адной гандлёвай кропкі. На шчасце, у нашым распараджэнні маецца некалькі дакументаў 1740-х гг., у якіх акрэслены параметры трох зямельных участкаў пад крамамі на віцебскім рынку. Яны былі нестандартнымі і рознымі, а іх даўжыня ўздоўж вуліцы складала адпаведна 3½, 5⅓ і 3¾ віленскіх локцяў [8, с. 304–307, 320–324, 326]. На гэтай падставе можна дапусціць, што франтальны бок сярэдняй крамы меў даўжыню каля 4⅕ віленскіх локцяў ці 2,72 м (1 локаць = 64,96 см). Такім чынам, суцэльны рад крам на ўсходнім баку вуліцы Вялікай (26×2,72 м = 70,72 м) разам з комплексам хлебных лавак, што выходзіў на вуліцу тарцом, на наш погляд, мог мець даўжыню да 80 м. Ідучы ад рога вуліцы Гавейнай (цяпер паўднёва-заходні рог дома 35 па вуліцы Леніна), ён мог дасягаць месца насупраць сярэдзіны корпуса пазнейшай мураванай Васкрасенскай (Рынкавай) царквы, адкуль ужо пачынаўся комплекс гасцінага двара. Папярэчны рад, на адным з бакоў якога павінна было знаходзіцца 11 крам, мог дасягаць даўжыні каля 30 метраў (11×2,72 м = 29,92 м), што прыблізна адпавядае адлегласці ад вуліцы Вялікай да Багародзіцкай ці шырыні гасцінага двара.

У канцы 1640-х гг. у паўднёвай частцы ўсходняга боку «вялікага» рада быў узведзены знакавы для тагачаснай амаль цалкам драўлянай гарадской забудовы аб’ект – мураваны дом («камяніца») віцебскага бурмістра Сцяпана Пятровіча, першы цагляны будынак на Рынкавай плошчы. На час яго ўзвядзення ўказвае запіс пра кантракт на пабудову трох мураваных дамоў у Віцебску, заключаны ў 1647 г. паміж С. Пятровічам і невядомымі нам дойлідамі (сам дакумент, па ўсёй верагоднасці, не захаваўся) [1, с. 9–10]. Лакалізаваць «камяніцу» на мясцовасці можна з высокай ступенню дакладнасці. Яна была збудавана на месцы крам бурмістра (першыя 7 ад вугла вуліцы Гавейнай; 7×2,72 м = 19,04 м), а значыць, у любым выпадку знаходзілася там, дзе зараз стаіць дом 35 па вуліцы Леніна.

У 1667 г., пасля адыходу з Віцебска маскоўскіх войскаў, згаданую «камяніцу» занялі і прыстасавалі пад сваю капліцу манахі-францысканцы, якія прыбылі сюды з канвента мястэчка Сянно. Аднак яны не здолелі ўтрымаць пляцоўку, бо ўласнік размешчанай побач буйной юрыдыкі ваявода віцебскі Ян Антоні Храпавіцкі меў планы заснаваць тут

кляштар бернардзінцаў. У выніку францысканцы былі вымушаны пакінуць горад. Ужо пасля іх ад’езду, 5 верасня 1676 г. было складзена апісанне капліцы (а значыць, былой «камяніцы» С. Пятровіча) і драўляных будынкаў, якія да яе адносіліся, што дае пэўнае ўяўленне пра першае цаглянае збудаванне на віцебскім рынку [1, с. 9–10].

Пра саму капліцу («камяніцу») у апісанні 1676 г. гаворыцца наступнае: *«Найперш ідучы да той капліцы з вуліцы Большай Рынкавай ад брамы праз мост з правага боку. Дзверы ў тую капліцу драўляныя работы цяслярскай на завесах, зашчэпка з прабоямі і з замком. Увайшоўшы ў сені, дзверы ў тую самую капліцу драўляныя работы цяслярскай на завесах без зашчэпак і прабояў. У сярэдзіне капліцы стол для Святой Імшы адзін, лавак з правага боку пяць, а з левага тры. Хоры, дзе спяваюць, драўляныя. Вокнаў у свінец апраўленых пяць, а шостае дошкамі закрытае. Абразоў ніякіх няма. Выходзячы з той капліцы, дзверы на завесах адны без клямкі. Закрыстыя ўся занепалая, дзвярэй няма. Пад той капліцай склеп мураваны, дзверы дваістыя з трыма завесамі, а трэцяя зашчэпка і прабой 1»* [40, с. 373–374]. Такім чынам, будынак быў аднапавярховым, меў 6 вокнаў і два ўваходы, а таксама сутарэнні пад асноўным аб’ёмам.

У тым жа 1676 г. Ян Антоні Храпавіцкі перадаў згаданы мураваны дом віцебскаму кляштару бернардзінцаў [7, арк. 412; 1, с. 11]. Аднак цяжка сказаць, ці быў пры гэтым канчаткова вызначаны ўласніцкі статус аб’екта. 6 кастрычніка 1686 г. віцебскі земскі пісар Адам Францішак Кісель пры наданні кляштару пусташы Булатнікава адназначна сцвярджаў, што «камяніца» нябожчыка Пятровіча, якая раней перайшла да яго бацькоў за пазыкі бурмістра, належыць менавіта яму [7, арк. 468 адв.–469]. У святле захаваных крыніц немагчыма сказаць, калі дом Пятровіча быў разбураны. Верагодна, у другім дзесяцігоддзі XVIII ст. ён яшчэ ў нейкай форме існаваў, бо ў дакументах гэтага часу згадваецца *«даўні мур»* побач з бернардзінскімі крамамі, які мог быць толькі рэшткамі дома [8, с. 321].

Найлепш абсталяванай часткай «вялікага» рада крам быў крыху адасоблены ад яго (выходзіў на вуліцу тарцом) *«торг, дзе хлеб і пірагі прадаюць»*. Як сведчаць інвентары 1639 і 1641 гг., ён быў забяспечаны адмосткай з дошак у праходах і дахам над прылаўкамі [39, k. 5v.; 6, арк. 69–69 адв.]. У глыбіні гэтага торгу (але дакладна не на лініі вуліцы Вялікай) у першай палове XVII ст. стаяла Спаса-Праабражэнская царква з прыдзелам Святога Мікалая. Цікава, што 3 лютага 1619 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза сваім прывілеем на падставе дабраславення ўніяцкага архіепіскапа Ясафата Кунцэвіча дазволіў віцебскім мяшчанам-кормнікам адрамантаваць гэты занепалы на той момант храм і арганізаваць пры ім брацтва [4, с. 97–98]. У 1663 г.

Спаса-Праабражэнская царква яшчэ існавала [5, с. 177–178]. У дакументах пасля 1667 г. згадкі пра яе не выяўлены.

Актам фундацыі 1676 г. Ян Антоні Храпавіцкі перадаў віцебскаму кляштару бернардзінцаў значную дзялянку зямлі на Узгор'і, які быў з усходу абмежаваны Віцьбай, з поўдня – вуліцай Гавейнай, з захаду – вуліцай Вялікай, а на поўначы даходзіў да пляца, дзе стаяла царква Святога Мікалая. У гэтым чатырохвугольніку бернардзінцы не атрымалі адразу толькі шэраг крам «вялікага» рада і некалькі дамоў юрыдыкі ўніяцкіх архіепіскапаў, якія цясніліся ўздоўж вуліцы Вялікай [1, с. 11; 7, л. 411 об.–412]. У апошняй чвэрці XVII – першай палове XVIII ст. на гэтай дзялянцы некалькі разоў узводзіліся і аднаўляліся пасля пажараў 1680, 1708 і 1733 гг. драўляныя будынкі касцёла і кляштара. Аднак пра іх дакладнае размяшчэнне, формы і архітэктуру цяжка сказаць што-небудзь пэўнае [1, с. 10–12]. У пачатку 1740-х гг., калі распачалося ўзвядзенне мураванага касцёла Святога Антонія, бернардзінцы былі вымушаны набыць у віцебскіх мяшчан некалькі крам на ўсходнім баку «вялікага» рада, бо для размяшчэння ўздоўж вуліцы галоўнага фасада новай святыні ім не хапала месца [1, с. 14; 8, с. 300–328].

Далей на поўнач на тым жа ўсходнім баку вуліцы Вялікай у XVII – пачатку XVIII ст. стаяла драўляная царква Святога Мікалая, фактычна забытая ў наш час. Па ўсёй верагоднасці, яна была пабудавана яшчэ ў XVI ст., бо ў інвентары маёмасці полацкай архіепіскапіі 1618 г. згадваецца як *«заняпалая»* (трэба разумець, старая) [4, с. 347]. Згодна са звесткамі інвентара Віцебска 1638 г., ад месца, *«дзе крамы скончыліся»*, яе аддзялялі тры дамы юрыдыкі ўніяцкіх архіепіскапаў [17, с. 37]. Даўжыня пляцаў пад згаданымі дамамі ўздоўж вуліцы нам невядомая, аднак відавочна, што храм знаходзіўся насупраць комплексу гасцінага двара, усходні бок якога меў даўжыню да 60 м. Яшчэ адным маркерам блізкага размяшчэння царквы Святога Мікалая можа служыць Мікольскі «бычок» умацаванняў так званага Узгорскага замка, назва якога, несумненна, паходзіць ад назвы царквы. Згодна з вымярэннямі, выкананымі ў 1665 г. маскоўскімі ўладамі, даўжыня лініі абарончых сцен і веж ад паўночнага берага Віцьбы насупраць Ніжняга замка да гэтага аб'екта складала каля 63⅓ сажаняў (1 сажань = 2,16 м) ці 136,5 м [5, с. 335–336]. Гэта азначае, што Мікольскі «бычок» стаяў на поўнач ад сучаснага маста, які вядзе з Ратушнай плошчы да Канцэртнай залы «Віцебск», ці, іншымі словамі, як і аднайменная царква, выразна насупраць былога гасцінага двара.

У першай палове XVIII ст. царква Святога Мікалая на рынку ўсё яшчэ дзейнічала. 12 снежня 1738 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст III у сваім прывілеі віцебскім саладоўнікам, піваварам і вінакурам на цэх і брацтва абавязаў гэтую новую рамесніцкую карпарацыю па

мажлівасці падтрымліваць храм ахвяраваннямі [6, арк. 101]. У студзені 1765 г. на поўнач ад мураваных будынкаў кляштара бернардзінцаў на месцы царквы ўжо стаяў толькі крыж, які нагадваў пра яе існаванне [21, арк. 9 адв.]. У далейшым царква Святога Мікалая на рынку не аднаўлялася і паступова была забыта.

Цяпер звернемся да разгляду забудовы больш кароткага (заходняга) боку віцебскага рынку. Найважнейшым аб'ектам гэтай яго часткі, як і ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст., так і пазней, з'яўлялася Васкрасенская (Рынкавая) царква. У літаратуры звычайна адзначаецца, што яна магла быць заснавана ў першай палове XVI ст. [32, с. 54]. У 1558 г. храм ужо дакладна існаваў, бо гэтым годам датуецца ўкладны запіс на ахвяраваным яму віцебскімі мяшчанамі Евангеллі сярэдзіны XVI ст., якое цяпер захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Маскве: *«Васіль і Сімяон Сісцчы, мяшчане віцебскія, на царкву рынкавую Уваскрэсення Хрыстовага, што ў Віцебску стаіць, у год тысяча пяцьсот пяцьдзясят восьмы ў гонар і хвалу Госпаду Богу на вечныя часы»* [32, с. 54]. І ўсё ж, храналагічны прамежак заснавання царквы можа быць вызначаны больш дакладна.

У дакументах 16-й і 228-й кніг Метрыкі ВКЛ, што з'яўляюцца судовымі кнігамі віцебскіх ваявод, адпаведна, Яна Юр'евіча Глябовіча за 1530–1532 гг. і Мацея Войцехавіча Клочкі за 1533–1540 гг., згадваюцца каля дзесяці віцебскіх цэркваў. Аднак Васкрасенскай царквы на Узгор'і сярод іх няма [2, с. 5–110; 30, с. 58–357]. Паколькі згаданыя кнігі Метрыкі ўтрымліваюць масавы і дастаткова падрабязны матэрыял пра жыццё Віцебска за цэлае дзесяцігоддзе, можна з вялікай ступенню верагоднасці дапусціць, што да 1540 г. яе яшчэ не існавала.

У інвентары маёмасці Полацкай архіепіскапіі, складзеным 10 студзеня 1618 г., пералічаны ўсе тагачасныя віцебскія цэрквы і пададзена сціслае апісанне іх нерухомай маёмасці. Пра Васкрасенскую (Рынкавую) царкву ў гэтым дакуменце гаворыцца наступнае: *«На царкву Уваскрэсення Хрыстовага, размешчаную ў горадзе Віцебску на рынку, за пасадам Узгорскім, наданне нейкага Грыгорыя, войта, палянак дзве, на тую ж царкву сенажаць, якая завецца Трашчаніца, і палянак дзве, наданне Стафана Кекі»* [4, с. 352]. Перадачу «нейкім» (а значыцца, даўно забытым) войтам Грыгорыем, а таксама Стафанам Кекам згаданых зямель Васкрасенскай (Рынкавай) царкве варта разглядаць як «фундацыю» – матэрыяльнае забеспячэнне падстаў дзейнасці будучага храма. Па ўсёй верагоднасці, гэтыя зямельныя ахвяраванні былі зроблены пры заснаванні царквы.

Сярод віцебскіх войтаў XVI – пачатку XVII ст. імя Грыгорый меў толькі адзін чалавек. Гэта – Грыгорый (ці «Грыша») Алехнавіч Гутар, які атрымаў віцебскае войтаўства ад Жыгімонта Аўгуста не пазней за

пачатак 1547 г. на ўмовах *«да ласкі гаспадарскай»*, а каля 1553 г. з невядомых прычын адмовіўся ад пасады і добраахвотна *«здаў той урад у рукі»* манарха [13, с. 119]. Паколькі «фундацыя» Васкрасенскай (Рынкавай) царквы звязана з яго імем, можна зрабіць выснову, што храм быў заснаваны ў перыяд з 1547 па 1553 г. Да таго ж, хутчэй за ўсё, гэта адбылося ў апошнія гады пазначанай «сямігодкі», бо ў спісе віцебскіх цэркваў 1552 г. (праўда, дэфектным і няпоўным) згаданы храм таксама адсутнічае [4, с. 341–343].

Такім чынам, драўляная Васкрасенская (Рынкавая) царква была ўзведзена ў пачатку 1550-х гг. (але не пазней за 1553 г.). Цікава, што тым жа часам датуецца ўзвядзенне гасцінага двара, сімвалічнай датай пачатку якога можна лічыць 23 лістапада 1551 г. Не выключана, што будаўніцтва абодвух аб’ектаў ажыццяўлялася ў рамках адзінага плана, а кіраваць акцыяй мог тагачасны віцебскі войт Грыгорый Гутар.

Васкрасенская царква другой паловы XVI – пачатку XVIII ст. (размова ідзе пра некалькі драўляных будынкаў, што па чарзе ўзводзіліся на адным і тым жа месцы пасля пажараў і разбурэнняў), па ўсёй верагоднасці, была некалькі меншай па памерах, чым познебарочны храм другой паловы XVIII ст. Апрача таго, яна мела традыцыйную для царкоўных будынкаў арыентацыю па восі ўсход-захад і выходзіла на Рынкавую плошчу сваёй усходняй алтарнай часткай. Менавіта такой яна адлюстравана на «Чарцяжы 1664 г.» [37, с. 73–74].

Пэўныя складанасці выклікае пытанне пра лакалізацыю драўлянай Васкрасенскай царквы адносна пазнейшай мураванай. У гістарычнай літаратуры выказваліся меркаванні, што яна магла знаходзіцца на месцы паўднёвай ці паўночнай часткі познебарочнага храма. Археолаг Ігар Цішкін, які ў 1991–1994 гг. праводзіў раскопкі падмуркаў апошняга і выявіў пад яго паўночнай алтарнай часткай шэраг больш ранніх пахаванняў, прыйшоў да высновы, што *«на пагорку з паўночнага боку царквы знаходзіліся могілкі»* [32, с. 54] (а значыць, сама першапачатковая драўляная царква была размешчана ў паўднёвай (ніжняй) частцы пляцоўкі). На думку Вольгі Ляўко, якая праводзіла археалагічныя назіранні пры падрыхтоўцы ў 2000–2003 гг. катлавана пад аднаўленне зруйнаванага ў 1936 г. храма і выявіла шэраг пахаванняў *«перыяду існавання тут праваслаўнай царквы»* ля падмуркаў яго вежаў, драўляная царква займала паўночную, а могілкі – паўднёвую частку зямельнага ўчастка [12, с. 156, 259]. Аднак аргументацыя, заснаваная на размяшчэнні пахаванняў, у абодвух выпадках непераканаўчая, бо ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу нябожчыкаў часта хавалі пад падлогай саміх цэркваў ці непасрэдна ля іх сцен.

Дапамагчы разабрацца ў гэтым пытанні могуць пісьмовыя крыніцы. Паводле інвентара Віцебска 1638 г., у якім у парадку ўздоўж вы-

ліц скрупулёзна пералічаны ўсе аб’екты нерухомасці (дамы, пляцы, агароды і інш.), драўляная Васкрасенская (Рынкавая) царква стаяла *«на рагу»* вуліц Багародзіцкай і Падзвінскай [17, с. 39]. Гэта азначае, што яна размяшчалася на месцы ніжняй (паўднёвай) часткі мураванага храма. А вось высокая (паўночная) частка зямельнага ўчастка была далучана да маёмасці Васкрасенскай царквы значна пазней – 20 верасня 1733 г. Яна была выкуплена царкоўным брацтвам у віцебскага мешчаніна Сымона Фялінскага Лыткі за грошы, ахвяраваныя на гэтую справу мешчанінам Янам Тэадоравічам Бонічам, з умовай свабоднага распараджэння ёй (прадугледжвалася магчымасць выкарыстання гэтага пляца пад могілкі). Неабходна адзначыць, што згаданая транзакцыя адыграла выключную ролю ў далейшай гісторыі царквы. У яе выніку дзялянка зямлі на рынку, што належала храму, значна павялічылася і набыла выцягнутую ўздоўж вуліцы Багародзіцкай (Суражскай) форму. Дзякуючы гэтаму праз некалькі дзесяцігоддзяў пры ўзвядзенні мураванай царквы невядомы нам дойлід атрымаў магчымасць адмовіцца ад традыцыйнай арыентацыі будынка апсідай на ўсход, развярнуць яго корпус па восі поўдзень–поўнач і арганічна ўпісаць галоўным фасадам у ансамбль Рынкавай плошчы [15, с. 283–285].

На поўнач ад Васкрасенскай царквы на заходнім баку вуліцы Багародзіцкай у XVI – пачатку XVIII ст. размяшчаўся яшчэ адзін варты ўвагі аб’ект – «дом карчэмны» ці «кабак касцельны» Віленскай капітулы. Неабходна адзначыць, што алкагольная манаполія на тэрыторыі горада, нададзеная Віцебскаму касцёлу ўладамі ВКЛ, з’яўлялася галоўнай матэрыяльнай падставай яго дзейнасці на раннім этапе існавання. Дазвол на арганізацыю дзвюх дадатковых піцейных устаноў, у тым ліку на Узгор’і *«за ракой Віцьбай»*, касцёл атрымаў ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка ў 1503 г. [42, p. 260–261], і, несумненна, неўзабаве гэтыя выключна прыбытковыя ўстановы распачалі сваю працу. Ад драўлянай Васкрасенскай царквы ўзгорскую карчму аддзяляў адзін пляц (у 1638 г. ён належаў Фёдару Сухаруку, а ў пачатку XVIII ст. – Сымону Фялінскаму Лытку), які перайшоў ва ўласнасць гэтага храма 20 верасня 1733 г. Паколькі працягласць згаданага пляца ўздоўж вуліцы складала 39 віленскіх локцяў (39×64,96 см = 25,33 м), можна вызначыць, што карчма знаходзілася фактычна насупраць сучаснай ратушы – на месцы паўночнай часткі дома 2 і паўднёвай часткі дома 4 па вуліцы Суворава [15, с. 283–284; 17, с. 39].

Такім чынам, у канцы XVI – пачатку XVIII ст. рынак на Узгор’і займаў прыблізна той жа абшар, што і пазнейшая Ратушная (ці Рынкавая) плошча. Яго «шкілетам» былі два рады крам («вялікі» і «папярэчны»), якія фактычна з’яўляліся адрэзкамі ці працягам вуліц Вялікай і Падзвінскай у межах гандлёвай плошчы. Вакол гэтых радоў размяшчалася ўся

астатняя забудова: цэрквы, кляштар бернардзінцаў, комплекс гасцінага двара, касцельная карчма, жылыя дамы. Да 1740-х гг. яна была пераважна драўлянай, тут знаходзілася ўсяго некалькі цагляных будынкаў (дом бурмістра Пятровіча, першая мураваная ратуша). Забудова рынка была вельмі шчыльнай, і незанятай рознымі пабудовымі тэрыторыі тут было няшмат. Недахоп месца прывёў нават да таго, што 12 жніўня 1699 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст II сваім асобным прывілеем дазволіў віцебскім мяшчанам будаваць мясныя і рыбныя крамы проста на мосце, што вёў ад Завіцебнай брамы Ніжняга замка на рынак [6, арк. 49–50 адв.]. Свабодная прастора Ратушнай (Рынкавай) плошчы, так добра вядомая па малюнках, фотаздымках і планах XIX – пачатку XX ст., была створана ўжо пасля 1772 г. расійскімі ўладамі, якія расчысцілі рынак ад ранейшай забудовы.

## Крыніцы і літаратура


1. Баберскі, В. З гісторыі касцёла бернардзінцаў у Віцебску // Віцебскі сшытак. – 2019. – № 6. – С. 4–43.
2. Беларускі архіў. Т. 2: (XV–XVI ст.). Літоўская Метрыка. Кніга запісаў № 16 / склад., уступ. арт. З. Даўгяла. – Менск : Інстытут беларускай культуры, 1928. – 343 с.
3. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.): монография. – Витебск: Издательство ВГУ, 2004. – 276 с.
4. Витебская старина / Сост. А. П. Сапунов. – Т. 1: с приложениями и рисунками в тексте. – Витебск : Типография губернского правления, 1883. – XXII, 668 с., [55] л. ил.
5. Витебская старина / Сост. А. П. Сапунов. – Т. 4: с приложениями и рисунками в тексте. – Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1885. – [768] с., [17] л. ил.
6. Віцебскі абласны краязнаўчы музей. – КП 7261. – Кніга прывілеяў горада Віцебска. XVIII ст. – 103 арк.
7. Государственный архив Тверской области. – Ф. 1409 (Коллекция рукописных, старопечатных книг и документальных материалов). Оп. 1. Д. 1521. – Книга Витебского суда для регистрации дарственных и продажных записей на недвижимые имения. 1684–1687 гг. – 663 л.
8. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске / под ред. М. Веревкина. – Вып. 18. – Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1888. – [2], VIII, 492, XLI с.
9. Квітніцкая, А. Прыёмы фарміравання гандлёва-адміністрацыйнага цэнтра Віцебска ў XVIII ст. // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 8–19.

10. Квитницкая, Е. Д. Приёмы формирования торгово-административного центра Витебска в XVIII в. // Архитектурное наследство. – 1974. – № 22. – С. 136–149.
11. Левко, О. Н. Витебск в XIV–XVIII вв.: (стратиграфия, хронология, социально-историческая топография и технология производств). – Минск : Наука и техника, 1984. – 118 с.
12. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие. – Минск : Беларуская навука, 2004. – 278 с.
13. Макараў, М. Д. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
14. Макараў, М. Д. Бітва пад гадзіннікам: штурм віцебскай ратушы 11 верасня 1749 года // Віцебскі край. – Т. 3: Матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, 23 лістапада 2017 г., г. Віцебск / [рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) і інш.]. – Віцебск : НББ, 2018. – С. 94–99.
15. Макараў, М. Д. Новая крыніца па гісторыі Васкрасенскай Рынкавай царквы ў Віцебску // Віцебскі край. – Т. 2: Матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля, 24 лістапада 2016 г., г. Віцебск / [рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) і інш.]. – Віцебск : НББ, 2017. – С. 283–288.
16. Макараў, М. Д. Пра пачаткі ансамбля Ратушнай плошчы ў Віцебску // Віцебскі край. – Т. 4: Матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, 22 лістапада 2018 г., г. Віцебск / [рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) і інш.]. – Віцебск : НББ, 2019. – С. 70–74.
17. Макараў, М. Д., Волкаў, М. А. Інвентар замка і горада Віцебска 1638 года // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 18. – Мінск : НГАБ, 2020. – С. 28–58.
18. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: кніга № 35 (1551–1558): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.) / Падрыхтаваў А. А. Мяцельскі. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 537, [1] с.
19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 1751 (Віцебскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 3. – Актавая кніга. 08.01.1598–06.06.1598. – 296 арк.
20. НГАБ. – Ф. 1751. Воп. 1. Спр. 23. – Актавая кніга. 05.01.1677–15.10.1677. – 629 арк.
21. НГАБ. – Ф. 1823 (Полацкі магістрат). Воп. 1. Спр. 42. – Актавая кніга. 03.01.1766–10.12.1766. – 125 арк.
22. НГАБ. – Ф. 3267 (Полацкая губернская канцылярыя). Воп. 1. Спр. 5. – Справа пра пабудову салянога склада, пра пабудову дома і іншых будынкаў. 16.02.1773–19.08.1776. – 282 арк.
23. НГАБ. – Ф. КМФ-18 (Метрыка Вялікага Княства Літоўскага). Воп. 1. Спр. 35. – Метрыка прывілеяў, данін, пацвярджэнняў і іншых розных

спраў караля Жыгімонта Аўгуста за час канцлерства пана Мікалая Радзівіла, ваяводы віленскага, ад 1551 года да 1558 года. 1551–1558 гг. – 319 арк.

24. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 47. – Пажалаванні, пацвярджэнні арэнды мыт Жыгімонта Аўгуста. 1565–1567 гг. – 123 арк.
25. Полное собрание русских летописей. Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / Сост. и ред. Н. Н. Улащик. – Москва : Наука, 1975. – 233, [1] с.
26. Российский государственный архив древних актов. – Ф. 192 (Картографический отдел библиотеки Московского Главного архива Министерства иностранных дел (коллекция)). Оп. 1m. Карты Витебской губернии. – Д. 2. – Чертеж города Витебска, присланный от воеводы князя Волконского из Витебска 15 ноября 1664 года.
27. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1399 (Карты, планы и чертежи Петербургского Сенатского архива, коллекция). Оп. 1. Д. 261. – План города Витебска. 1774–1775 гг.
28. Роцька, І. Віцебская Уваскрасенская Рынкавая царква: архітэктурны аналіз // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 58–63.
29. Страчаная спадчына: Загінуўшыя абаронцы. Зруйнаваныя святыні. Па колішніх маёнтках. Гарады і час / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя і інш.; уклад. Т. В.: Габрусь. – Мінск : Полымя, 1998. – 350, [1] с.
30. Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М. В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9) / публ. подгот.: В. А. Воронин [и др.]. – Москва : Наука, 2008. – 525 с.
31. Хмельницкая, Л. В. Прогулки со старой картой: очерк истории Витебска начала XX века: (с приложением карты). – 2-е изд. – Минск : Четыре четверти, 2013. – 115, [4] с.
32. Цішкін, І. Храм на Рынку ў Віцебску // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 54–56.
33. Чантурия, В. А. История архитектуры Белоруссии. – Т. 1: Дооктябрьский период. – Изд. 3-е. – Минск : Вышэйшая школа, 1985. – 294, [1] с.
34. Чарняўская, Т. І. Архітэктура Віцебска: з гісторыі планіроўкі і архітэктуры горада. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 110 с.
35. Чарняўскі, І., Цішкін, І. Віцебская ратуша // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1987. – № 2. – С. 17–20.
36. Чарняўскі, І., Цішкін, І. Віцебская ратуша // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 33–35.
37. Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.: справочное пособие. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 366 с.
38. Якімовіч, Ю. А. Сілуэты старога Віцебска: гісторыка-краязнаўчая экскурсія. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – 239 с.
39. Archiwum Główne Akt Dawnych. – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. XXV. № 4598. – Inwentarz województwa witebskiego. 1639 r. – 17 k.
40. Archiwum Prowincji oo. Bernardynów, Kraków. – S-wit-1: Akta klasztoru bernardynów w Witebsku.

41. Bobierski, W. Z dziejów kościoła bernardynów w Witebsku // Biuletyn Historii Sztuki. – T. 75. – 2013. – № 4. – S. 793–838.
42. Lietuvos metrika. Knyga 5: (1427–1506): Užrašymų knyga 5 / parengė: E. Banionis. – Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1993. – 401, [1] p.
43. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. – Rankraščių skyrius. – F17-208. – Хроніка Віцебска. 1768 г. – 326 арк.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.04.2022

*В. Л. Насевіч*

## З гісторыі маёнтка Белае – папярэдніка сучаснага Лепеля

Першыя звесткі пра Лепель (Стары Лепель) тычацца паселішча на паўвостраве Лепельскага возера, якое ўжо не існуе. Аднак яно яшчэ прысутнічае на плане Лепельскага павета, створаным паміж 1810 і 1816 гг. [4]. Цяпер на яго месцы размешчаны могілкі вёскі Стары Лепель, што знаходзіцца побач, на заходнім беразе возера. Гістарычным папярэднікам сучаснага горада Лепеля з часоў першых публікацый па яго гісторыі прынята лічыць маёнтак Белае, датай першай згадкі якога Міхаіл Без-Карніловіч называў 1548 г. [3, с. 111], а Дзмітрый Даўгяла – 1550 г. [10, с. 6]. Гэты маёнтак Леў Сапега ў 1586 г. аб'яднаў з маёнткам Лепель, набытым ад Віленскага капітула.

Менавіта на тэрыторыі Белага, паводле згаданых аўтараў, Л. Сапега заснаваў мястэчка Новы Лепель. Гэтая думка грунтавалася на сцвярджэнні прыдворнага біёграфа Сапегаў Казіміра Кагнавіцкага, што пры фундацыі на карысць Віленскага кляштара бернардзінак назва аднаго з мястэчкаў была прыведзена ў форме *«Белае альбо Новы Лепель»* [277, s. 187]. Аднак адпаведны тэкст К. Кагнавіцкі даслоўна не прывёў. Дакументальнае пацвярджэнне, што Новы Лепель прыгадваўся і пад назвай «Белае» (*«з места нового прозываемого Белого»*), выяўлена толькі нядаўна [11, с. 68].

Такім чынам, ранняя гісторыя Лепеля звязана з абодвума маёнткамі. Гісторыя Старога Лепеля разглядаецца ў іншай нашай публікацыі [14; 15]. У гэтым тэксце мы засяродзімся на гісторыі маёнтка Белае да таго, як ён быў разам са Старым Лепелем падараваны Л. Сапегам віленскім бернардзінкам.

Узнікла Белае на тэрыторыі аддаленага анклава маёнткавага комплексу, які стваралі двары Лемніца (цяпер вёска ў Талачынскім раёне) і Палоннае (не існуе, знаходзіўся каля сучаснай вёскі Нямойта

Сенненскага раёна). Абодва двары ўпершыню згадваюцца 16 чэрвеня 1446 г. у духоўнай грамаце аднаго з унукаў вялікага князя літоўскага Альгерда – князя Андрэя Уладзіміравіча. Ён пералічыў іх сярод іншых сваіх маёнткаў: *«иже есмь выслужил на своих господарех, своею верною службою, на великом князи Витовте и на великом князи Жикгимонте и на своем господари великом князи Казимире»*. На той час князь Андрэй *«вси тые имениа поручил и дал есмь жене своей кнегини Марии, и сыну своему князю Глебу, и дочьце своей княжне Овдотии»* [1, № 46, с. 59–60; 23, № 83, с. 153–154].

Аднак пазней – 5 мая 1455 г. – ён частку сваёй маёмасці, а менавіта *«Полоное со всими селы Полонскими, а к тому сельца свои Олексичы, Ходцо, Берешево, Березовича»* падараваў сваяку Сенку Іванавічу *«по своей свести Овдотьи за его к нам великую добродетель и прыязнь»* [2, № 72, с. 106–107]. Прыгаданыя тут «сельца» – гэта сучасныя вёскі Алексінічы, Ходцы, Берашова і, верагодна, Бярозкі[1] Сенненскага раёна. Жонка Сенкі Іванавіча (Сямёна Чарэйскага) была сястрой жонкі – нявесткай («свесцяй») князя Андрэя і мела такое ж імя, як і яго дачка – Аўдоцця (Еўдакія).

Андрэй Уладзіміравіч памёр каля 1457 г. амаль адначасова з сынам Глебам. Раней памерлі і Сямён Чарэйскі з жонкай. Удава Андрэя, княгіня Марыя, паспрабавала адсудзіць Палоннае ў сваёй асірацелай пляменніцы, таксама Марыі. Аднак вялікі князь літоўскі Казімір, разгледзіўшы справу 25 сакавіка 1459 г., *«прысудили есмо тое именье Полоное сестрычне ее Марьи, водле князя Андреева листа»*, а княгіні Марыі даручыў апякунства над пляменніцай і цёзкай, пакуль тая *«лет своих дорастет»* [2, № 72, с. 107].

Марыя скарысталася правам апякунства на сваю карысць. У наступныя год ці два яна выдала пляменніцу замуж за князя Фёдара Бабіча (Друцкага-Саколінскага). Прытым маёнтак Палоннае застаўся ў фактычным карыстанні князёўны Аўдоцці, чаго хацела яе маці спачатку. На той час Аўдоцця была ўжо жонкай Івана Рагацінскага. Памерла яна маладой. У І. Рагацінскага было не менш за чатыры дачкі, але ад шлюбу з Аўдоццяй, напэўна, толькі адна – Фядора (гл. дадатак 1).

Фядора Рагацінская ўжо ў 1473 г. была жонкай князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага. Пра тое, што маёнткі дзеда, уключаючы Лемніцу і Палоннае, засталіся ў яе руках, сведчыць спроба іх адсудзіць з боку

---

[1] Падставай для атаясамлівання «Березовича» з Бярозкамі з’яўляецца тое, што рака Бярозка (правы прыток Крывінкі), ля вытоку якой з Бярозаўскага возера знаходзяцца Бярозкі, у XVI ст. называлася Беразвеч ці Беразвечча. Пад такой назвай яна згадваецца ў «Рэвізіі Полацкага ваяводства» 1552 г. пры апісанні маёнтка Крывіна княгіні Саколінскай: *«В том имению маеть гоны бобровые, ловы зверинные, дерево бортное и езы по Крывине и по Березвечы»* [26, с. 109].

князя Сямёна Іванавіча Бельскага, пляменніка князя Андрэя Уладзіміравіча. На гэтую "блізкасць" ён спасылаўся, сцвярджаючы, што мае права на маёнткі як на родавую ўласнасць. Аднак пры разглядзе справы 25 жніўня 1484 г. высветлілася, што спрэчныя маёнткі Андрэй Уладзіміравіч выслужыў асабіста. Таму яго бакавыя родзічы ніякіх правоў на іх не мелі. Усе маёнткі, сярод якіх згадваюцца *«Илемница а Полоный»*, былі пацверджаны *«кнегини Ивановои Семеновича Кобринского, кнегини Федце, внуце князя Андрея Володимировича, вечно з всим тым, што к тым именьям здавна слушаеть, по тому, как держал небощик князь Андрей Володимирович»* [24, сл. 393–395].

Тое, што да маёнткаў Лемніца і Палоннае *«здавна слушаеть»* і сяло Белае, высвятляецца са складзенага ў 1516 г. пераліку спадчыны, якая засталася пасля смерці Фядоры ў 1512 г. Да таго часу яна паспела тройчы аўдавець, змяніць веру і імя – *«будучи вдова, пошла потом за пана Паца и до веры римской приступила»* [33, s. 164]. Прыняўшы каталіцтва, яна ўзяла і новае імя – Зофія. Не маючы дзяцей, свае мацярынскія маёнткі, сярод іх *«двор Лемницы, а другий двор Полонны з селы тых дворов на имя з Ходчем, а з Олексеничы, а з Березовичом, а з Белою»*, яна завяшчала пасынку – Мікалаю Юр'евічу Пацу. Пра гэта згадваецца ў пагадненні, заключаным ім 23 студзеня 1516 г. з прэтэндэнтамі, якія заявілі правы на спадчыну Фядоры-Зофіі як на сваю "блізкасць"[2].

З тэксту пагаднення вынікае, што М. Пац адмовіўся ад азначаных маёнткаў на карысць нашчадкаў братоў князя Андрэя Уладзіміравіча. Хаця раней было ўжо прызнана, што на выслужаную маёмасць бакавыя родзічы правоў не маюць, на сітуацыю паўплывала тое, што гэтая спадчына была абцяжарана вялікімі даўгамі. М. Пац пагадзіўся саступіць родзічам сваёй мачахі вышэйзгаданыя маёнткі *«в руских сторонах»* з той умовай, што яны возьмуць на сябе і частку даўгоў.

На гэтую спадчыну спрабаваў прэтэндаваць таксама князь Багдан Адзінцэвіч, грунтуючыся на хісткіх аргументах. Яго даўно памерлы брат Дзмітрый быў жанаты з Уллянай – дачкой Івана Уладзіміравіча, брата князя Андрэя. Аднак сыны Дзмітрыя ў 1508 г. узялі ўдзел у мяцяжы Міхала Глінскага. За гэта яны былі пазбаўлены маёнткаў, якія заставаліся ў карыстанні Улляны, а пасля яе смерці іх перадалі Багдану як бліжэйшаму родзічу. Апошні, відаць, спрабаваў даказаць, што да яго перайшло і права на вымарачную спадчыну князя Андрэя. Прынамсі, сын Багдана, князь Сямён Адзінцэвіч, скардзіўся 20 ліпеня 1521 г., што яго бацька мае правы на спадчыну ў Лемніцы і Палонным, але князь Астрожскі і пан Хадкевіч яго да гэтай спадчыны не дапускаюць [33, s. 282].

---

[2] Пагадненне вядома паводле копіі, якая 20 чэрвеня 1583 г. была ўпісана ў 6-ю кнігу т. зв. Рускай (Валынскай) метрыкі [19, арк. 261–262 адв.].

І тут на сцэну выйшлі Сапегі – нашчадкі Марыі Чарэйскай ад шлюбу з князем Фёдарам Бабічам (гл. дадатак 2). Адсунутыя ад валодання Палонным, яны збераглі дароўны ліст князя Андрэя і судовы вырак 1459 г. У 1533 г. справе далі ход. На той час і Багдан Сапега, і яго жонка Фядора ўжо памерлі. Паспелі памерці і іх сыны Януш і Фёдар. Справу за зварот спадчыны сваёй бабкі павёў падляшскі ваявода Іван Сапега разам з пляменнікам Глебам. Яны пазвалі за няслушнае валоданне Палонным князя Юрыя Слуцкага, удаву князя Канстанціна Астрожскага Аляксандру, пана Аляксандра Хадкевіча і яго сястру Аграфену. Паводле судовага рашэння ад 21 лістапада 1533 г. адказчыкі пагадзіліся вырашыць справу палюбоўна: саступіць правы на спрэчны маёнтак і абавязацца не ўступацца *«в тое имене Полоное и все села Полонские, которыи кольвек к тому именю з стародавна прыслухают, ... и в тыи теж сельца, которыи в листе князя Андрееве суть выображены и на имя выписаны»*. Сапегі абяцалі выплаціць ім за гэта адносна невялікую суму ў 35 коп грошаў [17, № 204, арк. 220–223; 299]. У выніку да іх перайшлі таксама двор Лемніца і сяло Белае, якія ў дакументах *«на имя выписаны»* не былі.

Неўзабаве ўдава Фёдара Багданавіча Сапегі ад імя трох сваіх непаўнагадовых сыноў запатрабавала ад Глеба Янушавіча Сапегі, каб ён падзяліўся з імі часткай Палоннага. Разгляд справы, прызначаны на 2 мая 1536 г., не адбыўся, бо ўдава Фёдара Сапегі на суд не з'явілася [30, s. 38].

Свае правы на частку адсуджанай спадчыны абвясцілі сёстры Багдана і Ганна Сапяжанкі (гл. дадатак 3). Захаваліся звесткі толькі пра асобныя эпізоды гэтай доўгай справы. Сярод іх – запіс 1540 г. пра позву Багданы Янавай Сцяцкевічавай і яе сястры Ганны Алехнавай Скаруцінай да іх брата Івана Багданавіча Сапегі і пляменнікаў, сыноў Януша, пра ўдзел у спадчынных «мацярыстых» маёнтках Лемніцы і Палоннае [30, s. 39].

Наступныя звесткі фіксуюць ужо заключную фазу працэсу. Гэта – два запісы («апавяданні»), зробленыя 12 лістапада 1550 г. паводле просьбы князя Дзмітрыя Раманавіча Відзініцкага, які выступаў ад імя свайго брата Івана і маці Багданы, на той час жонкі Яна Сцяцкевіча. Адзін з запісаў засведчыў, што князі Відзініцкія і іх маці паклікалі ў суд сястру апошняй Ганну, жонку Алехны Скаруты, каб дамагчыся ад яе кампенсацыі часткі выдаткаў, якія яны панеслі *«доходячы именей их материстых Череи, Полоного и Мелниц и сел, к тым дворам прислухаючих, под братом их небожчиком паном Иваном Сопегою и братаничи их»* [20, арк. 632] («Мелніцы» гэта, відаць, скажоная назва Лемніцы). Тое, што ў лік сёл, «прыслухаючых» да азначаных маёнткаў, уваходзіла Белае, непасрэдна не згадваецца, але яно фігуруе ў другім запісе – пра тое, што князі Відзініцкія, на гэты раз разам з сястрой Ганнай Осцікавай, паклікалі ў суд удаву Івана Багданавіча Сапегі і яе сыноў. Падставай

было *«непоступление им близкости их: людей в Мелехове, Бершове и на Белом»* (згаданае тут Мелехава, цяпер вёска ў Сенненскім раёне, таксама адносілася да Палоннага) [20, арк. 633].

У выніку маёнткавы комплекс быў падзелены на чатыры часткі: паміж Іванам Багданавічам, сынамі яго памерлага брата Януша і дзвюма сёстрамі з іх нашчадкамі. Прытым у кожную частку ўвайшло па некалькі двароў у сяле Белым, кожная – са сваім *«старцам»*, адказным за збор падаткаў.

У наступныя гады частка, што дасталася сынам Януша Сапегі, была, відаць, аддадзена ў заклад князю Андрэю Лукомскаму (Меляшкоўскаму). Непасрэдныя звесткі пра гэта не выяўлены, але вядома, што ў закладзе ў А. Лукомскага да 1555 г. знаходзілася частка іншага сапежынскага маёнтка – Чарэі, што належала Дзмітрыю Янушавічу Сапегу [30, s. 96]. Гэтым можа тлумачыцца прысутнасць А. Лукомскага сярод уладальнікаў Белага ў 1550 г. падчас канфлікту з падданымі сумежнага Лепеля.

Апошні дакумент – менавіта той, які Д. Даўгяла лічыў найбольш ранняй згадкай Белага, грунтуючыся на сціслай згадцы ў манаграфіі «Sapiehowie» [30, s. 67]. Звярнуўшыся да тэксту дакумента [18, арк. 613; 8, с. 14], можна знайсці цікавыя падрабязнасці. У ім гаворыцца пра напад на лепельскі млын, у якім удзельнічалі жыхары трох частак Белага: *«Оповедал и жаловал перед их милостью его милость князь Езоф Ясеньский, ардиакон виленски, иж дей тых недавних часов, з середы на четверг в ночи перед Светою Малгоретою* [з 12 на 13 ліпеня 1550 г. – В. Н.], *старец беляньски пана Ивана Ивановича Сопеги воеводича подляшского на имя Лукьян Сухач з людьми пана своего беляньскими а помочники своими, а другий старец пани Олехновое Скорутиное на имя Ходор Коркун з поддаными панее своее, а третий старец князя Андрея Мелешковского Степан Пушкар з людьми пана своего а помочниками своими, нашедши моцно гвалтом на именье его милости Лепскои плебанеи Витебской, греблю на реце Ули прекопали, ... и там же дей тые старцы вышей мененые, з тыми людьми панов своих, у млыне его милости замок и двери одбившы, статки млыновые посекли»*.

Неўзабаве Івану Сапегу давялося з яго часткі вылучыць долю сястры Зофіі. 5 лістапада 1550 г., адказваючы на позву сваёй маці, Іван сцвярджаў, што *«з именей з своее части, окром панов брати моее, поступил есми панне сестре моей»*, апрача іншага, *«на Белой шесть служоб людей»* на яе ўтрыманне да таго часу, *«яко ей милости панне сестре моей даст Бог мети малжонка»*. На шлюб ён абяцаў выплаціць ёй грашовы пасаг, *«а тых людей мает ми ее милость панна сестра моя за ся мне поступити»*. Далей адзначаў, што *«панове братя моя пан Михайло, а пан Павел своее части побрали»* і павінны з іх таксама ўдзельнічаць у забеспячэнні сястры. Гэты ліст Івана Сапегі па патрабаванні яго маці

быў 14 лістапада ўпісаны ў Літоўскую метрыку, каб надаць яго абяцанню юрыдычную моц [17, арк. 615, 635].

Каля 1559 г. Зофія выйшла замуж за Лукаша Куранецкага, а ў 1561 г. паміж яе мужам і Іванам Сапегам было заключана пагадненне, паводле якога апошні выплаціў належачы ёй грашовы пасаг і атрымаў назад маёнткі, якія раней былі вылучаны на яе ўтрыманне [30, s. 90–91]. На той час у сяле Белае заставаліся 6 службаў падданых яго маці. Іх Іван павінен быў атрымаць паводле яе тастамента, падпісанага 18 сакавіка 1558 г. [30, s. 68], што і адбылося пасля яе смерці ў 1561 г.

Багдана Багданаўна Сцяцкевічава памерла каля 1550 г., сваю частку перадаўшы нашчадкам ад першага шлюбу з князем Любецкім (Відзініцкім): двум сынам і ўнуку. 21 кастрычніка 1551 г. яе дачка Ганна, жонка Мікалая Осціка, судзілася са сваімі братамі, патрабуючы ад іх вылучэння ёй таксама часткі ў Палонным, Лемніцы, Белым і іншых маёнтках, якія запісала ім маці [30, s. 43]. З запісу ад 9 снежня 1551 г. вынікае, што мацярынскія маёнткі былі на той час у закладзе ў іх цёткі Ганны Скаруцінай [30, s. 43]. Напэўна, у Багданы была яшчэ адна дачка – жонка Івана Сялявы, які двойчы прыгадваецца сярод саўладальнікаў Белага на пачатку 1560-х гг. [177, с. 439; 30, s. 80]. Магчыма, яна нарадзілася ў другім шлюбе з Янам Сцяцкевічам, але непасрэдных звестак пра яе не захавалася.

Ганна Багданаўна Скаруціна сваю частку таксама завяшчала нашчадкам. Ад яе першага шлюбу з Якубам Кунцэвічам засталіся два сыны і дзве непаўнагадовыя ўнучкі, Барбара і Кацярына; ад другога – сын Марцін Алехнавіч Скарута. Усе яны 27 сакавіка 1555 г. падзялілі паміж сабой *«маёнткі мацярынскія рускія»* [22, арк. 81; 30, s. 46]. Пры гэтым дзве трэці Палоннага і Лемніцы з прыналежнасцямі дасталіся Марціну Скаруту, а рэшта – Барбары і Кацярыне. Да іх паўналецця апекуном быў прызначаны брат іх маці Астафій Багданавіч Валовіч. У той жа дзень ён пацвердзіў ад імя падапечных, што прызнае правы Марціна Скаруты на яго частку [201, арк. 277; 30, s. 46].

Правы на частку спадчыны зноў прад’явілі і нашчадкі Фёдара Багданавіча Сапегі. 23 кастрычніка 1561 г. яго сын Дзмітрый прыгадваў, што раней разам з братамі Іванам (ужо памерлым) і Багданам выклікаў у суд сваіх родзічаў за недапушчэнне да ўдзелу ў маёнтках Палоннае, Лемніца і Белае [300, s. 80, 105]. Справа была адкладзена. Долю ў спадчынных маёнтках Фёдаравічы ўрэшце атрымалі, але да пачатку Інфлянцкай вайны яна засталася непадзеленай. Гэта вынікае з датаванага 1563 г. дакумента, якім Дзмітрый Фёдаравіч пасля шлюбу забяспечыў жонцы пэўную суму грошай *«на двух частях именей своих, которые ся ему в делу достанут»*, і сярод іх *«на Руси Полоное и Лемницы а Белое»* [30, s. 321, doc. XIV]. Здаецца, гэтая галіна Сапегаў свае правы на азначаныя

маёнткі рэалізаваць так і не паспела. Пасля Інфлянцкай вайны яе прадстаўнікі ў сувязі з Белым больш не згадваюцца.

У такім раздробненым стане Белае застала вайна. У дыпламатычнай перапісцы з Іванам IV літоўскі бок 22 жніўня 1563 г. узгадваў, што маскоўцы *«в место Лепле и в волость Лепельскую костела Виленьского плебании Витебское и в село Боровно, также в села маршалка дворного, подскарбьего земского, писара нашого старосты Могилевского и Озерищского пана Остафъя Воловича Белое и на Лепли, и в Черею и в ыные, шкоды немалые чиняшь уходячи»* [12, № 158, с. 236]. Пісцовая кніга, складзеная маскоўскай адміністрацыяй Полацка, пералічвае *«волости и села по книгам письма Семена Офонасьева сына Бортенева да Русина Тимофева сына Мошнина, лета 7071* [1563 – В. Н.]». Сярод іх: *«Вол. Лепль, преж того была бискупа Виленского да князя Степана Избарского, на оз. на Лепли... Да в той же вол. слц. Белое и Ледное, стоит по обе стороны оз. Лепля, что было пана Остафья Воловича, да пана Ивана Селявина, да пана Омструха»* [177, с. 439].

І маскоўская пісцовая кніга, і дыпламатычная перапіска, прыгадваючы ў складзе Лепельскай воласці сяло Белае, называюць яго ўладальнікам Астафія Валовіча. Фактычна ж ён быў апекуном дзвюх саўладальніц – незамужніх дачок Мікалая Кунцэвіча. Далейшы лёс гэтай часткі не прасочваецца. Вядома, што абедзве падапечныя Астафія Валовіча выйшлі ўрэшце замуж, але ні яны, ні іх мужы пасля Інфлянцкай вайны ў сувязі з Палонным і Белым не прыгадваюцца. Напэўна, яны пазбавіліся сваіх частак у гэтых маёнтках на карысць іншых саўладальнікаў.

Каментуючы звесткі з пісцовай кнігі, Д. Даўгяла меркаваў, што Сапегі ў ёй выступаюць пад прозвішчам Амструхі, і пабудаваў цэлую тэорыю ў падмацаванне гэтай здагадкі, каб растлумачыць з яе дапамогай *«адкуль у Івана Сапегі з'явілася сяльцо Белае»* [10, с. 8–9]. Між тым, адказ на гэтае пытанне дае судовая справа 1533 г., не ўлічаная ў манаграфіі пра Сапегаў. Што да Амструхаў, то ў іх трэба бачыць паноў Астравухаў, а іх уладанні звязваць з усходнім берагам возера, дзе знаходзіліся Леднае (Лядна) і суседняе Жэзліна («Железна» ў пісцовай кнізе). 21 красавіка 1561 г. айчым Паўла Янушавіча Любецкага, князь Багдан Саколінскі, судзіўся з адным з Астравухаў за незаконны захоп спадчыны свайго пасынка [333, s. 210]. Да 1563 г. справа, напэўна, не была скончана, што і дало падставу маскоўскім пісцам залічыць Астравуха ў саўладальнікі Белага і Леднага.

А вось ніхто з Сапегаў у 1563 г. не згадваецца, хоць ім павінна была належаць большая частка Белага. Не згадваюцца таксама ні князі Любецкія з іх шваграм Мікалаем Осцікам, ні Марцін Скарута. Затое фігуруе загадкавы князь Сцяпан Ізбарскі, невядомы па іншых крыніцах. Падаецца, што ў гэтай асобе трэба бачыць князя Стэфана Збаражскага, які ў 1555–1564 гг. займаў пасаду віцебскага ваяводы. Магчыма, ён тры-

маў нейкую частку Белага ў закладзе ад Сапегаў, як раней князь Андрэй Меляшкоўскі. Аднак больш верагодна, што князь Збаражскі спрычыніўся да Лепельскай воласці праз тую частку Белага, якой валодаў Марцін Скарута і якая стала неўзабаве дзяржаўнай уласнасцю.

З пазнейшых згадак вядома, што Марцін Скарута падараваў сваю частку Палоннага, Лемніцы і Белага каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту Аўгусту. Дакладная дата невядомая, але гэта адбылося, напэўна, неўзабаве пасля падзелу спадчыны ў 1555 г. Гэтая частка ахоплівала па некалькі двароў у розных паселішчах. У кожным з іх меўся і асобны панскі двор ці фальварак, які называўся пазней «Скаруцінскім». Такі двор існаваў і ў Белым. Магчыма, пасля пераходу ў дзяржаўную ўласнасць ён быў перададзены ў карыстанне віцебскаму ваяводу, які ў 1560 г. пабудаваў замак Сураж у іншым сапежынскім маёнтку – Дрэчых Луках [33, s. 614]. Даходы са Скаруцінскіх двароў маглі ісці на ўтрыманне замка. Пазней – 1 жніўня 1570 г. – дзяржаўны фальварак у Палонным з належачымі да яго вёскамі (у сучасным Сенненскім раёне) быў часова вылучаны *«на хлебокормленье»* Івану Іванавічу Сапегу ў якасці кампенсацыі за спусташэнне Дрэчых Лук маскоўскай аблогай і гарнізонам Суража [30, s. 71, 150].

Маёнтак Белае, раздроблены ў сярэдзіне XVI ст., быў зноў сабраны ў адно цэлае Львом Сапегам, якому адна з частак маёнтка дасталася ў спадчыну ад бацькі. У 1586 г. ён купіў сумежны маёнтак Лепель [16, № 116, с. 64]. Заняўшы ў канцы 1589 г. пасаду канцлера ВКЛ, Леў Сапега атрымаў 18 красавіка 1590 г. згоду караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы на перадачу яму і яго братам, у якасці кампенсацыі за адлучаны Сураж, Скаруцінскіх двароў ва ўсіх маёнтках: Палонным, Чарэі, Лемніцы, Берашове, Алексінічах, Беразвечы, Цепляках і Белым [30, s. 150–151][3].

29 кастрычніка 1591 г. адбыўся падзел спадчыны паміж братамі Львом, Грыгорыем і Андрэем Іванавічамі Сапегамі. Льву дасталася, апрача іншага, *«Белае под Леплем, обе части, отчызная и Скорутинская»* [255, № 62, с. 100–101]. Незадоўга да таго, паводле запісу ад 3 жніўня 1591 г., Леў атрымаў частку, што належала яго дзядзьку Міхайлу (Белае ў яе складзе непасрэдна не згадваецца), які быў абавязаны выплаціць сынам брата Івана 400 коп грошаў за тое, што ні ён сам, ні памерлы брат Павел не бралі ўдзелу ў выплаце пасагу падчас шлюбу сястры Зофіі. Да канца жыцця Міхайла так і не сабраў належную суму, таму замест яе саступіў пляменніку Льву спадчынныя маёнткі, уключаючы і долю, раней завешчаную яму Паўлам [25, № 61, с. 63].

---

[3] Адпаведны прывілей надрукаваны [32, s. 317]. Аўтар манаграфіі пра Сапегаў, пераказваючы яго, замест Белага памылкова згадаў іншы сапежынскі маёнтак – Басею.

У гаспадарчай кнізе Льва Сапегі за 1588–1607 гг., якая захавалася ў складзе так званай Асалінскай бібліятэкі, маецца запіс пра тое, што ў 1597 г. ён выкупіў у князя Паўла Любецкага за 360 коп грошаў частку Белага, якая таму належала [13, s. 403]. Магчыма, яшчэ адна частка ўваходзіла ў склад тых маёнткаў, якія атрымала ў спадчыну адзіная дачка Ганны Раманаўны Любецкай ад шлюбу з Мікалаем Осцікам – Ганна Мікалаеўна, жонка князя Льва Сангушкі. Яе сын Грыгорый Сангушка на пачатку 1590-х гг. саступіў гэтую спадчыну Пятру Стаброўскаму, а той 25 мая 1596 г. прадаў яе Льву Сапегу за 600 коп грошаў [30, s. 159; 33, s. 446].

На пачатку 1599 г. Леў Сапега набыў апошнюю, здаецца, рэшту спадчыны. Гэта была доля, якая з 1533 г. належала Глебу Янушавічу Сапегу і тром яго братам. Адзін з іх, Міхайла, пакінуў двух сыноў: Мікалая, кухмістра ВКЛ, і Льва. Пры падзеле спадчыны паміж імі ў 1595 г. часткі Палоннага, Белага і Чарэі дасталіся старэйшаму, Мікалаю, якія ён праз чатыры гады прадаў Льву Сапегу за 2500 коп грошаў [30, s. 207–208].

25 чэрвеня 1599 г.[4] Леў Сапега ахвяраваў свае маёнткі ў Лепелі і Белым кляштару бернардзінак у Вільні. Фундушавы запіс унесены ў яго гаспадарчую кнігу [13, s. 489–495]. У ім адзначаецца, што ахвяруюцца ўсе часткі Белага: і атрыманыя ў спадчыну, і Скаруцінская, і набытыя ў князя Паўла Любецкага і кухмістра Мікалая Сапегі.

Папярэдне на спадчыннай частцы гэтага ўладання Львом Сапегам было заснавана «места» (мястэчка), вядомае спярша пад рознымі назвамі. Некалькі дакументаў з першымі згадкамі пра яго нядаўна былі апублікаваны Валянцінам Голубевым [5; 6; 7; 8; 9] і Аляксандрам Доўнарам [11]. У далейшым за гэтым паселішчам замацавалася назва «Новы Лепель», а пасля далучэння да Расійская імперыі яно атрымала статус павятовага горада пад назвай Лепель. Шэраг звестак, якія тычацца гісторыі Старога і Новага Лепеля, прыводзіцца ў другой частцы нашага з В. Азаронкам артыкула [15]. Агульныя ж высновы на падставе ўсяго комплексу крыніц плануецца падвесці ў наступным выпуску «Архіварыўса».

[4] Міхал Кусцінскі, аўтар першага энцыклапедычнага артыкула пра Лепель [31, s. 149], датаваў фундацыю 1609 г. Гэтую дату некрытычна ўспрыняў Д. Даўгяла [10, с. 15]. Яго спасылка пры гэтым на працу Юзафа-Ігната Крашэўскага [28] няслушная: той на с. 333–335 прыводзіць толькі пералік фундацый паводле Кагнавіцкага, без дат.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. – Т. 1. – Санкт-Петербург : Типография II Отделения Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1846. – 428 с.
2. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. – Т. 2. – Санкт-Петербург : Тип. Эдуарда Праца, 1865. – 288 с.
3. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии: с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. – Санкт-Петербург : Типография III Отд. собств. Е. И. В. канцелярии, 1855. – 355 с.
4. Геометрической план Белорусской Витебской губернии, присоединенной части от Минской к Витебской губернии, Лепельскаго целого уезда. 1816 г. М 1:42000 // Российский государственный архив древних актов (далее – РГАДА). – Ф. 1356 (Губернские, уездные и городские атласы, карты и планы генерального межевания 1766–1883 гг. (коллекция)). Оп. 1. Д. 92.
5. Голубеў, В. Ф. Карта горада Новы Лепель з Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы // V Лепельскія чытанні : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (21–22 верасня 2012 года, г. Лепель). – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2012. – С. 47–52.
6. Голубеў, В. Ф. Устава Льва Іванавіча Сапегі гораду Новы Лепель ад 6 мая 1596 г. // V Лепельскія чытанні : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (21–22 верасня 2012 года, г. Лепель). – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2012. – С. 53–65.
7. Голубеў, В. Ф. Устава мяшчанам горада Новы Лепель пасля завяршэння дванаццацігадовай слабады ў 1601 г. // V Лепельскія чытанні : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (21–22 верасня 2012 года, г. Лепель). – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2012. – С. 65–70.
8. Голубеў, В. Ф. Новыя дакументы па гісторыі Лепеля // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 10. – С. 5–20.
9. Голубеў, В. Ф. „A w mieście Jesie, to est w Nowym Lieplu" (Яшчэ раз да лакалізацыі і эвалюцыі назвы Лепеля) // VII Лепельскія чытанні : матэрыялы VII навукова-практычнай канферэнцыі (г. Лепель, 27–28 кастрычніка 2016 г.) / [пад рэд. Я. А. Грэбеня]. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2017. – С. 48–51.
10. Довгялло, Д. И. Лепель, уездный город Витебской губернии. Хроника минувшей жизни. – Витебск : Губ. типолитогр., 1905. – 105 с.
11. Доўнар, А. Б. Лепельскія мяшчане гандлявалі з Рыгай (дакумент па справе лепельскіх мяшчан аб суднаходстве ракі Ула 1612–1613 гг. // VII Лепельскія чытанні : матэрыялы VII навукова-практычнай канферэнцыі (г. Лепель, 27–28 кастрычніка 2016 г.) / [пад рэд. Я. А. Грэбеня]. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2017. – С. 62-73.

12. Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского, содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда-Августа (с 1545 по 1572 год) / Ред. М. А. Оболенский, И. Н. Данилович. – Т. 1. – Москва : Университетская типография, 1843. – XX, 480, [1] с.
13. Навуковая бібліятэка імя В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў. – Ф. 103 (Архіў Сапегаў з Красічына). Спр. 880. – Kwitariusz gospodarczy Lwa Sapiehy. 1588–1607. – 594 арк.
14. Насевіч, В. Л., Азаронак, В. В. Раннія крыніцы па гісторыі Лепеля. Частка 1. Да сярэдзіны XVI ст. // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 22. – Мінск : БелНДІДАС, 2021. – С. 116–124.
15. Насевіч, В. Л., Азаронак, В. В. Раннія крыніцы па гісторыі Лепеля. Частка 2. Другая палова XVI – першая палова XVII ст. // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 23. – Мінск : БелНДІДАС. , 2022. – С. 97–106.
16. Описание рукописного отделения Виленской публичной библиотеки. – Вып. 1. – Вильна : [б. и.], 1895. – Приложения. – XVII, 39, 144 с.
17. Писцовые книги Московского государства. – Ч. 1: Писцовые книги XVI века. Отд. 2: Местности губерний: Ярославской, Тверской, Витебской, Смоленской, Калужской, Орловской, Тульской / под ред. Н. В. Калачова. – Санкт-Петербург : Типография II Отделения Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1877. – [5], 1598 с.
18. РГАДА. – Ф. 389 (Литовская метрика). Оп. 1. Д. 15. – Метрика короля его милости Жикгимонта старого справ судовых, уфалы земские, посельства розные и некоторые данины. 1528–1538. – 240 л.
19. РГАДА. – Ф. 389. Оп. 1. Д. 196. – Книга короля Стефана; вице-канцлера Боруковского. 1582–1583. – 267 л.
20. РГАДА. – Ф. 389. Оп. 1. Д. 237. – Книга Виленского замкового суда справцы воеводства Ивана Горностая. 1549–1550. – 532 л.
21. РГАДА. – Ф. 389. Оп. 1. Д. 247. – Книга Виленского замкового суда воеводы Миколая Радзивилла. 1554–1558. – 998 л.
22. РГАДА. – Ф. 389. Оп. 1. Д. 248. – Книга королевских решений. 1554–1556. – 127 л.
23. Розов, В. Українські грамоти. – Т. 1. XIV в. і перша половина XV в. – Київ : Друкарня Українскої Академії Наук, 1928. – 268 с.
24. Русская историческая библиотека, издаваемая императорской археографической комиссией. – Т. 27: Литовская метрика. – Санкт-Петербург : Сенатская типография, 1910. – 660 с.
25. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки, состоящей под августейшим покровительством его императорского высочества государя наследника цесаревича Александра Александровича : [Труд Петра Гильтебрандта]. – Вып. 1. – Вильна : Печатня А. Г. Сыркина, 1871. – XIV, [2], 230 с.

26. Рэвізія Полацкага ваяводства 1552 года [Тэматычны дадатак да нумара «ARCHE» «Полацак: падарожжа ў прасторы і часе»] / уклаў В. Варонін. – Менск : [б. в.], 2011. – 271 с.
27. Kognowicki, K. Zycia Sapiehow y listy od monarchow, książąt, y roźnych panujących do tychźe pisane. – T. 1. – Wilno : Druk. J. K. Mości przy Akademii, 1790. – [18], 393, [5] s.
28. Kraszewski, J. I. Wilno od początków jego do roku 1750. – T. 2. – Wilno : Nakładem i Drukiem Józefa Zawadskiego, 1840. – 528 s.
29. Lietuvos Metrika. – Knyga № 15 (1528–1538): Užrašymų knyga 15 / Parengė A. Dubonis. – Vilnius : Žara, 2002. – 448 p.
30. Sapiehowie. Materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe / wydane nakł. rodziny. – T. 1. – Petersburg : nakł. rodziny, 1890. – XVI, 456 s.
31. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. – T. 5. – Warszawa : nakł. Filipa Sulimierskiego i Władysława Walewskiego, 1884. – 960 s.
32. Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem XX Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. – T. 2. – Petersburg : J. Ohryzko, 1859. – 482, XIII, [1] s.
33. Wolff, J. Kniaziowie Litewsko-Ruscy od końca czternastego wieku. – Warszawa : Drukiem J. Filipowicza, 1895. – 724 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.02.2021

**Дадатак 1.** Нашчадкі і родзічы князя Андрэя Уладзіміравіча

| I калена | II калена | III калена | IV калена |
|---|---|---|---|
| | кн. Глеб Андрэевіч<br>1420?–1457?<br>*(памёр пры жыцці бацькі)* | | |
| кн. Андрэй Уладзіміравіч<br>1390?–1457<br>*(выслужыў у 1420-х гг., валодаў да смерці)*<br><br>жонка Марыя<br>1400?–1460-я<br>*(валодала з 1459 г. да смерці)* | кн. Еўдакія (Аўдоцця)<br>1425?–1460-я<br>жонка Івана Рагацінскага<br>*(валодала пасля маці, калі не памерла раней)* | Фядора-Зофія Рагацінская<br>1450?–1512<br>жонка кн. Сямёна Ів. Кобрынскага з 1470-х гг. да 1490 г.;<br>жонка Юрыя Паца з 1492 да 1505;<br>жонка Мікалая Радзівіла з 1508 да 1509 г.<br>*(валодала да смерці)* | Мікалай Юр'евіч Пац<br>1485?–1550<br>пасынак Фядоры-Зофіі<br>*(валодаў па тастаменце мачахі з 1512 да 1514 г.)* |
| | кн. Сямён Іванавіч Бельскі<br>1430?–1508?<br>*(прэтэндаваў у 1484 г.)* | | |
| кн. Іван Уладзіміравіч<br>1385?–1446?<br>*(не валодаў)* | кн. Бельская<br>жонка кн. Івана Васільевіча Астрожскага<br>*(не валодала)* | кн. Канстанцін Іванавіч Астрожскі<br>1465?–1530<br>*(адсудзіў у Мік. Паца, валодаў з 1514 г. да смерці)* | |

| **I калена** | **II калена** | **III калена** | **IV калена** |
|---|---|---|---|
| | кн. Агнешка Бельская<br>жонка Івана Хадкевіча<br>*(не валодала)* | Аляксандр Іванавіч Хадкевіч<br>1470?–1549<br>*(адсудзіў у Мік. Паца, валодаў з 1514 да 1533 г.)*<br><br>Аграфена Іван. Хадкевічаўна<br>1475?–1530-я<br>жонка кн. Багдана Жаслаўскага<br>з 1490-х гг. да 1530 г. | |
| | кн. Ульяна Бельская<br>жонка кн. Дзмітрыя Фёдаравіча Адзінцэвіча<br>*(не валодала)* | | |
| | кн. Багдан Фёдаравіч Адзінцэвіч<br>1450?–1529?<br>*(прэтэндаваў у 1521 г.)* | кн. Сямен Багдан. Адзінцэвіч<br>1475?–1542<br>*(прэтэндаваў у 1521 г.)* | |
| | | | кн. Юрый Сям. Слуцкі<br>1492–1542<br>*(адсудзіў у Мік. Паца, валодаў з 1514 г. да 1533 г.)* |
| кн. Алелька Уладзіміравіч Кіеўскі<br>1380?–1454<br>*(не валодаў)* | кн. Міхайла Алелькавіч Слуцкі<br>1420?–1481<br>*(не валодаў)* | кн. Сямён Міхайлавіч Слуцкі<br>1445?–1505<br>*(не валодаў)* | кн. Аляксандра Слуцкая<br>1500?–1556?<br>2-я жонка кн. Канстанціна Астрожскага<br>з 1522 по 1530 г.<br>*(валодала пасля мужа з 1530 да 1533 г.)* |

**Дадатак 2.** Сапегі – мужчынскія нашчадкі Марыі Чарэйскай

| I калена | II калена | III калена |
|---|---|---|
| Сямён Іванавіч Чарэйскі *(не валодаў)*<br><br>жонка Еўдакія (Аўдоцця), сястра Марыі, нявестка кн. Андрэя Уладз. 1425?–1458? *(атрымала паводле тастамента ў 1457 г.)* | Марыя Сямёнаўна Чарэйская 1440?–1480-я жонка кн. Фёдара Іван. Бабіча-Саколінскага *(пацверджана ў 1459 г., рэальна не валодала)* | Фядора Фёдараўна кн. Саколінская 1460?–1521? *(не валодала)* жонка Багдана Сям. Сапегі з 1470-х гг. да 1513 г. |

| **IV калена** | **V калена** | **VI калена** |
| --- | --- | --- |
| | | Леў Іванавіч Сапега<br>1557–1633<br>канцлер ВКЛ<br>*(валодаў з 1580 да 1599 г.)* |
| | Іван Іванавіч Сапега<br>1515?–1580<br>*(валодаў з 1546 г. да смерці)* | Грыгорый Іванавіч Сапега<br>1560?–1600<br>*(валодаў з 1580 г. да падзелу 1591 г.)* |
| | | Андрэй Іванавіч Сапега<br>1565?–1611<br>*(валодаў з 1580 г. да падзелу 1591 г.)* |
| Іван Багдановіч Сапега<br>1480?–1546<br>ваявода падляшскі<br>*(адсудзіў у 1533 г., валодаў да смерці)* | Міхайла Іванавіч Сапега<br>1520?–1590-я<br>*(валодаў з 1546 да 1591 г., падараваў Льву Сапегу)* | |
| | Павел Іванавіч Сапега<br>1525?–1580<br>*(валодаў с 1546 г. да смерці)* | |
| жонка Ганна Андрэеўна Сангушка<br>1485?–1561<br>*(валодала з 1546 да смерці)* | Зофія Ів. Сапяжанка<br>1530?–1565<br>муж з 1559 да 1561 г. Лукаш Куранецкі<br>*(валодала з 1550 да 1561 г.)* | |
| | Глеб Януш. Сапега<br>1510?–1575?<br>*(адсудзіў у 1533 г., валодаў да смерці)* | Іван Глебавіч Сапега<br>1540?–да 1575<br>*(памёр пры жыцці бацькі)* |
| Януш Багданавіч Сапега<br>1485?–1530<br>*(не валодаў)* | Дзмітрый Януш. Сапега<br>1515?–1561 | |

| IV калена | V калена | VI калена | VII калена |
|---|---|---|---|
| | Стэфан Януш. Сапега 1520?–1561 | | |
| | Міхайла Янушавіч Сапега 1525?–1550-я | Мікалай Міх. Сапега 1545?–1611 кухмістр ВКЛ *(валодаў з 1575? да 1599 г., прадаў Льву Сапегу)* | |
| | | Леў Міх. Сапега 1550?–1611 *(валодаў да падзелу 1595 г.)* | |
| Фёдар Багданавіч Сапега 1490?–1529? *(не валодаў)* жонка Марыя *(прэтэндавала ў 1536 г.)* | Іван Фёдар. Сапега 1520?–1561 | | |
| | Багдан Фёдар. Сапега 1520?–1610-я *(валодаў у 1560-я гг.)* | | |
| | Дзмітрый Фёдар. Сапега 1525?–1576 *(валодаў у 1560-я гг.)* | | |

**Дадатак 3**. Сапяжанкі – жаночыя нашчадкі Марыі Чарэйскай

| | | |
|---|---|---|
| кн. Багдан Рам. Любецкі 1505?–1546 *(не валодаў)* жонка Зофія Давойна 1515?–1557 | кн. Януш Багд. Любецкі 1530?–1558 *(валодаў у 1550-х гг. да смерці)*, жонка Васіліса яе 2-гі муж з 1559 г. кн. Багдан Андр. Сакалінскі *(валодаў пасля жонкі да 1560-х гг.)* | кн. Павел Янушавіч Любецкі 1555?–1590-я *(страціў пасля 1560-х гг.?)* |

| **IV калена** | **V калена** | **VI калена** | **VII калена** |
|---|---|---|---|
| | кн. Дзмітрый Рам. Любецкі-Відзініцкі 1510?–1558 *(валодаў з 1550 г.)* | кн. Богуш Дзмітрыевіч Любецкі-Відзініцкі 1540?–1564 *(валодаў з 1558 г. да смерці)* | |
| | кн. Іван Рам. Любецкі-Відзініцкі 1515?–1561 *(валодаў з 1550 г.)* | кн. Грыгорый Іванавіч Любецкі 1555?–1596 *(валодаў да смерці)* | кн. Павел Грыгор’евіч Любецкі 1580?–1610-я? *(прадаў Льву Сапегу ў 1597 г.)* |
| Багдана Багд. Сапяжанка 1485?–1550? жонка кн. Рамана Вас. Любецкага з 1500-х гг. да 1523? г., жонка Яна Сцяцкевіча з 1525 да 1541 г. *(прэтэндавала з 1540 г.)* | кн. Ганна Любецкая 1520?–1570-я жонка Мікал. Осціка з 1540-х гг. да 1564 г. *(валодала з 1551 г. да смерці)* | Ганна Мік. Осцікаўна 1545?–1583? жонка кн. Льва Алякс. Сангушкі з 1565 да 1571 г. *(валодала з 1570-х гг. да смерці?)* | кн. Грыгорый Сангушка 1570?–1602 *(у пач. 1590-х гг. прадаў Пятру Стаброўскаму а той – Льву Сапегу ў 1596 г.)* |
| | Сцяцкевічаўна? муж Іван Сялява *(валодаў у 1560-я гг. пасля жонкі?)* | | |

| IV калена | V калена | VI калена | VII калена |
| --- | --- | --- | --- |
| Ганна Багд. Сапяжанка<br>1490?–1554<br>жонка Якуба Кунцэвіча<br>з 1510-х гг. да 1523 г.;<br>жонка Алехны Скаруты<br>з 1524? г. да 1540-х гг.<br>*(прэтэндавала з 1540 г., валодала з 1550-х гг. да смерці)* | Мікалай Як. Кунцэвіч<br>1515?–1555?<br>*(памёр да падзелу 1555)*<br>жонка Раіна Багданаўна Валовічна<br>1520?–1550-я | Барбара Кунцэвіч<br>1540?–?<br>жонка Мікалая Нарушэвіча<br>з 1560-х гг. | |
| | | Кацярына Кунцэвіч<br>1545?–?<br>жонка Мікалая Тальваша<br>з канца 1560-х гг.<br>*(валодала з 1555 г. да замуж. пад апекай Астафія Валовіча)* | |
| | Міхайла Як. Кунцэвіч<br>1520?–? | | |
| | Мацей Як. Кунцэвіч<br>1525?–?<br>*(не атрымалі пры падзеле 1555 г.)* | | |
| | Марцін Алехнавіч Скарута<br>1525? – к. 1550-х?<br>*(валодаў с 1555 г. да смерці, завяшчаў каралю, у 1590 г. вернута Льву Сапегу як Скаруцінская частка)* | | |

*А. Р. Радзюк*

# Нелегальная літаратура на землях Беларусі ў першай палове XIX ст.

На працягу ўсёй першай паловы XIX ст. у палітычным жыцці Расійскай імперыі выразна прасочвалася ўзмацненне ахоўных тэндэнцый, накіраваных на захаванне яе тэрытарыяльнай цэласнасці і непарушнасці асноў дзяржаўнага ладу. Па ініцыятыве вышэйшых уладных структур паўсталі новыя дзяржаўныя інстытуты, былі перагледжаны старыя і прыняты новыя прававыя нормы, уведзены дадатковыя абмежаванні асабістых свабод падданых, пашырана сфера пазасудовай адказнасці. Ключавым элементам сістэмы, якая павінна была забяспечыць усебаковы кантроль за грамадствам, стала Трэцяе аддзяленне Уласнай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі (палітычная паліцыя). У гэтым працэсе была задзейнічана фактычна ўся дзяржаўная машына: армія, царква, сістэма адукацыі, паліцыя і жандармерыя, паштовае ведамства і інш. Татальны кантроль за перамяшчэннем жыхароў, перлюстрацыя асабістай перапіскі, персаніфікаваны паліцэйскі нагляд, разгром універсітэцкіх цэнтраў, абавязковае цэнзураванне літаратурных і мастацкіх твораў, стварэнне разгалінаванай агентурнай сеткі для выяўлення іншадумцаў як унутры, так і па-за межамі дзяржавы – вось няпоўны пералік тых захадаў, што актыўна выкарыстоўвалі ўлады Расійскай імперыі ў той час.

Важнай часткай палітыкі царызму, накіраванай на захаванне існуючага ладу, была барацьба са стварэннем, пранікненнем з-за мяжы і распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры. Асабліва вострай гэтая праблема для расійскіх улад стала ў так званых "прыгранічных губернях", якія ўключалі тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы і Украіны. З пункту гледжання царызму гэта быў самы неспакойны рэгіён імперыі ў палітычным плане. Тут не раз выкрываліся палітычныя змовы і ўздымаліся паўстанні. Сітуацыя ўскладнялася блізкасцю мяжы, з-за якой разам з новымі павевамі еўрапейскай палітычнай думкі пранікала на абшары імперыі забароненая літаратура.

У дадзеным артыкуле ставіцца мэтай вызначыць паняцце «нелегальная літаратура» (адносна таго, як яно разумелася ў першай палове XIX ст.), разгледзець яе асноўныя віды і шляхі пранікнення на тэрыторыю сучаснай Беларусі, а таксама спосабы барацьбы царскіх улад з гэтай з'явай.

Тэрмін «нелегальная літаратура» вельмі шчыльна пераплецены з тагачаснай цэнзурай у Расійскай імперыі. Менавіта яна вызначала, што царскім падданым дазволена чытаць, а што – не. Актывізацыю гэтага інстытута ў канцы XVIII ст. варта звязваць з рэвалюцыйнымі падзеямі ў

Францыі. Цэнзура была заклікана паставіць бар’ер на шляху пранікнення ў краіну “крамольных” думак.

На працягу ўсяго XIX ст. адбывалася далейшае “ўдасканаленне” цэнзурнай палітыкі ў імперыі. Не варта адмыслова спыняцца на дэталях эвалюцыі нагляду за друкаваным словам. Неабходна толькі адзначыць, што ў гэты час ствараліся адмысловыя органы (камітэты), які ажыццяўлялі кантроль за ўвозам, выданнем і распаўсюджваннем любой літаратуры [39, p. 46; 25, s. 27]. Іх дзейнасць рэгулявалася адпаведнымі правіламі, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «Цэнзурныя статуты». Штогод ствараліся і дапаўняліся адмысловыя спісы твораў, якія забараняліся для чытання, захоўвання, цытавання і распаўсюджвання [41, s. 141]. На думку ўлад, падобны ўсебаковы нагляд павінен быў забяспечыць кантроль як за грамадскай думкай, так і за самім грамадствам.

Зыходзячы з тых падыходаў да друкаваных выданняў, якія ў першай палове XIX ст. замацоўваліся на дзяржаўным узроўні, да так званай «нелегальнай» літаратуры варта ў першую чаргу аднесці творы, якія з розных прычын не прайшлі працэдуры цэнзуравання. У іх пералік траплялі выданні, надрукаваныя на тэрыторыі Расійскай імперыі ў абыход афіцыйнай цэнзуры, а таксама выдадзеныя (альбо ўвезеныя з-за мяжы) легальна, а пасля забароненыя, выданні, якія трапілі з-за мяжы без адпаведнага дазволу, і, нарэшце, творы, якія не прызначаліся для друку, а распаўсюджваліся ў рукапісных копіях.

У пераважнай большасці выпадкаў у афіцыйным справаводстве таго часу ўтрымліваецца агульная згадка аб «забароненай» літаратуры без удакладнення таго, што гэта канкрэтна за твор(ы). Так, аналіз спісаў асоб[1], якія ў розных рэгіёнах Беларусі ў першай палове XIX ст. знаходзіліся пад наглядам паліцыі, сведчыць, што тыя трапілі туды *«за чытанне забароненых кніг»*, *«за знойдзены падбухторваючы твор»*, *«за захаванне забароненых кніг»*, *«па справе аб падбухторваючым творы»*, *«за прынцыце для чытання падбухторваючых кніг»*, *«за чытанне забароненых кніг і перыядычных твораў»*, *«за атрыманне мяцежніцкіх твораў»* і г. д.

Значна больш інфармацыі даюць справы аб правозе друкаваных выданняў праз мяжу. Згодна з правіламі мытныя органы непасрэдна справамі дагляду кніг не займаліся. Яны іх апячатвалі і высылалі ў Віленскі цэнзурны камітэт. Той пасля злічэння з адмысловым «індэксам забароненых выданняў» даваў дазвол на правоз або канфіскоўваў выданне. У лік апошніх найбольш часта траплялі творы палітычнага характару. Для таго, каб кніга не прайшла кантроль, дастаткова было, каб у яе на-

---

[1] Гэтыя спісы ў вялікай колькасці захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна і Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (г. Вільнюс).

зве ўтрымліваліся словы кшталту «палітыка», «рэвалюцыя», «свабода» і падобныя [10, арк. 3; 23, л. 110]. Невялікія шанцы прайсці праверку мелі і гістарычныя даследаванні (асабліва, калі яны былі прысвечаны мінуўшчыне Рэчы Паспалітай, яе войнам з расійскай дзяржавай і г. д.), а таксама творы некаторых аўтараў, якія былі залічаны царскімі чыноўнікамі да ліку «шкодных». У пераліку такіх, напрыклад, у поўным складзе апынуліся дзеячы так званай «Вялікай эміграцыі», уключаючы найбольш вядомых з іх – Іаахіма Лялевеля і Адама Міцкевіча. Што тычыцца апошняга, то склалася парадаксальная сітуацыя: да пэўнага часу яго творы ў Расійскай імперыі цалкам легальна выдаваліся і прадаваліся. Аднак пасля эміграцыі яго прозвішча трапіла ў спіс забароненых аўтараў, з якімі расійскія ўлады вялі найбольш зацятае змаганне. Паводле іх логікі, ад чытання А. Міцкевіча да ўзброенага паўстання быў усяго адзін крок. Выпадак са студэнтам Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі Фларыянам Краскоўскім, які *«чытаючы аднаго разу вершы яго* [А. Міцкевіча. – А. Р.], *забыўся да такой ступені, што сарваў са сцяны партрэт Яго Імператарскай Вялікасці і парваў яго…»* [29, l. 11], толькі ўмацоўваў іх у гэтай думцы.

На землях Беларусі і Літвы, у асяроддзі мясцовай шляхты, а таксама гарадскога насельніцтва, попыт на літаратуру, што выдавалася эміграцыйнымі коламі ў Францыі, Бельгіі і Германіі, быў досыць значны. Аб гэтым, сярод іншага, сведчыць факт выяўлення ўладамі дзейнасці цэлай суполкі *«аматараў замежнай літаратуры»*, якая складалася як мінімум з пяці памешчыкаў Слонімскага павета Гродзенскай губерні. У сярэдзіне 1830-х гг. Фердынанд Баржымоўскі, Фларэнцін Мікульскі, Юрый Пратасовіч, Мікалай Пратасовіч і Адам Шукевіч былі абвінавачаны ў тым, што нелегальна пераводзілі грошы за мяжу і атрымлівалі адтуль *«мяцежніцкія творы»* [4, арк. 69–70]. У 1848 г. у Гродне быў арыштаваны чыноўнік Тэафіл Янкоўскі, у якога падчас вобшуку выявілі перапісаную ад рукі справаздачу аднаго з эміграцыйных камітэтаў (верагодна, Польскага Нацыянальнага Камітэта) за 1832 г. [15, арк. 7]. Падобных прыкладаў можна прывесці шмат.

Несумненна, бурлівае палітычнае жыццё як унутры краіны, так і за яе межамі, стымулявала пранікненне, а таксама стварэнне на тэрыторыі Беларусі нелегальных твораў. Да падзей, якія стымулявалі іх распаўсюджванне, варта аднесці паўстанне 1831 г. і дзейнасць разнастайных замежных эмісараў. Сярод апошніх у першую чаргу варта вылучыць Шымана Канарскага. Для прапаганды дэмакратычных і патрыятычных ідэй удзельнікі створанай ім канспіратыўнай сеткі, а таксама іншых арганізацый, якія далучыліся да «Садружнасці польскага народа», актыўна выкарыстоўвалі забароненыя ў Расійскай імперыі літаратурныя і навуковыя творы [42. s. 231, 233, 287, 273, 399].

У выніку працяглага і дэталёвага следства царскімі ўладамі было выяўлена дастаткова шмат фактаў распаўсюджвання «падбухторваючых» кніг. Сярод іншых асоб гэтым займаўся непасрэдна сам Ш. Канарскі (паводле сведчанняў двараніна Мінскай губерні Яна Дмахоўскага, той набыў у Канарскага кнігі, *«некаторыя з іх раздаў, некаторыя спаліў»*) [20, с. 155]. Апрача таго, у канчатковым прысудзе многім удзельнікам дадзенага таварыства ў якасці абцяжарваючых абставін фігуравала набыццё, распаўсюджванне, чытанне (у тым ліку і сялянам), а таксама перапісванне «рэвалюцыйных», «падбухторваючых» твораў і заклікаў. Дзякуючы тым асобам, што пайшлі на супрацоўніцтва са следствам, вядома, што гэта былі за кнігі. У іх пераліку згадваліся «Польскае паломніцтва»[1], «Паўстанне Ражыцкага на Валыні»[2], «Палякі ў Апорта»[3], «Апісанне рэвалюцыі 1831 г.»[4], «Цэсарэвіч Канстанцін»[5], «Катэхізіс Яноўскага»[6], «Вешчыя словы»[7], «Справа Рыма»[8], «Пан Тадэвуш»[9], «Кардыян»[10], «Параўнан-

---

[1] Маецца на ўвазе твор Адама Міцкевіча «Кнігі польскага народа і польскіх пілігрымаў» (Mickiewicz, A. Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego. – Paryż : w druk. A. Pinard, 1832).

[2] Маецца на ўвазе мемуарны твор палкоўніка польскай арміі Караля Ружыцкага «Паўстанне на Валыні, ці Успаміны палка валынскай конніцы, сфарміраванага падчас польскай нацыянальнай вайны супраць дэспатызму расійскага трону 1831 года» (Różycki, K. Powstanie na Wołyniu czyli Pamiętnik Pułku Jazdy Wołyńskiej, uformowanego w czasie wojny narodowej polskiej przeciw despotyzmowi tronu Rossyiskiego 1831 roku. – Bourges : [b/w], 1832).

[3] Маецца на ўвазе кніга Яўстаха Янушкевіча «Палякі ў Апорта» (Januszkiewicz, E. Polacy w Oporto. – Paryż : w druk. i gisserni A. Pinard, 1833).

[4] Маецца на ўвазе кніга Маўрыцыя Махнацкага «Паўстанне польскага народа ў 1830 і 1831 гадах» (Mochnacki, M. Powstanie narodu polskiego w roku 1830 i 1831. – Paryż : [s. n.], 1834).

[5] Маецца на ўвазе твор Яна Чыньскага «Цэсарэвіч Канстанцін і Іаана Грудзіньская альбо польскія якабінцы» (Czyński, J. Cesarzewicz Konstanty i Joanna Grudzińska czyli jakubini polscy. – T. 1–4. – Paryż : w Drukarni P. Baudouin, 1833–1834).

[6] Маецца на ўвазе твор Яна Яноўскага «Кароткі палітычны катэхізіс» (Janowski, J. Krótki katechizm polityczny. – Bourges : [s. n.], 1833).

[7] Маецца на ўвазе твор абата Феліcітэ Робера Ламанэ «Вешчыя словы» (Lamennais, de, F. R. Słowa wieszcze księdza Lamenego / tłum. Aleksander Jełowiecki. – Paris : Typografia A. Pinard, 1834).

[8] Маецца на ўвазе твор абата Феліcітэ Робера Ламанэ «Справы Рыма» (Lamennais, de, F. R. Affaires de Rome. Mémoires adressés au Pape. Des maux de l'Église et de la Société et des moyens d'y remédier. – Bruxelles : P.-J. Voglet, 1837).

[9] Маецца на ўвазе твор Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш, ці Апошні наезд у Літве» (Mickiewicz, A. Pan Tadeusz, czyli ostatni zajazd na Litwie – Paryż : Alexander Jełowiecki, 1834).

[10] Маецца на ўвазе твор Юліўша Славацкага «Кардыян» (Słowacki, J. Kordian. – Paryż : nakł. autora, 1834).

не трох канстытуцый»[11], «Справаздача дзейнасці Камітэта»[12] і інш. [42, s. 221, 399, 406, 463].

На набыццё гэтых і іншых выданняў сябры арганізацыі рабілі адмысловыя грашовыя зборы. Для большага ахопу друкаваным словам насельніцтва ў планах было стварэнне ўласнай друкарні. Следчыя спрабавалі адсачыць шляхі, па якіх нелегальная літаратура трапляла ў край. Сляды вялі ў Адэсу, а таксама на Валынь, на мяжу з Галіцыяй, дзе былы ўдзельнік паўстання 1831 г. Ігнат Кульчынскі з-за аўстрыйскай мяжы наладзіў канал пастаўкі карэспандэнцыі і замежных выданняў [42, s. 533].

У Вільні ў 1846 г. падчас разгрому канспіратыўнай сеткі «Польскага дэмакратычнага таварыства» ўлады выявілі цэлую бібліятэку з забароненых твораў. Знаходзілася яна на кватэры медыка Аніцэта Рэньера (Рэнігера), які меў чытачоў (уладам удалося даведацца імёны толькі 71 з іх [40, s. 500]) у розных мясцінах беларуска-літоўскага краю. Досыць часта выпадкі выяўлення «антыўрадавай» літаратуры фіксаваліся ў сувязі з арыштамі ўдзельнікаў паўстання 1831 г., а таксама дзейнасцю эмісараў 1833 г. («Экспедыцыя Заліўскага»). Так, у 1833 г. у Вільні ваенна-палявы суд разглядаў справу, у межах якой калежскі сакратар Францыц Захарэўскі абвінавачваўся ў *«прыняцці, перапісванні і захоўванні ў сябе папер, якія тычыліся бунту, а таксама чытанні іх іншым»*, а кандыдат філасофіі Бярнард Юсевіч і чыноўнік Вінцэнт Вішнеўскі ў тым, што мелі ў сябе адозвы і апісанне бітвы, якія давалі іншым перапісваць [38, l. 1] і г. д. У тым жа 1833 г. *«у сувязі з выяўленнем у беларускіх губернях паміж некаторымі асобамі падбухторваючых твораў»* у Віцебску паводле загаду генерал-губернатара была ўтворана адмысловая камісія для расследавання падобных выпадкаў [2, с. 667, 776–777]. Значны рост колькасці выданняў, звязаных з падзеямі 1830–1831 гг., зафіксаваны ў рапарце начальніка 4-й жандарскай акругі, штаб-кватэра якой знаходзілася ў Вільні. Гэты дакумент удакладняе, што гэта былі за творы, якія *«з'явіліся тут сакрэтна і ў вялікай колькасці»*: *«1. На французскай мове «Нататкі графа Патоцкага»*[13]*. 2. Такія ж капіта-*

[11] Маецца на ўвазе праца Іаахіма Лялевеля «Тры польскія канстытуцыі 1791, 1807, 1815» (Lelewel, J. Trzy konstytucje Polskie 1791, 1807, 1815. – Lipsk i.e Lwów : s.n., 1831).

[12] Маецца на ўвазе праца І. Лялевеля «Справаздача дзейнасці Польскага Нацыянальнага Камітэта» (Lelewel, J. Zdanie Sprawy z czynności Komitetu Narodowego Polskiego. – Paryż : [s. n.], 1832).

[13] Маецца на ўвазе двухтомная кніга Яна Патоцкага «Падарожжа ў стэпах Астрахані і Каўказа» (Potocki, J. Voyage dans les steps d'Astrakhan et du Caucase. Histoire primitive des peuples qui ont habité anciennement ces contrées. Nouveau périple du Pont-Euxin, par le Cte Jean Potocki. Ouvrages publiés et accompagnés de notes et de tables par M. Klaproth. – Vol. 1–2. – Paris : Merlin, 1829).

*на Бжазоўскага аб вайне ў Польшчы 1831 г., друкаваныя ў Парыжы*[14]. *3. На нямецкай мове «Гісторыя аб паўстанні польскага народа ў 1830 і 1831 гг.» выданне Рыхарда Ота Шпацыра ў 9 кнігах*[15]. *4. На польскай мове. Вершы і розныя творы ў прозе, выдадзеныя Вінцэнтам Полем, Адамам Міцкевічам і Сцяпанам Зонам*[16]. *5. Часопісы, якія выдаюцца пад кіраўніцтвам Іаахіма Лялевеля былымі яго вучнямі [Феліксам] Уратноўскім, Эдвардам Ходзькам*[17] *і Галынскім*[18]. *Надрукаваны ў Бруселі»* [1, с. 293].

Прыведзеныя вышэй пералікі твораў у цэлым даюць агульнае ўяўленне аб тым, якія з іх адносіліся ўладамі да «падбухторваючых» ці «мяцежніцкіх». Разам з тым, аналіз захадаў царызму па барацьбе з нелегальнай літаратурай дазваляе зрабіць выснову, што ў першай палове XIX ст. кола апошняй не абмяжоўвалася выключна кнігамі і брашурамі палітычнага характару. Да іх, напрыклад, адносіліся і музычныя творы. Логіка ўлад у дадзеным выпадку цалкам зразумелая: публічнае іх выкананне магло мець куды большы ахоп аўдыторыі (не кажучы ўжо пра эмацыянальны эфект), чым дзейнасць некалькіх таемных бібліятэк. Таму ноты таксама падпадалі пад цэнзураванне, але, нягледзячы на гэта, «падбухторваючыя» музычныя сшыткі і асобныя нотныя лісты траплялі на беларуска-літоўскія землі. Так, у 1836 г. вінаватым у *«трыманні і распаўсюджванні недапушчальных нот да рэвалюцыйных песень»* быў прызнаны студэнт Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі Юзаф Радзевіч. Сярод іншых папер, у яго былі знойдзены «марш касінераў», «марш Дэмбінскага» і інш. [27, l. 1]. Яшчэ да аднаго тыпу забароненай літаратуры адносіліся антырэлігійныя[19] і антыклерыкальныя[20] творы. Таксама ў выніку канфіскацый кнігазбораў удзельнікаў паўстання

---

[14] Маецца на ўвазе кніга Мар'яна Бразоўскага «Вайна 1831 г. у Польшчы» (Brzozowski, M. La guerre de Pologne en 1831. – Leipzig : F. A. Brockhaus, 1833).

[15] Маецца на ўвазе кніга Рыхарда Шпацыра «Гісторыя паўстання польскага народа ў 1830 і 1831» (Spazier, R. Geschichte des Aufstandes des polnischen Volkes in den Jahren 1830 und 1831. – Altenburg : Literatur-comptoir, 1832).

[16] Магчыма, маецца на ўвазе Стэфан Зан – брат вядомага філамата Тамаша Зана. Аднак з'яўленне яго імя ў гэтым шэрагу пакідае пытанні, бо невядома, каб С. Зан пісаў і друкаваў нейкія літаратурныя творы ці займаўся выдавецкай справай.

[17] Верагодна, маецца на ўвазе Леан Ходзька – адзін з самых вядомых эміграцыйных выдаўцоў, які ўваходзіў у кола блізкіх знаёмых І. Лялевеля. Асоба пад імем і прозвішчам «Эдвард Ходзька» ўвогуле невядомая сярод эміграцыйных дзеячаў першай паловы XIX ст.

[18] Не ўдалося ідэнтыфікаваць асобу.

[19] Так, Уладзіслаў Бронц у 1839 г. абвінавачваўся ў тым, што чытаў Л. Ордзе *«з прывезенай ім кнігі адзін артыкул, які абвяргае Святое Пісанне»* [17, арк. 265].

[20] Напрыклад, да ліку такіх твораў адносілася прытча-казка «Папоўская хітрасць».

1831 г. былі выяўлены адзінкавыя выданні, якія за свой змест уладамі былі *«прызнаны непрыстойнымі»* [22, л. 1].

На землі Беларусі і Літвы нелегальная літаратура пранікала праз розныя каналы і рознымі спосабамі. У большасці выпадкаў гэта адбывалася ў абыход мытнага кантролю. Кантрабанда адыгрывала вельмі важную ролю ў сацыяльна-эканамічным жыцці прыгранічных губерняў. У першую чаргу магчымасць зарабіць, а не нейкія маральна-патрыятычныя перакананні штурхалі кантрабандыстаў да рызыкі, звязанай з перавозам праз мяжу забароненых тавараў. Паколькі на кнігі, як і на іншыя артыкулы бяспошліннага гандлю, існаваў сталы попыт, то і яны сталі аб'ектам кантрабанды.

Афіцыйныя ўрадавыя дакументы даюць мінімум інфармацыі наконт гэтага. Тым не менш, нават урыўкавыя звесткі дазваляюць выявіць датычнасць яўрэйскага насельніцтва да кантрабанды кнігамі: *«Такія творы насычаны хлуслівым патрыятызмам і недарэчнымі выдумкамі..., перадаюцца ў тутэйшы край яўрэямі і асобамі, якія займаюцца кантрабандай, і гатовымі для сваёй карысці на ўсё пайсці...»*, – даносіў шэфу III Аддзялення Аляксандру Бенкендорфу начальнік 4-й жандарскай акругі ў 1835 г. [1, с. 294]. У лісце непасрэдна ўжо самога А. Бенкендорфа, датаваным 1836 г., гэтая інфармацыя пацвярджаецца і канкрэтызуецца: *«атрыманы з-за мяжы звесткі, што з Лейпцыга перасылаюцца ў Польшчу і Літоўскі край шкодныя творы праз перавозчыкаў кантрабанды і што, між іншым, моцнае падазрэнне падае на віленскага купца яўрэя Берэнштайма, які ёсць адзін з галоўных кантрабандыстаў краю»* [28, l. 3]. Арыштаваны ў 1856 г. за *«набыццё, чытанне і продаж розных твораў нядобранамеранага зместу»* дваранін Юрый Баруцкі падазраваўся ў зносінах з кантрабандыстам Лейбам, які *«прывозіў з-за мяжы творы нядобранамеранага зместу, атрыманыя нібыта ад графіні Залускай»* [35, l. 2].

Кантрабанду нелегальнай літаратуры нельга аднесці да выключных прэрагатыў іудзейскага насельніцтва краю. Ёю актыўна займаліся і асобы іншых веравызнанняў, пераважна вышэйшых сацыяльных слаёў, якія жылі па абодва бакі мяжы. Да прыкладу можна згадаць Бенядыкта Касевіча, які быў затрыманы ў 1845 г. у Любліне з вялікай колькасцю выдадзеных у эміграцыі кніг і папер. На допыце выявілася, што ён заняўся распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры свядома, з мэтай *«абудзіць розумы»* жыхароў Польшчы і Літвы. Пры гэтым не забываўся і пра матэрыяльны складнік гэтай справы, бо лічыў яе *«прыбытковай і ў гандлёвых адносінах»* [6, арк. 1].

Натуральна, што апрача апісаных вышэй выпадкаў, калі кантрабанда мела "прафесійны" ці "паўпрафесійны" характар і здзяйснялася ў вялікіх аб'ёмах, яна таксама ажыццяўлялася асобнымі грамадзя-

намі, так бы мовіць, для сваіх уласных патрэб. Паколькі тыя не былі адмыслоўцамі ў гэтай справе, то часцяком трапляліся падчас мытнага дагляду. Такія выпадкі даюць магчымасць адсачыць спосабы правозу нелегальнай літаратуры ў Расійскую імперыю ў першай палове XIX ст.

Дзеля гэтых мэт найчасцей выкарыстоўвалася адзенне, а таксама падарожныя аксэсуары. Так, брэсцкія мытнікі ў 1840 г. выявілі *«розныя патрыятычныя паперы на польскай мове»* ў ботах Уладзіслава Лапацецкага [7], які перасякаў мяжу з боку Каралеўства Польскага. У тым жа годзе пільнасць службоўцаў суседняй Ганёндзскай мытні дазволіла спыніць правоз значнай колькасці *«мяцежных»* вершаў і песень пры даглядзе памешчыцы Гродзенскай губерні Сусаны Мрачкоўскай. Жанчына схавала паперы (каля 30 штук) у падушку [8, арк. 1; 34, l. 1]. Сярод іх былі «Белы Арол на дзень 29 лістапада 1830 г.»[21], «Мазурка Дамброўскага»[22], «Паланез на ноты паланеза Касцюшкі»[23], «Верш да дам, якія танцавалі ў Вільні 6 снежня 1831 г.»[24], «Падборка прыгожых патрыятычных вершаў А. Д. 1832 г.»[25], «Варшавянка»[26], «Марсельеза»[27] і інш.

Распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры ўнутры самога краю кантрабандысты звычайна не займаліся. У паведамленнях жандарскіх

---

[21] Маецца на ўвазе твор «Orzeł Biały: wiersz na dzień 29. listopada 1830. roku» (Warszawa : [s. n.], 1830), які выйшаў пад крыптанімам R. M.

[22] Пол. арыг. «Mazurek Dąbrowskiego» – гімн сучаснай Польшчы, які з'явіўся ў 1797 г. у асяроддзі польскіх легіёнаў, што ваявалі ў Іспаніі на баку напалеонаўскай Францыі. Аднак невядома, якое выданне маецца на ўвазе, бо да 1840 г. іх было зроблена некалькі.

[23] Пол. арыг. «Polonez (na note poloneza Kościuszki)». Маецца на ўвазе польская патрыятычная песня, першая версія якой з'явілася ў 1792 г. з нагоды эміграцыі Тадэвуша Касцюшкі пасля паражэння Рэчы Паспалітай ад Расійскай імперыі ў ваеннай кампаніі 1792 г. Верагодна, тут маецца на ўвазе нотнае выданне для фартэпіяна «Polonez Kościuszki», надрукаванае пасля 1830 г.

[24] Пол. арыг. «Wiersz do dam tancujących w Wilnie dnia 6 grudnia 1831 r.». Не ўдалося ідэнтыфікаваць твор.

[25] Пол. арыг. «Wybór pięknych wierszy patriotycznych A.D. roku 1832». Не ўдалося ідэнтыфікаваць выданне.

[26] Маецца на ўвазе франкамоўная песня «La Varsovienne» («Варшавянка»), якая была напісана французскім паэтам Казімірам Дэлявінем у 1831 г. і пакладзена на музыку Каралем Курпінскім. У 1831 і 1832 гг. у Варшаве і Парыжы было зроблена некалькі яе выданняў.

[27] Пол. арыг. «Hymn Marsylczykow». Маецца на ўвазе «Марсэльеза» (фр. «La Marseillaise») – французская патрыятычная песня часоў Вялікай Французскай буржуазнай рэвалюцыі, напісаная ў 1792 г. Клодам Жазэфам Ружэ дэ Лілем, якая ў цяперашні час з'яўляецца гімнам Францыі. Тут маецца на ўвазе выданне «Hymn Wojenny Marsylczyków / przekład Bruno Kicińskiego» (Warszawa : [s. n.], 1831).

і паліцэйскіх органаў пра гэта часцяком фігуруюць кніжныя гандляры. Іх дзейнасць, а таксама тавар, які яны прадавалі, знаходзіліся пад сталым кантролем адпаведных ведамстваў. Актыўны ўдзел у незаконным распаўсюджванні літаратуры бралі яўрэі, што пацвярджаюць шматлікія ўспаміны. Так, доктар і мемуарыст Тэадор Трыплін у сваіх вандроўных нататках апісваў, як у ваколіцах Гродна адзін яўрэй прапаноўваў набыць яму кніжкі *«з-пад палы»* [43, s. 29]. Вучань гродзенскай гімназіі Станіслаў Ражбіцкі ў 1860 г. быў уражаны, як у цэнтры горада магчыма лёгка набыць забароненыя выданні: *«…а тут яўрэй-фактар на вуліцы запрашае «Паніцу, купі сардзінку, дзін, дзін, дзін». Таварыш тлумачыць, што ў таямнічай бляшанцы не сардзіны, а свежы нумар «Колокола». Яўрэй прасіў 20 кап[еек], але пры садзейнічанні таварыша саступіў»* [24, с. 10].

Кнігі, часопісы, газеты, улёткі, ноты і перапісаныя ад рукі разнастайныя творы, якія прывозіліся з-за мяжы, складалі значную частку нелегальнай літаратуры ў першай палове XIX ст. Разам з тым, вялікі яе пласт ствараўся непасрэдна ў беларуска-літоўскім краі. У пераважнай большасці выпадкаў гэта былі невялікія вершаваныя творы. Геаграфія выяўлення ўладамі падобных твораў надзвычай шырокая.

Мастацкая вартасць такіх вершаў невялікая. Звычайна іх аўтары імкнуліся ў рыфмаванай форме выказаць свае патрыятызм і нелюбоў да Расійскай імперыі і яе ўлад. Сустракаюцца і «тэматычныя» вершы, прысвечаныя пэўнай падзеі ці асобе. Да ліку апошніх можна аднесці два вершаваныя творы «Просьба да ад’язджаючага Мураўёва» і «На ад’езд Мураўёва», выяўленыя ў Гродне ў 1834 г. Галоўным іх героем з’яўляўся тагачасны гродзенскі губернатар Міхаіл Мураўёў:

*«Злога вылюдка з Гродна за Волгу прагналі,*
*Крывасмока, што кроўю не мог наталіцца,*
*І ад яду чыйго камянела зямліца»* [21, с. 125–126].

Прыкладам іншага тыпу падобных твораў з’яўляюцца вершы, знойдзеныя ў Мінску на Нямізскай вуліцы, *«напісаныя ў дзень для нас навечна незабыўны знішчэння касцёла Дамініканцаў у 1845 г. ліпеня 17 дня ў Мінску»*. Польскі іх арыгінал не захаваўся, а тагачасны даслоўны пераклад на рускую мову дае толькі агульнае ўяўленне аб іх змесце:

*«... тотчас бежит убитый горем народ,*
*с тоскою в сердце со слезами на глазах*
*стоном боязнью укрощенный,*
*отчаяньем страхом в каждом шагу,*
*пробиваясь толпою перейти порог Святыни,*
*чтобы смиренно приклонить чело…»* [36, l. 4–5].

Апрача вершаў, у дакументах афіцыйнага справаводства таго часу раз-пораз сустракаюцца і іншыя віды літаратурных твораў. Да іх ліку можна аднесці заклікі і адозвы, часта ў форме ўлёткі. Верагодна, менавіта такі фармат мела *«аб'ява падбухторваючага зместу»*, выяўленая на слупе ў Ашмянах у 1848 г. [1, с. 308], альбо *«цыдулка з дзёрзкімі пагрозамі»* ў бок дырэктара Слуцкай гімназіі, якая была прычэплена да аканіцаў шыбы дома апошняга [34]. Прычынай пераследу і пакарання з боку ўлад маглі стаць нават графіці [9, арк. 59]. У некаторых выпадках казённая мова афіцыйнага справаводства не дае магчымасці больш дакладна вызначыць, які від нелегальнай літаратуры быў знойдзены падчас аператыўна-следчых дзеянняў у той ці іншай асобы. Так, дваранін Слуцкага павета Мінскай губерні Іпаліт Корсак быў аддадзены пад суд за *«дзёрзкія творы супраць Вышэйшай асобы Імператара»* [11, арк. 1, 2]. Застаецца толькі здагадвацца: былі гэта вершы ці, можа, нейкія трактаты.

Да ліку апошніх можна залічыць «Нарыс духа Віленскай Медыка-Хірургічнай Акадэміі», напісаны ў 1839 г. студэнтам гэтай навучальнай установы Мацеем Лавіцкім. Звязаны пэўны час з Дэмакратычным таварыствам Ф. Савіча, ён апісаў падзеі тых гадоў ва ўзгаданым нарысе, які ўпершыню пабачыў свет толькі праз 70 гадоў [3]. Аднак, што цікава, нават у першай палове XIX ст. на беларуска-літоўскіх землях фіксуюцца адзінкавыя выпадкі, звязаныя з выданнем *«злачынных, зламысных і ганебных твораў»*. Падобныя выключна суб'ектыўныя ацэнкі былі выказаны следчымі, якія ў 1850 г. распачалі справу супраць «Навукова-Літаратурнага часопіса» і асоб, якія вакол яго гуртаваліся. Дадзенае выданне – яскравы прыклад адсутнасці адзіных падыходаў у вызначэнні дакладнай мяжы дазволенасці свабоды слова ў гэты час. Усе шэсць нумароў (сшыткаў) часопіса прайшлі цэнзураванне. Аднак пасля сведчання-даносу аб верагодным існаванні таемнага таварыства, звязанага з выданнем, яго змест падпаў пад больш скрупулёзны аналіз, у выніку чаго рэдактар і некаторыя аўтары часопіса былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці [14, арк. 4; 42, s. 469, 473].

Як вынікае з прыведзеных вышэй прыкладаў, царскія ўлады вялі зацятую барацьбу з «крамольнымі» творамі і думкамі. Да захадаў, накіраваных на спыненне пранікнення ў межы імперыі недазволеных твораў і думак, можна аднесці ўвядзенне перлюстрацыі перапіскі. Як вядома, у выніку паражэння паўстання 1831 г. многія яго былыя ўдзельнікі апынуліся ў эміграцыі. Аднак сувязі з радзімай яны не гублялі, падтрымліваючы яе пераважна праз ліставанне. Неўзабаве ўлады спахапіліся, што гэтыя зносіны знаходзяцца па-за іх кантролем, а праз лісты ў край траплялі не толькі звесткі асабістага характару, але і інфармацыя аб гра-

мадска-палітычным жыцці ў Еўропе, дзейнасці эміграцыйных цэнтраў і, сярод іншага, розныя забароненыя (звычайна перапісаныя ад рукі) творы. Улады адрэагавалі на гэтую праблему досыць аператыўна: было выдадзена некалькі распараджэнняў, якія ўводзілі абавязковую перлюстрацыю і нават забарону на ліставанне [26, l. 29]. Іншым спосабам стала прымусовая падпіска, якой улады абавязвалі мясцовых жыхароў не прымаць пісьмовыя пасланні ад сваіх сваякоў з-за мяжы. Аднак у дадзеным выпадку прыклад пінскага павятовага маршалка Францішка Солтана, які публічна адмовіўся ад ліста, што прыйшоў на яго імя з Бельгіі [33, l. 1], з'яўляецца хутчэй выключэннем з агульнага правіла. У абсалютнай большасці выпадкаў такая карэспандэнцыя трапляла ў рукі тых, каму прызначалася.

У першай палове XIX ст. для барацьбы з нелегальнай літаратурай і яе распаўсюджваннем у Расійскай імперыі пачынае шырока выкарыстоўвацца агентура, якая дзейнічала як за межамі, так і ўнутры краіны. Дзякуючы звесткам ад шпегаў, якія аператыўна паступалі з усіх еўрапейскіх краін, улады былі ў курсе асноўных планаў і намераў адносна пастаўкі кніг і часопісаў, выдадзеных эмігранцкімі коламі. Гэтыя веды давалі ім магчымасць дзейнічаць на апярэджанне і перакрываць магчымыя каналы пранікнення падобных твораў. *«Атрымаўшы з Парыжа звесткі аб намеры выхадцаў выслаць на працягу ліпеня гэтага 1838 г. праз Лейпцыг у далучаныя ад Польшчы губерні падбухторваючыя творы і літары для іх перадруку... прашу Вас прыняць усе неабходныя меры...»*, – пісаў А. Бенкендорф віленскаму генерал-губернатару Мікалаю Далгарукаву [30, l. 12]. Падобныя распараджэнні ў 1830–1840-я гг. мелі сапраўды масавы характар. "Кампетэнтныя" органы былі добра інфармаваны аб тым, хто, калі, а таксама што і ў якой колькасці павязе. Праўда, даволі часта падобныя агентурныя звесткі ў выніку аказваліся нічым не пацверджанымі чуткамі. Тым не менш, пастаянная дзейнасць III Аддзялення ў гэтым кірунку мела свае поспехі і перашкаджала нелегальнаму пранікненню забароненых твораў з-за мяжы.

У працэс адсочвання шляхоў распаўсюджвання нелегальнай літаратуры была таксама ўцягнута агентура ўнутры краіны. Да гэтага адпаведныя органы актыўна прыцягвалі цывільнае насельніцтва краю, у тым ліку і яўрэяў. Адметнасці работы з такімі інфарматарамі адлюстраваны ў рапарце чыноўніка спецыяльных даручэнняў Маслава: *«павінны быць зроблены на месцы розныя росшукі, але не наўпрост самім, але найбольш праз яўрэяў, якія па вядомым срэбралюбстве без грошай за справу не возьмуцца»* [16, арк. 3]. Пэўныя абавязкі па выяўленні забароненай літаратуры ўскладаліся і на мясцовую паліцыю. Звычайна пасля атрымання чарговых звестак ад замежных шпегаў, губернскае начальства давала распараджэнне земскім і гарадскім паліцмайстрам мець пільны

нагляд за тым, ці не з'явіўся той ці іншы твор у падпарадкаваным ім павеце ці населеным пункце. Тыя ў сваю чаргу рапартавалі ў адказ, што падобных выпадкаў адзначана не было. Хутчэй за ўсё, ніякіх росшукаў яны насамрэч не праводзілі, а адказы мелі фармальны характар.

Ступень адказнасці за правоз, распаўсюджванне, капіраванне ці стварэнне нелегальнай літаратуры ў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. значна вар'іравалася. Напрыклад, ад адказнасці цалкам вызваляліся тыя асобы, у якіх падчас перасячэння мытных пунктаў і далейшай праверкі былі выяўлены забароненыя творы. У такіх выпадках выданне ці рукапіс канфіскоўваліся, а яе ўладальніку проста паведамлялі аб гэтым. Без сур'ёзных наступстваў звычайна пакідаліся факты, звязаныя з выяўленнем нелегальнай літаратуры, забароненай на падставе цэнзурных распараджэнняў, аднак пры ўмове, што яна не была скіравана супраць Расійскай імперыі, яе тэрытарыяльнай цэласнасці, існуючага ладу ці асобы імператара. У адваротным выпадку ў дачыненні да асобы, у якой былі выкрыты падобныя творы, пачыналася працяглае следства, што магло скончыцца вынясеннем жорсткага прысуду.

Адзінага ўніверсальнага падыходу ці нейкага канкрэтнага заканадаўчага акта, які рэгуляваў бы прававыя адносіны ў гэтай справе, не існавала. Назіралася пэўная варыятыўнасць, абумоўленая канкрэтнымі гістарычнымі абставінамі і суб'ектыўнымі фактарамі ў асобе следчых, суддзяў і тых, хто канфірмаваў (зацвярджаў) прысуд. Цікава, што ў прысудах па падобных эпізодах вызначанага перыяду можна сустрэць адгалоскі сярэднявечча. Так, у 1800 г. у Вільні *«пасквільныя паперы»* шляхціца Крушынскага на лобным месцы пад шыбеніцай публічна паліў кат [37, l. 3], а ў 1839 г. ваенна-палявы суд прысудзіў 20-гадовага Францішка Чарноцкага з Мінскай губерні, абвінавачанага ў захоўванні *«крамольных»* вершаў і *«ў намерах распаўсюдзіць прапаганду сярод жыхароў Мінскай губ.»*, да чацвертавання[28] [31, l. 149–151, 156].

Падобныя прысуды ў першай палове XIX ст. былі хутчэй выключэннем з правілаў. Адной з найбольш пашыраных санкцый пры разглядзе спраў, звязаных з забароненымі творамі, было ўсталяванне паліцэйскага нагляду. Аднак яе прымяненне абмяжоўвалася толькі тымі выпадкамі, калі абвінавачванні тычыліся выключна захоўвання нелегальнай літаратуры. У эпізодах, звязаных з яе перапісваннем, распаўсюджваннем альбо стварэннем, пакаранне было больш жорсткім. Дэталёвае вывучэнне пытання засведчыла, што менавіта ўдзел у стварэнні і распаўсюджван-

---

[28] Гэты прысуд у далейшым быў палагоджаны (у адпаведнасці з традыцыйнай практыкай расійскай судовай адміністрацыі), і Ф. Чарноцкі быў сасланы ў жаўнеры Каўказскага корпуса [40, s. 113].

ні нелегальнай літаратуры займаў другое месца (адразу пасля ўдзелу ў паўстаннях і рознага кшталту змовах) па колькасці пакараных ссылкай на беларуска-літоўскіх землях у вызначаны перыяд [19, с. 115]. Гэта было абумоўлена тым, што падобныя справы звычайна разглядаліся ваенна-палявымі судамі ў адпаведнасці з законамі ваеннага часу. Адсюль такая жорсткасць прысудаў. Таксама неабходна ўлічваць, што досыць часта абвінавачванні, звязаныя з нелегальнай літаратурай, спалучаліся з іншымі «злачынствамі».

Апрача ссылкі ў Сібір, маладыя асобы, якія прыцягваліся да следства па падобных справах, маглі быць аддадзены на вайсковую службу. Часам улады праводзілі пакаранне ў пазасудовым парадку. Адміністрацыйны від адказнасці найчасцей выкарыстоўваўся ў тых выпадках, што не падлягалі судовай юрысдыкцыі. Таму прысуд выносіўся не згодна з літарай закона, а па волі начальства. Так, напрыклад, вучань 5-га класа Магілёўскай губернскай гімназіі Леў Пятроўскі не толькі быў выключаны з гэтай навучальнай установы за знойдзеныя перапапісаныя яго рукой *«самыя шкодныя для грамадскага разумення вершы»*, але і пакараны фізічна (розгамі, дома, без сведкаў) [18, арк. 1, 46, 47].

Падводзячы вынікі, варта адзначыць, што ў першай палове XIX ст. улады Расійскай імперыі разглядалі літаратуру як важны элемент у барацьбе за "розумы" жыхароў дзяржавы. У сувязі з гэтым пэўная яе частка, што не адпавядала дзяржаўнай ідэалогіі ці тагачасным маральным крытэрыям, трапіла пад забарону. Вызначэннем дазволу/недазволу на абарачэнне тых ці іншых твораў займаўся адмыслова створаны орган – Цэнзурны камітэт.

Нягледзячы на забарону і іншыя перашкоды, нелегальная літаратура ў першай палове XIX ст. атрымала досыць шырокае распаўсюджанне на беларуска-літоўскіх землях. У першую чаргу гэта было абумоўлена шырокім попытам на пэўную катэгорыю твораў унутры краю. Найбольш пашыраным спосабам задавальнення яго была кантрабанда розных выданняў з-за мяжы, пераважна з эміграцыйных цэнтраў. Нелегальныя пастаўкі ажыццяўляліся як асобамі, што займаліся гэтым прафесійна, так і тымі, хто правозіў іх "для асабістага карыстання". Частка твораў, якія пасля траплялі ў катэгорыю забароненых, стваралася непасрэдна на землях Беларусі і Літвы. Сярод іх пераважалі вершы патрыятычнага характару.

Імкнучыся паставіць бар’ер на шляху стварэння і распаўсюджання літаратуры, якая не адпавядала дзяржаўным інтарэсам і яе ідэалогіі, расійскія ўлады выкарыстоўвалі разнастайныя спосабы і метады. Для адсочвання і перакрыцця каналаў паставак забароненых твораў была задзейнічана агентурная сетка як унутры краіны, так і па-за яе межамі. Важным элементам гэтай барацьбы былі рэпрэсіі. Любы выпадак выяў-

лення нелегальнай літаратуры суправаджаўся пакараннем, якое ў залежнасці ад яе зместу і шэрагу іншых фактараў было досыць варыятыўным. У цэлым у справах падобнага кшталту даволі часта адсутнічалі агульныя логіка і адзінства ў трактоўцы аднолькавых эпізодаў. Аднак падобная тэндэнцыя была ўласцівай рысай амаль усіх палітычных працэсаў таго часу.

## Крыніцы і літаратура


1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. – Т. 4. – Минск : Наука и техника, 1979. – 376 с.
2. Журнал комитета Западных губерний. – Т. 1. 1831–1835 гг. – Санкт-Петербург : ООО «Дмитрий Буланин», 2018. – 848 с.
3. Ловицкий, М. Очерк духа Виленской академии от учреждения оной до 1839 г. // Русский архив. – 1909. – Кн. 1. – № 4. – С. 534–564.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). – Ф. 1 (Канцылярыя гродзенскага губернатара). Воп. 19. Спр. 1381. – Ведомости о лицах, состоящих под надзором полиции 05.01.1839–03.02.1839.
5. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1606. – Дело о недопущении распространения прокламаций в губернии политического характера. 20.01.1833–01.08.1833.
6. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 20. Спр. 1567. – О задержании Косевича Венедикта с литературой революционного характера. 04.08.1845–25.11.1845.
7. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 20. Спр. 258. – Об аресте жителя Сандомирской губ. Лопатецкого Владислава за обнаружение при нем запрещенной правительством литературы. 09.08.1840–23.08.1840.
8. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 20. Спр. 315. – Об обнаружении у дворянки Мрочковской Сузанны запрещенной правительством литературы. 03.12.1840–09.09.1841.
9. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 20. Спр. 63. – Ведомости о лицах, состоящих под надзором полиции в губернии в 1839 г. 05.07.1839–07.09.1839.
10. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 20. Спр. 764. – Об изъятии иностранной литературы у возвращавшегося из-за границы помещика Оржешко и направлении ее на цензуру 27.11.1842–27.05.1843.
11. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 27. Спр. 497. – По прошению помещицы Корсаковой о взыскании долгов с конфискованного имения ее мужа 10.07.1834–14.08.1834.
12. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 28. Спр. 276. – Дело о разрешении поездки на родину, состоявшему под надзором полиции помещику Полубинскому для получения наследства. 28.11.1852– 04.01.1854.
13. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 28. Спр. 833. – По прошению бывшего губернского секретаря Янковского Феофила, высланного в 1846 г. в Ка-

занскую губ., о разрешении ему вернуться в гор. Гродно. 29.10.1856.–28.02.1857.

14. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 28. Спр. 838. – Ведомости о лицах, состоявших под надзором полиции. 28.05.1856–01.03.1857.
15. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 29. Спр. 78. – Дело о ссылке в центральные губернии России чиновника Янковского за обнаружение у него при обыске отчета о действиях участников польского восстания 1831 г. 11.09.1848–15.12.1849.
16. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 29. Спр. 82. – Об установлении связи помещика Выгоновского с польскими эмигрантами. 25.02.1845–15.04.1850.
17. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 31 (Гродзенскае ўпраўленне земляробства і дзяржаўных маёмасцей). Воп. 2. Спр. 175. – Дело о секвестре имений и имуществ по Гродненской губ., принадлежавших участникам восстания 1831 г., и передаче их в ведение казны 18.10.1838–18.01.1840.
18. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 1297 (Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага). Воп. 1. Спр. 9820. – Дело по представлению могилевского гражданского губернатора о найденных у ученика Могилёвской гимназии Льва Петровского польских списков, вредных для пользования в обществе. 29.03.1837–19.06.1837.
19. Радзюк, А. Пад скіпетрам Расейскай імперыі. Рэпрэсіўная палітыка царызму на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. – Гародня : Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт; Кракаў : Беларускае таварыства ў Кракаве, 2017. – 196 с.
20. Радзюк, А. Дзейнасць арганізацыі Канарскага на Гродзеншчыне // Культура, наука, образование в современном мире : Материалы IV Международной научной конференции / [редкол. : Л. Л. Мельникова и др.]. – Гродно : ГГАУ, 2009. – С. 153–158.
21. Радзюк, А., Брусевіч, А. «Молім: хай ён у пекле на век застанецца» (два невядомыя вершы, прысвечаныя М. М. Мураўёву) // Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах. – Выпуск 7. – Мінск : Лімарыус, 2016. – С. 122–127.
22. Российский государственный исторический архив (далей – РГИА). – Ф. 384 (Второй департамент Министерства государственных имуществ). Оп. 15. Д. 1018. – Дело о передаче в МВД книг, обнаруженных в конфискованных имениях. 01.05.1836–18.03.1839.
23. РГИА. – Ф. 384. Оп. 15. Д. 202. – Дело о передаче в библиотеку Мин-ва Финансов книг, обнаруженных в конфискованных имениях Подольской губ. 16.08.1832–07.07.1835.
24. Рожбицкий, С. Из воспоминаний гимназиста 60-х годов. – Тифлис : тип. М. Вартанянца, 1904. – 120 с.
25. Kul-Sielwiestrowa, S. Cenzura na ziemiach litewsko-białoruskich za czasów Mickiewicza // Ruch Literacki. – 1998. – Z. 3. – S. 403–415.
26. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей – LVIA). – F. 378 (Канцелярия виленского, ковенского и гродненского генерал-губернатора). Ap. 123.

В. 2. – О письмах, пересылаемых из-за границы мятежникам, и о прочем. 1832–1835 гг.
27. LVIA. – F. 378. Ap. 127. B. 25. – О воспитаннике Виленской Медико-Хирургической Академии Родзевиче, бывшем под судом за найденые у него музыкальные ноты к б[ывшему] мятежу относящиеся. 21.05.1836–27.05.1836.
28. LVIA. – F. 378. Ap. 127. B. 52. – О вредных сочинениях, привозимых из-за границы в Польшу и Литовский край посредством провозителей контрабанды, в чем особенно подозревается еврей Беренштейм. 09.06.1836–09.09.1836.
29. LVIA. – F. 378. Ap. 129. B. 29. – О студенте медико-хирургической академии Флориане Крашевском. 29.03.1838–19.04.1838.
30. LVIA. – F. 378. Ap. 129. B. 8. – О ввозе в Россию вместе с контрабандою политических прокламаций на польском и русском языках. 28.04.1838–26.07.1839.
31. LVIA. – F. 378. Ap. 130. B. 32. – О вновь открытом тайном обществе между студентами Виленской М. Х. Академии. 30.04.1839–31.07.1841.
32. LVIA. – F. 378. Ap. 131. B. 126. – О найденных у дворянки Пружанского уезда Сузанны Мрочковской возмутительных сочинениях при проезде из Царства Польского в Пружанский уезд. 14.12.1840–13.09.1841.
33. LVIA. – F. 378. Ap. 131. B. 15. – По донесению военного начальника подполковника Кремпина о письмах, полученных из-за границы ко многим помещикам Пинского уезда и к предводителю дворянства Солтану. 07.03.1840–18.04.1840.
34. LVIA. – F. 378. Ap. 140. B. 288. – О лицах состоящих под надзором за 1849 г.
35. LVIA. – F. 378. Ap. 147. B. 4. – О наблюдении за непривозом из-за границы запрещенных книг и вообще за книжною торговлею. 22.02.1856–17.03.1856.
36. LVIA. – F. 378. Ap. 53. B. 1937. – О найденных в Минске у Кол. Ас. Жеготты пасквильных стихах. 04.12.1845–03.09.1846.
37. LVIA. – F. 378. Ap. 8. B. 28. – О пасквиланте шляхтиче Кучинском и о сожжении гнусных его бумаг на публичном месте через палача. 30.08.[1800].
38. LVIA. – F. 381. Ap. 24. B. 9981. – Дело о ссылке в отдаленные губернии России под строгий надзор полиции Юсевича, Вишневского, Савицкого и Михневича за хранение и распространение возваний. 1833–1838 гг.
39. Medišauskienė, Z. Centhership in Lithuania: a tool of Russian policy: 1831–1865 // Lithuanian Historical Studies. – 2002. – № 7. – P. 43–66.
40. Śliwowska, W. Zesłańcy polscy w Imperium Rosyjskim w pierwszej połowie XIX wieku. – Warszawa : DiG, 1998. – 835 s.
41. Stoch, E. Literatura i teatr pod presją cenzury w pierwszej połowie XIX wieku – na przykładzie życia kulturalnego Lublina // Napis. – 2009. – Seria XV. – S. 141–158.

42. Stowarzyszenie Ludu Polskiego na Litwie i Białorusi. Szymon Konarski = Содружество польского народа в губерниях Виленской и Минской. Шимон Конарский. – Warszawa : DiG, 2015. – 820 s.
43. Tripplin, T. Dziennik podróży po Litwie i Żmudzi odbytej w 1856 r. – T. I. – Wilno : nakład Maurycego Orgelbranda, 1858. – 267 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.05.2022

*Ф. В. Чарняўскі*

# Заснаванне Менскага Свята-Траецкага жаночага манастыра ў кантэксце фундацыйнай дзейнасці жонкі менскага земскага пісара Марыны Вяжэвіч (1630–1650-я гг.)[1]

Жаночы манастыр пры царкве святой Тройцы ў Менску быў заснаваны ў пачатку 1630-х гг. дзякуючы фундацыі Марыны Міхайлаўны Вяжэвіч. З 1633 г. і да моманту сваёй смерці 10 студзеня 1657 г. яна прыкладала вялікія намаганні па яго стварэнні. Каля дваццаці гадоў Марына Вяжэвіч аказвала манастыру падтрымку і забяспечыла яго існаванне ў будучыні. На нашу думку, яе фундацыйная дзейнасць у значнай ступені была выклікана трагедыяй, якая спасцігла Марыну Міхайлаўну – заўчаснай смерцю малодшага сына Юрыя і мужа Мікалая Вяжэвіча, менскага земскага пісара. У манастыры мусілі маліцца за спачын іх душы і здароўе крэўных Марыны Вяжэвіч. У тыя часы жыццё ўдоў было няпростым, нярэдка суседзі захоплівалі іх землі і падданых. Але Марына Вяжэвіч знаходзілася ў бяспецы, дзякуючы падтрымцы старэйшага сына – вядомага палітычнага дзеяча ВКЛ Пятра Казіміра Вяжэвіча, які напрыканцы жыцця стаў навагародскім ваяводам. Варта больш падрабязна распавесці пра яе лёс.

Марына Вяжэвіч паходзіла з роду Яцынічаў, які ў канцы XVI – першай палове XVII ст. належаў да эліты Слонімскага павета. Яе бацька Міхаіл Іванавіч Яцыніч у жніўні 1582 г. атрымаў прывілей на ўрад слонімскага земскага падсудка [4, арк. 99] і знаходзіўся на гэтай пасадзе яшчэ 12 чэрвеня 1621 г. [18, арк. 134 адв.]. Яе маці, верагодна, была Багдана Бенядыктаўна Пратасовіч (памерла да чэрвеня 1604 г.) [15, арк. 203]. Дзед Марыны – ключнік троцкі, войскі гарадзенскі Бенядыкт Васільевіч Пратасовіч – карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод шлях-

[1] За карысныя парады, якія пасадзейнічалі павышэнню якасці гэтага артыкула, выказваю шчырую падзяку **Яўгену Глінскаму**.

ты Гарадзенскага, Лідскага, Навагародскага і Слонімскага паветаў [14, арк. 55–58]. Ён узяў шлюб з прадстаўніцай княжацкага роду Марынай Іванаўнай Палубінскай. За свае паслугі Б. Пратасовіч атрымаў нямала гаспадарскіх наданняў, частка з якіх затым трапіла ў рукі Мікалая і Марыны Вяжэвічаў. Дзядзька Марыны – Ян Бенядыктавіч Пратасовіч – быў аўтарам шэрагу літаратурных твораў [25, s. 77].

Сваякі Міхаіла Яцыніча парадніліся з элітай суседніх паветаў. Так, яго сястра Марына выйшла замуж за лідскага скарбніка Яна Радзівіловіча-Шостака [23, s. 375–376]. Сястра Ганна стала жонкай Пятра Сметанковіча-Быльчынскага [15, арк. 39, 203]. Апрача Марыны, Міхаіл Яцыніч меў сыноў Адама, Мікалая і Аляксандра.

Шлюб Мікалая Вяжэвіча з Марынай Яцыніч, верагодна, быў заключаны яшчэ ў канцы XVI ст. Пры передачы маладым пасагу і неабходнай выправы Міхаіла Яцыніча напаткалі цяжкасці, выкліканыя адсутнасцю належнай сумы грошай. Гэтым пытаннем ён займаўся да 1609 г. уключна. Пасагавыя грошы, выправу і землі, акрэсленыя ў перадшлюбнай дамове, даводзілася перадаваць Мікалаю і Марыне Вяжэвічам часткамі. 17 чэрвеня 1604 г. Міхаіл Іванавіч прадаў швагру Пятру Сметанковічу-Быльчынскаму і яго жонцы, сваёй сястры Ганне, за 2 000 коп літоўскіх грошаў частку Яваpаўскага маёнтка ў Слонімскім павеце [15, арк. 203]. Праз год, 8 чэрвеня 1605 г., ён склаў запіс аб перадачы зяцю і дачцэ дзвюх частак маёнтка Івачэвічы таго ж павета [16, арк. 153]. 12 студзеня 1609 г. Яцыніч прадаў Пятру Быкоўскаму адну частку маёнтка Явар, а другую аддаў у заставу Пятру Сметанковічу-Быльчынскаму [19, арк. 80; 17, арк. 201]. У выніку пасля выдачы маладым пасагу слонімскі падсудак пазбавіўся значнай часткі зямельнай уласнасці.

Мікалай і Марына Вяжэвічы мелі двух сыноў – Пятра Казіміра і Юрыя (Ежы), якія, верагодна, нарадзіліся ў канцы XVI ст. Старэйшы сын Пётр Казімір Вяжэвіч атрымаў выдатную адукацыю і да 1635 г. у якасці сакратара трапіў на службу да канцлера ВКЛ князя Альбрыхта Станіслава Радзівіла, што забяспечыла яго далейшае прасоўванне па кар'ернай лесвіцы (Пётр Казімір быў навагрудскім ваяводам, памёр у 1657 г.) [24, s. 125].

Малодшаму сыну Вяжэвічаў Юрыю, які прысвяціў сябе вайсковай справе, лёсам было наканавана кароткае жыццё. Ён загінуў у адной з апошніх бітваў вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600–1629 гг., у 1628 г. пад Рыгай [22, s. 289].

Мікалай Вяжэвіч, земскі пісар Менскага ваяводства, памёр у сярэдзіне 1633 г., пра што сведчыць наданне 4 чэрвеня 1633 г. каралём польскім і вялікім князем літоўскім Уладзіславам IV Вазам вакантнай пасады менскага земскага пісара суддзічу земскаму менскаму Крыштафу Ва-

ладковічу [5, арк. 373]. На момант смерці Мікалаю Вяжэвічу было каля пяцідзесяці гадоў.

21 кастрычніка 1635 г. Марына Вяжэвіч атрымала дазвол уніяцкага мітрапаліта кіеўскага і ўсёй Русі Іосіфа Вельяміна-Руцкага на перадачу пляцаў царкве Святой Тройцы, пры якой павінен быў знаходзіцца манастыр [6, арк. 723 адв.–725]. У тым жа годзе Марына Вяжэвіч звярталася па дазвол на здзяйсненне штотыднёва дзвюх літургій і ўвядзенне ў штат манастыра святара, які мусіў прымаць споведзь у манахінь [2, с. 37]. Святары ордэна Васіля Вялікага, якія сабраліся ў 1636 г. у Вільні на кангрэгацыю, увялі ў манастыры пасаду спаведніка і дазволілі яго манахіням праводзіць кожны тыдзень толькі адну літургію, што павінна было спыніцца пасля смерці фундатаркі.

5 верасня 1636 г. Уладзіслаў IV Ваза пацвердзіў перадачу Марынай Вяжэвіч пляцаў фундаванаму ёй жаночаму манастыру ордэна святога Васіля *«рэлігіі грэчаскай, што знаходзіцца ў адзінстве з рымска-каталіцкім касцёлам»*. Кляштар вызваляўся з-пад юрыдычнага падначалення менскім свецкім судам – земскаму, замкаваму (гродскаму) і месцкаму. У гэты ж дзень фундатарка ўнесла вялікую грашовую суму на забеспячэнне яго будаўніцтва [3, с. 162]. Яна таксама перадала ў карыстанне манастыру частку сваіх маёнткаў разам з падданымі: землі ў Грыневічах, некалі набытыя ў Лукаша Ваўчка, унука скарбнага ВКЛ Лукаша Мамоніча, за 20 000 злотых [13, арк. 618–621 адв.]. Яны аддаваліся з умовай захавання за ёй і яе сынам падкаморыем мсціслаўскім Пятром Казімірам Вяжэвічам права на пражыванне ў гэтым сяле. Адначасова ў акце надання Марына Міхайлаўна прасіла манахінь маліцца за збаўленне сваёй душы і душы сына Пятра Казіміра.

Падчас падрыхтоўкі да перадачы сяла ў карыстанне манастыра Марына Вяжэвіч паклікала ў 1643 г. падкаморыя менскага Крыштафа Кавячынскага і правяла межаванне зямель [13, арк. 618], каб пазбегнуць узнікнення ў далейшым памежных спрэчак манахінь з суседзямі. Манастыру перадаваліся і землі ў фальварку Чарнаручча з сялом Дзераўніна, набытыя ў Юдыты Віцкай Янавай Лашэўскай. М. Вяжэвіч агаварыла ўмовы перадачы – святары павінны маліцца за душы фундатаркі, яе сына Пятра Вяжэвіча і яе прыяцеляў [13, арк. 618 адв.–619]. Для засведчання фундушовага запісу на будаўніцтва жаночага кляштара пры царкве Святой Тройцы Марына Вяжэвіч запрасіла паставіць подпісы і прыкласці пячаткі найбольш блізкіх сяброў: Станіслава Буйвіда, крэўнага жонкі яе дзевера Андрэя, і Мікалая Міцкевіча [13, арк. 621].

Марына Вяжэвіч адыгрывала вялікую ролю ў кіраванні новаўтвораным манастыром. Захаваліся крыніцы, якія адлюстроўваюць яе ўдзел у вырашэнні амаль усіх пытанняў, што датычыліся жыцця манахінь. 22 верасня 1639 г. кіраўніцтва манастыра ў складзе «маці» (старшай)

Алімпіяды Мамоніч, вікарыі Еўфрузыны Яцыніч і фундатаркі Марыны Вяжэвіч выдала квіт Адаму і Яўфіміі, народжанай Драчылоўскай, Корсакам аб атрыманні пасагавых грошай, прызначаных імі дачцэ Праксэдзе (у манастве насіла імя Венефрыда), перададзеных манастыру пры ўступленні яе ў ордэн Васіля Вялікага [10, арк. 155–156 адв.].

Нам вядомы тры асобы, якія выконвалі пры Марыне Вяжэвіч абавязкі старшай манастыра. Алімпіяда Мамоніч, крэўная скарбнага ВКЛ Л. Мамоніча, у першы раз згадвалася 21 кастрычніка 1637 г., у апошні – 11 верасня 1639 г. [10, арк. 155–156; 1, с. 1]; Еўфрузына Яцыніч – адпаведна 28 чэрвеня 1641 г. і 5 чэрвеня 1643 г. [10, арк. 299–300, 658–659] (яе прызначылі старшай манастыра пасля пераходу (да 1640 г.) А. Мамоніч у Оршу, дзе яна ўзначаліла мясцовы жаночы базыльянскі манастыр [1, с. 53]). Першая згадка пра Аляксандру Марыяну Віцкую адносіцца да 25 лістапада 1645 г., а апошняя – да 12 снежня 1682 г. [1, с. 389–391; 8, арк. 26]. Яна была дачкой зямян Менскага павета Крыштафа і Марыны Лукашаўны[2] Віцкіх, уладальнікаў зямель у Гараўцы на поўнач ад Менска. У манастыры знаходзілася і яе сястра – Кацярына [1, с. 41].

Складана вызначыць першапачатковую колькасць насельніц манастыра. Для ўяўлення аб яго магчымых памерах варта прывесці звесткі аб праваслаўным манастыры, створаным у Менску пры царкве святых апосталаў Пятра і Паўла. У 1637 г. у ім налічвалася не больш за 15 манахінь разам з ігуменняй [20, с. 212].

Адной з першых насельніц манастыра пры царкве святой Тройцы стала Гальшка Уніхоўская – унучка менскага земскага суддзі Марціна Валадковіча, народжаная ў шлюбе яго дачкі з Янам Анікеевічам Уніхоўскім. Пасля дасягнення сталасці і смерці бацькоў Гальшка ўступіла ў манастыр (да 6 ліпеня 1641 г.) [10, арк. 299–300 адв.] і прыняла манаскае імя Віктарына. Марцін Валадковіч, згодна са звычаем, падараваў манастыру срэбраную лыжку. Грашовую суму ў памеры 1000 польскіх злотых унесла яго жонка Дарота з Дарагастайскіх. Гэтыя грошы належалі Уніхоўскай паводле тастамента Алены Ізабелы Кенсоўскай [10, арк. 116–117 адв.].

Сродкі на царкоўныя патрэбы і пабудову жаночага базыльянскага манастыра ахвяравалі і іншыя жыхары горада. 6 ліпеня 1641 г. старшая манастыра і Марына Вяжэвіч унеслі ў менскія гродскія акты тастамент памерлай Дароты Валадковіч, у якім тая запісала на будаўніцтва вялікую суму грошай [10, арк. 299–300].

Здаралася, што ахвярадаўцы «забываліся» своечасова выконваць свае абяцанні. У такіх выпадках Марына Вяжэвіч праз суды дабівалася спагнання ахвяраванняў. 10 лістапада 1649 г. гродскі суд Менскага

---

[2] Марына была дачкой скарбнага ВКЛ Лукаша Мамоніча.

ваяводства выдаў дэкрэт, паводле якога Ян Казімір Альшэўскі мусіў адправіць у манастыр да 2 лютага 1650 г. 13 бочак хлеба [1, с. 41–42]. Ад імя манастыра ў гэтым судовым працэсе выступалі Марына Вяжэвіч, старшая Марыяна Віцкая і яе сястра Кацярына (у манастве Схаластыка).

Як і іншыя тагачасныя кляштары і манастыры, Свята-Траецкі манастыр займаўся ліхвярствам. Далёка не заўсёды пазычаныя ў манастыра грошы вярталіся ў належны тэрмін. Так, 20 лютага 1652 г. менскія зямяне Уладзіслаў і Дарота (народжаная Кастравіцкая) Пашкоўскія пазычылі ў Марыяны Віцкай 600 злотых і абавязаліся вярнуць пазыку праз год. Але не вярнулі грошы, а затым не з'явіліся на суд. У выніку Галоўны Трыбунал ВКЛ 25 кастрычніка 1653 г. прысудзіў іх да выплаты, з улікам судовых выдаткаў і розных штрафаў, ужо 2405 злотых [1, с. 45–46].

Манахіні Свята-Траецкага манастыра мелі непаразуменні з менскім зямянінам Юрыем Ярашавічам Ваўчком[3]. Валоданні і яго, і манастыра (запісаныя паводле фундуша М. Вяжэвіч) знаходзіліся ў сяле Грыневічы Менскага павета. Чарговае пасяджэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ па разглядзе справы манастыра супраць Ю. Ваўчка адбылося да 22 лістапада 1644 г. На яго маёнтак у Грыневічах суд усклаў спагнанне пазыкі, судовых выдаткаў і іншыя штрафы. Аднак Юрый Ваўчок працягнуў супрацьстаянне: яго слугі не дапусцілі ў маёнтак каралеўскага двараніна, які прыбыў для прымусовага спагнання грошай. У выніку 22 лістапада 1644 г. Уладзіслаў IV Ваза за такое непадпарадкаванне падпісаў ліст аб асуджэнні Ю. Ваўчка на баніцыю [10, арк. 963–964 адв.]. З дэкрэта Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад 25 лістапала 1645 г. вынікае, што справа пачалася з пазыкі Ю. Ваўчка ў старшай манастыра 20 коп літоўскіх грошаў. У лістападзе 1645 г. вяртаць было неабходна ўжо 82 капы, але Ю. Ваўчок і ў гэты раз праігнараваў суд [1, с. 18].

Яшчэ адно, верагодна, не апошняе пасяджэнне суда з удзелам Ю. Ваўчка і прадстаўніц манастыра адбылося 23 снежня 1645 г. [1, с. 29–31]. Ад імя манастыра падчас працэсу выступалі старшая Аляксандра Марыяна Віцкая і фундатарка Марына Вяжэвіч. На гэты раз да Ю. Ваўчка выстаўляліся прэтэнзіі *«въ невымеренью пяти волокъ кгрунту въ Деревнине»* і невыкананні дэкрэта Галоўнага Трыбунала ВКЛ аб выплаце манастыру 203 коп грошаў.

---

[3] На нашу думку, Юрый Ваўчок быў сваяком манастырскай старшай Аляксандры Марыяны Віцкай. Яе маці Марына Мамоніч да пачатку XVII ст. была ў шлюбе з Ярашам Мікалаевічам Ваўчком. Да 1606 г. той памёр, і Марына Мамоніч узяла другі шлюб з Крыштафам Віцкім – бацькам Аляксандры Марыяны. У першым шлюбе Марыны Мамоніч нарадзіліся некалькі сыноў і дачок. Пра Юрыя Ярашавіча Ваўчка захавалася нямала звестак, напрыклад, у 1616 г. ён забяспечыў пасагам сваю сястру Эстэр, якая ўступіла ў шлюб з Кемешам [9, арк. 228 адв.].

Працяглым быў судовы працэс манастыра супраць Крыштафа і Ганны (народжанай Цяцерынай) Халхоўскіх аб неперадачы грошай, якія належалі манастыру. З улікам таго, што на многія пасяджэнні Халхоўскія не з'яўляліся, памер грашовых прэтэнзій да іх істотна павялічыўся і ўключаў штрафы за невыкананне судовых рашэнняў, што было замацавана дэкрэтам Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад 21 кастрычніка 1637 г. [1, с. 2–3].

У 1645 г. Свята-Траецкі манастыр не раз выклікаў на пасяджэнні Галоўнага Трыбунала ВКЛ менскую гродскую пісаравую Кацярыну Зяновічаўну Севярынавую Станскую. Яшчэ 8 жніўня 1643 г., калі старшай манастыра з'яўлялася Е. Яцыніч, К. Станская пазычыла 100 коп грошаў. 23 снежня 1645 г. трыбунальскія суддзі прысудзілі ёй да вяртання ўжо 402 капы [1, с. 31–32].

Не заўсёды перамога ў судовых працэсах была на баку манахінь. 3 снежня 1653 г. суд строга пакараў старшую манастыра Аляксандру Марыяну Віцкую і яе сястру Схаластыку, а таксама віленскага падкаморыя Гілярыя Мінтаўта-Чыжа. Яшчэ ў 1650 г. Галоўны Трыбунал ВКЛ прысудзіў ім выплаціць Адаму Корсаку 2000 злотых. Манастыр супраціўляўся спробам спагнання з яго маёмасці гэтага штрафу, у выніку ў канцы 1653 г. суд павялічыў суму спагнання да 8025 злотых [1, с. 52–54].

Нягледзячы на вялікую рэлігійнасць насельніцтва ВКЛ, адносіны шляхты да канфесійных структур змяняліся, калі закраналіся яе матэрыяльныя інтарэсы. Часта не выконваліся фундушовыя запісы. Такая сітуацыя магла назірацца, калі фундатары паміралі, не выканаўшы свае запісы, а іх нашчадкі намагаліся пакінуць сваю спадчыну некранутай.

Грошай на існаванне Свята-Траецкага манастыра пастаянна не хапала. Асноўнай задачай яго кіраўніцтва і фундатаркі напачатку быў пошук сродкаў. Кожная манахіня прыносіла ў скарбніцу манастыра свае пасагавыя грошы. Памеры пасагу залежалі ад матэрыяльных магчымасцей сям'і, а ў Свята-Траецкі манастыр траплялі ў асноўным жанчыны з не вельмі заможных родаў. Таму пажаданым было прыцягванне ў якасці насельніц асоб, якія маглі атрымаць дастатковае матэрыяльнае забеспячэнне.

У снежні 1645 г. у Галоўным Трыбунале ВКЛ слухалася скарга манастыра на прысуд Менскага земскага суда па справе супраць Яна Грабінскага (і яго сына Яна) і Яна Гамшэя – апекуноў маёмасці памерлага слонімскага харужага Юрыя Мялешкі [1, с. 22–24, 26–29]. Гэтая спрэчка ў выпадку яе вырашэння на карысць манастыра магла прынесці яму каля 2000 польскіх злотых. А пачалася яна яшчэ ў 1633 г. [1, с. 22, 27]. Перад смерцю харужы слонімскі зрабіў некалькі запісаў. Згодна з адным з іх жонка Яна Янавіча Грабінскага Зафея Салагубаўна атрымала

3000 злотых, забяспечаных на фальварку Сёмкава-Саламярэцкае Менскага павета, а таксама частку гэтага фальварка. Перад смерцю яна пакінула гэтую суму дачцэ Алене, якая нарадзілася ў 1630 г., і сыну Юрыю. Таксама Зафея Грабінская ў 1639 г., перад смерцю, даручыла са згоды мужа дачку апецы Марыны Вяжэвіч. Ва ўзросце каля 11 гадоў дзяўчынка без ведама бацькі была прынята ў манастыр, дзе атрымала імя Гілярыя. Адначасова яна падпісала згоду на пераход у карыстанне манастыра не толькі 1500 злотых, але і тых грошай, якія павінна была атрымаць яе маці ад некаторых даўжнікоў. Праз некалькі месяцаў пасля гэтага дзяўчынка памерла. З улікам таго, што ў ВКЛ у ордэны маглі ўступаць асобы жаночага полу пасля дасягнення 13-гадовага ўзросту, суд не дазволіў манастыру атрымаць частку спадчыны Ю. Мялешкі. Манастыру быў выпісаны штраф у 6 коп літоўскіх грошаў, а Грабінскія вызвалены ад магчымых паўторных позваў [1, с. 22–24, 26–29].

Сёння складана растлумачыць, чаму, нягледзячы на значныя ахвяраванні менскіх месцічаў і навакольнай шляхты, манастыр не быў пабудаваны яшчэ ў 1652 г. [3, с. 162]. Зразумела, што падчас вайны 1654–1667 гг. праца па яго будаўніцтве была цалкам спынена.

Падаецца слушным меркаванне, што пляцы ў Менску, якія перадаваліся Марынай Вяжэвіч на пабудову новаўтворанага жаночага манастыра, так і не былі выкарыстаны паводле прызначэння. У 1708 г. высветлілася, што паперы на гэтыя землі, якія раней знаходзіліся на захаванні ў старшай манастыра Тэклі Валадковіч, былі забраны падчас абрабавання манастыра, а пляцы аказаліся ў валоданні новых гаспадароў, а менавіта, у віленскага падкаморыя Гілярыя Чыжа і яго сына Казіміра. Новыя гаспадары адмовіліся іх вяртаць [12, арк. 77].

Праяўляючы вялікі клопат аб новым менскім манастыры, Марына Вяжэвіч не забывалася і пра асабістыя інтарэсы. 14 лютага 1635 г. яна атрымала каралеўскі прывілей на вызваленне ад пастою вайскоўцаў і дэпутатаў Галоўнага Трыбунала ВКЛ у яе двух дамах на Рынку ў Менску. Першы з іх быў набыты ў каралеўскага ротмістра Крыштафа Стэфанавіча Гладкага і знаходзіўся насупраць кальвінскага збора, а другі (былая ўласнасць суддзі земскага менскага Марціна Валадковіча) размяшчаўся каля кляштара бенедыктынак. Пры наданні прывілея былі ўлічаны вялікія заслугі перад краінай яе памерлага мужа [6, арк. 230 адв.–231]. На нашу думку, на прыняцце такога рашэння ў істотнай ступені паўплывала падтрымка, якую аказаў удаве ваявода троцкі Януш Скумін-Тышкевіч.

У канцы 1640-х гг. Марына Вяжэвіч не раз выклікала ў суды ВКЛ шматлікіх нашчадкаў памерлага ў 1638 г. віцебскага ваяводы князя Сымона Самуэля Сангушкі. Некалі ваявода пазычыў у яе мужа грошы, а вярнуць іх не здолеў. Не спяшаліся з разлікам і яго дзеці. Разгляд яе скарг у Галоўным Трыбунале ВКЛ праходзіў з пераменным поспехам

у 1643–1644 гг. [7, арк. 61, 97]. Марына Вяжэвіч засталася незадаволенай вынікамі і працягвала дамагацца вырашэння справы на сваю карысць. У 1645 г. трыбунальскі суд усклаў на валоданні князя Казіміра Сангушкі Ракаў і Смаляны вялікі штраф памерам у 5216 коп літоўскіх грошаў. Не засталіся без увагі Марыны Вяжэвіч і маёнткі смаленскага біскупа Гераніма Сангушкі. 7 красавіка 1648 г. Галоўны Трыбунал ВКЛ выдаў вырак аб баніцыі для Г. Сангушкі за невыкананне судовых пастаноў аб спагнанні штрафу з той часткі маёнтка Ракаў, якая яму належала [7, арк. 762]. З улікам асаблівасцей судовай сістэмы ВКЛ можна меркаваць, што жонка земскага пісара пры жыцці не змагла дабіцца вяртання грошай.

Варта адзначыць, што Марыну Вяжэвіч не вельмі хвалявала пытанне аб неабходнасці своечасова і поўнасцю разлічвацца з дзяржавай па шматлікіх падатках. Пры складанні павятовых рэестраў збору падымнага яна заніжала колькасць падданых на яе землях. Што ж датычылася тых сялян, якіх ёй удавалася прыцягнуць у свае маёнткі з іншых тэрыторый, то звесткі пра іх наогул не траплялі ў фіскальныя кнігі. У 1650 г. Менскі гродскі суд ажыццявіў праверку ўсіх землеўладальнікаў павета і выявіў прысутнасць каля 500 «новікаў» (новапаселеных сялян), пра якіх павятовыя люстратары раней «не ведалі» [11, арк. 538]. Марына Вяжэвіч не паказала 50 «новікаў», якія пражывалі ў Буцэвічах і Душкавічах. Яе сын мсціслаўскі падкаморый Пётр Казімір «забыўся» паведаміць паборцам падымнага аб наяўнасці ў яго частцы Буцэвічаў яшчэ сямі «новікаў».

Марына Вяжэвіч пражыла доўгае жыццё, значную частку якога прысвяціла ўмацаванню пазіцый уніяцкай (грэка-каталіцкай) канфесіі ў Менску і развіццю створанага пры яе актыўным удзеле жаночага Траецкага манастыра. Памерла яна 10 студзеня 1657 г., пражыўшы каля сямідзесяці гадоў [21, s. 110–111, 631]. У тым жа годзе 2 красавіка спачыў і яе сын – навагародскі ваявода Пётр Казімір Вяжэвіч. Марына Вяжэвіч адыграла вызначальную ролю ў ранняй гісторыі Свята-Траецкага жаночага манастыра ў Менску. Менавіта яна ў сярэдзіне 1630-х гг. заклала асноўныя фундушы, на падставе якіх ён дзейнічаў. Верагодна, імкненне да заснавання манастыра было абумоўлена асабістай рэлігійнасцю фундатаркі, а таксама заўчаснымі смерцямі мужа Мікалая і сына Юрыя. Марына Вяжэвіч актыўна ўдзельнічала ў жыцці манастыра, у тым ліку абараняла яго інтарэсы падчас шэрагу судовых працэсаў.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 15 : Декреты Главного Литовского Трибунала. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1888. – XLIII, 552 с.

2. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. – Т. 12. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1900. – XLVII, 230 с.
3. Беларускі архіў. – Т. 3 : Менскія акты. – Вып. 1 : XV–XVIII ст. / Уклад. З. Даўгяла. – Менск : Выданьне Беларускае акадэміі навук, 1931. – XXV, 416 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 69. – Прывілеі, наданні, пацвярджэнні Стэфана Баторыя. 1581–1585 гг. – 274 арк.
5. НГАБ. – КМФ-18 (Метрыка Вялікага Княства Літоўскага). Воп. 1. Спр. 106. – Прывілеі, наданні і дэкрэты Уладзіслава IV. 1633 г. – 646 арк.
6. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 111. – Кнігі прывілеяў, наданняў, пацвярджэнняў Уладзіслава IV падчас канцлерства Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1634–1636 гг. – 737 арк.
7. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 335. – Дэкрэты па земскіх справах ВКЛ рэляцыйных і асэсарскіх судоў у панаванне Уладзіслава IV падчас канцлерства Альбрыхта Станіслава Радзівіла. 1646–1648 гг. – 830 арк.
8. НГАБ. – Ф. 1702 (Галоўны Трыбунал ВКЛ). Воп. 1. Спр. 9. – Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні дэкрэта ў справе полацкай ваяводзіны Дамінікавай Слушчынай Канстанцыі Падбярэзскай з мальбарскай ваяводзінай Канстанцыяй Слушчанкай Дэнгафавай і яе сынам каронным мечнікам Станіславам Дэнгафам і іншымі аб праве ўласнасці на спадчыну (Валожын, Стоўбцы і інш.) пасля нябожчыка надворнага падскарбія ВКЛ Багуслава Слушкі. 06.08.1718. – 119 арк.
9. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. – Актавая кніга Менскага гродскага суда. 01.1616–10.1620. – 1727 арк.
10. НГАБ. – Ф. 1727 (Менскі гродскі суд). Воп. 1. Спр. 3. – Актавая кніга Менскага гродскага суда. 01.1640–06.12.1649. – 1383 арк.
11. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 34. – Дэкрэтавая кніга Менскага гродскага суда. 04.04.1641–07.11.1665. – 2011 арк.
12. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 51. – Паточная кніга Менскага гродскага суда. 06.01.1701–30.12.1727. – 1291 арк.
13. НГАБ. – Ф. 1769 (Менскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 25. – Актавая кніга Менскага земскага суда. 20.01.1793–30.12.1793. – 908 арк.
14. НГАБ. – Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 4. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 01.06–07.10.1571. – 136 арк.
15. НГАБ. – Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 20. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 09.01–25.06.1604 г. – 507 арк.
16. НГАБ. – Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 21. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 07.01– 02.06.1606. – 280 арк.
17. НГАБ. – Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 22. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 08.06.1608–25.06.1609. – 324 арк.
18. НГАБ. – Ф. 1785 (Слонімскі земскі суд). Воп. 1. Спр. 28. – Актавая кніга Слонімскага земскага суда. 1621 г. – 500 арк.

19. НГАБ. – Ф. 1926 (Павятовыя камісіі па праверцы метрычных і актавых кніг). Воп. 8. Спр. 3. – Вопіс дакументаў актавых кніг Слонімскага земскага суда. 1604–1631 гг. – 315 арк.
20. Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей и по разным предметам. – Минск : Губернская типография, 1848. – 2, XLVIII, 402 с.
21. Chrapowicki J. A. Diariusz. Część 1: lata 1656–1664 / oprac. T. Wasilewski. – Warszawa : Instytut Wydawczy Pax, 1978. – 664 s.
22. Niesiecki, K. Herbarz polski. – T. 9 / wyd. J. N. Bobrowicz. – Lipsk : Breitkopf i Haertel, 1845. – 468 s.
23. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. – T. 1 : Województwo wileńskie, XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. P. Romaniuk, przy współpr. U. Jemialianczyka, A. Macuka. – Warszawa : DiG, 2004. – 764 s.
24. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. – T. 9 : Województwo mścisławskie, XVI–XVIII wiek / Oprac. H. Lulewicz, T. Jaszczołt, A. Radaman, A. Rachuba, P. P. Romaniuk, A. Macuk, A. Danilczyk, A. Haratym; pod red. A. Rachuby. – Warszawa : IH PAN, 2019. – 262 s.
25. Wijuk Kojałowicz, W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego / wyd. F. Piekosińskiego. – Kraków : «Czas» Fr. Kluczyckiego i Spółki, 1897. – IV, 527 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.11.2021

# Гістарыяграфія

*М. М. Кароль*

## Праблематыка міжканфесійных канверсій на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. у сучаснай беларускай гістарыяграфіі

Праблематыка пераводу часткі каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе ў беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст. займае значнае месца ў даследаванні рэлігійнай палітыкі ўлад Расійскай імперыі на землях Беларусі ў акрэслены перыяд. Пры гэтым у навуковай літаратуры асноўная ўвага надавалася дзеянням царкоўнай і свецкай адміністрацый, накіраваным на ўмацаванне ў беларускіх губернях становішча праваслаўнай царквы насуперак каталіцкаму касцёлу, які пасля паўстання 1863–1864 гг. успрымаўся як пераважна нелаяльны ўладам. У меншай ступені закраналася пытанне стаўлення пераведзенага насельніцтва да новай канфесійнай прыналежнасці, яго спроб падтрымліваць ранейшую каталіцкую ідэнтычнасць. У дадзеным артыкуле будзе здзейснена спроба прасачыць асноўныя тэндэнцыі ў асэнсаванні пытання міжканфесійных канверсій у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі.

Цікавасць да рэлігійнай праблематыкі, у тым ліку да тэмы міжканфесійных канверсій, якія адбываліся ў другой палове XIX – пачатку XX ст., у беларускай гістарычнай навуцы ўзрастае пачынаючы з 1990-х гг. Даследчыкі звярнулі ўвагу на рэлігійную сітуацыю на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. наогул і пасля паўстання 1863–1864 гг. у прыватнасці. З’явіліся працы, прысвечаныя праблематыцы міжканфесійных узаемаадносін, становішчу праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, заканадаўчаму афармленню пануючага статусу праваслаўя.

У гістарыяграфіі праблемы міжканфесійных пераходаў на беларускіх землях можна вылучыць некалькі этапаў. На працягу першага з іх (канец XIX – пачатак XX ст.) гэтае пытанне асэнсоўвалася сучаснікамі

падзей, якія ў некаторых выпадках з’яўляліся ўдзельнікамі пераводаў. Для наступнага этапу (1920–1980-я гг. – час функцыянавання савецкай гістарычнай навукі) характэрна слабая ўвага да вывучэння канфесійнага жыцця ў Беларусі. Трэці этап, які пачаўся ў 1990-я гг., адрозніваецца ўзрастаннем цікавасці да праблематыкі рэлігійных канверсій, што абумоўлена агульным ростам навуковага і грамадскага інтарэсу да аспектаў рэлігійнай гісторыі Беларусі.

З канца XX ст. пачалі выходзіць абагульняючыя працы, прысвечаныя перыяду знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. У 1998 г. пабачыла свет кніга «Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.)» пад рэдакцыяй Уладзіміра Навіцкага, якая фактычна стала першай спробай у даследаванні праблем канфесійнай гісторыі з пункту гледжання сучасных навуковых падыходаў [15]. Праблематыка пераводу каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе (найперш у кантэксце абмежавальных мерапрыемстваў у адносінах да каталіцызму і дваранства каталіцкага веравызнання, уплыву праваслаўнай царквы на грамадска-палітычныя погляды сялянства пасля паўстання 1863–1864 гг.) закраналася ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі і ў даследаваннях, прысвечаных гісторыі асобных саслоўяў [7, с. 242, 500; 11, с. 57, 75–77; 27, с. 333].

Далейшае развіццё канфесійная праблематыка атрымала ў грунтоўнай манаграфіі Валянціны Яноўскай (Грыгор’евай). На аснове шырокага кола архіўных матэрыялаў даследчыца прааналізавала працэс замацавання праваслаўнай царквы ў якасці пануючай пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., акрэсліла абмежаванні, накладзеныя на каталіцкі касцёл. Асобную ўвагу В. Яноўская звярнула на ролю ўказа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г. як фактара, які сфарміраваў новую канфесійную сітуацыю ў рэгіёне ў пачатку XX ст. [49].

З найноўшых абагульняючых прац варта адзначыць калектыўную манаграфію «Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» [14], дзе разглядаюцца працэс уключэння праваслаўнай і каталіцкай цэркваў беларускіх зямель у сістэму рэлігійнага жыцця Расійскай імперыі, змены ў іх становішчы, а таксама стаўленне да вернікаў абедзвюх згаданых канфесій і нашчадкаў уніяцкага насельніцтва. Аднак праблема пераводаў у праваслаўе вернікаў іншых канфесій у 1860-я гг. амаль не закранаецца. У падрыхтаваным калектывам аўтараў даследаванні «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» праблема канверсій разглядаецца з пункту гледжання сацыяльнай мабільнасці: падкрэсліваецца, што пераход у праваслаўе даваў магчымасць павысіць сацыяльны статус, пазбавіцца абмежаванняў, што дзейнічалі ў дачыненні да прадстаўнікоў іншых рэлігій, у тым ліку каталіцтва [31, с. 621].

З цягам часу з’явіліся даследаванні, непасрэдна прысвечаныя праблематыцы пераводу ў праваслаўе. Найперш варта згадаць манаграфію Аляксандра Бендзіна «Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.)» [4]. У ёй аналізуюцца канфлікты і супярэчнасці, якія ўзнікалі на рэлігійнай глебе ў беларускіх губернях і былі абумоўлены палітыкай расійскіх улад. На падставе шырокага кола крыніц (пераважна на матэрыяле за 1860–1870-я гг.) прасочваецца працэс пераводу ў праваслаўе вернікаў іншых канфесій, але высновы аўтара нярэдка маюць тэндэнцыйную афарбоўку. Так, А. Бендзін пагаджаецца з дадзенай прадстаўнікамі расійскіх улад характарыстыкай каталіцкага насельніцтва, якое не жадала пераходзіць у праваслаўе. Гэтую даволі масавую з’яву даследчык акрэсліў як *«нелегальное движение упорствующих в латинстве»* [4, с. 22] і звёў яго вытокі амаль выключна да наступстваў мэтанакіраванай прапаганды з боку каталіцкага духавенства і буйных землеўласнікаў. Апрача таго, ён прымяншаў ступень самастойнасці сялян «Паўночна-Заходняга краю» ў іх супраціўленні прымусовай канверсіі.

Святар Андрэй Міронаў у 2015 г. выдаў кнігу «Противостояние: Минская епархия после выхода указа 17 апреля 1905 года “Об укреплении начал веротерпимости”», прысвечанаю працэсам у рэлігійным і грамадска-палітычным жыцці Мінскай губерні ў пачатку XX ст. У сваіх высновах аўтар акцэнтуе ўвагу на адмоўнай ролі каталіцкага касцёла ў пытанні міжканфесійных канфліктаў і ажыццяўленні паланізацыі [22, с. 53–69].

Больш узважана да вывучэння пераводу з каталіцтва ў праваслаўе падышоў Аляксандр Грахоцкі. Ён ахарактарызаваў пытанне прававога рэгулявання міжканфесійных пераходаў і акрэсліў заканадаўчыя нормы, у адпаведнасці з якімі яны маглі ажыццяўляцца [9, с. 5]. Аўтар таксама звярнуўся да палітыкі па пераводзе католікоў у праваслаўе пасля паўстання 1863–1864 гг. і паспрабаваў рэканструяваць гэты працэс, акрэсліць ступень яго адпаведнасці заканадаўчым нормам, вылучыць тых, хто яго арганізоўваў і ажыццяўляў на месцах, высветліць абставіны правядзення акцый, накіраваных на канверсію, матывы дзеянняў прадстаўнікоў свецкай і царкоўнай адміністрацый, а таксама ўласна вернікаў, якія не прымалі прымусова навязанае ім веравызнанне [8, с. 22].

Разнастайныя аспекты, звязаныя з суіснаваннем праваслаўнай і каталіцкай канфесій на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст. у сваіх даследаваннях закранаў Васіль Табуноў, які ў 2008 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па гэтай праблематыцы [41]. Ім акрэслена розніца ў прававым становішчы паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі, якая заключалася ў пануючым статусе першай і існаванні абмежаванняў для дзейнасці другой [43, с. 12]. Ён прааналізаваў узаемаад-

носіны паміж праваслаўнымі і каталікамі на побытавым узроўні і выказаў меркаванне, што ў пашырэнні пэўнай нецярпімасці паміж прадстаўнікамі розных канфесій, якая мела месца, не апошнюю ролю адыгрывалі прадстаўнікі духавенства [36, с. 164]. Таксама даследчык звярнуў увагу на ролю змяшаных шлюбаў, да якіх і праваслаўнае, і каталіцкае духавенства ставілася негатыўна, бо разглядала іх як сродак перацягнення прыхаджан у іншую канфесію [38, с. 110] і поле барацьбы за вернікаў у межах асобных сямей [37, с. 96].

Пры характарыстыцы сітуацыі, што склалася ў беларускіх губернях пасля выдання ўказа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г., В. Табуноў вызначыў паслабленні, нададзеныя касцёлу (у адпаведнасці з гэтым дакументам) і адзначыў паляпшэнне яго становішча ўвогуле [39, с. 82]. Таксама даследчык спыніўся на актывізацыі дзейнасці каталіцкага духавенства пасля выдання згаданага ўказа і на супярэчнасцях у заканадаўстве, якія дазвалялі каталіцкаму духавенству ігнараваць афіцыйныя пастановы аб парадку міжканфесійных пераходаў [35, с. 169]. У кантэксце канфесійнай сітуацыі, якая склалася пасля 1905 г., В. Табуноў прааналізаваў ступень верацярпімасці насельніцтва беларускіх губерняў у пачатку XX ст. [40, с. 51].

У артыкуле Андрэя Пятчыца падрабязна разбіраецца працэдура пераходаў у праваслаўе і наступствы, якія яны выклікалі. Даследчык адзначыў, што сярод прычын прыняцця праваслаўя каталікамі, асабліва асобамі шляхецкага паходжання, прысутнічалі і прагматычныя матывы: напрыклад, спадзяванні пазбегнуць падазрэнняў ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг. [30, с. 53].

Іншы аспект міжканфесійных канверсій прааналізаваў Вадзім Урублеўскі. Ён разгледзеў праблему парушэнняў пахавальнай абраднасці, якія з пункту гледжання праваслаўнай царквы дапускалі былыя каталікі, адкрыта выказваючы нязгоду выконваць пахавальныя абрады паводле праваслаўнай традыцыі [46, с. 290]. Гэта таксама з'яўлялася праявай захавання каталіцкай ідэнтычнасці ў асяроддзі «ўпартых у лацінстве».

На праблему існавання міжканфесійных пераходаў і змяшаных шлюбаў у кантэксце барацьбы каталіцкага і праваслаўнага духавенства за прыхаджан звярнуў увагу Віктар Лінкевіч. Ён ахарактарызаваў сацыяльны склад тых, хто прымаў праваслаўе ў другой палове XIX ст., і прыйшоў да высновы, што большасць з іх адносілася да сялян, але ў асобных выпадках гэта былі прадстаўнікі лакальнай эліты, чыноўніцтва і нават каталіцкага духавенства [21, с. 263].

У абароненай у 2011 г. кандыдацкай дысертацыі Кацярына Марозька на прыкладзе Мінскай епархіі апісала і прааналізавала канфесійнае і сацыяльна-культурнае жыццё Беларусі ў другой палове XIX ст. Сярод іншага, яна ахарактарызавала выпадкі міжканфесійных пераходаў у

Цэнтральнай Беларусі, для чаго выкарыстала тэрмін «праваслаўізацыя», якім пазначыла афіцыйную палітыку, накіраваную на перавод часткі насельніцтва ў праваслаўе і закрыццё каталіцкіх храмаў [24; 25, с. 29–40, 181–182; 26]. Даследчыца звярнула ўвагу на ролю змяшаных шлюбаў у імкненні фармальна праваслаўных вызнаваць каталіцызм [23, с. 35–37]. Але пытанне міжканфесійных пераходаў не з'яўлялася асноўным у даследаваннях К. Марозька. Галоўнае месца ў іх нададзена аналізу дзейнасці Мінскай епархіі ў галіне асветы і дабрачыннасці.

Асобным напрамкам у кантэксце праблематыкі міжканфесійных пераходаў у сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'яўляюцца змены, якія адбыліся ў пачатку XX ст. з прыняццем шэрагу заканадаўчых актаў, якія абвяшчалі верацярпімасць.

Прычыны, якімі быў абумоўлены пераход часткі насельніцтва беларускіх губерняў у каталіцызм пасля 1905 г., вылучыў і ахарактарызаваў Міхаіл Крывіцкі. Ён прыйшоў да высновы, што такімі прычынамі найперш былі змяшаныя шлюбы, місіянерская дзейнасць каталіцкага духавенства, крызіс праваслаўнай царквы, эканамічны ўціск з боку памешчыкаў каталіцкага веравызнання [19, с. 90]. Таксама М. Крывіцкім на падставе матэрыялаў перыёдыкі прасочаны змены ў становішчы праваслаўнай царквы пасля выдання згаданага ўказа 1905 г., пададзены прыклады як адмоўнай, так і станоўчай рэакцыі на яго праваслаўнага духавенства [18].

Да разгляду рэлігійнай сітуацыі, што склалася пасля 1905 г., звярнуўся і Юры Туронак. На яго думку, адыход ад праваслаўя ў гэты час з'яўляўся неістотнай праблемай: колькасць праваслаўных паменшылася толькі на 1%. Але па-за ўвагай гісторыка засталося пытанне кантэксту, у якім адбываўся пераход з праваслаўя ў іншыя веравызнанні (найперш, шматгадовае існаванне «ўпартых у лацінстве») [45, с. 447].

Даследавала рэакцыю праваслаўнага духавенства на ўказ 1905 г. і Людміла Ігнатавец. Яна вылучыла захады, якімі праваслаўнае духавенства спрабавала не дапусціць пераходу прыхаджан у іншую (пераважна каталіцкую) канфесію. Аднак неабходна адзначыць пэўную тэндэнцыйнасць у разважаннях даследчыцы. Так, яна палічыла, што ксяндзы і простыя каталіцкія вернікі апрыёры вылучаліся *«фанатычнай нянавісцю да праваслаўных»*, на падставе чаго зрабіла выснову, што ўказ ад 1905 г. абвастрыў рэлігійную сітуацыю на тэрыторыі Беларусі праз дазвол на празелітызм з боку каталіцкага духавенства [13, с. 273, 277, 278]. Перадумовы выдання ўказа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» Л. Ігнатавец звязала менавіта з наяўнасцю так званых «упартых у лацінстве». На думку даследчыцы, іх пераход у каталіцызм пазбавіў праваслаўную царкву крыніцы рэлігійнай незадаволенасці і напружання [12, с. 197].

Да змен, якія прынёс у рэлігійнае становішча на беларускіх землях указ «Аб умацаванні асноў верацярпімасці», звярнулася В. Яноўская, якая разгледзела яго ўплыў на жыццё не толькі праваслаўных і католікоў, але і на прадстаўнікоў пратэстанцкіх дэнамінацый і нехрысціянскага насельніцтва (яўрэяў, мусульман) [47, с. 46].

Пашырэнне магчымасцей для міжканфесійных пераходаў пасля выдання ўказа 1905 г. прасачыла Зінаіда Антановіч, якая адзначыла наяўнасць спрошчанай працэдуры для пераходу ў каталіцызм пачынаючы з 1905 г. [1, с. 132, 134]. Некаторыя іншыя беларускія даследчыкі аналізавалі наступствы выдання ўказа ў кантэксце асаблівасцей функцыянавання каталіцкага касцёла ў рэгіёне, рэалізацыі яго палажэнняў на практыцы (Юрый Бачышча) [2; 3, с. 6], станаўлення верацярпімасці і ажыццяўлення спроб змяншэння пры яго дапамозе рэлігійных супярэчнасцей (Віктар Старасценка) [33, с. 138].

Апрача спецыяльных даследаванняў, міжканфесійныя пераходы вывучаюцца навукоўцамі ў кантэксце больш шырокіх тэм, перш за ўсё звязаных з гісторыяй асобных рэлігійных супольнасцей, міжканфесійнымі адносінамі, а таксама з этнаканфесійнымі працэсамі.

У манаграфіі Андрэя Ганчара, прысвечанай праблеме дзейнасці каталіцкага касцёла ў другой палове XIX ст. [6], сярод іншага, даецца падрабязная характарыстыка захадам, якія рабілі касцельныя іерархі і шараговыя святары для супрацьстаяння абмежаванням, накладзеным дзяржавай на іх канфесію. Пры вывучэнні міжканфесійных адносін канца XIX – пачатку XX ст. Наталля Кожыч прыйшла да высновы аб наяўнасці напружанасці паміж каталіцызмам і праваслаўем на беларускіх землях, бо, на яе думку, абедзве канфесіі імкнуліся пашырыць сферу свайго ўплыву, што не спрыяла міжрэлігійнаму дыялогу [16].

Да праблемы прымусовых рэлігійных канверсій, якія адбываліся ў 1860-я гг., звярнуўся Алесь Смалянчук у працы «Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй». Ён вылучыў асноўныя напрамкі дзейнасці спецыяльна створанай Рэвізійнай камісіі і захады, якія яна рабіла ў справе пераводу насельніцтва з каталіцызму ў праваслаўе. Таксама аўтар адзначыў пераважна адмоўную рэакцыю насельніцтва, якое замест таго, каб наведваць праваслаўныя цэрквы, пачало само таемна ажыццяўляць рэлігійныя абрады [32, с. 63].

Павел Церашковіч у артыкуле «Памежжа як наканаванне: метамарфозы этнічнасці ва ўсходнееўрапейскім памежжы ў XIX – пачатку XX ст.» паставіў пытанне пераводу ў праваслаўе ў кантэкст скарачэння колькаснай вагі каталіцкага насельніцтва і даў ацэнку падобным захадам як мэтанакіраванай імперскай палітыцы. Ён прыйшоў да высновы, што вынікам прымусовай канверсіі насельніцтва стала стварэнне сітуацыі нестабільнасці і зменлівай этнаканфесійнай ідэнтычнасці [44, с. 216].

У працах па рэгіянальнай гісторыі звяртаецца ўвага на выпадкі масавых пераводаў у праваслаўе, якія назіраліся ў асобных рэгіёнах – паветах і нават прыходах.

Свіслацкаму краю на гістарычнай Гродзеншчыне, дзе ў 1860-х гг. адбываліся значныя падзеі, звязаныя з пераводам насельніцтва ў праваслаўе, прысвечаны працы В. Яноўскай і Кірыла Сыцько, якія ахарактарызавалі стракаты сацыяльна-канфесійны і моўны склад насельніцтва рэгіёна, а таксама спыніліся на падзеях «Свіслацкай смуты» [34, с. 120], і А. Ганчара, які разгледзеў рэакцыю насельніцтва на перавод у праваслаўе, увядзенне рускай мовы ў дадатковае набажэнства ў касцёле і перадачу праваслаўным Альшэўскага касцёла і трох капліц (Руднянскай, Рэгінаўскай, Грудапольскай) [5, с. 127].

Міжканфесійныя пераходы на Гродзеншчыне закраналі таксама Таццяна Казлова, якая падлічыла статыстыку па колькасці прымусова пераведзеных у праваслаўе па Гродзенскай губерні за 1863–1866 гг. [17, с. 79], і Вольга Працэнка, якая адзначыла антаганізм, што існаваў паміж каталікамі і праваслаўнымі, закранула закрыццё каталіцкіх храмаў і перавод часткі насельніцтва ў праваслаўе [28, с. 230; 29, с. 451].

Яшчэ адным рэгіёнам інтэнсіўнага міжканфесійнага ўзаемадзеяння, які актыўна вывучаецца даследчыкамі, з’яўляецца Беларускае Палессе. Канфесійнаму становішчу ў Рэчыцкім павеце ў XIX ст. прысвечаны артыкул В. Яноўскай, у якім даследчыца піша пра закрыццё кляштараў і касцёлаў і прыводзіць падрабязную статыстыку колькасці прыходаў і касцёлаў у Рэчыцкім павеце [48, с. 189]. Падобная праблематыка, але ўжо на прыкладзе сеткі каталіцкіх парафій Віцебскай губерні, разглядаецца ў сумесным артыкуле В. Яноўскай і Алены Філатавай [10, с. 48–53].

Канфесійную сітуацыю ў Пінскім павеце даследавала К. Марозька. Яна звярнула найбольшую ўвагу на перавод каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе і закранула праблему супраціўлення часткі былых католікоў прыняццю праваслаўнай абраднасці. На яе думку, рэлігійнае напружанне прысутнічала нават у сямейнай сферы, дзе праяўлялася ў праблеме складанай рэлігійнай ідэнтычнасці дзяцей ад змяшаных шлюбаў [23, с. 239, 240].

Пры аналізе практыкі пераводу ў праваслаўе ў Мазырскім павеце Зінаіда Кур’ян прыйшла да высновы аб захаванні рэшткаў уніяцкай свядомасці сярод пераведзенага насельніцтва і адзначыла пераважную рэлігійную індыферэнтнасць значнай часткі насельніцтва Мазыршчыны ў другой палове XIX ст. [20, с. 33].

Такім чынам, калі ў савецкай гістарыяграфіі пытанні пераводу ў праваслаўе прадстаўнікоў іншых канфесій і іх рэакцыі на яго амаль не закраналіся, то ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі цікавасць да гэтых праблем істотна павялічылася. Даследчыкі ў сваіх працах засяроджва-

юцца на заканадаўчых асновах і фактычнай рэалізацыі працэдуры пераводу ў праваслаўе ў другой палове XIX ст., спыняюцца на канкрэтных рэгіёнах, дзе пытанне міжканфесійных узаемаадносін стаяла асабліва востра, адзначаюць уплыў указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г. на змяненне рэлігійнай сітуацыі ў беларускіх губернях, акрэсліваюць яго наступствы, перш за ўсё, праявы зваротнага працэсу – пераходу істотнай колькасці вернікаў з праваслаўя ў каталіцызм. Неабходна адзначыць, што ў шэрагу выпадкаў у сучаснай гістарыяграфіі паўтараюцца ідэі, уласцівыя дарэвалюцыйнай навуцы, – адмаўленне наяўнасці ў беларускага сялянства развітой канфесійнай ідэнтычнасці (якая, між іншым, праяўлялася ў супраціўленні прымусоваму пераводу ў праваслаўе), апраўданне правядзення канверсій, імкненне ўскласці адказнасць за непрыняцце сялянамі праваслаўя выключна на каталіцкіх святароў і памешчыкаў каталіцкага веравызнання. Тым не менш большасць названых вышэй даследаванняў вылучаецца высокім навуковым узроўнем, якаснай апрацоўкай крыніц, грунтоўным аналізам дзяржаўнай палітыкі ў галіне рэлігіі на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст.

## Крыніцы і літаратура

1. Антановіч, З. В. Міжканфесійныя пераходы ў матэрыялах Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі як крыніца па гісторыі штодзённасці канца XIX – пачатку XX ст. // Архіварыус. – Вып. 8. – Мінск : НГАБ, 2010. – С. 130–138.
2. Бачышча, Ю. А. Каталіцкая царква ў нацыянальна-рэлігійнай палітыцы царызму ў Беларусі (1900–1914 гг.) : аўтарэферат дысертацыі … кандыдата гістарычных навук : 07.00.02 / Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. – Мінск, 2003. – 20 с.
3. Бачышча, Ю. А. Свабода сумлення і яе ажыццяўленне ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі XX ст. // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць : зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 7–8 кастрычніка 2004 г. – Брэст : БрДУ, 2005. – С. 5–8.
4. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.). – Минск : БГУ, 2010. – 439 с.
5. Ганчар, А. И. Положение римско-католической церкви на территории Свислочского края (вторая половина XIX – начало XX в.) // Мінулае і сучаснасць Свіслацкага краю : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – С. 122–134.
6. Ганчар, А. И. Римско-католический костел в Беларуси (1864–1905 гг.). – Гродно : ГГАУ, 2008. – 275 с.
7. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. – Т. 2. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 552 с.

8. Грахоцкі, А. П. «Возвращение в православие»: масавая канверсія каталікоў Беларусі ў праваслаўе ў 60-я гады XIX ст. (па матэрыялах Мінскай губерні) // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў : этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. – Ч. 1. – Гомель : ГДУ, 2009. – С. 21–31.
9. Грахоцкі, А. П. Прававое рэгуляванне парадку рэлігійнай канверсіі ў Беларусі (1863–1905 гады) // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2012. – № 1. – С. 4–18.
10. Грыгор'ева, В. З гісторыі канфесіянальнага жыцця Віцебскай губерні (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 45–56.
11. Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861–1914 гг. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
12. Игнатовец, Л. М. Предпосылки указа императора Николая II «Об укреплении начал веротерпимости» 17 апреля 1905 г. // Религия и общество – 4 : сборник научных трудов. – Могилев : МГУ, 2009. – С. 195–197.
13. Игнатовец, Л. М. Реакция православного духовенства белорусско-литовских губерний на католический прозелитизм после издания указа 17 апреля 1905 г. о веротерпимости // XV Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвященные Дням славянской письменности и культуры, Минск, 21–24 мая 2009 г. : материалы чтений «Духовные основы социальной и экономической устойчивости современного общества». – Минск : Зорны Верасок, 2010. – С. 271–278.
14. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 496 с.
15. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 339 с.
16. Кожич, Н. М. Православие в Беларуси конца XIX – начала XX века: идейные установки и формы деятельности : автореферат диссертации … кандидата философских наук : 09.00.13 / Белорусский государственный университет. – Минск, 2007. – 20 с.
17. Козлова, Т. И. Конфессиональный облик населения Гродненской губернии (1801–1914 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2007. – № 4. – С. 76–81.
18. Кривицкий, М. А. Положение православной церкви на белорусских землях после издания указа об укреплении начал веротерпимости (по материалам церковной периодической печати) // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 11, ч. 1. – Минск : РИВШ, 2011. – С. 89–97.
19. Кривицкий, М. А. Предпосылки массовых переходов из православия в католичество на территории Беларуси после издания указа о веротерпимости (1905–1914) // Архіварыус. – Вып. 11. – Мінск : НГАБ, 2013. – С. 76–92.

20. Курьян, З. С. К вопросу о взаимоотношениях православных и католиков в Мозырском уезде в XIX веке // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы: матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, Гомель, 13–14 кастрычніка 2011 г. – Гомель : ГДУ, 2011. – С. 29–33.
21. Линкевич, В. Н. Взаимоотношения православного и католического населения Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. – Ч. 1. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 262–267.
22. Миронов, А. В. Противостояние: Минская епархия после выхода указа 17 апреля 1905 года «Об укреплении начал веротерпимости». – Минск : Братство в честь Св. Архистратига Михаила в г. Минске Мин. епархии Белорус. Правосл. Церкви, 2015. – 332 с.
23. Морозько, Е. В. Изменение религиозной ситуации на Пинщине после восстания 1863–1864 гг. // Национализм и концепция гражданского общества в Восточной Европе: сборник материалов Четвертых международных Афанасьевских чтений «Социальные процессы: восточноевропейский контекст», Брест, 15–16 декабря 2008 г. – Брест : БрГУ, 2009. – С. 236–243.
24. Морозько, Е. В. Конфессиональная и социально-культурная жизнь Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. (на примере Минской Православной епархии): диссертация … кандидата исторических наук: 07.00.02. – Брест, 2011. – 197 с.
25. Морозько, Е. В. Минская православная епархия в социально-культурной жизни Беларуси (1861–1905 гг.). – Минск : БГУ, 2012. – 191 с.
26. Морозько, Е. В. Политика царизма по отношению к Православной Церкви и другим конфессиям во второй половине XIX – начале XX в. (на примере Минской православной епархии) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2011. – № 2. – С. 10–17.
27. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 2 / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – 559 с.
28. Проценко, О. Э. Конфессиональный аспект истории Гродненской губернии в XIX в. // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зборнік навуковых артыкулаў. – Ч. 1. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 229–236.
29. Проценко, О. Э. О конфессиональной ситуации в Гродненской губернии в XIX в. // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна : ГрДУ, 2008. – С. 449–453.
30. Пятчиц, А. И. «Торжество» православия в Беларуси: имперский вариант // Деды: дайджест публикаций о белорусской истории. – Вып. 5. – Минск : Харвест, 2010. – С. 40–55.
31. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 682 с.
32. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864–1917 гг. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 320 с.

33. Старостенко, В. В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории. – Могилев : МГУ, 2011. – 271 с.
34. Сыцько, К. В. Канфесійнае становішча Свіслаччыны ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Мінулае і сучаснасць Свіслацкага краю: зборнік навуковых артыкулаў / рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]; А. У. Унучак (адк. рэд.). – Мінск : Беларуская навука, 2018. – С. 108–122.
35. Табунов, В. В. Активизация деятельности Римско-католической церкви на белорусских землях в начале XX ст. // Русский язык в контексте культуры: сборник научных статей / под общ. ред. Т. Г. Михальчук. – Могилев : МгГУ, 2010. – С. 167–169.
36. Табунов, В. В. Борьба за влияние на население белорусских земель между церковью и костёлом посредством межконфессиональных браков в конце XIX – начале XX в. // Актуальные проблемы современного гуманитарного познания: материалы международной научной конференции, 29–30 октября 2009 г. – Витебск : ВГУ, 2009. – С. 164–165.
37. Табунов, В. В. Взаимоотношения между Православной Церковью и Римско-Католическим Костелом в области образования и заключения межконфессиональных браков на белорусских землях в конце XIX – начале XX столетий // 1917–2017. Православие в истории и культуре Беларуси: итоги столетия: сборник материалов Вторых Белорусских рождественских чтений. – Минск : Медиа, 2017. – С. 93–97.
38. Табунов, В. В. Взаимоотношения православия и католицизма на белорусских землях в конце XIX – начале XX столетий // История, культура и внешняя политика России в 1613–1913 гг.: сборник научных статей по итогам Международного научного семинара, посвященного 400-летию окончания Смутного времени и начала царствования династии Романовых в России, 21–22 февраля 2013 г. – Витебск : МИТСО, 2013. – С. 107–114.
39. Табунов, В. В. Влияние революции 1905–1907 гг. на политику царского правительства по отношению к римско-католической церкви в Беларуси // Культура праз прызму духоўнасці: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 16–17 ліпеня 2007 г. – Магілёў : Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы, 2007. – С. 80–83.
40. Табунов, В. В. Значение указа 17 апреля 1905 г. в конфессиональной жизни белорусских земель начала XX в. // Материалы научно-методической конференции преподавателей и сотрудников по итогам научно-исследовательской работы в 2010 г., 3–4 февр. 2011 г. / под ред. А. В. Иванова. – Могилев : МГУ, 2011. – С. 49–51.
41. Табунов, В. В. Политика российского правительства в отношении христианских конфессий в Беларуси (1895–1907): автореферат диссертации … кандидата исторических наук : 07.00.02 / Белорусский государственный педагогический университет. – Минск, 2008. – 22 с.
42. Табунов, В. В. Причины перехода из православия в католицизм на белорусских землях в начале XX столетия // Романовские чтения – IX: сбор-

ник статей Международной научной конференции, Могилев, 29 ноября 2012 г. – Могилев : МГУ, 2013. – С. 178–180.
43. Табунов, В. В. Регламентация законодательством Российской империи деятельности православной церкви и римско-католического костела в Беларуси конца XIX – начала XX в. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2012. – № 1. – С. 10–13.
44. Терешкович, П. В. Пограничье как судьба: метаморфозы этничности в Восточноевропейском пограничье в XIX – начале XX в. // Ab Imperio. – 2009. – № 1. – С. 191–226.
45. Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. – 881 с.
46. Урублеўскі, В. В. Парушэнне праваслаўнай царкоўнай практыкі пахавання як адлюстраванне працэсу супрацьстаяння каталікоў ліквідаваных парафій масаваму пераводу ў праваслаўе (другая палова XIX – пачатак XX ст.) // Архіварыус. – Вып. 15. – Мінск : НГАБ, 2017. – С. 284–294.
47. Яноўская, В. В. Змены канфесійнага становішча на тэрыторыі Беларусі як вынік прыняцця заканадаўчых актаў 1905 г. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 33. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – С. 44–51.
48. Яноўская, В. В. Канфесійны стан Рэчыцкага павета ў XIX ст. // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Калінкавічы і Калінкавіцкі край: зборнік навуковых артыкулаў: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 23–24 красавіка 2015 г. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – С. 188–198.
49. Яноўская, В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі, 1863–1914 гг. – Мінск : БДУ, 2002. – 197 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.10.2022

*Д. Ч. Матвейчык*

## Гістарыяграфія паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі ў Літоўскай ССР (1944–1991 гг.)[1]

Уваходжанне Літвы ў склад СССР і перадача ёй Вільні і Віленскага краю стварылі палітычныя перадумовы для развіцця літоўскай гістарыяграфіі паўстання на тэрыторыі Беларусі. Галоўным пунктам узаемасувязей паміж беларускай і літоўскай гістарыяграфічнымі традыцыямі стала ў дадзеным выпадку дзейнасць у Вільні органаў перадпаўстанцкай канспірацыі і кіраўніцтва паўстаннем непасрэдна ў

[1] За аказаную дапамогу пры напісанні артыкула выказваю падзяку **Яўгену Глінскаму**.

1863–1864 гг., а таксама расійскай цэнтральнай адміністрацыі Літоўскага (Віленскага) генерал-губернатарства па задушэнні паўстання.

Літоўская гістарыяграфія паўстання 1863–1864 гг. пасляваеннага перыяду ўжо трапляла ў поле ўвагі даследчыкаў, у першую чаргу літоўскіх (напрыклад, Дарыюса Сталюнаса [27] і Рымантаса Мікніса [52]), аднак да цяперашняга часу невядома ніводнай адпаведнай працы ў беларускай гістарычнай навуцы. Таму ніжэй будзе зроблена спроба прааналізаваць працы літоўскіх пасляваенных гісторыкаў на прадмет вызначэння іх унёску ў распрацоўку пытанняў паўстання, варта падкрэсліць, менавіта на тэрыторыі Беларусі альбо тых праблем, якія з'яўляюцца агульнымі для Беларусі і Літвы.

Неабходна згадаць, што літоўская гістарыяграфія паўстання дарэвалюцыйнага і міжваеннага перыядаў (да 1939 г.) не вылучалася багаццем і насычанасцю. Літоўскі нацыянальны рух перыяду Расійскай імперыі ў вялікай ступені меў антыпольскую скіраванасць. Адпаведна, паўстанне, якое разглядалася ў гэты час выключна як «польскае», не выклікала ў дзеячаў руху, у тым ліку гісторыкаў, цікавасці. У пэўнай ступені, хоць і дастаткова невялікай, сітуацыя змянілася пасля стварэння незалежнай Літоўскай дзяржавы. У 1921 г. у Каўнасе была выдадзена брашура комплекснага характару Аўгусцінаса Янулайціса пад назвай «Паўстанне 1863–1864 гадоў» [40]. Пра стан літоўскіх даследаванняў паўстання ён пісаў: *«Склалася ўражанне, што паўстанне ў Літве – гэта свавольства вышэйшай шляхты, рэакцыйная задума, якая не павінна цікавіць дэмакратыю. Гэтыя забабоны ўсё яшчэ існуюць, і ўжо надышоў час рассеяць іх у Літве»* [40, p. 1; 42, s. 1]. І паўстанне разглядаецца менавіта ў такім кантэксце – як этапная падзея ў развіцці дэмакратыі ў Літве. Станоўча характарызуюцца дзеячы лагера «чырвоных» (Канстанцін Каліноўскі, Зыгмунт Серакоўскі, Антоні Мацкевіч, Цітус Далеўскі і інш.). Хаця ў цэлым брашура мае хутчэй навукова-папулярны, чым уласна навуковы характар. Апрача таго, яна не пазбаўлена палітычнай тэндэнцыйнасці. Праз два гады гэтая праца была перакладзена на польскую мову і спачатку апублікавана на старонках віленскай літоўскай польскамоўнай газеты «Айчынная зямля» [41], а затым выдадзена асобнай брашурай [42]. З крытыкай на яе выступілі польскія даследчыкі, якія паставілі аўтару ў якасці недахопаў (апрача тэндэнцыйнасці) слабую методыку даследавання і нешырокае кола выкарыстаных крыніц [45; 55].

Аднак нават гэты пачатковы крок А. Янулайціса не быў развіты літоўскімі даследчыкамі да канца існавання незалежнай Літвы. Паўстанне па-ранейшаму працягвала ўспрымацца большасцю гісторыкаў (напрыклад, Паўлюсам Шляжасам [57], Антанасам Алекнам [32, p. 461–465, 469–474] і інш.) як частка «польскай справы», а значыць, ацэньвацца негатыўна – як частка з'явы, што не мае дачынення да літоўскага наро-

да і развіцця літоўскага нацыянальнага руху. Напрыклад, Юозас Міляўскас-Міглавара, які ў 1925 г. апублікаваў урывак з успамінаў удзельніка паўстання Тамаша Жычкоўскага, адзначаў: *«Для нас, літоўцаў, так званы польскі перыяд у палітыцы не мае значэння. Сваё месца ён можа знайсці выключна ў польскай гісторыі, паколькі гэта была справа не літоўская, а польская»* [53, p. 45–46].

У развіцці гістарыяграфіі паўстання меліся таксама арганізацыйныя перашкоды – у першую чаргу недаступнасць з палітычных прычын для літоўскіх гісторыкаў архіўных сховішчаў Польшчы і СССР, якія захоўвалі асноўны комплекс неабходных для даследавання матэрыялаў. Усё гэта вяло да таго, што вывучэнне падзей паўстання не вялося нават на ўзроўні фактычнага насычэння. Пэўная тэндэнцыя развіцця абазначалася толькі ва ўвядзенні ў навуковы ўжытак некаторых крыніц. Напрыклад, часопіс «Ваенны архіў» (літ. – «Karo archyvas») у некаторых нумарах публікаваў невялікія падборкі адпаведных матэрыялаў [37; 47; 53; 56; 59; 60].

У выніку да Другой сусветнай вайны праблематыка паўстання ў літоўскай гістарыяграфіі заставалася распрацаванай слаба. Аднак для яе актыўнага развіцця ў пасляваенны перыяд з’явілася адразу некалькі перадумоў. Па-першае, у складзе Літоўскай ССР апынулася адно з самых важных сховішчаў архіўных матэрыялаў па гісторыі паўстання ў Літве і Беларусі – былы Дзяржаўны архіў у Вільні, пераўтвораны ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літоўскай ССР (далей – ЦДГА ЛітССР; цяпер – Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). Апрача гэтага, літоўскія даследчыкі атрымалі доступ да іншых архіўных сховішчаў СССР (у Маскве, Мінску, Ленінградзе і інш.). Па-другое, уваходжанне Літвы ў склад СССР і саюзныя адносіны апошняга з ПНР паспрыялі актывізацыі кантактаў літоўскіх гісторыкаў з прадстаўнікамі іншых гістарыяграфічных традыцый і ўдзелу іх у міжнародных праектах. Па-трэцяе, палепшылася арганізацыйнае афармленне літоўскай гістарычнай навукі – быў заснаваны асобны Інстытут гісторыі ў складзе новастворанай Акадэміі навук Літоўскай ССР.

У ідэйна-метадалагічным плане для літоўскіх савецкіх гісторыкаў паўстання характэрныя ўсе тыя ж рысы, што і для астатніх савецкіх даследчыкаў гэтага перыяду – выкананне даследаванняў у межах марксісцкай (а больш дакладна, марксісцка-ленінскай) метадалогіі з ухілам у кантэкст развіцця рэвалюцыйнага руху і з пошукам інтэрнацыянальных сувязей. Добрай ілюстрацыяй такой пазіцыі з’яўляюцца першыя радкі аднаго з артыкулаў Уладзіслава Бікуліча: *«Марксісцкая гістарыяграфія ўпершыню з прынцыпова новых пазіцый узялася за асвятленне той велізарнай ролі, якую сыграла ў паўстанні 1863–1864 гг. сумесная барацьба польскіх, рускіх, літоўскіх і беларускіх рэвалюцыянераў. Працы*

*савецкіх даследчыкаў <...> з'явіліся каштоўным унёскам у справу вывучэння гісторыі паўстання, дапамаглі аднавіць слаўныя старонкі інтэрнацыянальных сувязей суседскіх і сяброўскіх цяпер народаў»* [4, с. 301]. Хаця варта адзначыць, што падобны кірунак зарадзіўся яшчэ ў незалежнай Літве. У 1938 г. адзін з лідараў Камуністычнай партыі Літвы Зігмас Алекса (псеўданім – Ангарэціс) у сваёй прапагандысцкай брашуры «Пра паўстанне 1863 г. у Літве» акцэнтаваў увагу на ўдзеле ў выступленні шырокіх народных мас, адзначаў «рэвалюцыйнасць» прадстаўнікоў лагера «чырвоных» (З. Серакоўскага, К. Каліноўскага і інш.) і антыпамешчыцкі кірунак іх дзейнасці [33].



Юозас Жугжда

У пасляваенны перыяд у палітычным плане было абвешчана пра прыналежнасць К. Каліноўскага, які *«на працягу ўсяго свайго свядомага жыцця быў шчыльна звязаны з рускімі, польскімі, літоўскімі рэвалюцыянерамі»*, абодвум народам – беларусам і літоўцам. У органе ЦК Кампартыі Літвы часопісе «Камуніст» проста сцвярджалася: *«Жыццё і барацьба Каліноўскага неаддзельныя ад Літвы»* [25, с. 41]. Такая пазіцыя адкрывала, безумоўна, усе магчымасці для ўключэння яго постаці ў літоўскія даследаванні паўстання.

Адным з піянераў літоўскай пасляваеннай гістарыяграфіі з'яўляўся Юозас Жугжда. Праблематыка паўстання разглядалася ім у кантэксце развіцця дэмакратычнага руху ў Літве, у тым ліку ў Вільні, у 1860-я гг. і яго сувязей з расійскім рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам. Пры гэтым Ю. Жугжда ў 1950-я гг. цалкам паўтараў схему, якую крыху раней выпрацавалі беларускія гісторыкі – ён успрыняў канцэпцыю «сялянскага паўстання», якую накладаў на літоўскую сітуацыю. У прыватнасці, таксама адмяжоўваў сялянскае выступленне, якое выводзіў з агульнарасійскага сялянскага руху і рэвалюцыйнай сітуацыі канца 1850-х – пачатку 1860-х гг., ад польскага вызваленчага руху з імкненнем да адраджэння Рэчы Паспалітай [12]. У 1954 г. ён пісаў: *«У пачатку 1863 г. рух літоўскіх сялян выліўся ў адкрытае сялянскае паўстанне, якое ахапіла ўсю Літву»* і *«Актывізацыі сялянскага руху ў Літве, таксама, як і ў Беларусі, безумоўна, садзейнічаў нацыянальна-вызваленчы рух у*

*Польшчы, аднак значэнне польскага нацыянальнага руху для Літвы і Беларусі моцна перабольшана рускай, польскай і літоўскай буржуазнай і манархічнай гістарыяграфіяй»* [14, с. 189]. Адзін з яго аб'ёмных артыкулаў 1957 г. меў адпаведную назву – «Сялянскае паўстанне ў Літве 1863 года» [63]. Хаця ў далейшым ад канцэпцыі «сялянскага паўстання» Ю. Жугжда, як і навукоўцы ў Беларусі, адышоў (напрыклад, у 1963 г. ён ужо даследаваў праблему як аграрнае пытанне ў паўстанні ў Літве і Беларусі [13]), у цэлым, яго распрацоўкі 1950–1970-х гг. па дадзеным пытанні змяшчаюць тыя ж пастулаты, якія крыху раней былі ўключаны ў працы беларускіх даследчыкаў, – вызначальны ўплыў расійскіх рэвалюцыйных дэмакратаў (Аляксандра Герцэна, Мікалая Чарнышэўскага і інш.) на «чырвоных» кіраўнікоў паўстання (К. Каліноўскага, З. Серакоўскага і інш.), барацьба сялян на два фронты (супраць расійскага царызму і мясцовых памешчыкаў), рэакцыйная роля ў выступленні духавенства і дваранства, якому прыпісвалася выключна імкненне да барацьбы за Рэч Паспалітую 1772 г. ды і тое толькі на пачатковым этапе паўстання [48, p. 26–66; 62]. К. Каліноўскі характарызуецца ім як *«беларускі рэвалюцыянер»*, З. Серакоўскі – як *«польскі рэвалюцыянер»*, і яны абодва, нароўні з *«літоўскім рэвалюцыянерам»* А. Мацкявічусам, разглядаюцца як знакамітыя дзеячы, якія змагаліся за *«рэвалюцыйна-дэмакратычнае вырашэнне сялянскага пытання ў Літве»* [14, с. 191].

Калі Ю. Жугжда проста працягваў канцэпцыю «сялянскага паўстання», то Леонас Бічкаўскас-Гентвіла яе развіў далей. Паводле яго, сялянскае паўстанне ў Літве і Беларусі з'яўлялася ўсяго толькі часткай значна больш маштабных планаў. У 1955 г. у сваёй кандыдацкай дысертацыі ён пісаў: *«Сялянскае ўзброенае паўстанне ў Літве і Заходняй Беларусі, арганізаванае Каліноўскім, Серакоўскім і Мацкевічам, складала частку агульнага плана ваенна-сялянскага паўстання ва ўсерасійскім маштабе, якое рыхтавалася да лета 1863 г. рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі»* [9, с. 17]. Аднак гэты вектар ацэнкі не набыў далейшага развіцця, і нават сам Л. Бічкаўскас-Гентвіла пазней не паўтараў настолькі гучныя заявы.

Тэмпы развіцця літоўскай гістарыяграфіі паўстання былі значнымі. У выніку ў 1958 г. Л. Бічкаўскас-Гентвіла выдаў першую комплексную манаграфію пад назвай «Паўстанне 1863 года ў Літве» [34]. У значнай ступені яе структура паўтарыла аналагічныя ранейшыя працы, выдадзеныя ў Беларусі, Расіі і Польшчы, – вялікая ўвага (больш за палову аб'ёму) надаецца аналізу эканамічных і палітычных перадумоў паўстання, падрабязна разглядаюцца пазіцыі і стаўленне да яго розных сацыяльных груп, мерапрыемствы расійскай адміністрацыі па задушэнні паўстання і да т. п. Асобна і падрабязна аналізуецца супрацоўніцтва беларускіх і літоўскіх рэвалюцыйных дэмакратаў (К. Каліноўскага, З. Серакоўскага і



Леонас Бічкаўскас-Гентвіла

інш.) з рускімі і польскімі, а таксама іх сумесная барацьба напярэдадні і падчас паўстання. К. Каліноўскі характарызуецца як *«беларускі рэвалюцыйны дэмакрат»* [34, p. 179], а ўнёсак «Мужыцкай праўды» ў прапаганду сярод беларускіх і літоўскіх сялян рэвалюцыйна-прапагандысцкіх ідэй ацэньваецца высока. Упершыню масава выкарыстаны архіўныя крыніцы з ЦДГА ЛітССР, якія дапоўнены матэрыяламі некаторых іншых сховішчаў. Аднак з іншага боку, у значна меншай ступені разглядаюцца некаторыя іншыя пытанні (напрыклад, баявыя дзеянні), а ацэнкі даюцца ў адпаведнасці з вышэйзгаданымі палітызаванымі пастулатамі, што грунтуюцца на выказваннях класікаў марксізму-ленінізму.

Першая палова 1960-х гг. для літоўскай гістарыяграфіі, як і для беларускай, характарызавалася адыходам ад канцэпцыі «сялянскага паўстання» і тэзісу аб узаемнай незалежнасці сялянскага і вызваленчага рухаў. Хаця, як і ў Беларусі, вялікая ўвага па-ранейшаму звярталася на сацыяльна-эканамічныя пытанні, а пазіцыя сялянства ва ўсіх працах па гісторыі паўстання акрэслівалася абавязковым чынам. Такі падыход яскрава бачны ў вышэйзгаданым часопісе «Камуніст». У прымеркаваным да 100-гадовага юбілею артыкуле пісалася: *«Хаця галоўнай мэтай паўстання было аднаўленне Польскай дзяржавы, аднак вялікую ролю ў ім сыграла барацьба сялян супраць памешчыкаў, барацьба за зямлю і свабоду. Гэтая барацьба – выключна важная рыса паўстання, а ў Літве яна была, бадай, найбольш важнай рысай»* [26, с. 41]. Хаця з іншага боку, усё ж неабходна адзначыць наяўнасць непрацяглага “пераходнага перыяду”, калі ранейшыя і новыя падыходы перапляталіся. Напрыклад, у другім томе «Гісторыі Літоўскай ССР», падрыхтоўкай якой займаўся калектыў Інстытута гісторыі АН ЛітССР пад кіраўніцтвам яго дырэктара Ю. Жугжды, паўстанне ўжо выводзілася з двух “генетычных каранёў” – агульнаімперскага сялянскага руху і «польскага нацыянальна-вызваленчага» руху – з выразнай перавагай важнасці першага. У адпаведным раздзеле Ю. Жугжда пісаў: *«Літоўскі сялянскі рух выспяваў поруч з падрыхтоўкай расійскімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі сялянскага паўстання*

*ў Расіі, поруч з нарастаннем польскага нацыянальна-вызваленчага руху, які ахапіў усю тэрыторыю Польшчы, што знаходзілася ў складзе Расіі, меў прыхільнікаў у Літве і Беларусі, а таксама быў пашыраны на польскіх землях пад уладай Аўстрыі і Прусіі. У такіх абставінах было вельмі важна, каб агульнае ўзброенае паўстанне супраць царскага самаўладдзя пачалося адначасова ў розных месцах – у Расіі, Польшчы, Літве, Беларусі, Украіне»* [48, p. 34] (неабходна адзначыць, што ў гэтым томе значная ўвага нададзена разгляду дзейнасці К. Каліноўскага, якому прысвечаны нават асобны падраздзел [48, p. 59–61]).

Істотным чынам на развіццё літоўскай гістарыяграфіі паўстання паўплываў удзел літоўскіх даследчыкаў у польска-савецкім праекце 1957–1988 гг. па выданні крыніц па гісторыі паўстання і іншых звязаных з ім праектах Інстытута славяназнаўства АН СССР (больш падрабязна пра праект гл.: [23]). Найбольшай актыўнасцю сярод іх у гэтым праекце вылучаўся Уладзіслаў Бікуліч. У выніку праведзеных архіўных пошукаў ён выявіў вялікую колькасць каштоўных крыніц. Яны як публікаваліся ў вышэйзгаданых тамах серыі «Паўстанне 1863 г.», прысвечаных Беларусі і Літве, так і прадстаўляліся ў спецыялізаваных артыкулах. Напрыклад, менавіта ім падрабязна апісаны дзённік жонкі З. Серакоўскага Апалоніі Далеўскай і раскрыты яго інфармацыйны патэнцыял [3], уведзены ў навуковы ўжытак некаторыя новыя матэрыялы пра ўдзел у паўстанні сям'і Францішка Багушэвіча [7], у шэрагу артыкулаў пададзены агляд матэрыялаў ЦДГА ЛітССР па гісторыі руска-польска-літоўска-беларускіх «рэвалюцыйных сувязей» напярэдадні і падчас паўстання [4; 6] і інш.

Вялікае значэнне для гістарыяграфіі паўстання ў Беларусі мае кандыдацкая дысертацыя У. Бікуліча, у якой прасочаны арганізацыя і дзейнасць у Вільні цэнтральных органаў кіраўніцтва перадпаўстанцкім падполлем і паўстаннем у 1861–1864 гг. [5]. У ёй падрабязна разгледжаны перыпетыі эвалюцыі віленскага кіраўнічага кола, яе прычыны і вынікі, а таксама дадзены характарыстыкі дзейнасці розных арганізацый (Камітэт руху, Літоўскі правінцыйны камітэт, Аддзел кіравання правінцыямі Літвы, Выканаўчы камітэт у Літве) і іх сябрам. Праца грунтуецца на шырокім коле разнастайных крыніц (гістарычных і гістарыяграфічных) і да цяперашняга часу застаецца найбольш грунтоўнай у сваёй праблематыцы, хоць так і не была выдадзена асобнай кнігай.

Гаворачы пра ўдзел літоўскіх даследчыкаў у вышэйзгаданым міжнародным праекце, немагчыма не адзначыць унёсак беларуска-літоўскага (на той час) гісторыка Генадзя Кісялёва, які ў 1962 г. працаваў у Інстытуце гісторыі АН ЛітССР, а ў 1963–1970 гг. – у ЦДГА ЛітССР. Яго роля была асабліва важнай у складанні двух тамоў выдавецкай серыі, прысвечаных Беларусі і Літве. Падчас працы над храналагічна першым з іх ён быў кіраўніком літоўскай групы архівістаў, якія займаліся выяўлен-

нем дакументаў, у працэсе падрыхтоўкі другога тома з'яўляўся яшчэ і складальнікам усіх раздзелаў, што не ўваходзілі ў поле дзейнасці мінскіх гісторыкаў (агульны раздзел, а таксама раздзелы па Віленскай, Ковенскай і Аўгустоўскай губернях). У прадмовах да абодвух тамоў пазначана наступнае: *«Рэдагаванне археаграфічнай апрацоўкі дакументаў зроблена Г. В. Кісялёвым; ён жа падрыхтаваў археаграфічную частку прадмовы»* [11, с. XLI; 24, с. LII]. Пры гэтым ён не проста адрэдагаваў і паўдзельнічаў у напісанні прадмовы, а распрацаваў асобную рабочую інструкцыю (ці памятку) па археаграфічнай апрацоўцы выяўленых дакументаў, якая ў 1962 г. была прынята за аснову не толькі для тамоў па Беларусі і Літве, але і для ўсіх тамоў "савецкай" часткі серыі, якія яшчэ не былі на той час падрыхтаваны да друку [28].



Станісловас Лазутка

Праблеме «рэвалюцыйнай сітуацыі» ў Літве ў 1859–1862 гг. прысвяціў некалькі сваіх прац і кандыдацкую дысертацыю Станісловас (Стасіс) Лазутка [18; 19; 20; 21]. Ім была зроблена выснова пра складанае становішча літоўскіх сялян і паступовае яго пагаршэнне ў выніку рэформы 1861 г., што стварыла перадумовы для іх шырокага ўдзелу ў паўстанні. Геаграфічны абшар яго даследаванняў часта выходзіў па-за межы тагачаснай ЛітССР і ахопліваў Ковенскую, Віленскую, а часам і Гродзенскую губерні, таму ў працах прыводзяцца шматлікія звесткі па тэрыторыі Беларусі (Лідскі, Ашмянскі, Дзісенскі і іншыя паветы). З пазіцый інтэрнацыянальнага супрацоўніцтва рэвалюцыйных дэмакратаў ім разглядаецца дзейнасць віленскага падпольнага цэнтра, дзе, на думку С. Лазуткі, сканцэнтраваліся найбольш актыўныя рэвалюцыйныя элементы, якія займаліся падрыхтоўкай паўстання. Самая станоўчая характарыстыка дадзена ў яго працах К. Каліноўскаму. Ён разглядаецца як адзін з кіраўнікоў лагера «чырвоных» і паслядоўнік рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, які праводзіў у жыццё іх ідэі ў Беларусі і Літве. Асобна раскрываецца роля ў яго дзейнасці «Мужыцкай праўды», што распаўсюджвалася *«не толькі сярод беларускага, але і сярод літоўскага сялянства»* [20, с. 14] (гэты момант падкрэслены як моцны бок працы ў рэцэнзіі польскага даследчыка Станіслава Ханкоўскага [36]).



Генадзь Кісялёў

С. Лазутку належыць таксама вялікая заслуга ў распрацоўцы праблематыкі паўстання ў межах вышэйзгаданага міжнароднага праекта. Ён не толькі з'яўляўся рэцэнзентам тамоў серыі ад літоўскага боку, але і выступіў суаўтарам шэрагу прадмоў да некаторых тамоў. Апрача гэтага, нярэдка выступаў з рэцэнзіямі на працы, выдадзеныя па праблематыцы паўстання ўдзельнікамі праекта па-за яго межамі (напрыклад, на кнігі Анатоля Смірнова [16; 17; 46]). У 1960-я гг. С. Лазутка працаваў над доктарскай дысертацыяй, прысвечанай гістарыяграфіі паўстання 1863–1864 гг., і нават склаў рукапіс на *«некалькі соцень старонак»*, але праект застаўся нясконччаным праз яго цяжкую хваробу, а затым пераарыентацыю на распрацоўку іншых гістарычных праблем (Статуты і Метрыка ВКЛ) [61, p. 15].

Выразнай ілюстрацыяй уцягвання літоўскіх даследчыкаў у міжнароднае супрацоўніцтва і ў цэлым выхаду літоўскай гістарыяграфіі паўстання на міжнародную арэну з'яўляецца біяграфічны нарыс пра В. Урублеўскага аўтарства Уладзіслава (Уладаса) Абрамавічуса. У 1958 г. выйшла першае яго выданне на літоўскай мове [30], на якое напісалі рэцэнзіі на беларускай мове Г. Кісялёў [15], на літоўскай і рускай – Юозас Юргініс [29; 44], на польскай – Давід Файнгаўз [39]. У 1964 г. нарыс выйшаў на рускай мове [1], а ў 1968 г. быў выдадзены (таксама на рускай) у пашыранай версіі сумесна з расійскім даследчыкам Уладзімірам Дзьякавым [2], а рэцэнзію на апошняе выданне апублікаваў у Польшчы Ежы Барэйша [35].

Адзначэнне ў Літве 100-годдзя паўстання таксама, як і ў Беларусі, Расіі і Польшчы, паспрыяла актывізацыі разнастайных даследаванняў на тэму паўстання альбо яго гістарыяграфіі. Напрыклад, супрацоўнікамі Цэнтральнай бібліятэкі АН ЛітССР у адзін з тамоў сваёй серыі «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» быў уключаны асобны тэматычны блок, куды ўвайшлі важныя для далейшых даследаванняў аб'ёмныя публікацыі, напрыклад, бібліяграфія прац па гісторыі паўстання ў Літве [31], бібліяграфічны паказальнік рукапісаў па гісторыі паўстання ў Літве [54] і біяграфічны нарыс З. Серакоўскага [10].

Традыцыю даследавання ваенных дзеянняў у Літве падчас паўстання працягнула ў 1960-я гг. Она Максімайцене, якая прысвяціла праблематыцы сваю кандыдацкую дысертацыю [22] і выдадзеную на яе падставе манаграфію [51]. Праца грунтуецца на самым шырокім коле крыніц (дакументальных, мемуарных і інш.) і літаратуры, таму змяшчае вялікую колькасць канкрэтнага фактапагічнага матэрыялу. Галоўная заслуга працы заключаецца не ў канцэптуальных высновах, а ў стварэнні цэласнай карціны мілітарнага боку паўстання ў Літве і раскрыцці прычын яго інтэнсіўнасці менавіта на гэтай тэрыторыі. У поле ўвагі даследчыцы трапляе, безумоўна, шэраг агульных для Беларусі і Літвы тэматычных пытанняў – дзейнасць віленскага паўстанцкага цэнтра па кіраўніцтве атрадамі ў Беларусі і Літве, ваенныя дзеянні на беларуска-літоўскім памежжы (у Лідскім, Ашмянскім, Свянцянскім, Гродзенскім і іншых паветах). Вялікая ўвага ў працы нададзена дзейнасці З. Серакоўскага, даследаваннем якой О. Максімайцене займалася ў папярэдні час [50].



Она Максімайцене

Вызначэнне ўплыву паўстання на сялянскае пытанне ў Беларусі і Літве было працягнута ў даследаваннях Л. Бічкаўскаса-Гентвілы. У яго доктарскай дысертацыі 1972 г. разгледжаны мерапрыемствы ў аграрным сектары, праведзеныя ў межах новай мураўёўскай палітыкі. З аднаго боку прааналізаваны ўплыў рэпрэсіўных захадаў супраць памешчыкаў (канфіскацыі, секвестры, грашовыя зборы і інш.), з другога – палітыка саступак сялянам у 1863–1864 гг. [8]. У сваіх высновах даследчык у значнай ступені паўтарыў сваіх беларускіх калег (Міру Фрыдман, Антона Палонскага і інш.). Паводле яго, аграрная палітыка расійскіх улад, выкліканая паўстаннем, часта з’яўлялася непаслядоўнай, прывяла хутчэй да кансервацыі памешчыцкага землеўладання ў Беларусі і Літве і стрымлівала пранікненне капіталістычных адносінаў у вёску, а сістэма “саступак”, апрача таго, што была вымушанай, “вырванай” паўстанцамі, засталася пераважна дэмагагічнай і не прывяла да істотнага паляпшэння становішча літоўскіх і беларускіх сялян пасля паўстання.

Даследаваннямі паўстання займаліся таксама літоўскія эміграцыйныя гісторыкі. Не маючы доступу да асноўных крыніц па яго гісторыі, яны сканцэнтраваліся на пошуку адказаў на канцэптуальныя пытанні, галоўным з якіх была роля паўстання ў станаўленні літоўскай нацыі. Пры гэтым жыццё не ў СССР накладала на іх распрацоўкі свой палітычны адбітак – літоўскай эміграцыяй у пасляваенны перыяд галоўным палітычным ворагам Літвы разглядаецца ўжо не Польшча, як у міжваенны перыяд, а Расія (Савецкі Саюз). Адпаведна, паўстанне як форма барацьбы супраць Расіі становіцца зручным для паказу змагання літоўскага народа за сваю незалежнасць. Гэта змяніла стаўленне да яго, і яно пачало разглядацца не як выключна частка «польскай справы», а як важная падзея ў палітычнай гісторыі Літвы. Сярод прыхільнікаў падобнай пазіцыі найбольш аўтарытэтнымі з'яўляліся Ванда Даўгірдайце-Струовене і Костас (Канстанцінас) Юргела. Першая з іх у невялікім артыкуле «Істотныя праблемы гісторыі Літвы», які выйшаў у 1969 г., прытрымлівалася той пазіцыі, што літоўская шляхта, нягледзячы на значную паланізаванасць, захоўвала традыцыі мясцовага патрыятызму і адасобленасці Вялікага Княства Літоўскага ад Каралеўства Польскага. Паводле яе, у дзейнасці К. Каліноўскага і групы яго прыхільнікаў падчас паўстання прасочваецца імкненне да ства рэння літоўска-беларускай дзяржавы [38].

К. Юргела ў сваёй аб'ёмнай кнізе, якая выйшла праз год пасля згаданага артыкула, яшчэ больш развіў падобную логіку. Паводле яго, нягледзячы на тое, што іншыя народы называлі літоўскіх шляхціцаў «палякамі», самі сябе яны называлі «літоўцамі», і шмат хто з іх ужываў у паўсядзённым жыцці літоўскую мову. Адсюль вынікала імкненне літоўскай шляхты да адасаблення ад польскай і да стварэння ўласнай дзяржаўнасці. Таму ў паўстанні праявілася праблема «літоўскага сепаратызму», перш за ўсё – у дзейнасці лагера «чырвоных» (К. Каліноўскага і інш.). Аднак праца К. Юргелы напісана хутчэй у публіцыстычным стылі і ў значнай ступені запалітызавана, а ў заключнай частцы ён проста сцвярджае, што паўстанцы – гэта выразны прыклад абаронцаў Айчыны, і яны *«дазваляюць нам чэрпаць сілу з іх бітваў, з мінуўшчыны Літвы»* [43, p. 720]. Хаця з іншага боку, у ёй нададзена значная ўвага разгляду дзейнасці віленскага паўстанцкага цэнтра напярэдадні і падчас выступлення.

Палітычным апанентам двух вышэйзгаданых даследчыкаў з'яўляўся эміграцыйны гісторык Вінцас Трумпа, які ў 1988 г. у Чыкага выдаў сваю працу «Літва ў XIX стагоддзі» [58]. Гэта – спроба стварыць канцэптуальную мадэль гісторыі Літвы перыяду яе ўваходжання ў склад Расійскай імперыі. В. Трумпа зыходзіў з наяўнасці трох канфліктаў на тэрыторыі Літвы ў гэты перыяд – «польска-літоўскага», «польска-рус-

кага» і «літоўска-рускага», – кожны з якіх праяўляўся ў свой час і меў свае спецыфічныя формы. На яго думку, у паўстанні 1863–1864 гг. праявіўся выключна «польска-рускі» канфлікт, бо мясцовая пануючая эліта (паланізаванае дваранства) імкнулася выключна да адраджэння Рэчы Паспалітай (Польшчы) 1772 г. Удзел жа літоўскіх сялян у паўстанні В. Трумпа тлумачыў сацыяльна-эканамічнымі прычынамі – іх імкненнем выключна да атрымання зямлі і ліквідацыі феадальных перажыткаў (паншчыны). У адрозненне ад В. Даўгірдайце-Струовене і К. Юргелы В. Трумпа не разглядаў паўстанне як частку літоўскага нацыянальнага руху – нават як адну з праяў на яго пачатковым этапе.

Паступовая эвалюцыя падыходаў да даследавання паўстання адбывалася таксама ў Літоўскай ССР, што прасочваецца на падставе выданняў, якія выпускаліся Інстытутам гісторыі АН ЛітССР. Калі першая комплексная «Гісторыя Літоўскай ССР», што выйшла ў 1957–1975 гг., напісана ў класічнай марксісцкай традыцыі, то яе выданне 1985 г. характарызуе меншы ўплыў марксізму і пачатак адыходу ад разгляду падзей выключна з пункту гледжання класавай барацьбы (у тэрміналогіі Р. Мікніса, у выданні паўстанне ацэнена *«больш адпаведным рэчаіснасці чынам»* [52, s. 476]). Хаця шматлікія савецкія падыходы (падрыхтоўка паўстання выключна рэвалюцыйнымі дэмакратамі (К. Каліноўскім, З. Серакоўскім, А. Мацкевічам і інш.), вызначальны ўплыў на іх рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, характарыстыка М. Мураўёва як «Вешальніка» і глыбока негатыўнае стаўленне да ўсіх яго мерапрыемстваў і інш.) працягвалі ўжывацца [49, p. 272–281].

Такім чынам, для літоўскай савецкай гістарыяграфіі характэрнае прынцыповае змяненне (у параўнанні з міжваенным перыядам) стаўлення даследчыкаў да паўстання і поўнае ўкараненне пераканання аб яго істотнай важнасці для гісторыі Літвы ў незалежнасці ад ацэнкі ўплыву на развіццё літоўскага нацыянальнага руху. У гэты час сфарміравалася плеяда даследчыкаў, якія прафесійна спецыялізаваліся на распрацоўцы гісторыі паўстання альбо біяграфій яго дзеючых асоб (Ю. Жугжда, С. Лазутка, У. Бікуліч, Л. Бічкаўскас-Гентвіла, О. Максімайцене, У. Абрамавічус, К. Юргела і інш.). Гісторыкі ЛітССР пераарыентаваліся на выкарыстанне марксісцкай метадалогіі, таму пры пошуку прычын паўстання і ўдзелу ў ім розных сацыяльных груп галоўная ўвага імі звярталася на аналіз сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, а пры разглядзе падзей ужываўся класавы падыход. Літоўскія даследчыкі ўспрынялі выпрацаваную беларускімі гісторыкамі канцэпцыю «сялянскага паўстання» і актыўна ўжывалі яе ў 1950-я гг., а потым таксама адыйшлі ад яе ў 1960-я гг. Пад уплывам палітычных фактараў літоўская гістарыяграфія паўстання выйшла на міжнародны ўзровень, а падчас правядзення даследаванняў адбывалася актыўнае міжнароднае (міждзяржаўнае і ўнутрысаюзнае

міжрэспубліканскае) супрацоўніцтва, у тым ліку з беларускімі гісторыкамі. У гістарыяграфіі паўстання адбыўся крыніцазнаўчы пераварот: у выніку правядзення маштабных пошукавых работ была выяўлена і ўведзена ў навуковы ўжытак вялікая колькасць гістарычных крыніц, што ў сваю чаргу выклікала грунтоўнае факталагічнае насычэнне навуковых прац[2]. Гэта дазволіла выйсці гістарыяграфіі паўстання на больш высокі ўзровень праблемнага асэнсавання, выдаць некалькіх грунтоўных манаграфій, дзе вялікая ўвага надавалася фарміраванню і дзейнасці паўстанцкага цэнтра ў Вільні – агульнага для развіцця выступлення ў Беларусі і Літве. Разгляд праблематыкі паўстання праводзіўся ў кантэксце фарміравання рэвалюцыйных сувязей прадстаўнікоў розных народаў Расійскай імперыі, літоўскія гісторыкі ўдзельнічалі ў выпрацоўцы пастулату аб узаемным уплыве рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў Расійскай імперыі і вызваленчага руху на землях былой Рэчы Паспалітай. У сувязі з крыніцазнаўчым паваротам адбылося значнае развіццё некаторых тэматычных кірункаў, напрыклад, гісторыі баявых дзеянняў у 1863–1864 гг., у тым ліку на сучасным беларуска-літоўскім памежжы.

У цэлым ступень развіцця літоўскай гістарыяграфіі паўстання ў пасляваенны перыяд неабходна ацаніць як высокую. Літоўскія даследчыкі ўступілі ў новы перыяд (перыяд незалежнасці) са значным гістарыяграфічным даробкам.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.09.2022 г.

## Крыніцы і літаратура

1. Абрамавичюс, В. Е. Валерий Врублевский // К столетию героической борьбы «За нашу и вашу свободу»: сборник статей и материалов о восстании 1863 г. / под ред. В. А. Дьякова. – Москва : Наука, 1964. – С. 117–172.
2. Абрамавичюс, В. Е., Дьяков, В. А. Валерий Врублевский. – Москва : Мысль, 1968. – 159 с.
3. Бикулич, В. Б. Воспоминания А. Сераковской (Далевской) и другие материалы о З. Сераковском в ЦГИА Литовской ССР // К столетию героической борьбы «За нашу и вашу свободу»: сборник статей и материалов о восстании 1863 г. / под ред. В. А. Дьякова [и др.]. – Москва : Наука, 1964. – С. 55–114.

---

[2] Наконт знешніх стымулаў факталагічнага насычэння прац літоўскіх гісторыкаў пасляваеннага перыяду цікава прывесці думку сучаснага літоўскага даследчыка Дарыюса Сталюнаса, выказаную ў 2007 г.: *«Факталагічнае апісанне той ці іншай з'явы дазваляла не кранацца дагматычных канонаў марксізму-ленінізму. Можна нават сказаць, што фактаграфічны падыход стаў самай дзейснай зброяй супраціўлення супраць ідэалагічных схем»* [27, с. 541].

4. Бикулич, В. Б. О русско-польско-литовско-белорусских революционных связях периода восстания 1863–1864 гг. (Материалы ЦГИА Литовской ССР) // Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг. : [Сборник статей и материалов] / редкол.: М. В. Нечкина (отв. ред) [и др.]. – [Т. IV]. – Москва : Наука, 1965. – С. 301–313.
5. Бикулич, В. Б. Революционная организация восстания 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии / Автореферат дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук. – Вильнюс, 1973. – 38 с.
6. Бикулич, В. Б. Речь П. Г. Заичневского о русско-польском сотрудничестве // Связи революционеров России и Польши. XIX – начало XX века / под ред. В. А. Дьякова, И. С. Миллера, Л. А. Обушенковой. – Москва : Наука, 1968. – С. 75–80.
7. Бікуліч, У. Б. «Ідзіце ў Кушляны смела…». Новыя матэрыялы аб удзеле сям'і Ф. Багушэвіча ў паўстанні 1863 года // Беларусь. – 1967. – № 3. – С. 29.
8. Бичкаускас-Гентвила, Л. Н. Аграрный вопрос в Литве и Западной Белоруссии (1861–1905 гг.): Автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора исторических наук: специальность 07.571 История СССР. – Вильнюс, 1972. – 51, [1] с.
9. Бычкаускас-Гентвила, Л. Н. Крестьянская реформа и восстание 1863 года в Литве : Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата ист. наук / Моск. гор. пед. ин-т им. В. П. Потемкина. – Москва, 1955. – 24 с.
10. Вождь восстания 1863 г. в Литве Зигмунт Сераковский // Bibliotekininkystė i bibliografija. – Т. 2. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1963. – P. 254–302.
11. Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг.: Сб. документов / подгот.: Л. Аржаева, С. Байкова, В. Бикулич [и др.]; редкол.: В. Дьяков, В. Жигалов, Ю. Жюгжда [и др.]. – Москва; Вроцлав : Наука, 1965. – 586 с. – (Восстание 1863 года : Материалы и документы / [гл. ред. серии: С. Кеневич (и др.)]).
12. Жюгжда, Ю. И. Антанас Мацкевичус – руководитель борьбы крестьянства Литвы против царизма и помещиков // Коммунист. – 1951. – № 1. – С. 30–41; № 2. – С. 30–43.
13. Жюгжда, Ю. И. Отражение аграрного вопроса в восстании 1863–1864 гг. в Литве // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1963 г. – Вильнюс : Минтис, 1964. – С. 29–44.
14. Жюгжда, Ю. И. Развитие демократического движения в Литве в 60-х годах XIX в. и влияние на него русского революционно-демократического движения // Исторические записки. – Т. 45. – Москва : Изд-во АН СССР, 1954. – С. 183–200.
15. Кісялёў, Г. В. Кніга пра генерала Парыжскай Камуны // Літаратура і мастацтва. – 1960. – 13 лютага. – № 13. – С. 4.
16. Лазутка, С. А. Их имена бессмертны // Коммунист. – 1959. – № 12. – С. 67–71.
17. Лазутка, С. А. Книга о революционных связях братских народов // Istorija. – 1963. – Т. 4. – P. 149–155.

18. Лазутка, С. А. О воспроизводстве феодального хозяйства и разорении крестьян в Литве накануне восстания 1863–1864 годов // Вопросы истории. – 1958. – № 8. – С. 114–125.
19. Лазутка, С. А. Революционная ситуация в 1859–1862 гг. в Литве // Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг. : [Сборник статей и материалов] / редкол.: М. В. Нечкина (отв. ред.) [и др.]. – [Т. I]. – Москва : Наука, 1960. – С. 480–501.
20. Лазутка, С. А. Революционная ситуация 1859–1862 гг. в Литве: (Предпосылки восстания 1863–1864 гг.) : Автореферат дисс. на соискание учен. степени кандидата ист. наук / Академия общественных наук при ЦК КПСС, Кафедра истории СССР. – Москва, 1958. – 17 с.
21. Лазутка, С. А. Революционная ситуация в Литве. 1859–1862 гг. – Москва : Высшая школа, 1961. – 260 с.
22. Максимайтене, О. И. Военная организация повстанцев и боевые действия в 1863–1864 гг. в Литве: Автореферат дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук / АН Литовской ССР, Институт истории. – Вильнюс, 1966. – 25 с.
23. Матвейчык, Д. Ч. Унёсак беларускіх гісторыкаў і архівістаў у рэалізацыю польска-савецкага праекта па выданні крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. (1957–1987 гг.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 19. – Мінск : НГАБ, 2021. – С. 237–249.
24. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. / подгот.: Л. Аржаева, С. Байкова, В. Бикулич [и др.]; редкол.: В. Дьяков, В. Жигалов, Ю. Жюгжда [и др.]. – Москва : Наука, 1964. – LXXI+707 с. – (Восстание 1863 года : Материалы и документы / [гл. ред. серии: С. Кеневич (и др.)]).
25. Розаускас, Е., Киселев, Г. К. Калиновский и Литва // Коммунист. – 1963. – № 5. – С. 41–44.
26. Сидеравичюс, К. Восстание в 1863 году в Литве // Коммунист. – 1963. – № 1. – С. 41–48.
27. Сталюнас, Д. Взгляд на политику Российской империи в литовской историографии // Западные окраины Российской империи / [Л. А. Бережная и др.]; Международный благотворительный фонд им. Д. С. Лихачева. – Москва : Новое литературное обозрение, 2007. – С. 533–552.
28. Шумейко, М. Ф. Из истории подготовки международных публикаций (Методические рекомендации по археографической обработке документов серии сборников «Восстание 1863 г.») // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 11. – Мінск : БелНДІДАС, 2010. – С. 273–291.
29. Юргинис, Ю. Валерий Врублевский – генерал Парижской Коммуны // Коммунист. – 1959. – № 3. – С. 77–78.
30. Abramavičius, V. Valerijonas Vrublevskis. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatuūros leidykla, 1958. – 104 p.
31. Adomonienė, O. 1863 m. sukilimo Lietuvoje bibliografija // Bibliotekininkystė i bibliografija. – T. 2. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1963. – P. 305–318.

32. Alekna, A. Lietuvos istorija : su keturiais spalvotais žemėlapiais. – 6-asis trumpesnysis pataisytas leidimas. – Kaunas : [Šv. Kazimiero d-ja], 1934. – 96 p., [4] žml. lap. – (Šv. Kazimiero draugijos leidinys; № 598).
33. Angarietis, Z. Apie 1863 m. sukilimą Lietuvoje. – [Kaunas : LKP CK], 1938. – 5 p.
34. Bičkauskas-Gentvila, L. 1863 metų sukilimas Lietuvoje. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1958. – 350, [1] p.
35. Borejsza, J. W. [recenzja na:] „Walerij Wrublewski", W. E. Abramoviczius, W. A. Djakow, Moskwa 1968; „Marks, Engels i polskoje oswoboditielnoje dwiżenije", W. A. Djakow, Moskwa 1968; „Jarosław Dombrowski", W. A. Dajkow, Moskwa 1969 // Przegląd Historyczny. – 1970. – T. 61. – № 4. – S. 725–727.
36. Chankowski, S. [recenzja na:] Лазутка С. А. Революционная ситуация в Литве. 1859–1862 гг. – Москва : Высшая школа, 1961. – 260 с. // Acta Baltico-Slavica. – T. 6. – Białystok : Polonia, 1969. – S. 317–320.
37. Čilvinaitė, M. Barboros Vyčiūnienės pasakojimas apie 1863 m. sukilimą // Karo archyvas. – T. 7. – [Kaunas] : «Spindulio» sp., 1936. – P. 101–103.
38. Daugirdaitė-Sruogienė, V. Esminiu Lietuvos istorijos klausimu // Metmenys. – 1969. – № 17. – P. 174–183.
39. Fajnhauz, D. [recenzja na:] Abramavičius Vladas, Valerijonas Vrublevskis. LTST Mosklų Akademija 1958, ss. 103 // Kwartalnik Historyczny. – R. 68. – 1961. – № 1. – S. 249–250.
40. Janulaitis, A. 1863–1864 metų sukilimas Lietuvoje. – Kaunas : Krašto apsaugos ministerijos literatūros skyrius, 1921. – 44 p.
41. Janułajtis, A. Powstanie w Litwie 1863–1864 r. (tlumaczenie z litewskiego) // Ziemia Ojczysta. – R. 1. – 1923. – № 1–18.
42. Janułajtis, A. Powstanie w Litwie, 1863–1864 r.: tlumaczenie z litewskiego. – Wilno : Nakladem "Ziemi Ojczystej", 1923. – 109 s.
43. Jurgėla, K. R. Lietuvos sukilimas 1862–1864 metais: sukilimo 100-mečio sukakčiai pagerbti. – Boston : Lietuvos enciklopedijos leidykla, 1970. – 720 p.
44. Jurginis, J. Valerijus Vrublevskis – Paryžiaus komunos generolas // Komunistas. – 1959. – № 3. – P. 73–74.
45. Kościałkowski, S. [Recenzja na:] Janułajtis Augustyn. Powstanie w Litwie 1863–1864. Tłumaczenie z litewskiego, nakładem „Ziemi Ojczystej". Wilno, 1923. – 16o str. 109 // Ateneum Wileńskie. – R. 1. – 1923. – № 3/4. – S. 585–590.
46. Lazutka, S. Jų vardai nemirtingi // Komunistas. – 1959. – № 12. – P. 67–71.
47. Ličkūnas, S. 1863–64 m. žemaičių sukilimas Mažeikių apylinkėje // Karo archyvas. – T. 6. – [Kaunas] : «Spindulio» sp., 1935. – P. 47–53.
48. Lietuvos TSR istorija. T. 1–4 / Lietuvos TSR Mokslų akademija, Istorijos institutas; vyr. red.: J. Žiugžda. – T. 2: Nuo 1861 iki 1917 metų. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1963. – 494, [2] p., [2] žml. p.
49. Lietuvos TSR istorija. T. 1: Nuo seniausių laikų iki 1917 metų / Lietuvos TSR Mokslų akademijos, Istorijos institutas; red. kol.: B. Vaitkevičius, M. Jučas, V. Merkys. – Vilnius : Mokslas, 1985. – 401 p.

50. Maksimaitienė, O. Iš Zigmanto Sierakausko gyvenimo ir veiklos // Lietuvos TSR Moksklų Akademijos Darbai. – Serija A. – 1964. – № l(16). – P. 135–154.
51. Maksimaitienė, O. Lietuvos sukilėlių kovos 1863–1864 m. – Vilnius : Mintis, 1969. – 294, [9] p.
52. Miknys, R. Powstania XIX wieku w Polsce i na Litwie w historiografii litewskiej // Polskie powstania narodowe na tle przemian europejskich w XIX wieku / red. A. Barańska, W. Matwiejczyk, J. Ziółek. – Lublin : Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 2001. – S. 467–480.
53. Miliauskas-Miglovara, J. 1863 metų sukilimą atsiminus: Iš Tomo Žičkausko autobiografijos // Karo archyvas. – T. 2. – Kaunas : Varpas, 1925. – P. 45–51.
54. Petkevičiutė, D. Rankraščiai apie 1863 m. sukilimą Lietuvoje. Bibliografinė rodyklė // Bibliotekininkystė ir bibliografija. – T. 2. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1963. – P. 213–253.
55. Sak, W. [Recenzja na:] Augustyn Janułajtis. Powstanie w Litwie w r. 1863–1864. Tłumaczenie z litewskiego. Wilno, nakładem „Ziemi Ojczystej" r. 1923 // Przegląd Wileński. – 1923. – № 21. – S. 12.
56. Steponaitis, V. Medžiaga 1863–64 metų sukilimo istorijai // Karo archyvas. – T. II. – Kaunas : Varpas, 1925. – P. 62–158.
57. Šležas, P. Muravjovo veikimas Lietuvoje 1863–1865 m. – Kaunas : [s.n.], 1933. – 42 p.
58. Trumpa, V. Lietuva XIX amžiuje. – Chicago : Algimanto Mackaus knygų leidimo fondas, 1989. – 279 p.
59. Tumas, J. Iš Liudvikos Gedgaudienės-Didžiulienės užrašų // Karo archyvas. – T. 2. – Kaunas : Varpas, 1925. – P. 52–59.
60. Urbelis, A. 1863 m. sukilimo dalyvio atsiminimai // Karo archyvas. – T. 6. – [Kaunas] : «Spindulio» sp., 1935. – P. 54–56.
61. Vasiliauskienė, A. Stanislovas Lazutka. Bibliografija. – Vilnius : [s. n.], 1984. – 88 p.
62. Žiugžda, J. Antanas Mackevičius: 1863–1864 m. sukilimo reikšmė lietuvių tautos istorijoje. – Vilnius : Mintis, 1971. – 203 p.
63. Žiugžda, J. Valstiečiu sukilimas Lietuvoje 1863 metais // Lietuvos valstiečiai XIX amžiuje / Lietuvos TSR Mokslų akademija, Istorijos institutas. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1957. – P. 134–176.

# Генеалогія

*В. В. Урублеўскі*

## Гісторыя і генеалогія насельніцтва вёскі Цялякава (паводле матэрыялаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь)

У прадстаўленай спробе разгляду гісторыі і генеалогіі насельніцтва вёскі Цялякава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці аўтар адыходзіць ад стандартнага падыходу па абагульненні гісторыі паселішча з гісторыяй яго ўладальнікаў, адзначае толькі вехі канфесійнай гісторыі. Для напісання дадзенай працы найбольш інфармацыйнымі з'яўляюцца разнастайныя крыніцы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ).

Паселішча ў залежнасці ад гістарычнага кантэксту згадваецца пад назвай Цялякава (Целякова) або Цялякаў. У яе аснове – мянушка Цяляк (Cielak). Назва вызначае прыналежнасць да ўласнасці некага Цяляка. Адказ на пытанне аб тым, чыя мянушка легла ў яе аснову, варта шукаць у матэрыялах Літоўскай Метрыкі. У запісе за 10 красавіка 1473 г. ад імя караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелончыка адзначаецца факт перадачы пасольскаму дзяку пану Васілю або Васку Любічу правоў на валоданне сялом і двума падданымі Клімовічам і Чолятычам (разам з сем'ямі), якія дагэтуль належалі князю Яўлашку Цяляціне, памерламу ў тым жа годзе [3, с. 536; 27, р. 52].

Згаданы князь загадкавы для нашай гістарыяграфіі. Пэўнай зачэпкай да высвятлення яго асобы з'яўляюцца тытул і прозвішча. Верагодна, ён меў блізкую повязь з князем Фёдарам Аляксандравічам Цяляцеўскім (Рурыкавічам у 17-м калене), прадстаўніком мікулінскага адгалінавання цвярскіх князёў, які з'яўляўся адзіным уладальнікам Цяляцеўскага княства, што ў першай палове XV ст. вылучылася з Мікулінскага княства. Ужо яго сын Міхаіл Фёдаравіч па мянушцы Вашута перайшоў на службу да маскоўскага князя Івана III і атрымаў ад яго баярства.

Род Цяляцеўскіх перапыніўся ў прамой мужчынскай лініі ў 1645 г. са смерцю астраханскага ваяводы Фёдара Андрэевіча Цяляцеўскага, які фактычна з'яўляўся апошнім прадстаўніком цяляцеўскіх, мікулінскіх і цвярскіх князёў з радаводу Рурыкавічаў.

Цяляцеўскае княства складалася з умацаванага гарадка Цяляцеў і воласці (месца яго ранейшага знаходжання лакалізуецца ў паўночна-заходнім напрамку ад сучаснага сяла Мікуліна Латошынскага раёна Маскоўскай вобласці).

Адносна імя Яўлашкі напрошваецца сувязь з імёнамі Аўласій, Яўлампій і Яўстафій. Аднак яны дакладна не княжацкія. Этымалагічна названая форма можа адыходзіць і ад княжацкага імя Аляксандр. Верагодна, у ВКЛ аўтарытэт новага пасяленца быў невысокі, таму за ім замацавалася спрошчаная форма імя. Мае права на існаванне і альтэрнатыўная версія аб самаісным імені Яўлах. Так, звянігарадскі князь Яўлах Аляксандравіч жыў у XIV ст. [4, с. 414].

Паводле радаводаў Рурыкавічаў, акрамя Міхаіла, Фёдар Аляксандравіч Цяляцеўскі меў сыноў Андрэя, Юрыя і Васіля [4, с. 621]. Князь Яўлашка мог быць няўлічаным братам Міхаіла Фёдаравіча Цяляцеўскага, які падтрымліваў Івана III у палітыцы збірання рускіх зямель вакол Масквы. Факт знаходжання князя Яўлашкі ў ВКЛ у 1473 г. можа сведчыць пра яго пасіўнае супраціўленне такой палітыцы і яго добраахвотнае перасяленне ў суседнюю дзяржаву.

Паколькі ўзрост князя Яўлашкі на момант яго смерці невядомы, варта мець на ўвазе, што ён можа быць не сынам, а невядомым родным братам Фёдара Цяляцеўскага. Акрамя факта валодання безназоўным сялом і падданымі Клімовічам і Чолятычам, князь Яўлашка яшчэ раз згадваецца ў тым жа дакуменце як уласнік двух падданых – Грыдкі і Хацяна Скарынічаў [27, р. 52].

Адсутнасць назвы сяла ў тэксце даравальнай граматы або прывілея можа сведчыць, што назва яшчэ не была замацавана за паселішчам. Звычай усякаць ці падаўжаць назвы геаграфічных аб'ектаў і антрапонімаў у цэлым характэрны для тэрыторыі Верхняга Панямоння. Прыгадаем назву мястэчка, а цяпер горада Узда, утвораную ад назвы ракі Уздзянка. Прозвішча Цяляціна цалкам магло быць скарочана да формы Цяляк і ў форме блізкай да Цялякава ўпершыню трапіць на старонкі дакументаў.

Цялякава ўпершыню згадваецца ў пацвярджальным прывілеі вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка ад 27 мая 1500 г. як маёнтак, уласнасць шляхціца Юрыя Андрэевіча Давойны Салагуба, яго спадчына па бацьку Андрэю і браце Багдане [1, с. 52–53].

Наступныя згадкі ўладання прыходзяцца на 1550–1551 гг., у сувязі з супрацьстаяннем Салагубаў і Сакаловічаў. Так, Жыгімонт Мікалаевіч Салагуб, унук Юрыя, 6 снежня 1550 г. падаў скаргу на Каспара Кунцаві-

ча Сакаловіча, дзяржаўцу перавальскага, за нелегітымнае ўваходжанне ва ўладанне цяглымі людзьмі, парабкамі, ворывам і сенажацямі маёнтка Цялякава, а таксама за ігнараванне выкліку ў суд [7]. 11 снежня 1551 г. разглядалася скарга Жыгімонта Салагуба на чатырох сялян Прысынкавічаў, падданых Сакаловіча, якія заманілі Салагуба ў дом старца Сцяпана і жорстка яго збілі [8]. 20 лютага 1600 г. Салагубы напалі на Дабрылеўскіх – спадчыннікаў Сакаловіча, збілі падданых і падпалілі дымы. Пры гэтым на баку Пятра Трэскі, слугі Мікалая Паўлавіча і Дароты Лаўрынаўны Салагубаў, быў Станіслаў Агрэнскі, ураднік Мікалая Янавіча і Кацярыны Кунцаўны Дабрылеўскіх [21].

Апрача гэтых сварак, у самім маёнтку мелі месца памежныя спрэчкі з суседзямі. Фактычна ў акрэслены час адна яго частка належала Салагубам, а другая – Сакаловічам, а затым Дабрылеўскім. Так, пасля наезду ў жніўні 1582 г. ячанскіх сялян жамойцкага старасты Яна Станіслававіча Кішкі на цялякаўскія ўрочышчы Конанава і Занцава Ляда, у Менскі гродскі суд было пададзена дзве скаргі. Цівун Ходар Шпек скардзіўся ад імя Мікалая і Кацярыны Дабрылеўскіх, а Іван Зубейкавіч – ад імя Жыгімонта Салагуба [2, с. 284–286]. Напружанымі былі і адносіны з Крыштафам Радзівілам Перуном, чые падданыя з сяла Возера маёнтка Вязынь 3 мая 1600 г. збілі трох цялякаўскіх падданых Адама Жыгімонтавіча Салагуба [22].

Апошні раз Дабрылеўскія і Салагубы згадваюцца ў баніцыйным лісце, падпісаным каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам III Вазам 12 снежня 1617 г., які тычыўся выгнання з маёнтка за нявыплачаную грашовую пазыку ў памеры 302 коп грошаў літоўскіх зямяніна Яна Мікалаевіча (верагодна, Дабрылеўскага). Той быў іх вінен зямянцы Марыне Гузаўне, жонцы Адама Салагуба [23].

Далей, да 1641 г., маёнтак разам з сялом перайшоў у карыстанне прадстаўнікоў біржанска-дубінкаўскай галіны Радзівілаў, а пасля яе згасання ў мужчынскім (1669) і жаночым (1695) каленах – у склад так званых “нойбургскіх маёнткаў” (ва ўласнасць князёў нямецкага графства Нойбург). 22 мая 1744 г. князь Геранім Фларыян Радзівіл выкупіў у тагачаснага курфюстра-пфальцграфа Рэйнскага Карла Тэадора згаданыя ўладанні.

Нягледзячы на знешнія падзеі, што тычыліся роду Радзівілаў, унутранае жыццё ў маёнтку і ў сяле нязменна кіравалася адным усталяваным парадкам – цялякаўскае ўладанне здавалася ў часовае трыманне крэдыторам уладальнікаў (Араноўскія,Валадковічы, Варанецкія, Верашчакі, Даўнаровічы, дэ Раесы, Забелы, Кастравіцкія).

Паміж 1617 і 1641 гг., ужо пры Радзівілах, побач з сялом было закладзена мястэчка Цялякаў, што паўплывала на развіццё рамёстваў і гандлю. Пры гэтым у 1641 г. побач з мястэчкам згадваецца сяло Стары Цялякаў, якое ў першай трэці XIX ст. знікла ўжо пад назвай Стараселле [27, с. 233].

У часы Паўночнай вайны 1700–1721 гг. мястэчка Цялякаў згадваецца ў кантэксце эканамічнага сутыкнення інтарэсаў маёнткавай адміністрацыі і жаўнераў з атрада паручніка Эйсманта, якія кватаравалі ў маёнтку ў перыяд паміж 23 студзеня і 13 красавіка 1710 г. У скарзе, пададзенай у Мінскі гродскі суд аканомам Янам Рымінскім 27 чэрвеня 1710 г., падрабязна пералічваюцца шкоды, нанесеныя сялянскім гаспадаркам кватарантамі. У ёй згадваюцца першыя вядомыя прадстаўнікі мясцовых цялякаўскіх родаў Ананічаў, Мацкевічаў, Шымановічаў [25].

У 1766 г. у мястэчку Цялякаў (разам са Старым Цялякавым) пражывалі 26 сем'яў, 124 чалавекі, з прозвішчамі Андрыеўскі, Берасцевіч, Бурдынскі, Вайніловіч, Колка, Ласіцкі, Мартулевіч, Марцінеўскі, Маскевіч, Мацкевіч, Рак, Шчыгельскі, Шымановіч [19, арк. 143–143 адв.]. Усе яны былі парафіянамі Цялякаўскай уніяцкай царквы (гэта яе першая згадка ў крыніцах). Паводле інвентара за 24 красавіка 1780 г. у мястэчку пражывалі 18 сем'яў сялян з прозвішчамі Ананіч, Берастовіч, Драган, Колка, Мацкевіч, Піваварчык, Рак, Рэдзька, Стрыгельскі, Чачкоўскі, Шымановіч [10, арк. 37–38 адв.].

У 1793 г. паселішча ўвайшло ў склад Расійскай імперыі і страціла статус мястэчка. У крыніцах XIX ст. Цялякава з-за знаходжання ў ім царквы згадвалася часцей менавіта як сяло, населенае прыгоннымі сялянамі. У 1811 г. тут зафіксавана 17 двароў і 68 прыгонных мужчын з прозвішчамі Ананіч, Берасцевіч, Дзеражынскі, Кароль, Колка, Кулакоўскі, Мацкевіч, Рак, Сымановіч, Чачкоўскі [14, арк. 559 адв.–602]. У Стараселлі на 5 двароў прыходзілася 14 мужчын з прозвішчамі Ананіч, Савінка, Слепіца [14, арк. 603 адв.–604].

У 1812 г. праз сяло праходзіў на ўсход, у напрамку Салтанаўкі, французскі корпус маршала Луі Нікаля Даву (на баку Напалеона ў вайне браў удзел уладальнік Цялякава Дамінік Геранім Радзівіл (1786–1812)) [26, с. 644]. Паміж 1811 і 1816 гг. з-за цяжкага эканамічнага становішча і ўзмацнення прыгону 20 прыгонных сялян рознага полу і ўзросту ўцяклі з сяла. На 5 жніўня 1816 г. тут налічвалася 22 двары, 47 мужчын, 34 жанчыны з прозвішчамі Ананіч, Берасцевіч, Ганчар, Дзеражынскі, Кароль, Марцінкевіч, Мацкевіч, Панішча, Рак, Сасіновіч, Стрыгельскі, Шымановіч [13, арк. 556 адв.–560]. А ў Стараселлі – 5 двароў і 17 жыхароў з прозвішчамі Ананіч, Савінка, Слепіца, Ражановіч. Уцяклі 4 чалавекі [13, арк. 560 адв.–561].

Пасля смерці 26 ліпеня 1832 г. Стэфаніі Радзівіл, дачкі Дамініка, яе ўладанні перайшлі да мужа, графа Льва Пятровіча Вітгенштэйна (1799–1866). 11 лютага 1834 г. у Цялякава налічвалася 27 двароў, 80 мужчын, 80 жанчын з прозвішчамі Ананіч (форма Ананец), Барталевіч, Берасцевіч (форма Берастовіч), Ганчар, Гурын, Дзеражынскі, Кароль, Карп (форма Корша), Колка (форма Колька), Марцінкевіч, Мацкевіч, Ражановіч, Рак, Савінка (форма Савенка), Сасіновіч, Слепіца, Шымановіч

[15, арк. 293 адв.–299]. Вёска Стараселле ў 1824–1832 гг. была ліквідавана, а яе насельніцтва пераведзена ў сяло Цялякава, вёскі Пашкаўшчыну, Пяшчанку, Стрыгелы, Тамілаўшчыну [15, арк. 17 адв.–18, 297 адв.–299, 302 адв.–303, 306 адв.–307, 328 адв.–329]. 3 ліпеня 1834 г. Вітгенштэйны прадалі маёнтак з сялом Несялоўскім [18, арк. 253 адв.]. У 1839 г. уніяцкае насельніцтва парафіі перавялі ў праваслаўе.

27 кастрычніка 1850 г. Несялоўскія прадалі Цялякава падпалкоўніку Канстанціну Гарцінгу (1821–1891) [11]. Ужо на наступны дзень была складзена рэвізская сказка, паводле якой у сяле налічвалася 34 двары, 104 мужчыны, 119 жанчын з прозвішчамі Ананіч, Барталевіч, Берасцевіч (форма Берастовіч), Ганчар-Стрыгельскі, Гурын, Дзеражынскі (форма Дыразінскі), Кароль, Колка (форма Колька), Марцінкевіч, Мацкевіч, Рак, Савінка, Сасіновіч, Шымановіч, Янкоўскі [16, арк. 845 адв.–853]. Апошняя рэвізія, праведзеная 1 мая 1858 г., зафіксавала ў сяле 26 двароў, 197 жыхароў з прозвішчамі Ананіч, Банькоўскі, Барталевіч, Берасцевіч, Бурак, Ганчар-Стрыгельскі, Гурын, Кароль, Колка, Марцінкевіч, Мацкевіч, Рак, Савінка, Сасіновіч, Шымановіч, Шынкевіч (пазней Сенькевіч), Янкоўскі [17, арк. 801–809].

Пры Несялоўскіх і Гарцінгах у маёнтку актыўна ствараліся фальваркавыя гаспадаркі, што паўплывала на жыццё Цялякава. Яго насельніцтва павялічылася за кошт перасяленцаў з іншых, ліквідаваных, вёсак, што абумовіла цеснае дворнае размяшчэнне ў сяле і наяўнасць малой колькасці ўрадлівай зямлі [20, арк. 13–14].

У 1860-я гг. сяло па-ранейшаму складалася з дзвюх паралельных вуліц. Пачыналася ад паварота на Міколку, а канчалася тым месцам, дзе знаходзілася царква і стаяла кузня.

Пасля адмены прыгоннага права, у красавіку 1861 г. у маёнтку адбылося хваляванне сялян. Але парадак быў даволі хутка ўсталяваны станавым приставам [5, с. 310–311]. Паводле рэформы ў вёсцы адбыўся абмен землямі паміж сялянамі і памешчыкам для ліквідацыі цераспалосіцы [20, арк. 55 адв.]. У 1863–1867 гг. Цялякава з’яўлялася цэнтрам воласці [9, арк. 1088 адв.–1089; 20, арк. 12–12 адв.]. У другой палове XIX ст. у сяле працавала карчма. Дзейнічала таксама казённая вінная лаўка, дзе служылі мінскі мешчанін Андрэй Іванавіч Кашэўскі, а затым яго зяць – адстаўны унтэр-афіцэр Аляксандр Фадзеевіч Андруховіч.

У 1897 г. тут налічвалася 66 двароў, 440 жыхароў, былі прыходская царква і хлебазапасны магазін. У тым жа годзе вялося будаўніцтва царкоўнапрыходскай школы. У пачатку XX ст. – 64 двары, 497 жыхароў [26, с. 644].

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Цялякаве з’явіліся сем’і Лычкоўскіх (1866), Бярновічаў (1866/1869), Станкевічаў (1875), Кучукоў (1877), Шабуняў (1901), Барысевічаў (каля 1910), Казакоў (1910), Булгакаў (1911/1912), Дашкевічаў (каля 1924), Падальшэцкіх (каля 1924).

У пачатку ХХ ст. сяло вырасла, пачалося асваенне новых зямель у напрамку Узды, за царкоўным цвінтаром. У 1916 г. тут налічвалася ўжо 79 двароў [12, арк. 16–16 адв.]. Пасля рэвалюцыі 1917 г., нямецкай і польскай акупацый сяло ўвайшло ў склад Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь.

Пасля рэвалюцыі на базе былой царкоўна-прыходскай школы была адкрыта пачатковая савецкая школа. У 1924–1925 навучальным годзе настаўнікі Ігнат Козел і Алеся Лычкоўская вучылі 92 школьнікі [26, с. 644].

З 20 жніўня 1924 г. сяло з'яўлялася цэнтрам сельсавета Уздзенскага раёна Мінскай акругі. Паводле сельскагаспадарчага перапісу, праведзенага 1 студзеня 1925 г., у сяле было 75 двароў, 405 жыхароў (з іх 126 пісьменных), 64 працоўныя кані, 19 жарабцоў старэйшых за год, 102 каровы, 39 цялушак і бычкоў старэйшых за год, 70 свіней старэйшых за 4 месяцы, 140 авец, 7 конных малацілак, тры веялкі. Старшынёй сельсавета быў нехта Ждановіч [6].

З пачатку 1930-х гг. да 1941 г. паселішча адносілася да калгаса «Прагрэс». У 1934 г. Цялякаўскую Пакроўскую царкву пераўтварылі ў клуб. У час рэпрэсій два жыхары вёскі былі растраляны, больш за пяць сасланы.

У Другую сусветную вайну вёску акупавалі немцы. Яе старастам прызначылі Мікалая Мікалаевіча Ананіча, брыгадзіра калгаса «Прагрэс». Са жніўня 1941 па красавік 1942 г. у Цялякаве дзейнічала падпольная група (кіраўнік – Макар Данілавіч Шымановіч). З-за пагрозы выкрыцця падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. На франтах загінулі 38 жыхароў і ўраджэнцаў Цялякава.

У 1944–1970 гг. насельніцтва вёскі па-ранейшаму было прымацавана да калгаса «Прагрэс», у 1970–1978 гг. – да саўгаса імя Чырвоназнамённай Беларускай ваеннай акругі. Першым пасляваенным старшынёй калгаса «Прагрэс» быў Іван Адамавіч Пармон (па-вясковаму Парымон). Пазней калгас заняпаў. Пасля спынення дзейнасці згаданага саўгаса моладзь масава пацягнулася ў горад.

У 1978 г. да вёскі Цялякава былі далучаны пасёлкі Цялякава і Градка. На 1 студзеня 2000 г. паселішча складаў 101 двор, пражывалі 253 жыхары. Працавалі сельсавет, лясніцтва, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, фельчарска-акушэрскі пункт (на месцы знесенай каля 1954 г. царквы), аддзяленне сувязі, дзіцячы сад, крама.

У 2009 г. Цялякаўскі сельсавет ліквідаваны і вёска перайшла ў падпарадкаванне Уздзенскага сельсавета. У тым жа годзе сярэднюю школу пераўтварылі ў інтэрнат для хворых і састарэлых людзей.

Вёска мае свае гістарычныя могілкі, якія знаходзяцца ў межах былога пасёлка Градка і змяшчаюць надмагільныя пахаванні, пачынаючы з 1860-х гг. Найбольш прыкметная пліта знаходзіцца на магіле савецкіх

воінаў, што загінулі тут у 1941–1945 гг. Помнік загінулым землякам ёсць каля будынка бібліятэкі ў межах пасёлка Цялякава.

Звернемся да некаторых радаводаў жыхароў вёскі Цялякава (усе крыніцы, якія згадваюцца ў радаводах, прыведзены вышэй). У іх згадваюцца асноўныя імёны, даты і падзеі родавай гісторыі ад пачатку XVIII ст.

**Ананічы**. Адзін з самых старажытных родаў Цялякава і ваколіц. Першыя прадстаўнікі згадваюцца ў скарзе цялякаўскага аканома Яна Рымінскага на жаўнераў паручніка Эйсманта ў 1710 г. Сярод жыхароў мястэчка згаданы Грышка Ананіч; у ліку пакрыўджаных жыхароў суседняй вёскі Карпілаўка – Цімох, Есіп і Адам Ананічы. У 1736 г. частку гаспадаркі праз паноў Іваноўскіх страціў Фёдар Ананіч (месца жыхарства не пазначана): у яго забралі вала, карову, свінню, чатыры авечкі і пчаліную калоду. У гэтай скарзе таксама згаданы Верамей Ананіч з Карпілаўкі, якога ў 1746 г. Кацярына дэ Раес купіла ў Радзівілаў за 10 тыс. злотых (разам з сям'ёй і рухомасцю). У рахунковай кнізе Цялякаўскага двара за 1756–1765 гг. у ліку пазыкаатрымальнікаў згаданы Мацей, Сцяпан і Іван Ананічы. У 1766 г. сярод парафіян мястэчка згаданы: Іван, Цімох і Раман. У суседнім Стараселлі згаданы Сцяфан Ананіч і Хведар Ананіч. У Карпілаўцы ў гэты час жылі Якаў, Іван, Антон і Сілка Ананічы. У спісе сялян, якія выплачвалі грашовы падатак за права вырабу колаў, за 1778 г. згадваюцца Габрыэль Ананіч з Карпілаўкі, Васіль, Міхал і Янка Ананічы з Цялякава. У інвентары маёнтка Цялякаў за 1780 г. адносна мястэчка Цялякаў згадваюцца Міхалка Ананіч і яго верагодны пляменнік войт Янка Ананіч.

Распаўсюджанасць прозвішча ў рэгіёне сведчыць аб тым, што карані Ананічаў у межах маёнтка былі дастаткова глыбокімі і маглі пачынацца ў сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст. Верагодна, у мястэчка Цялякава Ананічы перасяліліся з вёсак Стараселле і Карпілаўка.

Адзначым дзве галіны роду Ананічаў:

<u>Цялякаўская галіна</u>. Гіпатэтычна агульным продкам з'яўляецца Грышка Ананіч, згаданы ў 1710 г. Магчыма, яго сынамі былі Іван і Якаў. Верагоднымі сынамі Івана былі: Цімох, Васіль, Міхал і Іван. Ад апошняга з названых маглі паходзіць Міхал і Хведар.

- *Васіля-Іванавічы*, нашчадкі Васіля Іванавіча (1730?–1814?), жыхара мястэчка Цялякаў, які меў двух сыноў: Івана і Сцяпана. Галіна перапынілася са смерцю абодвух каля 1825 г.
- *Міхала-Іванавічы–1-я*, нашчадкі Міхала Іванавіча (1735?–1796?), жыхара мястэчка Цялякаў, які меў трох сыноў: Дзям'яна, Змітрука і Янку. Ад праўнука Дзям'яна – Якіма (Яўхіма) Філімонавіча (1859 – пасля 1916) – пайшлі два адгалінаванні гэтай галіны роду (нашчадкі Мікалая Якімавіча (1889–?) – *Сірачкавы*, нашчадкі Аляксандра Якімавіча (1895–1948) – *Калатушчыкавы*). Яны маюць працяг і цяпер.

▪ *Міхала-Іванавічы–2-я*, нашчадкі Міхала Іванавіча (1750? – да 1795?), жыхара мястэчка Цялякаў, верагоднага пляменніка Міхала і Васіля Іванавічаў (гл. вышэй). Галіна згасла ў 1837 г. з адбыццём у рэкруты яго ўнука Васіля Хведаравіча.

▪ *Хведара-Іванавічы,* нашчадкі Хведара Іванавіча (1755?–1812?), жыхара мястэчка Цялякаў, верагоднага пляменніка Міхала і Васіля Іванавічаў (гл. вышэй). Галіна згасла каля 1840 г. са смерцю яго сына Герасіма.

▪ *Цімохавічы*, нашчадкі Цімоха А. (1720? – да 1795), жыхара мястэчка Цялякаў, верагоднага брата Міхала і Васіля Іванавічаў (гл. вышэй). З яго сыноў нашчадкаў у Цялякаве пакінуў толькі Янка (Іван; 1750?–1804), які ў 1780 г. выконваў абавязкі войта. Яго ўнук Якаў Сцяпанавіч А. (1838–?) жыў у вёсцы яшчэ ў 1864 г. Сляды гэтай сям'і губляюцца ў 1866–1869 гг.

▪ *Якубавічы*, нашчадкі Якава (Якуба) А. (1700? – да 1765), жыхара мястэчка Цялякаў, верагоднага сына Грышкі А. Яго сын Гаўрыла (Габрусь) меў сыноў Дзмітрыя (Змітрука), Пятра, Кліма і Івана. У Цялякаве застаўся толькі Змітрук (1769?–1830?), які пакінуў сына Міхала. Сляды гэтай сям'і губляюцца ў 1866–1869 гг.

Старасельская галіна. Бярэ свой пачатак ад Фёдара (Хведара) і Сцяфана Ананічаў, якія згадваюцца пад 1766 г. у суседніх дварах вёскі Стараселле. Гіпатэтычна Сцяпан з'яўляецца сынам Хведара. Ён пакінуў трох сыноў: Савасцея, Грыгора і Пархіма.

Пархім (1759?–1809) паміж 1795 і 1803 гг. пайшоў у прымы да Хадоссі Драган у Цялякаў. Ад яго адзінага сына Герасіма, каваля (1805?–1885), пайшло два адгалінаванні лініі – Іллюковы (ад Іллі Герасімавіча А., 1840–1882) і Мікалаевы (ад Мікалая Герасімавіча А., 1855–1931).

Ілля ў шлюбе з Тэкляй Дзям'янаўнай Шымановіч меў дзевяць дзяцей. Мікалай у шлюбах з Аленай Дзям'янаўнай Бурак і Юзэфай Ігнатаўнай Бакун – дзесяць дзяцей (ад Юзэфы – дзевяць).

У абедзвюх галінах былі кавалі. Нашчадкі Фёдара (Тодара) Ілліна А. (1873–1924) па-вясковаму называліся *Кавалянкамі*. Нашчадкі пісьменнага унтэр-афіцэра і вясковага цырульніка Мікалая Герасімавіча А. – *Булачнікамі* (з-за звычая яго жонкі Юзэфы пекчы па святах булкі і частаваць імі). Дзявятым з дзесяці яго дзяцей быў Мікалай Мікалаевіч А. (1901–1945), калгасны брыгадзір, удзельнік падпольнага і партызанскага руху ў гады ВАВ. Сёння працягваецца адно з адгалінаванняў Булачнікаў – нашчадкі пяці сыноў Івана Мікалаевіча А. (1904–1969).

**Мацкевічы**. Адзін з самых старажытных родаў Цялякава і ваколіц. Яго першы прадстаўнік згадваецца ў скарзе цялякаўскага аканома Яна Рымінскага на жаўнераў паручніка Эйсманта ў 1710 г. У рахунковай кнізе Цялякаўскага двара за 1756–1765 гг. у ліку пазыкаатрымальнікаў згаданы Аўхім Мацкевіч. У 1766 г. сярод парафіян мястэчка згаданы

Ігнат Мацкевіч і Якім Маскевіч. У спісе сялян, якія выплачвалі грашовы падатак за права вырабу колаў, за 1778 г. згадваецца Іахім Мацкевіч з Цялякава. У інвентары маёнтка Цялякаў за 1780 г. адносна мястэчка Цялякаў згадваюцца: Ігнат Мацкевіч з сынамі Грыгорам, Хведарам, Янкам і Грышкам, Васіль Мацкевіч з сынамі Якавам, Паўлюком і Ігнатам і Яўхім Мацкевіч з сынам Змітраком.

Адсутнасць прозвішча Мацкевіч у іншых паселішчах маёнтка Цялякава ў першай палове XVIII ст. указвае на тое, што ў мястэчка агульны продак Мацкевічаў мог перасяліцца з іншага рэгіёна прыкладна ў другой палове XVII ст. Сем'і Ігната і Яўхіма Мацкевічаў (гл. вышэй) адсутнічаюць у дакументах па мясцовасці часоў Расійскай імперыі. Таму ўвесь радавод Мацкевічаў пайшоў па лініі Васіля Мацкевіча і яго сыноў Паўла і Ігната (пасля Якава, перасяленага ў суседнюю Ялоўку ў 1800 г., мужчынскіх нашчадкаў не засталося).

Адзначым дзве галіны роду Мацкевічаў:

<u>1-я Цялякаўская галіна або Паўлюковы</u>. Вядзецца ад Паўла (Паўлюка) Васільевіча (1775–1817?), жыхара мястэчка, а затым сяла Цялякаў, які меў сыноў Сымона і Мацвея. У Сымона былі два сыны: Андрэй і Ігнат. У 1916 г. у ліку цялякаўскіх гаспадароў значацца: Ігнат, яго пляменнік Васіль Андрэевіч і сын Андрэй. Нашчадкі старэйшага сына Ігната Фёдара (1876–1950), па мянушцы *Глянц*, па-вясковаму называліся *Глянцамі* або *Зорухамі*. Галіна мае працяг і сёння.

<u>2-я Цялякаўская галіна або Ігнатавы</u>. Вядзецца ад Ігната Васільевіча (1780?–1856?), жыхара мястэчка, а затым сяла Цялякаў, які меў сыноў Бенядыкта (Венедыся) і Філімона (Талімона). Бенядыкт (1801?–1855?) перасяліўся ў Ялоўку пры ўзбуйненні гэтага населенага пункта паміж 1834 і 1850 гг. Яго сын Даніла апошні раз згадваецца пад 1864 г. Талімон (1806? – 1866/1869) меў сыноў Дамініка, Васіля і Андрэя. Радаводныя лініі кожнага з іх маюць працяг і сёння. У 1916 г. сярод цялякаўскіх гаспадароў значацца: Андрэй Талімонавіч, яго пляменнікі Аляксандр Дамінікавіч (заснавальнік лініі *Кухаравых*) і Лявонцій Васільевіч (заснавальнік лініі *Клэпсікавых*), сын Мікалай, пляменнік Лявонція Антон Фёдаравіч.

**Шымановічы**. Адзін з самых старажытных родаў Цялякава і ваколіц. Яго першы прадстаўнік – каваль Мірон з мястэчка Цялякава – згадваецца ў скарзе цялякаўскага аканома Яна Рымінскага на жаўнераў паручніка Эйсманта ў 1710 г. У 1736 г. Мірон Шымановіч (першая згадка прозвішча) адзначыўся сярод цялякаўскіх падданых, пакрыўджаных Іваноўскімі (ён не змог давезці жывой да маёнтка Іваноўскіх Чаркасы частку рыбы з цялякаўскай сажалкі і мусіў расплаціцца з панам сваёй авечкай). У 1766 г. сярод парафіян Цялякаўскай уніяцкай царквы згаданы Ян, Бенядыкт і Васіль. У рэестры плацельшчыкаў падатку за права вырабу колаў з

панскага лесу за 1778 г. згадваюцца Бенядыкт і Габрыэль Шымановічы з Рабінавага Барка, Янка Семяновіч і Пётр Сымановіч з Цялякава. У інвентары маёнтка Цялякаў за 1780 г. адносна мястэчка Цялякаў згадваюцца: Пятрусь Шмаковіч з сынамі Яўхімам і Грышкам, удава Шмановічава з сынамі Лукімам і Янкам, Янка Шымановіч з сынам Грыгорам.

Пачынальнікам роду Шымановічаў з мястэчка Цялякаў з'яўляецца каваль Мірон Шымановіч, перасялены туды на мяжы XVII–XVIII стст. Ад яго мяркуемых сыноў пайшлі тры галіны Шымановічаў – цялякаўская або Гаўрылавічы, цялякаўска-пашкоўшчынская або Венядыктавічы і пасецка-ялоўская або Васільевічы:

Цялякаўская галіна або Гаўрылавічы. Пайшла ад селяніна мястэчка Цялякаў Гаўрылы (Габрыяэля) (1710? – пасля 1778), чый сын Іван пакінуў двух сыноў: Рыгора і Сідара. Лінія Рыгора не прасочваецца пасля смерці яго сына Мацвея ў 1873 г. Лінія Сідара мае працяг і дагэтуль. Нашчадкі яго ўнука Кузьмы Фаміча (1846–1922) носяць родавую мянушку *Кузюмкавых*.

Цялякаўска-Пашкоўшчынская або Венядыктавічы. Пайшла ад селяніна мястэчка Цялякаў Венядыкта (Бенядыкта) (1715? – пасля 1778), чый сын Пётр пакінуў двух сыноў: Яўхіма і Грышку. У 1816 г. сям'я жыла ў вёсцы Пашкоўшчына, адкуль у 1823 г. Яўхім з сынамі Восіпам, Якавам і Андрэем перабраліся ў Ялоўку (галіна згасла ў 1871 г. са смерцю Андрэя). У 1824 г. у Цялякава з Пашкоўшчыны пераехалі сыны Грышкі – Дзям'ян і Максім. Апошняе, што вядома пра нашчадкаў Максіма, гэта згадка аб смерці ў 1875 г. яго малодшага сына Мацвея. Нашчадкі Дзям'яна Грыгор'евіча (1792–1874) займалі ў 1916 г. у Цялякаве большасць з двароў, населеных Шымановічамі (адзінаццаць з дванаццаці). Родапачынальнікамі асобных адгалінаванняў сталі пяць з шасці яго сыноў: Вікенцій (Вінцэсь; 1824?–1887), Дамінік (1829?–1909), Кандрат (1831?–1882), Андрэй (1833?–1905), Іван (1839?–1876). Лінія мае працяг і цяпер. У вёсцы захаваліся мянушкі для асобных галін роду. Так, нашчадкі малодшага сына Вікенція – Савы Вікенцьевіча (1862–1920) – вядомы як *Саўкі*. Нашчадкі яго пляменніка Данілы Макаравіча (1881–1957) як *Ціхабудкі*. Сярод прадстаўнікоў лініі можна адзначыць Мікалая Вікенцьевіча (1846–1913), члена царкоўнага папячыцельства. Праз пераход у прымы Аляксея Андрэевіча ў 1901 г. з'явілася адгалінаванне Шымановічаў у вёсцы Алёхаўка. Ужо ў савецкі перыяд, дзякуючы Мікалаю Кандратавічу (1872–1938), з'явілася адгалінаванне ў вёсцы Слабодка.

Пасецка-Ялоўская або Васільевічы. Пайшла ад селяніна мястэчка Цялякаў, а затым вёскі Пасека Гаўрылы (Габрыэля, Габруся) Васілёва (1743?–1815), чые сыны Павел (Паўлюк) і Ігнат перасяліліся ў вёску Ялоўка пры яе ўзбуйненні паміж 1834 і 1850 гг. Мужчынскіх нашчадкаў пакінуў толькі Ігнат (1808?–1882). Яго ўнук Дзям'ян Васільевіч пасля

1897 г. разам са сваёй сям'ёй знікае з дакументаў мясцовасці (верагодна, перасяліўся). У Ялоўцы на 1916 г. засталіся дзве сям'і Шымановічаў, гаспадарамі якіх адзначаны: Геранім Ігнатавіч і яго пляменнік Аляксандр Сцяпанавіч. Гэта лінія мае працяг і сёння.

На сённяшні дзень можна прыгадаць толькі два беларускія праекты, скіраваныя на комплекснае падсумаванне звестак рэгіянальнай гісторыі, – гісторыка-дакументальныя хронікі серыі «Памяць» і шматтомны энцыклапедычны даведнік «Гарады і вёскі». Але тэксты нататак пра населены пункт у іх пераважна складаюцца з пазначэння даты яго першага ўпамінання, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і маёмаснай прыналежнасці, згадак у перапісах (з колькасцю двароў і жыхароў), выбітных аб'ектаў і ўраджэнцаў.

Мы паспрабавалі зірнуць на гісторыю населенага пункта не толькі шляхам падачы звестак "гісторыі зверху", але і з пазіцыі ўдзелу ў ёй мясцовага насельніцтва.

Архіўныя крыніцы з фондаў НГАБ дастаткова поўна асвятляюць разнастайныя аспекты гісторыі вёскі Цялякава. Аднак існуюць і пэўныя прабелы, звязаныя з адсутнасцю ў архіве метрычных кніг (раней за 1792 г.) і спавядальных ведамасцяў Цялякаўскай царквы (амаль цалкам). Пэўныя цяжкасці складае адсутнасць на захоўванні асобнага фонду Цялякаўскай Пакроўскай царквы. Аднак дзякуючы інвентарам і рэвізскім сказкам розных гадоў, ускосным звесткам дакументаў, мы маем дастаткова патрэбнай інфармацыі.

Прыведзеныя ў даследаванні прыклады выкарыстання генеалагічных крыніц у рэгіянальным даследаванні падкрэсліваюць той факт, што генеалогія знаходзіцца на сутыку крыніцазнаўства і рэгіянальнай гісторыі. Так, з аднаго боку разглядаецца гісторыя паселішча з прадстаўленнем інфармацыі аб яго жыхарах. Аднак асноўным падмуркам працы з'яўляюцца крыніцы з усёй паўнатой іх інфармацыі. Калі крыніцазнаўства, перш за ўсё, занята вызначэннем інфармацыйнай каштоўнасці дакумента, то лакальная гісторыя даследуе тыя працэсы, якія на падставе яго можна назіраць. Генеалогія дапамагае звязаць абодва гэтыя кірункі адным аб'ектам – генеалагічнай крыніцай, суб'ектам жа выступаюць людзі – стваральнікі дакумента і тыя, хто быў у ім зафіксаваны.

## Крыніцы і літаратура

1. Акты Литовской метрики / собр. Ф. Н. Леонтович. – Т. 1. – Вып. 2. – 1499–1507. – Варшава : Типография Варшавского учебного округа, 1897. – 200+55 с.
2. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 36 : Акты Минского гродского суда. – Вильна : Тип. "Русский почин", 1912. – 501 с.

3. Вольф, Ю. Князья литовско-русские с конца XIV века. – Варшава, 1895. – 719 с.
4. Коган, В. М., Домбровский-Шалагин, В. И. Князь Рюрик и его потомки. Историко-генеалогический свод. – Санкт-Петербург : Паритет, 2004. – 688 с.
5. Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.): Документы и материалы. – Минск : изд-во БССР, 1959. – 479 с.
6. НАРБ. – Ф. 30 (Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне БССР). Воп. 2. Спр. 1487. – Спіс гаспадарак сяла Цялякава Цялякаўскага с/с Уздзенскага р-на Мінскай акругі са звесткамі па іх. 1925 г. – Арк. 137–138 адв.
7. НГАБ. – КМФ-18 (Метрыка ВКЛ). Воп. 1. Спр. 238. – Скарга зямяніна Жыгімонта Мікалаевіча Салагуба, уладальніка маёнтка Цялякаўскага, на Каспара Кунцавіча Сакаловіча, дзяржаўцу перавальскага, за нелегітымнае ўваходжанне ва ўладанне цяглымі людзьмі, парабкамі, ворывам і сенажацямі згаданага маёнтка, а таксама яго ігнараванне выкліка ў суд. 06.12.1550. – Арк. 409.
8. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 239. – Пастанова па судовай справе Мікалая і Жыгімонта Салагубаў, баяр гаспадарскіх, з панам Каспарам Кунцавічам Сакаловічам, дзяржаўцам перавальскім, з нагоды збіцця Ананкам, Мялеціем, Грыцькам і Міхалкам Прысынкавічамі, падданымі дзяржаўцы, Жыгімонта Мікалаевіча Салагуба ў доме старца Сцяпана ў маёнтку Цялякава. 11.12.1551. – Арк. 206 адв.–208 адв.
9. НГАБ. – Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). Воп. 14. Спр. 324. – Копія метрычнай кнігі аб хрышчаных, венчаных і памерлых Зенькавіцкай Праабражэнскай царквы (руск.). 1863 г. – Арк. 1075–1098.
10. НГАБ. – Ф. 160 (Ігуменскі павятовы суд). Воп. 1. Спр. 81. – Інвентар маёнтка Цялякава, складзены пры перадачы яго князямі Каралём і Геранімам Радзівіламі ў застаўнае карыстанне Станіславу Араноўскаму, суддзі гродскаму віленскаму, за 24 тысячы польскіх злотых, адпаведна ўмоў закладнага пагаднення іх бабулі Ганны з Сангушкаў Радзівіл са Станіславам дэ Раесам, старастам цэльскім. 24.04.1780. – Арк. 37–41.
11. НГАБ. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 259. – Пастанова Ігуменскага павятовага суда аб зацвярджэнні здзелкі аб куплі маёнтка Цялякава памешчыкам Канстанцінам Марцінавічам Гарцінгам. 30.12.1850–20.02.1851. – Арк. 2 адв.
12. НГАБ. – Ф. 325 (Мінская губернская земская ўправа). Воп. 2. Спр. 233. – Матэрыялы Усерасійскага сельскагаспадарчага перапісу па Мінскай губерні Ігуменскаму павету Цялякаўскай сельскай грамадзе. 1916 г. Арк. 16–18.
13. НГАБ. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). Воп. 9. Спр. 77. – Рэвізская сказка маёнтка Цялякава княжны Стэфаніі Дамінікавай Радзівіл. 05.08.1816. – Арк. 555–574.
14. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 210. – Рэвізская асноўная сказка маёнтка Цялякава княжны Стэфаніі Дамінікавай Радзівілаўны. 1811 г. Арк. 599–626.
15. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 560. – Рэвізская асноўная сказка маёнтка Цялякава калежскага райцы Льва Пятровіча графа Бэрлібург Сайн-Вітгенштэйна, спадкаемца княжны Стафаніі з кн. Радзівілаў графіні Вітгенштэйн (руск.). 1834 г. – Арк. 9–18, 291–329.

16. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 647. – Рэвізская сказка маёнтка Цялякава Канстанціна Марцінавіча Гарцінга. 28.12.1850. – Арк. 844–870.
17. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 1016. – Рэвізская сказка маёнтка Цялякава Канстанціна Марцінавіча Гарцінга. 01.05.1858. – Арк. 801–822.
18. НГАБ. – Ф. 694 (Радзівілы, князі). Воп. 4. Спр. 1811. – Дакументы аб эканамічным стане маёнткаў Цітавяны, Цінішкі, Цяцеравец, Цялякаў і інш. XVI ст. – 1810 г. – 472 арк.
19. НГАБ. – Ф. 1502 (Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт). Воп. 1. Спр. 9. – Рэестр парафіян Цялякаўскай уніяцкай царквы Найсвяцейшай Панны Марыі. 1766 г. – Арк. 143–144.
20. НГАБ. – Ф. 1595 (Мінская губернская прысутнасць). Воп. 2. Спр. 1596. – Справа аб выкупе сялянамі зямлі з маёнтка Цялякава памешчыка Канстанціна Марцінавіча Гарцінга. 1862 г. – 20.09.1916. – 264 арк.
21. НГАБ. – Ф. 1727 (Мінскі гродскі суд). Воп.1. Спр. 1. – Скарга Кацярыны Кунцаўны Дабрылеўскай, уласніцы маёнтка Цялякаў, на Пятра Трэску, слугу зямянкі Дароты Лаўрынаўны Унучкаўны, жонкі Мікалая Салагуба, за збіццё падданых і падпальванне дымоў 20 лютага гэтага ж года сумесна са Станіславам Агрэнскім,ураднікам Дабрылеўскай. 05.03.1600. – Арк. 266 адв.–267.
22. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 1. – Скарга Адама Салагуба, уласніка маёнтка Цялякаў на Пракопа Каршуновіча, Антона Марцілевіча, Сеньку і Івана Леньковічаў і іншых падданых ваяводы віленскага Крыштафа Радзівіла з сяла Возера маёнтка Вязынь, за збіццё і грабёж 3 траўня сваіх падданых Васіля Жуковіча, Федкі Будзясовіча, Ігната Даманцэвіча на мяжы ячанскіх і целякоўскіх грунтаў. 03.05.1600. – Арк. 391 адв.–392.
23. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. – Акт падпісання каралём Жыгімонтам ІІІ баніцыйнага ліста на выгнанне зямяніна Яна Мікалаевіча з ВКЛ 7 лютага наступнага 1618 г. за нявыплату 302 коп грошаў літоўскіх зямянцы Марыне Гузаўне, жонцы падсудка Адама Салагуба, за набыццё ў яе маёмасці ў маёнтку Цялякава і сяле Палом. 12.12.1617. – Арк. 646–647.
24. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. – Акт падпісання каралём Жыгімонтам ІІІ баніцыйнага ліста на выгнанне зямяніна Івана Савіча з ВКЛ за нявыплату 302 коп грошаў літоўскіх жонцы падсудка Адама Салагуба за набыццё ў яе маёмасці ў сяле Палом. 12.12.1617. – Арк. 647–647 адв.
25. НГАБ. – Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 7. – Скарга Яна Рымінскага, аканома маёнтка Цялякава, уласнасці Валадковічавай, пісаравай земскай менскай, на жаўнераў з атраду паручніка Эйсманта, што пражывалі ў сялянскіх дварах з 23 студзеня па 13 красавіка 1710 г. і прычынілі значную матэрыяльную шкоду іх гаспадарам. 27.06.1710. – Арк. 194 адв.–195 адв.
26. Памяць : Уздзенскі р-н : Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал. : Г.К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 654 с.
27. Lietuvos Metrika (1440–1498). Kniga Nr. 3/3 / Parenge L. Anużyte, A. Baliulis. – Vilnius : Žara, 1998. – 166 p.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 26.10.2022 г.

# Рэцэнзіі і водгукі




***Сцебурака, У., Сцебурака, А.*** *Сцебуракаў лёс : гісторыя роду. – Мінск : Кнігазбор, 2022. – 300 с. : [12] с. іл.*

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі дастаткова «наватарскіх» прац па генеалогіі канкрэтных родаў і сем’яў. Іх «наватарства» заключаецца, галоўным чынам, у часта індывідуалізаваных аўтарскіх падыходах да размяшчэння генеалагічнага матэрыялу, у стаўленні да кантэксту і апераванні ім, а таксама ў адносінах да шырыні і глыбіні крыніцавай базы, што перадусім выцякае з мэт даследавання і залежыць ад прафесіяналізму аўтара. За генеалагічныя даследаванні нярэдка бяруцца людзі без спецыяльнай адукацыі, што абумоўлівае чыста дылетанцкія памылкі і недакладнасці. Аднак асобныя даследчыцкія працы прыцягваюць куды большую цікавасць навукоўцаў, бо іх аўтары выкарыстоўваюць шматпланавыя крыніцы з розных месцаў, здатныя пабачыць інфармацыю паміж радкоў з дапамогай кантэксту, вылучаюць нявырашаныя гістарыяграфіяй праблемы і спрабуюць даць ім узважаную ацэнку.

Да ліку апошніх мы адносім цалкам нечаканае для сябе даследаванне братоў Усевалада і Анатоля Сцебуракаў, прысвечанае іх радаводу па бацькаўскай лініі з загадкавым прозвішчам, якое паходзіць з пасіянарнай для беларускай генеалогіі Вілейшчыны. Навуковая ступень кандыдата гістарычных навук, якую мае малодшы брат Анатоль, у спалучэнні з літаратурнымі здольнасцямі старэйшага Усевалада, пры падтрымцы куратара – іх бацькі Мікалая Анатольевіча Сцебуракі – зрабілі іх даследаванне па-сапраўднаму сур’ёзным і недругарадным, якое нельга пакідаць па-за ўвагай, бо гэта будзе па-просту недаравальна для беларускай генеалагічнай навукі.

Ужо пасля азнаямлення са зместам гэтай кнігі становіцца зразумелым, што яна можа быць цікавай і для аматараў, і для навукоўцаў. Першы раздзел зводзіцца да падсумавання вынікаў гістарычна-генеалагічнага даследавання, а таксама да ўспамінаў Мікалая Анатольевіча (1957 г.н.) і яго бацькі Анатоля Мікалаевіча (1926–2020) Сцебуракаў (с. 5–237). Другі раздзел уласна цікавіць навукоўцаў, бо ставіць праблемы, вырашэнне якіх з'яўляецца важнай часткай беларускага генеалагічнага дыскурсу (с. 238–294).

Канешне, аўтары маглі абмежавацца адным раздзелам – гістарычнай даведкай пра агульнае жыццё-быццё продкаў у XVIII–XIX стст., матэрыяламі з сямейнага архіва (фотаздымкамі, выявамі дакументаў і кніг, карцінамі мастака Кастуся Сцебуракі), вуснымі ўспамінамі сведкаў і генеалагічнай схемай. Прынамсі, кніга і ў такім выпадку атрымалася б, але мела б выключна навукова-папулярны характар і цікавіла б па большай частцы генеалогаў-аматараў, краязнаўцаў, культуролагаў, родных і блізкіх аўтараў, як і большая частка сучаснай генеалагічнай літаратуры. Так, праца змяшчае раздзелы: «У Вялікім Княстве і Расійскай імперыі», «У часы Першай сусветнай вайны», «Адноўленая Рэч Паспалітая», «Пачатак ІІ Сусветнай і першыя саветы (1939–1941)», «Нямецкая акупацыя», «Паваенныя гады і дарога ў Казахстан (1944–1952)», «У Сярэдняй Азіі», «Мой Казахстан».

Навуковая значнасць кнігі праяўляецца ў гістарычным нарысе са спасылкамі на крыніцы, архіўныя дакументы і літаратуру XVIII–XXI стст. (усяго 80 пазіцый).

У развагах аўтараў адносна вытокаў роду вылучаюцца тры асноўныя тэмы: 1) паходжанне прозвішча Сцебурака са мноствам яго варыяцый (найбольш раннія вядомыя прамыя продкі роду Пракоп і Іллюк з фамільнай формай Scebieraka згадваюцца ў рэестры парафіян Іжанскай парафіі Даўгінаўскага дэканата Ашмянскага павета ў вёсцы Пукалы за 1765 г.);

2) сувязь з прозвішчам продкаў і час узнікнення засценка Шчэбракі або Іжанка-Шчэберакі (першыя згадкі часткі «Шчэберакі» прыпадаюць на канец 1770-х гг., знікла гэтае паселішча ў канцы 1830-х гг., папярэдне засценак мог называцца Юдзкі; апрача гэтага, праводзяцца паралелі з вёскай Сцеберакі, размешчанай на ўсход ад першага паселішча, якая ўпершыню згадваецца ў інвентары Маркаўскага староства пад 1738 г.);

3) сацыяльны стан роду Сцебуракаў у XVIII ст. (верагоднасць канверсіі цяглых вяскоўцаў у лік засцянковых чыншавікоў).

Аўтары не спыняюцца толькі на гэтых праблемах і вядуць радавод Сцебуракаў з засценка Шчэберакі ў засценак Курнікі (на паўднёвы захад ад Іжы) і з яго ў фальварак Субачы, набыты ў 1875 г. Мікалаем Васільевічам Шчэберакам.

На жаль, даводзіцца канстатаваць, што гістарычная антрапаніміка Беларусі перажывае цяпер заняпад, нават нягледзячы на выданне навукова-асветніцкай кнігі В. П. Лемцюговай «Карані нашых прозвішчаў» [10]. Аўтары тэорый паходжання прозвішчаў будуюць іх на падставе якога заўгодна эмпірычнага матэрыялу, толькі не на даных уласна гістарычнай антрапанімікі. Так, варта пагадзіцца з аўтарамі кнігі, што адсутнасць дадатковых гістарычных крыніц не дазваляе даць дакументалізаваную ацэнку таго, што паўплывала на фарміраванне прозвішча Сцебурака. Аднак такі працэс для XVII–XVIII стст. немагчыма прасачыць у большасці выпадкаў. Там, дзе няма гістарычных крыніц, дапамагае метад гістарычнага параўнання, калі даследчык мусіць шукаць аналагічныя выпадкі ў падмацаванне сваёй тэорыі.

На сённяшні дзень нам не даводзілася сустракаць звестак аб тым, што прозвішча можа цалкам капіраваць сакральную ці іншую назву ўрочышча, як пра гэта пішуць аўтары кнігі, якія прапануюць «балцкую» гіпотэзу паходжання прозвішча ад назвы вёскі Сцебуракі (с. 256). Калі падобнае мае месца, то звычайна пры перасяленні і са зменай канчатку. Так, згаданы зямянскі засценак Ходні (с. 247) сапраўды даў прозвішча перасяленцам у вёску Новы Двор Мінскага павета ў 1832 г. – Хадзінскі [11, арк. 388 адв.]. Да таго ж, калі латгалізм Стабурагас і ў стане сфарміраваць форму Сцебуракі, надаўшы яе жыхарам аднайменнага ўрочышча, то чаму на сёння невядома нічога аналагічнага і настолькі адназначнага. Такія прозвішчы, як Горац, Курган, Капец, не падыходзяць пад правіла, бо маюць аналагавыя варыянты паходжання (адпаведна з населенага пункта Горы ці Горкі, ад імя Кур’ян/Kurhan/Kurjan, ад назвы птушкі кабец).

Больш верагодная ўмоўна «польская» гіпотэза паходжання прозвішча ад назвы прылады хатняга ўжытку. Яна цалкам падыходзіць пад правіла антрапанімічнай аналогіі, паколькі беларуская антрапанімічная палітра поўніцца формамі, накшталт Бочка, Дзежка, Кадушка, Кульбака, Лагун, Латушка, Лыжка, Цэбар і г. д. [1, с. 59, 129, 167, 229, 241, 247, 259, 441]. На нашу думку, Цэберачка з адыходзячымі формамі Чэберачка, Шчэберачка і іншымі з’яўляецца памяншальна-ласкавым варыянтам мянушкі Цэбар ці Цабарок (ceberak) (с. 240), які часта замацоўваўся за дзецьмі. Прысутнасць у беларускім антрапаніміконе такіх прозвішчаў можна звязваць як з эксклюзіўнай уласнасцю адпаведных прадметаў у карыстанні сям’і, у параўнанні з суседзямі, так і са знешнімі якасцямі першых носьбітаў мянушак. У беларускай анамастыцы маецца нямала іншых формаў, якія пры жаданні можна было б прывязаць да гэтага прозвішча.

У праведзеным аўтарамі даследаванні, на нашу думку, даволі добра прапрацаваны выяўленыя гістарычныя крыніцы, што дазваляе накі-

роўваць парадыгму назіранняў у бок кантэкстуалізацыі знойдзенага. Безумоўна, можна чакаць новых адкрыццяў, але хацелася б акрэсліць сваё бачанне ў святле прадстаўленага аўтарамі апублікаванага матэрыялу. Перыяды пасля войнаў 1654–1667 і 1700–1721 гг. характарызаваліся наяўнасцю сацыяльнага ліфта для працавітых, кемлівых і энэргічных людзей, якія маглі займаць апусцелыя зямянскія і баярскія валокі, нават калі яны належалі да іншых катэгорый сялянства. Пры гэтым і памешчыкі пераводзілі новапасяленцаў пушчанскага краю на чынш, чым аблягчалі ім умовы жыцця. Хрысціянскія прозвішчы ўзнікалі ў гэтым рэгіёне, як правіла, у другой палове XVI – першай палове XVII ст. Варта дапусціць, што і вёска Сцебуракі ўжо была заснавана, калі не носьбітамі прозвішча, то носьбітамі родавай мянушкі. Гэта значыць, назва населенага пункта адназначна адсылае нас да сваіх заснавальнікаў. І варта адзначыць, што ў якім бы статусе не знаходзіліся тады Сцебуракі, мы далёкія ад назіранняў Л. Дацэвіча, на якога спасылаюцца аўтары (с. 240), аб тым, што назва населенага пункта не магла ўтварыцца ад прозвішча сялян. Назва засценка Іжа-Шчабяракі, дзе першыя прадстаўнікі роду згадваюцца ў 1765 г., сапраўды можа сведчыць пра сацыяльны ліфт і пераход верагодных сялян з вёскі Сцебуракі на правы асаднікаў-арандатараў у аднайменным засценку (с. 255–256).

Аднак даводзіцца прызнаваць, што падобная сацыяльная мабільнасць была хутчэй выключэннем з правілаў. Часцей, якімі не былі б разбуральнымі войны, на надзелах, прадугледжаных для землекарыстання баяраў і зямянаў, сяліліся адпаведныя катэгорыі [2–9]. Лягчэй прапанаваць менш сацыёцэнтрычную версію аб тым, што населены пункт Сцебуракі (вядомы з інвентара Маркаўскага староства за 1738 г.) заснаваны прыкладна ў другой палове XVII ст. носьбітамі родавай мянушкі ці прозвішча, якія або не затрымаліся там надоўга, або не замацавалі мянушку ў якасці прозвішча для сваіх нашчадкаў. Актуалізуецца і трэці варыянт з беларусізаванай формай назвы мясцовага сакральнага ўрочышча, умоўнага Стабурагаса. У гэтым выпадку тапонім Сцебуракі варта лічыць выпадковым семантычным супадзеннем з прозвішчам Шчэберака-Сцебурака. Менавіта гэтага варыянта прытрымліваецца аўтар дадзенай рэцэнзіі.

Падсумоўваючы нашы развагі, варта выказаць аўтарам, ідэйным натхняльнікам і выдаўцам кнігі вялікую падзяку за прыклады ў афармленні знойдзенага генеалагічнага матэрыялу і імкненне яго навукова прааналізаваць. Гэта, безумоўна, выдатнае даследаванне, якое прымушае задумацца аб слушнасці кампаратыўнага падыходу ў справе прадстаўлення вынікаў генеалагічнага даследавання.

Праца будзе карысна даследчыкам у сферы генеалогіі, архівазнаўства, вуснай і рэгіянальнай гісторыі, мікрагісторыі, антрапанімікі.

## Крыніцы і літаратура


1. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – Ч. 2. – 508 с.
2. Глінскі, Я. С. Зямянская супольнасць вёсак Вужа і Пракакаўшчына Слуцкага княства ў другой палове XVII – першай трэці XIX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 15. – Мінск : НГАБ, 2017. – С. 197–233.
3. Глінскі, Я. С. Зямянская супольнасць Капыльскага княства ў XVII–XVIII стст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 16. – Мінск : НГАБ, 2018. – С. 198–225.
4. Глінскі, Я. С. Баяры Печуранскага войтаўства ў XVIII – першай трэці XIX ст. // Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.) / Рэдкал.: В. І. Кураш (старшыня) і інш. – Мінск : БелНДІДАС, 2019. – С. 75–84.
5. Глінскі, Я. С. Зямяне маёнтка Магільна Новагародскага ваяводства ў XVI–XVIII стагоддзях // Архівы і справаводства. – 2019. – № 5. – С. 135–141.
6. Глінскі, Я. С. Уваходжанне баяраў і мяшчанаў у зямянскую супольнасць маёнтка Магільна Наваградскага ваяводства ў XVII–XVIII стст. // Герольд Litherland. – № 21. – Горадня; Мінск, 2019. – С. 24–34.
7. Глінскі, Я. С. Матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі як крыніца па гісторыі зямянскага насельніцтва маёнтка Грэск Новагародскага ваяводства ў канцы XVI–XVIII стст. // Архівы і справаводства. – 2020. – № 5. –С. 73–81.
8. Глінскі, Я. С. Мядовая даніна як баярская павіннасць: прыклад маёнтка Старыца Капыльскага княства ў XVII–XVIII стст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 18. – Мінск : НГАБ, 2020. – С. 196–210.
9. Глінскі, Я. С. Зямяне маёнткаў Урэчча, Новы Двор і Яромічы Слуцкага княства ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.: фарміраванне супольнасці і генеалагічная свядомасць // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 19. – Мінск : НГАБ, 2021. – С. 250–272.
10. Лемтюгова, В. П., Гапоненко, И. О. Корни наших фамилий = Карані нашых прозвішчаў. – Минск : Издательский дом “Звязда”, 2018. – 672 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). Воп. 9. Спр. 113. Арк. 388–402. – Рэвізская сказка маёнтка Новы Двор Мінскага павета Мінскай губерні, уласнасці Яна Любанскага, за 27.04.1834 г.


*В. В. Урублеўскі*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.05.2022




*Umysł miał jasny i serce miłujące: Edward Woyniłłowicz w dokumentach i materiałach / wybór, opracowanie, wstęp i przypisy:* ***R. Jurkowski****. – Olsztyn: Wydawnictwo Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego, 2021. – 744 s. – (Źródła do dziejów Europy Środkowo-Wschodniej / Pod red. R. Jurkowskiego. – T. II)*[1]*.*

Эдвард Вайніловіч (1847–1928) не патрабуе асобнага прадстаўлення ў Беларусі. Актыўны грамадскі дзеяч апошняй трэці XIX – першай трэці XX ст. і фундатар Чырвонага касцёла ў Мінску ўжо даўно стаў “сваім” у айчыннай (і не толькі) гістарыяграфіі. Прычым настолькі, што Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі арганізоўвае цыкл рэгіяльных канферэнцый, прысвечаных яму, а памятная дошка з яго радаводным дрэвам доўгі час знаходзілася ў сталай экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (у тэматычнай зале, прысвечанай беларускай геральдыцы). Працэс беатыфікацыі Э. Вайніловіча, ініцыяваны парафіяй Чырвонага касцёла (альбо касцёла Святых Сымона і Алены) і распачаты ў 2016 г. Папам Рымскім Францішкам, не толькі павялічвае гэтую цікавасць, але і сам з’яўляецца чарговым імпульсам да ўзмацнення “вайніловічазнаўства”. Таму выхад зборніка гістарычных крыніц, звязаных з выбітным дзеячам мінуўшчыны Беларусі, выглядае цалкам заканамерным. Ён быў выдадзены ў мінулым годзе ў Польшчы пад назвай «Розум меў светлы і сэрца з любоўю: Эдвард Вайніловіч у дакументах і матэрыялах».

Трэба адразу сказаць, што гэта далёка не першая прысвечаная Э. Вайніловічу кніга за апошнія гады. У 2007 г. быў выдадзены пераклад (у скарачэнні) першай часткі яго ўспамінаў (пробашчам парафіі Чырвонага касцёла Уладзіславам Завальнюком) [1]. У 2015 г. выйшаў яшчэ адзін пераклад – манаграфіі Гізэлі Хмялеўскай «Церні крэсаў» [7], арыгінал якой з’явіўся ў 2010 г. У 2016 г. у Польшчы апублікавана другая частка ўспамінаў Э. Вайніловіча [8], якой так не хапала доўгія гады (нагадаем, першая частка выйшла яшчэ ў 1931 г.). Гэта адразу паказвае, наколькі вялікае зацікаўленне выклікае яго постаць у грамадстве і наколькі лагічным з’яўляецца рашэнне пра складанне і выданне ніжэйпрадстаўле-

[1] За карысныя заўвагі і звесткі, выкарыстаныя пры напісанні гэтай рэцэнзіі, выказваю вялікую падзяку **Юрыю Снапкоўскаму**.

нага зборніка. Яго ўкладальнікам выступіў **Роман Юркоўскі** – доктар гістарычных навук (пол. – доктар габілітаваны), тытулярны прафесар Інстытута гісторыі Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта (г. Ольштын, Польшча), кіраўнік кафедры ўсеагульнай гісторыі. Да выхаду зборніка яго аўтарству ўжо належала некалькі навуковых публікацый, прысвечаных Э. Вайніловічу і яго дакументальнай спадчыне. Таму першае, што трэба адзначыць у дадзенай рэцэнзіі, гэта тое, што кваліфікацыя ўкладальніка пытанняў не выклікае – на сённяшні дзень гэта адзін з самых вядомых (калі не самы вядомы) “вайніловічазнаўцаў”.

Зборнік выйшаў у серыі «Крыніцы па гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы» як другі яе том (першы выйшаў у 2011 г.). Р. Юркоўскі з’яўляецца як укладальнікам першага тома, так і рэдактарам усёй серыі.

Мэты зборніка сфармуляваны ўкладальнікам наступным чынам: *«Па-першае, сабраць у адным томе рассеяныя матэрыялы, якія тычацца Э. Вайніловіча, і падаць іх Чытачу ў апрацаванай навукова і археаграфічна форме. Па-другое, азнаёміць Чытача, будучага даследчыка з крыніцамі, невядомымі да цяперашняга часу альбо вядомымі толькі фрагментарна. <…> Апрача гэтага, для мяне было важным паказаць постаць Э. Вайніловіча перш за ўсё на падставе дзвюх катэгорый крыніц. Першая – гэта пісьмовыя крыніцы, створаныя ім самім. <…> Другая катэгорыя матэрыялаў – гэта думкі, погляды і меркаванні іншых людзей пра яго, напісаныя тымі, хто яго ведаў, з ім працаваў, цаніў і шанаваў»* (с. 10). У адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і варта ацаніць дадзеную кнігу – з пункту гледжання паўнаты пададзеных матэрыялаў, узроўню навуковай апрацоўкі, а таксама рэпрэзентатыўнасці кожнай з «катэгорый» крыніц.

У «Спісе дакументаў» (с. 703–712) указана, што ўсяго ў зборнік уключаны тэксты 182 крыніц, але ў рэчаіснасці іх больш, бо некаторыя з пазіцый з’яўляюцца не «дакументамі», а блокамі, што ўтрымліваюць адразу некалькі тэкстаў, звязаных паміж сабой тэматычнай і відавой блізкасцю. Напрыклад, пад № 133 змешчана пазіцыя «Некралогі і паведамленні пра жалобныя імшы пасля смерці Эдварда Вайніловіча», дзе апублікаваны тэксты 18 некралогаў, надрукаваных у розных перыядычных выданнях у 1928–1930 гг. (с. 449–457). Храналагічна дакументы ахопліваюць увесь перыяд жыцця Э. Вайніловіча і нават шырэй – ад нараджэння (дакумент № 1: запіс аб хрышчэнні ў метрычнай кнізе Мінскага кафедральнага касцёла за 1847 г.) да пасмяротных рэляцый, самая позняя з якіх выйшла з друку ў 1974 г. (дакумент № 166: урывак з успамінаў Адама Грымалы-Сядлецкага). У адпаведнасці з тэматычным насычэннем усе дакументы згрупаваны ў 5 радзелаў:

I) «Жыццё і дзейнасць 1847–1928», дакументы №№ 1–132, згрупаваныя ў сваю чаргу ў 10 падраздзелаў («Асабістыя і сямейныя дакумен-

ты», «Сямейныя ўладанні», «Лісты да розных асоб», «Касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску» і інш.);

II) «Пра Эдварда Вайніловіча пасля яго смерці (1928–1931 гады)», дакументы №№ 133–155;

III) «Пра Эдварда Вайніловіча і яго мемуары, пасля выхаду I часткі *Успамінаў 1847–1928*, 1931–1935 гады», дакументы №№ 156–164;

IV) «Эдвард Вайніловіч у мемуарыстыцы», дакументы №№ 165–181;

V) «Першая друкаваная біяграфія Эдварда Вайніловіча, 1938 год», дакумент № 182.

Змешчаныя ў зборніку матэрыялы выразна сведчаць, што ў першую чаргу ўкладальнік імкнуўся менавіта сабраць *«рассеяныя матэрыялы»*, бо большая частка дакументаў – гэта разнастайныя артыкулы ў перыядычнай прэсе і вузка спецыялізаваных зборніках, а таксама ўрыўкі з больш аб’ёмных мемуарных твораў. Рукапісныя крыніцы прадстаўлены па большай частцы эпісталярнай спадчынай Э. Вайніловіча, якая захоўваецца ў цэлым шэрагу сховішчаў розных краін – Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве (г. Вільнюс), Нацыянальнай бібліятэцы (г. Варшава), Ягелонскай бібліятэцы (г. Кракаў) і інш. Некаторыя апублікаваныя творы эпісталярыі захоўваюцца ў сямейных архівах, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асоб. Сярод апублікаваных архіўных матэрыялаў неабходна згадаць, безумоўна, што чатыры дакументы паходзяць са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі – №№ 1, 3, 5 і 128: вышэйзгаданы запіс аб хрышчэнні, тастамент бацькі Э. Вайніловіча Адама ад 1874 г., фармулярны спіс аб службе Э. Вайніловіча ад 1904 г. і інвентар касцёла Святых Сымона і Алены ад 1911 г. Падобная “міжнароднасць” апублікаваных рукапісных дакументаў (а тут трэба дадаць, што яшчэ некалькі з іх паходзяць з фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Санкт-Пецярбургу) указвае на шырокі маштаб і высокую якасць праведзенага ўкладальнікам эўрыстычнага даследавання.

Беларускаму даследчыку асабліва варта звярнуць увагу на раздзел IV. У ім надрукаваны, а значыць, уведзены ў навуковы ўжытак фрагменты важных рукапісных мемуараў дзеячаў дарэвалюцыйнай Беларусі і міжваеннай Польшчы. Напрыклад, успамінаў Зыгмунта Даманскага з рукапіснага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве (с. 581–594), дзённіка Міхаіла-Станіслава Касакоўскага з Архіва Польскай акадэміі навук у Варшаве (с. 604–606), успамінаў Мечыслава Пароўскага за 1904–1918 гг. з Нацыянальнага інстытута імя Асалінскіх ва Уроцлаве (с. 614–621). Усё гэта мае вялікае значэнне як для развіцця эга-крыніцазнаўства ў цэлым, так і для ўвядзення ў навуковы ўжытак новых цікавых (нават выключных!) крыніц па гісторыі Беларусі першай трэці XX ст. Напрыклад, мемуары М. Пароўскага вартыя, без аніякіх сумневаў, публікацыі ў поўным аб’ёме асобным выданнем з добрым навукова-даведачным апаратам.

Усе тэксты апублікаваны на мове арыгіналаў – польскай і рускай. Паколькі кніга выдадзена ў Польшчы і прызначаецца ў першую чаргу для польскага чытача, пасля рускамоўных тэкстаў прыведзены іх пераклад на польскую мову.

Што тычыцца навуковай апрацоўкі ўключаных у зборнік матэрыялаў, то тут таксама неабходна адзначыць яе высокі ўзровень. Навукова-даведачны апарат складаецца з наступных элементаў:

1) аб'ёмны «Уступ» (с. 7–21), у якім падрабязна тлумачацца перадумовы і мэты выдання, прынцыпы адбору матэрыялаў і структуравання ўсёй кнігі, прыводзяцца правілы, якімі кіраваўся ўкладальнік пры археаграфічнай апрацоўцы дакументаў, а таксама падаецца невялікі біяграфічны нарыс Э. Вайніловіча і выказваюцца падзякі асобам, якія дапамагалі ў падрыхтоўцы кнігі (сярод іх прыемна бачыць прозвішчы беларускіх даследчыкаў – Уладзіміра Дзянісава, Аляксандра Смаленчука, Юрыя Снапкоўскага і інш.);

2) уводныя нататкі да ўсіх раздзелаў, якія, як слушна сцвярджае ўкладальнік, *«характарызуюць змешчаныя ў іх матэрыялы з пункту гледжання іх колькасці, рэпрэзентатыўнасці, тэматыкі, а таксама ўкладання ў асобных падраздзелах»* (с. 16); тут жа прыводзіцца аргументацыя на карысць змяшчэння ў зборнік менавіта гэтых матэрыялаў;

3) падрадковыя каментарыі, куды вынесены звесткі пра згаданых асоб, геаграфічныя аб'екты, падзеі, друкаваныя выданні, дадзены тлумачэнні спецыфічнай тэрміналогіі, а таксама змешчаны спасылкі на іншыя крыніцы і часткі тэксту, уключаныя ў зборнік; такіх спасылак у кнізе маецца 1767, што варта прызнаць сярэднім узроўнем для больш чым 700 старонак, аднак сам укладальнік ва «Уступе» зрабіў агаворку, што стараўся не перагружаць гэтую частку навукова-даведачнага апарату з мэтай эканоміі аб'ёму кнігі і захавання перавагі ўласна тэксту крыніц над тэкстам каментарыяў;

4) вышэйзгаданы спіс апублікаваных дакументаў;

5) асабовы і геаграфічны паказальнікі, прычым дастаткова падрабязныя, куды вынесены, напрыклад, імёны не толькі згаданых у тэкстах крыніц асоб, але і аўтараў асобных публікацый, а таксама іх псеўданімы і крыптонімы.

У цэлым навукова-даведачны апарат варта прызнаць грунтоўным і высакаякасным. Ён істотна дапамагае ўспрымаць апублікаваныя дакументы, "уключае" іх у кантэкст як усёй эпохі, так і канкрэтных падзей. Спіс апублікаваных дакументаў і паказальнікі дазваляюць лепей арыентавацца ў прыведзеным матэрыяле і ў цэлым карыстацца ўсёй кнігай, што вельмі немалаважна для зборніка дакументаў, тым больш такога аб'ёмнага.

Што тычыцца рэпрэзентатыўнасці прадстаўленых у зборніку дакументаў, то варта канстатаваць, што ўкладальніку ўдалася і гэтая частка працы. У кнізе прысутнічае шырокае кола розных іх відаў. Тут мы бачым і эпісталярыю (лісты і тэлеграмы), і публіцыстычныя творы Э. Вайніловіча, і тэксты яго публічных выступленняў, і звароты да афіцыйных улад (мемарыялы), і мемуары яго і пра яго. Гэта прыносіць свой плён: з упэўненасцю можна канстатаваць, што асоба Э. Вайніловіча ў апублікаваных дакументах раскрыта ва ўсёй сваёй шматграннасці. Тут прадстаўлена яго грамадска-палітычная дзейнасць, у першую чаргу, менавіта як дзеяча мясцовых (беларускіх) арганізацый гаспадарчага і культурніцкага (у шырокім сэнсе) кірункаў, а таксама, хоць і ў меншай ступені, як члена Дзяржаўнай Думы Расійскай імперыі, як буйнога памешчыка і як эмігранта, які страціў свой маёнтак у выніку войн і рэвалюцый, але не страціў свайго грамадскага аўтарытэту. Пра яго ролю ў грамадскім жыцці Мінска і ўсёй Мінскай губерні ўкладальнік "распавядае" галасамі сучаснікаў Э. Вайніловіча, таму ў кнізе ў вялікай колькасці прадстаўлены менавіта некралогі і водгукі на выданне першай часткі яго ўспамінаў. Такія крыніцы нярэдка застаюцца па-за полем увагі ўкладальнікаў зборнікаў дакументаў, хаця менавіта яны нясуць нярэдка каштоўныя для гісторыка сведчанні сучаснікаў.

Аднак разам з усімі станоўчымі рысамі зборніка, варта адзначыць некаторыя хібы, дапушчаныя пры яго ўкладанні. Па-першае, у кнігу не ўключаны запіс у дзённіку мінскага губернатара Валерыя Чарыкава пра маладога (30-гадовага) Э. Вайніловіча, хаця ён ужо ўведзены ў навуковы ўжытак і вядомы ўкладальніку [6, с. 57]. Магчыма, укладальнік не прыняў да ўвагі гэтую крыніцу праз яе лаканічнасць, але, як здаецца, сведчанне губернатара В. Чарыкава цікавае і ў пэўным сэнсе ўнікальнае, бо гэта ледзь не самая ранняя згадка ў крыніцах асабістага паходжання пра асобу Э. Вайніловіча. Калі і не друкаваць яе, то ўкладальнік мог бы хоць згадаць пра факт яе існавання ва ўводных нататках да адпаведнага раздзела (№ IV). Варта нагадаць, у сваім дарожным дзённіку за 1878 г. мінскі губернатар В. Чарыкаў піша, што ў Слуцку сустрэўся з памешчыкам Слуцкага павета Эдуардам Адамавічам Вайніловічам, якога ахарактарызаваў наступным чынам: *«Асоба, здаецца, добрая, мяркуючы па водгуку пра яго тых, якія з ім знаёмыя»*. Чым не выдатнае сведчанне сучасніка?

Па-другое, у навукова-даведачным апараце (каментарыях) маюцца фактычныя памылкі і некаторыя недакладнасці. Напрыклад, на с. 103 у спасылцы 298 браты Леан і Адам Даманскія памылкова названы сынамі Зянона Даманскага, хаця на самой справе яны былі сынамі Міхала-Брунона Віктарынавіча Даманскага, Зянон жа быў сынам Леана, а не бацькам [2, с. 90–91]. На с. 139 у спасылцы 452 памылкова пазна-

чаны год нараджэння (1830) стрыечнай сястры Э. Вайніловіча – Эміліі Тадэвушаўны Даманскай (народжанай Вайніловіч), якая, на самой справе, нарадзілася толькі ў 1848 г. (яе бацькі ажаніліся ў 1835 г. [4, арк. 204 адв.], і яна ніяк не магла нарадзіцца ў 1830 г.). Адпаведна, шлюб самой Эміліі таксама не мог адбыцца *«каля 1850 г.»* – як вынікае з архіўных крыніц, ён адбыўся не раней за кастрычнік 1861 г., бо ў фармулярным спісе аб службе яе бацькі (слуцкага павятовага маршалка) за гэты час яна фігуруе яшчэ як незамужняя [3, арк. 15–18].

На с. 620 у біяграме Міхаіла Бурнашова (спасылка 1533) укладальнік беспадстаўна сумняецца ў праўдападобнасці мемуарных звестак пра тое, што падчас нямецкай акупацыі ў 1918 г. Бурнашоў мог выконваць абавязкі мінскага губернскага маршалка. На самой справе, дэкрэт ЦВК і СНК РСФСР ад 10 лістапада 1917 г. аб скасаванні пасад губернскіх і павятовых маршалкаў закрануў Мінскую губерню не адразу. Дваране, у першую чаргу, памешчыкі Мінскай губерні не прызналі пераход улады да ўрада бальшавікоў, таму працягвалі дзейнасць сваіх органаў самакіравання, а пасады губернскага і павятовых маршалкаў існавалі ў Мінскай губерні да восені 1918 г. (пакуль не вярнуліся бальшавікі). Хаця па ўсёй Расіі пасады маршалкаў нібыта перасталі існаваць у 1917 г. Дакументальныя сведчанні аб інстытуцыянальнай дзейнасці дваранскай супольнасці, у тым ліку існаванні пасад маршалкаў, у Мінскай губерні ў 1917–1918 гг. маюцца ў фондзе Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) «Канцылярыя мінскага губернскага маршалка» (ф. 320). Па ўсёй верагоднасці, укладальнік проста не паспеў азнаёміцца з імі падчас сваіх прыездаў у Мінск.

Па-трэцяе, у кнізе няма агульнага спіса скарачэнняў і абрэвіятур, што асабліва істотна для такога аб'ёмнага выдання, а абрэвіятуры выкарыстоўваюцца адвольна без іх расшыфроўкі. Напрыклад, на с. 98 у спасылцы 268 двойчы сустракаецца абрэвіятура «ZCZW». Чытач, незнаёмы блізка з прадметам, наўрад ці зразумее, што гаворка ідзе пра «Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich» («Цывільны ўрад усходніх зямель»). Ва ўжыванні абрэвіятур таксама няма ўніфікацыі і паслядоўнасці. Напрыклад, у тым жа самым месцы (с. 98, спасылка 268), нават у адным сказе, адначасова ўжываюцца «Rada Polska Ziemi Mińskiej» і «RPZM». Назва пэўнай установы (Мінскага сельскагаспадарчага таварыства) на адной і той жа старонцы (с. 98) падаецца то абрэвіятурай («MTR» – спасылка 269), то цалкам («Mińskie Towarzystwo Rolnicze» – спасылка 271).

Аднак усе згаданыя хібы не могуць, безумоўна, панізіць агульны высокі ўзровень падрыхтоўкі зборніка. Яго выданне робіць каштоўны ўнёсак ва ўмацаванне факталагічнай базы не толькі "вайніловічазнаўства", але і ў цэлым у польскую і айчынную гістарыяграфію гісторыі Беларусі апошняга перыяду Расійскай імперыі і першага дзесяцігоддзя пасля яе

падзення. За гэта хацелася б выказаць Р. Юркоўскаму вялікую падзяку. У беларускай гістарычнай навуцы зборнік робіць крок наперад, але, безумоўна, не ставіць кропку ў даследаваннях біяграфіі Э. Вайніловіча. У архіўных сховішчах знаходзіцца яшчэ вялікая колькасць дакументаў, якія ў зборнік не трапілі (хаця, безумоўна, вядомыя Р. Юркоўскаму), напрыклад, прашэнне Э. Вайніловіча мінскаму дэкану аб гатоўнасці прафінансаваць пабудову Чырвонага касцёла, пададзенае ў 1904 г. [5, арк. 5–5 адв.]. Апрача гэтага, усё яшчэ з'яўляецца актуальным паўнавартаснае навуковае выданне перакладу абедзвюх частак яго мемуараў. Тым больш, што адпаведныя працы вядуцца, напрыклад, непасрэдна ў цяперашні час у Польшчы рыхтуецца, таксама з удзелам Р. Юркоўскага, новае – навуковае і поўнае – выданне згаданых мемуараў. З улікам таго, якую вялікую ўвагу прыцягвае ў грамадстве постаць Э. Вайніловіча, варта спадзявацца, што ў недалёкім часе мы ўбачым новыя дасягненні ў даследаваннях яго спадчыны.

## Крыніцы і літаратура


1. Войнилович, Э. Воспоминания / пер. с пол. В. Завальнюка. – Минск : Римско-католическая парафия св. Симона и Елены, 2007. – 379 с. : ил.
2. Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 5. Д / Я. С. Глінскі [і інш.] ; навук. рэд. А. Рахуба. – Мінск : Беларусь, 2018. – 847 с. : [16] л. іл.
3. НГАБ. – Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). Воп. 3. Спр. 85. – Справа аб службе розных асоб. – 10.07.1836–02.12.1867. – 55 арк.
4. НГАБ. – Ф. 937 (Мінская рымска-каталіцкая кансісторыя). Воп. 4. Спр. 127. – Копіі метрычных кніг Уздзенскага касцёла аб народжаных і пабраных шлюбам за 1827–1848 гг., аб памерлых за 1827–1831, 1833–1848 гг. (польск.). – 338 арк.
5. НГАБ. – Ф. 1781 (Магілёўская рымска-каталіцкая духоўная кансісторыя). Воп. 5. Спр. 114. – Справа пра пабудову ў г. Мінску новага каменнага касцёла. – 11.05.1905–30.11.1916. – 77 арк.
6. Снапкоўскі, Ю. М. Мінскі губернатар Валерый Чарыкаў і яго акружэнне ў святле дакументаў фамільнага архіва Чарыкавых // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 5. – С. 49–58.
7. Хмялеўская, Г. Церні Крэсаў: аповесць пра Эдварда Вайніловіча і яго сям'ю: пераклад з пол. мовы. – Мінск : Віктар Хурсік, 2015. – 372, [1] с., [14] л. іл.
8. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia 1847–1928. – Cz. 2. – Warszawa ; Szczęsne : Klinika Języka Lucyna Aninowska-Maciejewska, 2016. – 339, [2] s. : il.


*Д. Ч. Матвейчык*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.09.2022

# In memoriam

*Д. Ч. Матвейчык*

## Памяці Вялікага Гісторыка

### Адам Іосіфавіч Мальдзіс (07.08.1932–03.01.2022)



У беларускай гуманітарыстыцы ёсць усяго некалькі постацей, вядомых усім сваім калегам без выключэння. Іх працы цытуюцца, іх кнігі раскупляюцца, на іх спасылаюцца ў дыскусіях і да іх апелююць. Адным словам, іх імёны заўжды гучаць у калідорах навуковых інстытутаў і ў пакоях культурніцкіх арганізацый. І іх сыход ад нас на гэта не ўплывае – яны ўсё роўна застаюцца Аўтарытэтамі. Адным з такіх быў **Адам Іосіфавіч Мальдзіс**.

Яго ўнёсак у айчынныя літаратуразнаўства і гістарычную навуку пераацаніць немагчыма. Ён належаў да таго першага пасляваеннага пакалення, што ў прамым сэнсе заснавала сучасную беларускую гуманітарыстыку, жыццё якой пасля рэпрэсій 1930-х і вайны 1940-х гг. ледзьве цеплілася.

Адам Мальдзіс нарадзіўся ў вёсцы Расолы Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. У 1951 г. скончыў Ашмянскую сярэднюю школу, у 1956 г. – факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пасля чаго да 1959 г. працаваў сакратаром радашковіцкай раённай газеты «Сцяг Ільіча». Яго далейшы лёс вызначыла паступленне ў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР – з гэтага пачалося ўзыходжанне А. Мальдзіса на навуковы Алімп. Пра яго плённую працу сведчыць тое, што ўжо ў 1963 г. ён паспяхова абараніў дысертацыю (пад назвай «Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі

ў другой палове XIX ст.») і атрымаў ступень кандыдата філалагічных навук. Яшчэ да канца 1960-х гг. ён выдаў дзве ўласныя кнігі – спачатку выйшла «Творчае пабрацімства» (1966 г.), а затым славутае «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (1969 г.), якое трывала ўвяло яго ў айчынную гістарыяграфію. З тых жа 1960-х гг. імя А. Мальдзіса не сыходзіць са старонак шматлікіх айчынных (і не толькі) выданняў навуковага ці культурніцкага кірункаў – «Полымя», «Літаратура і мастацтва», «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», «Маладосць» і інш.

З 1962 г. А. Мальдзіс стаў штатным супрацоўнікам Інстытута літаратуразнаўства, і наступныя амаль 30 гадоў менавіта тут было месца яго навуковай творчасці (з 1981 г. ён з'яўляўся загадчыкам аддзела беларускай дакастрычніцкай літаратуры). У 1970–1980-я гг. ён самым плённым чынам праводзіў даследаванні па гісторыі беларускай культуры і літаратуры XVII–XIX стст., беларуска-польскіх і беларуска-літоўскіх літаратурных узаемасувязей, адкрываючы для беларусаў цэлыя пласты нацыянальнай гісторыі. У гэты час выйшла з друку цэлая нізка яго манаграфій – «Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1972), «Таямніцы старажытных сховішчаў» (1974), «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (1980), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў» (1982), «З літаратуразнаўчых вандраванняў» (1987), «Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў» (1988). І гэта далёка не поўны пералік, нават не лічачы дзясяткаў артыкулаў, што выйшлі ў гэты час.

Заканамерным вынікам такой пленнасці стала чарговая дысертацыя – «Заканамернасці развіцця беларускай літаратуры пераходнага перыяду (другая палова XVII – XVIII ст.», абароненая ў 1986 г. з прысуджэннем ступені доктара філалагічных навук.

З 1991 г. у навуковым жыцці Адама Іосіфавіча пачалася новая старонка – ён узначаліў Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Францыска Скарыны і кіраваў ім да 1998 г. Апрача гэтага, з 1987 г. з'яўляўся старшынёй камісіі «Вяртанне» Беларускага фонду культуры, а пазней уваходзіў у аналагічную камісію (па вяртанні ў Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцей) пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. У 1991–2005 гг. ён быў прэзідэнтам, а з 2010 г. ганаровым старшынёй Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, у 1996–2006 гг. – кіраўніком аддзела культуралогіі Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Нялішнім будзе таксама згадаць, што ў 1990 г. як член дэлегацыі БССР А. Мальдзіс удзельнічаў у рабоце 45-й сесіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Арганізацыйныя абавязкі спалучаліся з актыўнай навуковай дзейнасцю. У 1990-я і 2000-я гг. выйшлі кнігі «І ажываюць спадчыны старонкі: Выбранае» (1994), «Выбранае» (2007), «Белорусские сокровища за рубежом» (2010). Асобна трэба згадаць кнігу «Жыццё і ўзнясенне Уладзі-

міра Караткевіча» (1990), у якой спалучаюцца ўспаміны пра геніяльнага пісьменніка, уласныя разважанні і літаратуразнаўчыя даследаванні. А колькі яшчэ было надрукавана артыкулаў, дакладаў на канферэнцыях, краязнаўчых нарысаў і нават літаратурных твораў?! Колькі тамоў выйшла, будучы ўкладзенымі А. Мальдзісам ці пад яго рэдакцыяй?! Складанне яго поўнай бібліяграфіі – актуальная навуковая задача на бліжэйшую будучыню.

У распрацоўку архіўных матэрыялаў А. Мальдзісам зроблены таксама немалы ўнёсак. У той час, калі большасць беларускіх даследчыкаў абыходзілася без візітаў у архівы падчас сваёй працы, ён ужо быў сваім не толькі ў беларускіх, але і ў замежных сховішчах. Адным з першых літаратуразнаўцаў ён пачаў выкарыстоўваць дакументы Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва (далей – ЦДГА) БССР (цяпер – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). У сваіх пошуках нярэдка бываў у Вільні, дзе часта гасціў у свайго сябра і калегі – гісторыка-архівіста Генадзя Кісялёва, які ў 1960-я гг. працаваў у ЦДГА Літоўскай ССР. Дабіраўся А. Мальдзіс нават да аддзела рукапісаў Курніцкай бібліятэкі ў Познані (Рэспубліка Польшча), дзе выявіў беларускамоўны верш Іаахіма Храптовіча сярэдзіны XVIII ст. Свае шматлікія паездкі ён нярэдка апісваў у кнігах і артыкулах.

Плённа супрацоўнічаў А. Мальдзіс з Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі, доўгі час з’яўляўся рэцэнзентам зборніка «Архіварыус» – з 7-га (2009) па 16-ты (2018) выпускі. Яго карысныя парады паляпшалі якасць кожнага выпуска і дапамагалі ўкладальнікам прыцягваць да супрацоўніцтва новых даследчыкаў з цікавымі тэмамі.

Энцыклапедызм – вось што заўжды вылучала Адама Іосіфавіча і што зрабіла яго класікам яшчэ пры жыцці. Тэматычнае кола яго публікацый настолькі шырокае, што яго цяжка нават акрэсліць. Тым не менш, галоўнае, чаго яны заўжды тычыліся, – гэта гісторыя і культура роднай краіны. Нездарма, юбілейны зборнік, выдадзены ў 2007 г. вучнямі, аднадумцамі і калегамі А. Мальдзіса да яго 75-годдзя, так і называўся – «Беларусь і беларусы ў прасторы і часе».

✞ Вечная памяць Вялікаму Гісторыку!

*Д. В. Лісейчыкаў, М. Т. Скіданава*

# Памяці калегі і настаўніцы
## Галіна Яўгенаўна Акуловіч (30.08.1957–23.09.2022)



23 верасня 2022 г. пасля цяжкай працяглай хваробы памерла вядомая прадстаўніца беларускага архівазнаўства, шматгадовая загадчыца аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Галіна Яўгенаўна Акуловіч. Без перабольшвання можна сказаць, што з яе іменем была звязана цэлая эпоха ў жыцці ўстановы і нават усёй архіўнай галіны.

Галіна Яўгенаўна Акуловіч нарадзілася 30 жніўня 1957 г. у сям'і служачых. З дзяцінства яе заўсёды цікавіла гісторыя. Юнай 17-гадовай дзяўчынай яна прыйшла на працу ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (далей – ЦДГА БССР) і назаўсёды звязала свой лёс менавіта з ім. У 1974 г. яна пачала свой працоўны архіўны шлях з пасады машыністкі. З лістапада 1978 г. працавала малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела навукова-даведачнага апарату, з 1979 г. – архівістам II катэгорыі, з 1980 г. – старшым архівістам, з 1990 г. – старшым навуковым супрацоўнікам. З мая 1991 г. Галіна Яўгенаўна стала загадчыцай сектара ўліку дакументаў і фондаў аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм ЦДГА БССР. У 1981 г. скончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля часовага аб'яднання ЦДГА і былога Партархіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ у пачатку 1990-х гг. непрацяглы час з'яўлялася вядучым навуковым супрацоўнікам новай архіўнай структуры. З пачатку 1993 г. і да выхаду на заслужаны адпачынак у снежні 2019 г. узначальвала аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ).

Дзякуючы Галіне Яўгенаўне ў НГАБ была істотна ўдасканалена сістэма ўліку дакументаў і фондаў. Доўгія гады яна кіравала работамі па перапрацоўцы вопісаў фондаў устаноў рэлігійнага культу і судовых органаў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў, фамільных і родавых фондаў, сістэматычнага і асабовага каталогаў. Асноўная частка навукова-даведачнага апарату, якім сёння штодня карыстаюцца супрацоўнікі, а таксама наведвальнікі чытальнай залы і афіцыйнага

вэб-сайту архіва, была зроблена пад яе кіраўніцтвам, а часта і непасрэдна ёй самой. Менавіта пры ёй адбылася камп'ютарызацыя аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм, алічбоўка вопісаў усіх фондаў, якія сёння размешчаны ў адкрытым доступе на архіўным сайце. Апрача гэтага, Галіна Яўгенаўна кансультавала распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння «АІС архіва», а пасля яго ўвядзення ў эксплуатацыю з імпэтам праводзіла навучанне асновам работы ў новай сістэме не толькі для супрацоўнікаў свайго аддзела, але і для ўсяго архіва. У апошнія гады Галіна Яўгеньеўна актыўна ўключылася ў апрацоўку дакументаў, якія перадаваліся на захаванне ў НГАБ з абласных і раённых архіваў органаў ЗАГС. Дзякуючы яе кампетэнтным і своечасовым захадам на пастаяннае захаванне паступіла некалькі тысяч метрычных кніг цэркваў, касцёлаў і сінагог з усёй Беларусі.

Галіна Яўгенаўна з'яўлялася адной з галоўных складальніц даведнікаў «Фонды Национального исторического архива Беларуси» (2006) і «Национальный исторический архив Беларуси: путеводитель по фондам» (2022), актыўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы матэрыялаў для зборніка «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі – скарбніца дакументальнай спадчыны» (2008), біяграфічных даведнікаў «Архівісты Беларусі» (2006, 2020) і многіх іншых.

Галіна Яўгенаўна была своеасаблівым мастком, які злучаў розныя пакаленні архівістаў. Яна прыйшла ў архіў, калі тут яшчэ працавалі тыя, хто аднаўляў работу архіўнай галіны Беларусі ў пасляваенныя час. Часта менавіта ў яе пераказах можна было пачуць гісторыі, звязаныя з працай розных аддзелаў архіва ў 1950–1970-я гг. Яна ўмела падтрымліваць сувязі, і яе частымі гасцямі былі архівісты-ветэраны, з якімі яна ахвотна знаёміла моладзь, што прыходзіла працаваць па размеркаванні. Яна заўсёды актыўна ўдзельнічала ў жыцці калектыву, з'яўлялася ініцыятарам і арганізатарам экскурсій для супрацоўнікаў па розных гістарычных месцах Беларусі, ахвотна дапамагала ў арганізацыі разнастайных юбілейных мерапрыемстваў архіва і прэзентацый архіўных выданняў.

У розны час пад кіраўніцтвам Галіны Яўгенаўны свае першыя крокі ў архівазнаўстве і працы з архіўнымі фондамі рабілі вядомыя сёння гісторыкі і архівісты Зінаіда Антановіч, Маргарыта Кароль, Дзяніс Лісейчыкаў, Дзмітрый Матвейчык, Марына Скіданава, Юрый Снапкоўскі і іншыя. Свой працоўны архіўны шлях нам пашчасціла пачынаць у аддзеле інфармацыйна-пошукавых сістэм пад кіраўніцтвам незабыўнай Галіны Яўгенаўны. Без перабольшвання, дзякуючы ёй мы палюбілі архіўную справу і на доўгія гады звязалі свой лёс з Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі.

✞ Нізкі паклон Вам, дарагая Галіна Яўгенаўна, і вечная памяць!

# Рэзюмэ

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*«Канфесійнае рэгуляванне дзейнасці органаў епархіяльнага кіравання хрысціянскіх цэркваў на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст.»*

У артыкуле разглядаецца рэалізацыя функцый органаў канфесійнага кіравання (Сінода, Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі, Грэка-ўніяцкай духоўнай калегіі, Літоўскага сінода, Віленскай рэфарматарскай калегіі, Дзяржаўнай евангелічнай генеральнай кансісторыі) на епархіяльным узроўні беларускіх зямель у канцы XVIII – пачатку XX ст. праз распарадчую дакументацыю. Акрамя замацаваных урадам за органамі канфесійнага кіравання кампетэнцый, да агульных рыс іх рэгулятарнай дзейнасці аўтарам аднесена адпаведнасць агульнадзяржаўным патрабаванням па выкарыстанні відавой разнастайнасці распарадчай дакументацыі (указаў, распараджэнняў і інш.) і яе афармленні, падыходах да фарміравання ў справы ў непасрэдна паднначаленых установах. Пры гэтым маецца кананічна і традыцыйна абумоўленая спецыфіка ў канфесійным кіраванні хрысціянскіх цэркваў у Беларусі, у т. л. апасродкаваны ўплыў Папы Рымскага як кіраўніка каталіцкіх цэркваў, параўнальна паніжаны ўплыў канфесійных органаў у адміністрацыйна-тэрытарыяльным кіраванні евангелічных цэркваў, моўная разнастайнасць у афармленні распарадчых дакументаў, неабходнасць і наяўнасць органа перыядычнага друку для іх публікацыі.

**Галубовіч Віталь Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гуманітарных навук Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

*«Тэхнічны персанал канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага і крыніцы яго ўтрымання ў час праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.)»*

Артыкул прысвечаны найменш даследаванай катэгорыі супрацоўнікаў дзяржаўнай канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага – яе тэхнічнаму персаналу (пісарам і слугам). На падставе наданняў Уладзіслава Вазы, зафіксаваных у кнігах запісаў Метрыкі ВКЛ за 1633–1648 гг., выяўлены імёны 15 канцылярыстаў, большая частка якіх у дакументах называлася пісарамі. Адзначаецца, што тэхнічны персанал канцылярыі ВКЛ фарміраваўся з ліку дробнай шляхты, пераважна каталіцкага веравызнання. Некаторыя пісары паходзілі з беларускіх зямель ВКЛ. Матэрыяльныя выгады, на якія маглі прэтэндаваць ніжэйшыя супрацоўнікі канцылярыі, былі шчыльна звязаны з досведам і якасцю іх працы. Ва ўмовах дэфіцыту наяўных грошай галоўным прадме-

там узнагароды для пісараў была рухомая і нерухомая маёмасць, лёс якой залежаў ад волі манарха.

**Глінскі Яўген Станіслававіч,** магістр гістарычных навук, намеснік загадчыка аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Пераход баяр на зямянскую службу ў Слуцкім і Капыльскім княствах у канцы XVI – XVII ст.»*

Структура служылага насельніцтва ў Слуцкім і Капыльскім княствах у канцы XVI ст. вонкава заставалася традыцыйнай, асноўныя яго групы складалі зямяне (якія неслі ваенную службу) і путныя баяры (адказныя за транспартаванне грузаў і карэспандэнцыі). Пры гэтым менавіта з канца XVI ст. пачаўся працэс пераходу часткі баяр на зямянскія павіннасці. Як правіла, ён адбываўся праз перавод усяго насельніцтва асобных баярскіх паселішчаў на зямянскія абавязкі. Такое змяненне павіннаснага статусу замацоўвалася дакументамі, выдадзенымі радзівілаўскай адміністрацыяй. Фіксаваліся і адзінкавыя пераходы на зямянскую службу. У выніку на працягу XVII ст. служылая супольнасць Слуцкага і Капыльскага княстваў станавілася больш аднароднай, большасць колішніх путных баяр стала выконваць зямянскія абавязкі.

**Ерашэвіч Аляксандр Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

*«Пенсійныя выплаты ў Мінскай губерні ў канцы XVIII ст. – пачатку 1860-х гг.» (паводле дакументаў Мінскай казённай палаты)*

У артыкуле ўпершыню ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі падымаецца праблема фінансавання дэцэнтралізаванай сістэмы пенсійнага забеспячэння ваенных і грамадзянскіх служачых на тэрыторыі Мінскай губерні з канца XVIII ст. да пачатку 1860-х гг. На аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў з фонду Мінскай казённай палаты Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі зроблена спроба вызначыць у дынаміцы крыніцы, віды, склад і структуру пенсійных выплат, выявіць іх месца і ролю ў сістэме дзяржаўных выдаткаў.

**Кароль Маргарыта Міхайлаўна,** кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Праблематыка міжканфесійных канверсій на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. у сучаснай беларускай гістарыяграфіі»*

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі цікавасць да праблемы пераводу ў праваслаўе прадстаўнікоў іншых канфесій і рэакцыі на яго з боку насельніцтва істотна павялічылася. У сваіх працах даследчыкі засяроджваюцца на заканадаўчых асновах і фактычнай рэалізацыі працэдуры пераводу ў пра-

васлаўе ў другой палове XIX ст., спыняюцца на канкрэтных рэгіёнах, дзе пытанне міжканфесійных узаемаадносін стаяла асабліва востра, адзначаюць уплыў указа «Аб умацаванні асноў верацярпімасці» ад 17 красавіка 1905 г. на змяненне рэлігійнай сітуацыі ў беларускіх губернях, акрэсліваюць яго наступствы.

**Крыцук Раман Іванавіч,** магістр гістарычных навук, захавальнік калекцыі польскіх манет Кабінета манет і медалёў Нацыянальнага музея ў Варшаве.

*«Архіўныя матэрыялы Нацыянальнага музея ў Варшаве і іх патэнцыял для правядзення даследаванняў па гісторыі нумізматыкі Беларусі»*

Разглядаюцца і аналізуюцца архіўныя нумізматычныя матэрыялы 1930-х гг. нумізматычных кабінетаў Дзяржаўных калекцый мастацтва і Нацыянальнага музея ў Варшаве. Гэта фрагменты перапіскі дзяржаўных арганізацый, інвентарныя запісы і чарнавыя вопісы скарбаў, выяўленых на тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы і Украіны. Дзякуючы выяўленым матэрыялам можна прасачыць працу польскіх арганізацый па ахове нумізматычнай спадчыны, аднавіць і ўвесці ў навуковы ўжытак неапублікаваныя скарбы даваеннага перыяду. Асабліва каштоўныя чарнавыя вопісы скарбаў, якія дазваляюць не проста аднавіць факт знаходкі скарбу, а цалкам рэканструяваць яго склад, як, напрыклад, скарбаў з вёсак Вялікая Слабада і Хмелева.

**Лаўрык Юрый Мікалаевіч,** вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

*«Кірылічныя манускрыпты XV – першай паловы XVI ст. у калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь»*

У артыкуле даецца кадыкалагічнае апісанне рукапісных кніг XV – першай паловы XVI ст. са збораў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Аўтарам зроблена спроба высвятліць час і месца стварэння гэтых манускрыптаў, а таксама ўдакладніць акалічнасці бытавання.

**Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*«Ваенна-адміністрацыйная дзейнасць віцебскага грамадзянскага губернатара Карла Лешэрна ў ліпені 1812 – лютым 1813 г. (паводле матэрыялаў Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва)»*

У артыкуле аналізуецца ваенна-адміністрацыйная дзейнасць віцебскага грамадзянскага губернатара К. Лешэрна фон Герцфельда (1761–1818) падчас вайны 1812 г. Раскрываюцца абавязкі, ускладзеныя на яго ва ўмовах ваеннага часу (збор разведвальных звестак, арганізацыя правіянцкага забеспячэння войскаў, правядзенне рэкруцкіх набораў, падтрыманне парадку на падкантрольных тэрыторыях). Адзначаецца, што ў экстрэмальных умовах К. Лешэрн дзейнічаў хутка і ініцыятыўна. Гэта дазволіла захаваць кіруе-

масць падчас вайны ў шэрагу паветаў губерні, падкантрольных 1-му Асобнаму корпусу графа Пятра Вітгенштэйна.

**Любая Алёна Аляксандраўна,** кандыдат гістарычных навук, вядучы архівіст аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Духавенства мячэцей Мінскай губерні ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: спроба рэканструкцыі персанальнага складу»*

У артыкуле прадстаўлены звесткі пра персанальны склад мусульманскага духавенства, якое служыла ў мячэцях, што знаходзіліся на тэрыторыі Мінскай губерні ў перыяд уваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі, а таксама ў гэтых жа прыходах у апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай. Асноўнай крыніцай даследавання, ва ўмовах адсутнасці мусульманскіх метрычных кніг, з'яўляюцца метрычныя выпіскі, якія прадстаўляліся ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход для пацвярджэння сваяцкіх сувязей. У іх практычна заўсёды ўказваліся імёны імамаў, якія зацвярджалі той ці іншы дакумент і здзяйснялі абрад нарачэння імя. Таксама важнай інфармацыйнай крыніцай з'яўляюцца звесткі, што збіраліся Мінскім губерскім статыстычным камітэтам у другой палове XIX ст. і спарадычна друкаваліся ў «Памятных кніжках Мінскай губерні». Сабраныя звесткі прадстаўлены ў выглядзе табліцы, якая структуравана паводле намінальна-храналагічнага прынцыпу.

**Макараў Максім Дзмітрыевіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Рынкавая плошча Віцебска ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.»*

У артыкуле на падставе шырокага кола пісьмовых крыніц разгледжана планіроўка і забудова Рынкавай плошчы на Узгорскім пасадзе Віцебска ў перыяд да сярэдзіны XVIII ст. Прасочана развіццё сістэмы вуліц (Вялікая, Багародзіцкая, Падзвінская) і завулкаў, на скрыжаванні якіх функцыянаваў рынак. Забудова Рынкавай плошчы другой паловы XVI – пачатку XVIII ст. разгледжана ў наступным парадку: комплекс гасцінага двара і ратушы; усходні бок вуліцы Вялікай і рады рынкавых крамаў; заходняя частка плошчы. Вызначана, што першым мураваным будынкам на віцебскім рынку быў дом бурмістра Сцяпана Пятровіча, узведзены ў канцы 1640-х гг. Прапанавана лакалізацыя амаль забытых у наш час цэркваў Спаса-Праабражэнскай і Святога Мікалая, якія ў вывучаемы перыяд размяшчаліся на Рынкавай плошчы.

**Яго ж, Латушкін Андрэй Мікалаевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*«Карта Інфлянтаў 1560 г. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі»*

У артыкуле ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак цікавы помнік вайсковай картаграфіі ВКЛ XVI ст. – схематычная рукапісная карта Інфлянтаў, складзеная на пачатковым этапе Інфлянцкай вайны (1558–1583 гг.), якая

зберагаецца ў фондзе 694 «Радзівілы, князі» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Падрабязна разгледжаны змест і абставіны стварэння дакумента. Вызначана, што карта была створана ў 1560 г. у асяроддзі аднаго з камандуючых войскамі ВКЛ у Інфлянтах – кашталяна полацкага, старосты прапойскага і чачэрскага Юрыя Мікалаевіча Зяновіча. На сённяшні момант разгледжаны дакумент можа лічыцца самым старым захаваным помнікам вайсковай картаграфіі ВКЛ (раней на гэтую ролю прэтэндаваў план аблогі замка Улы войскам ВКЛ 1568 г.) і таму, несумненна, патрабуе далейшага ўважлівага вывучэння.

**Матвейчык Дзмітрый Часлававіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Гістарыяграфія паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі ў Літоўскай ССР (1944–1991 гг.)»*

У артыкуле разглядаецца ўнёсак літоўскіх гісторыкаў пасляваеннага перыяду ў распрацоўку праблематыкі паўстання на тэрыторыі Беларусі альбо аспектаў, агульных для беларускай і літоўскай гістарыяграфічных традыцый. Аналізуюцца працы, выдадзеныя ў вышэйзгаданы перыяд, вызначаюцца іх асноўныя дасягненні, характарызуецца ўнёсак асобных даследчыкаў. На падставе параўнання з папярэднім – даваенным – перыядам робіцца выснова пра крыніцазнаўчы пераварот у даследаваннях, калі ў навуковы ўжытак была ўведзена вялікая колькасць раней нявыкарыстаных крыніц, у першую чаргу, архіўных, а таксама пра выхад у цэлым літоўскай гістарыяграфіі паўстання на новы ўзровень развіцця. Вызначаюцца таксама пазанавуковыя, пераважна палітычныя фактары, якія ўплывалі на развіццё гістарычных даследаванняў.

***Яго ж,*** *Рэцэнзія: Umysł miał jasny i serce miłujące: Edward Woyniłłowicz w dokumentach i materiałach / wybór, opracowanie, wstęp i przypisy: R. Jurkowski. – Olsztyn: Wydawnictwo Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego, 2021. – 744 s. – (Źródła do dziejów Europy Środkowo-Wschodniej / Pod red. R. Jurkowskigo. – T. II)*

Рэцэнзуецца зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі жыцця і дзейнасці Эдварда Вайніловіча – адной з найбольш вядомых постацей гісторыі Беларусі канца XIX – першай трэці XX ст. Раскрываюцца структура і змест зборніка, ацэньваюцца тэматычная паўната апублікаваных у ім матэрыялаў, узровень навуковай апрацоўкі і рэпрэзентатыўнасць кожнага з відаў крыніц. Указваецца на некаторыя хібы, дапушчаныя пры складанні зборніка і выяўленыя падчас яго аналізу – крыніцавая і структурная непаўната, факталагічныя памылкі ў навукова-даведачным апараце, памылковая ацэнка некаторых звестак з мемуараў. Робіцца выснова пра агульны высокі ўзровень выдадзенай кнігі і яе каштоўны ўнёсак у гістарыяграфію гісторыі Беларусі.

**Насевіч Вячаслаў Леанідавіч,** кандыдат гістарычных навук.

*«З гісторыі маёнтка Белае – папярэдніка сучаснага Лепеля»*

У артыкуле прасочваецца гісторыя маёнтка Белае, на тэрыторыі якога ў канцы XVI ст. быў заснаваны Лепель. Упершыню Белае згадваецца ў 1512 г., але кантэкст дазваляе прасачыць яго гісторыю да сярэдзіны XV ст. паводле ўскосных меркаванняў. Пасля пераходу ва ўласнасць Сапегаў у 1533 г. маёнтак быў падзелены на некалькі частак. Яны зноў былі сабраны на працягу 1590-х гг. Львом Сапегам, які і заснаваў у сваіх уладаннях сучасны Лепель.

**Радзюк Аляксандр Рыгоравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных і лінгвістычных дысцыплін УА «БІП – Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій. Гродзенскі філіял».

*«Нелегальная літаратура на землях Беларусі ў першай палове XIX ст.»*

Артыкул прысвечаны праблеме так званай «нелегальнай літаратуры» на землях Беларусі і Літвы ў першай палове XIX ст. Аўтар дае вызначэнне тэрміну «нелегальная літаратура», разглядае яе асноўныя віды, аналізуе спосабы яе стварэння, пранікнення і распаўсюджвання на азначаных тэрыторыях. Адзначаецца важная роля замежных эміграцыйных цэнтраў у гэтай справе. Асобны раздзел працы прысвечаны выяўленню і даследаванню контрмер расійскіх улад па недапушчэнні распаўсюджвання падобнай літаратуры. Артыкул напісаны на падставе архіўных крыніц, якія ў сваёй большасці ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак. У заключэнні даследчык робіць высновы аб той ролі, якую адыгрывала нелегальная літаратура ў жыцці адукаванай часткі грамадства беларуска-літоўскіх зямель, і прычынах, па якіх царызм надаваў вялікую ўвагу барацьбе з ёю.

**Рындзін Сяргей Мікалаевіч,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

*«Вопыт прадстаўлення сістэмы навукова-даведачнага апарату архіваў Расійскай Федэрацыі і шэрагу краін Еўропы ў сетцы Інтэрнэт»*

Артыкул прысвечаны замежнаму вопыту стварэння электронных (лічбавых) архіваў і размяшчэння іх у сетцы Інтэрнэт. Асветлены праведзеныя ў некаторых краінах комплексныя працы з архіўнымі крыніцамі, ахарактарызаваны створаныя ў Расійскай Федэрацыі і шэрагу краін Еўропы адзіныя дзяржаўныя даведачна-інфармацыйныя сістэмы з агульным парадкам апісання архіўных крыніц. Адзначаецца, што важнай уласцівасцю распрацаваных сістэм з'яўляецца шырокае выкарыстанне гіпертэкставага фармату, што паскарае аўтаматызаваны пошук. Аўтарам разгледжаны міжнародныя стандарты апісання архіўных дакументаў. Вывучаны вопыт вырашэння ў замежных краінах праблемы дыстанцыйнага доступу да алічбаваных комплексаў архіўных дакументаў.

**Сцебурака Анатоль Мікалаевіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы;

**Булда Ганна Георгіеўна**, краязнаўца, даследчык спадчыны роду Храптовічаў.

*«Вяртанне ў Беларусь сямейнай карэспандэнцыі Храптовічаў з палаца ў Шчорсах»*

Артыкул прысвечаны нядаўна вернутаму ў Беларусь фрагменту сямейнага архіва Храптовічаў са Шчорсаў, вывезенаму падчас Першай сусветнай вайны ў Германію, які стаў аб'ектам прыватнай добраахвотнай ініцыятывы па рэстытуцыі ў 2020 г. Задачай публікацыі з'яўляецца кароткае апісанне зместу вернутай на радзіму сямейнай карэспандэнцыі Храптовічаў першай паловы XIX ст.

**Урублеўскі Вадзім Валер'евіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік сектара навуковай апрацоўкі рукапісаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*«Гісторыя і генеалогія насельніцтва вёскі Цялякава (паводле матэрыялаў Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі)»*

На падставе матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі раскрываецца патэнцыял рэгіянальнай гісторыі ў асвятленні генеалогіі сялянскіх сямей. У гістарычнай частцы працы падзеі разгортваюцца вакол удзелу насельніцтва ў гісторыі свайго населенага пункта, адзначаны факты грамадскай і гаспадарчай штодзённасці, падкрэсленыя праявамі абароны маёмасці і зямельных прэтэнзій. У генеалагічнай частцы даследаваны вытокі трох самых старажытных цялякаўскіх родаў, згаданых яшчэ ў 1710 г. Прапануецца падыход спрошчанай навукова-папулярнай падачы сялянскіх радаводаў са згадкамі асноўных імёнаў, дат і падзей родавай гісторыі як часткі гісторыі мясцовасці.

***Яго ж,** Рэцэнзія: Сцебурака, У., Сцебурака, А. Сцебуракаў лёс : гісторыя роду / Усевалад Сцебурака, Анатоль Сцебурака. – Мінск : Кнігазбор, 2022. – 300 с. : [12] с. іл.*

Рэцэнзуецца супольнае выданне гісторыкаў Усевалада і Анатоля Сцебуракаў, прысвечанае іх радаводу па бацькаўскай лініі. Ацэньваецца актуальнасць аўтарскага падыходу ў прэзентацыі фактаграфічнага матэрыялу для навуковай і навукова-папулярнай генеалогіі. Аналізуюцца высновы аб паходжанні прозвішча і яго сувязі з аднайменным населеным пунктам, па якім падобнае прозвішча не фігуруе ў адшуканых дакументах.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч**, гісторык і генеалог.

*«Заснаванне Менскага Свята-Траецкага жаночага манастыра ў кантэксце фундацыйнай дзейнасці жонкі менскага земскага пісара Марыны Вяжэвіч (1630–1650-я гг.)»*

У артыкуле разглядаюцца абставіны заснавання жаночага манастыра пры Свята-Траецкай царкве ў Менску. Адзначаецца, што вялікую ролю ў яго ўтварэнні адыграла ўдава менскага земскага пісара Марына Міхайлаўна

Вяжэвіч (з роду Яцынічаў). У сярэдзіне 1630-х гг. яна зрабіла шчодрыя ахвяраванні на карысць будучага манастыра, затым актыўна ўдзельнічала ў жыцці манастырскай установы, выступала ад яе імя ў судовых працэсах.

**Ялётнаў Віталь Ігаравіч,** кандыдат юрыдычных навук, намеснік начальніка кафедры ўпраўлення органамі папярэдняга следства Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

*«Устанаўленне выканаўцаў рукапісных запісаў калекцыі чарнавікоў малюнкаў XVII стагоддзя з фонду «Радзівілы, князі» шляхам комплекснага выкарыстання гістарычных і крыміналістычных ведаў»*

У артыкуле адзначаецца важнасць комплекснага падыходу ў вырашэнні задач па ўстанаўленні выканаўцаў гістарычных дакументаў. Разглядаецца прыклад узаемадзення Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, звязаны з устанаўленнем выканаўцы рукапісных запісаў на асобных дакументах з калекцыі чарнавікоў малюнкаў XVII ст. з фонду «Радзівілы, князі». Паказваецца працэс параўнальнага почырказнаўчага даследавання рукапісных запісаў на дакументах з дадзенай калекцыі з узорамі почырку гетмана Януша Радзівіла. Абгрунтоўваецца выснова аб тым, што частка рукапісных запісаў на дакументах з калекцыі выканана з высокай ступенню верагоднасці Я. Радзівілам.

# Резюме

**Антонович Зинаида Васильевна,** кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*«Конфессиональное регулирование деятельности органов епархиального управления христианскими церквями на белорусских землях в конце XVIII – начале XX в.»*

В статье исследуется реализация функций органов конфессионального управления (Синода, Римско-католической духовной коллегии, Греко-униатской духовной коллегии, Литовского синода, Виленской реформаторской коллегии, Государственной евангелической генеральной консистории) на епархиальном уровне на белорусских землях в конце XVIII – начале XX в. через распорядительную документацию. Помимо компетенций, определенных правительством для органов конфессионального управления, к общим чертам их регуляторной деятельности автор относит соблюдение общегосударственных требований по использованию видового разнообразия распорядительной документации (указов, предписаний и др.) и ее оформлению, подходам к формированию в дела в непосредственно подчиненных учреждениях. В то же время в конфессиональном управлении христианскими церквями в Беларуси существовала канонически и традиционно обусловленная специфика, в том числе опосредованное влияние Папы Римского как главы католических церквей, сравнительно сниженное влияние конфессиональных органов в административно-территориальном управлении евангелических церквей, языковое разнообразие в оформлении распорядительных документов, необходимость и наличие периодической печати для их публикации.

**Врублевский Вадим Валерьевич,** кандидат исторических наук, старший научный сотрудник сектора научной обработки рукописей отдела редких книг и рукописей Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси.

*«История и генеалогия населения деревни Теляково (по материалам Национального архивного фонда Беларуси)»*

На основании материалов Национального архива Республики Беларусь и Национального исторического архива Беларуси раскрывается потенциал региональной истории в освещении генеалогии крестьянских семей. В исторической части работы события развиваются вокруг участия населения в истории своего населенного пункта, отмечены факты общественной и хозяйственной повседневности, подчеркнутые проявлениями защиты имущества и земельных претензий. В генеалогической части исследованы истоки трех

самых древних теляковских родов, упомянутых еще в 1710 г. Предлагается подход упрощенной научно-популярной подачи крестьянских родословных с упоминанием основных имен, дат и событий родовой истории как части истори местности.

***Его же**, Рецензия: Сцебурака, У., Сцебурака, А. Сцебуракаў лёс : гісторыя роду / Усевалад Сцебурака, Анатоль Сцебурака. – Мінск : Кнігазбор, 2022. – 300 с. : [12] с. іл.*

Рецензируется совместное издание историков Всеволода и Анатолия Стебураков, посвященное их родословной по отцовской линии. Оценивается актуальность авторского подхода в презентации фактографического материала для научной и научно-популярной генеалогии. Анализируются выводы о происхождении фамилии и ее связи с одноименным населенным пунктом, по которому похожая фамилия не фигурирует в найденных документах.

**Глинский Евгений Станиславович,** магистр исторических наук, заместитель заведующего отделом научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Переход бояр на земянскую службу в Слуцком и Копыльском княжествах в конце XVI – XVII в.»*

Структура служилого населения в Слуцком и Копыльском княжествах в конце XVI в. внешне оставалась традиционной, основные его группы составляли земяне (несшие военную службу) и путные бояре (ответственные за транспортировку грузов и корреспонденции). При этом именно с конца XVI в. начался процесс перехода части бояр на земянские повинности. Как правило, он происходил посредством перевода всего населения отдельных боярских населенных пунктов на земянские обязанности. Такое изменение повинностного статуса закреплялось документами, выданными радзивилловской администрацией. Фиксировались и единичные переходы на земянскую службу. Как результат, на протяжении XVII в. служилое сообщество Слуцкого и Копыльского княжеств становилось более однородным, большинство прежних путных бояр стало исполнять земянские обязанности.

**Голубович Виталий Владимирович,** кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры гуманитарных наук Гродненского государственного аграрного университета.

*«Технический персонал канцелярии Великого Княжества Литовского и источники его содержания во время правления Владислава Вазы (1633–1648 гг.)»*

Статья посвящена наименее исследованной категории сотрудников государственной канцелярии Великого Княжества Литовского – ее техническому персоналу (писарям и слугам). На основании распоряжений Владислава Вазы, зафиксированных в книгах записей Метрики ВКЛ за 1633–1648 гг., выявлены имена 15 канцеляристов, большая часть которых в документах называлась писарями. Отмечается, что технический персонал канцелярии

ВКЛ формировался из числа мелкой шляхты, преимущественно католического вероисповедания. Некоторые писари происходили из белорусских земель ВКЛ. Материальное поощрение, на которое могли претендовать низшие сотрудники канцелярии, было тесно связано с опытом и качеством их работы. В условиях дефицита наличных денег главным предметом награды для писарей было движимое и недвижимое имущество, судьба которого зависела от воли монарха.

**Елётнов Виталий Игоревич,** кандидат юридических наук, заместитель начальника кафедры управления органами предварительного следствия Института повышения квалификации и переподготовки Следственного комитета Республики Беларусь.

*«Установление исполнителей рукописных записей коллекции черновиков рисунков XVII века из фонда «Радзивиллы, князья» путём комплексного использования исторических и криминалистических знаний»*

В статье отмечается важность комплексного подхода в решении задач по установлению исполнителей исторических документов. Рассматривается пример взаимодействия Национального исторического архива Беларуси и Института повышения квалификации и переподготовки Следственного комитета Республики Беларусь, связанный с установлением исполнителя рукописных записей на отдельных документах из коллекции черновиков рисунков XVII в. из фонда «Радзивиллы, князья». Излагается процесс сравнительного почерковедческого исследования рукописных записей на документах из данной коллекции с образцами почерка гетмана Януша Радзивилла. Обосновывается вывод о том, что часть рукописных записей на документах из коллекции выполнена с высокой степенью вероятности Я. Радзивиллом.

**Ерошевич Александр Владимирович,** кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры экономической истории Белорусского государственного экономического университета.

*«Пенсионные выплаты в Минской губернии в конце XVIII в. – начале 1860-х гг.» (по документам Минской казённой палаты)*

В статье впервые в современной белорусской историографии поднимается проблема финансирования децентрализованной системы пенсионного обеспечения военных и гражданских служащих на территории Минской губернии с конца XVIII в. и до начала 1860-х гг. На основе многочисленных архивных материалов из фонда Минской казённой палаты Национального исторического архива Беларуси сделана попытка определить в динамике источники, виды, состав и структуру пенсионных выплат, выявить их место и роль в системе государственных расходов.

**Король Маргарита Михайловна,** кандидат исторических наук, ведущий научный сотрудник отдела научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Проблематика межконфессиональных конверсий на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. в современной белорусской историографии»*

В современной белорусской историографии значительно возрос интерес к проблеме обращения представителей других конфессий в православие и реакции на него населения. В своих работах исследователи акцентируют внимание на законодательных основах и фактическом осуществлении процедуры конверсии в православие во второй половине XIX в., останавливаются на конкретных регионах, где вопрос межконфессиональных отношений стоял особенно остро, отмечают влияние указа «Об укреплении основ веротерпимости» от 17 апреля 1905 г. на изменение религиозной ситуации в белорусских губерниях, обозначают его последствия.

**Крицук Роман Иванович,** магистр исторических наук, хранитель коллекции польских монет Кабинета монет и медалей Национального музея в Варшаве.

*«Архивные материалы Национального музея в Варшаве и их потенциал для проведения исследований по истории нумизматики Беларуси»*

Рассматриваются и анализируются архивные нумизматические материалы 1930-х гг. из нумизматических кабинетов Государственной коллекции искусства и Национального музея в Варшаве. Это фрагменты переписки государственных организаций, инвентарные записи и черновые описи кладов, обнаруженных на территории современных Беларуси, Литвы и Украины. Благодаря обнаруженным материалам можно проследить работу польских организаций по охране нумизматического наследия, восстановить и ввести в научный оборот неопубликованные клады довоенного периода. Особую ценность представляют черновики описей кладов, позволяющие не только восстановить факт нахождения клада, но и полностью реконструировать его состав, как, например, кладов из деревень Великая Свобода и Хмелево.

**Лаврик Юрий Николаевич,** ведущий научный сотрудник Национального исторического музея Республики Беларусь.

*«Кириллические манускрипты XV – первой половины XVI в. в коллекции «Рукописные книги» Национального исторического музея Республики Беларусь»*

В статье дается кодикологическое описание рукописных книг XV – первой половины XVI в. из собраний Национального исторического музея Республики Беларусь. Автор делает попытку выяснить время и место создания манускриптов, а также уточнить обстоятельства их бытования.

**Лукашевич Андрей Михайлович,** доктор исторических наук, профессор кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени Белорусского государственного университета.

*«Военно-административная деятельность витебского гражданского губернатора Карла Лешерна в июле 1812 – феврале 1813 г. (по материалам Российского государственного военно-исторического архива)»*

В статье анализируется военно-административная деятельность витебского гражданского губернатора К. Лешерна фон Герцфельда (1761–1818) во время войны 1812 г. Раскрываются обязанности, возложенные на него в условиях военного времени (сбор разведывательных данных, организация провиантского обеспечения войск, проведение рекрутских наборов, поддержание порядка на подконтрольных территориях). Отмечается, что в экстремальных условиях К. Лешерн действовал быстро и инициативно. Это позволило сохранить управляемость во время войны в ряде уездов губернии, подконтрольных 1-му отдельному корпусу графа Петра Витгенштейна.

**Любая Алёна Александровна,** кандидат исторических наук, ведущий архивист отдела информационно-поисковых систем Национального исторического архива Беларуси.

*«Духовенство мечетей Минской губернии в конце XVIII – начале XX в.: попытка реконструкции персонального состава»*

В статье представлены сведения о персональном составе мусульманского духовенства, служившго в мечетях, которые находились на территории Минской губернии в период вхождения Беларуси в состав Российской империи, а также в этих же приходах в последние десятилетия существования Речи Посполитой. Основным источником исследования, в условиях отсутствия мусульманских метрических книг, являются метрические выписи, представлявшиеся в Минское дворянское депутатское собрание для подтверждения родственных связей. В них практически всегда указывались имена имамов, которые утверждали тот или иной документ и совершали обряд имянаречения. Также важным информационным источником являются сведения, собиравшиеся Минским губернским статистическим комитетом во второй половине XIX в. и эпизодически печатавшиеся в «Памятных книжках Минской губернии». Собранные сведения представлены в виде таблицы, структурированной по номинально-хронологическому принципу.

**Макаров Максим Дмитриевич,** кандидат исторических наук, заместитель директора Национального исторического архива Беларуси.

*«Рыночная площадь Витебска во второй половине XVI – начале XVIII в.»*

В статье на основании широкого круга письменных источников рассмотрена планировка и застройка Рыночной площади на Взгорском посаде Витебска в период до середины XVIII в. Прослежено развитие системы улиц (Великая, Богородицкая, Подвинская) и заулков, на пересечении которых функционировал рынок. Застройка Рыночной площади второй половины XVI – начала XVIII в. рассмотрена в следующем порядке: комплекс гостиного двора и ратуши; восточная сторона улицы Великой и ряды рыночных лавок; западная часть площади. Определено, что первым кирпичным зданием на витебском рынке был дом бурмистра Степана Петровича, возведенный в конце 1640-х гг. Предложена локализация почти забытых в наше время церквей

Спасо-Преображенской и Святого Николая, которые в изучаемый период размещались на Рыночной площади.

**Его же, Латушкин Андрей Николаевич**, кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*«Карта Инфлянтов 1560 г. из фондов Национального исторического архива Беларуси»*

В статье впервые вводится в научный оборот интересный памятник военной картографии ВКЛ XVI в. – схематичная рукописная карта Инфлянтов, составленная на начальном этапе Инфлянтской войны (1558–1583 гг.), которая хранится в фонде 694 «Радзивиллы, князья» Национального исторического архива Беларуси. Подробно рассмотрены содержание и обстоятельства появления документа. Установлено, что карта была создана в 1560 г. в окружении одного из командующих войсками ВКЛ в Инфлянтах – каштеляна полоцкого, старосты пропойского и чечерского Юрия Николаевича Зеновича. На сегодняшний момент рассмотренный документ может считаться самым старым сохранившимся памятником военной картографии ВКЛ (ранее на эту роль претендовал план осады замка Ула войсками ВКЛ 1568 г.) и поэтому, несомненно, требует дальнейшего тщательного изучения.

**Матвейчик Дмитрий Чеславович,** кандидат исторических наук, заведующий отделом научно-исследовательской и публикационной деятельности Национального исторического архива Беларуси.

*«Историография восстания 1863–1864 гг. на территории Беларуси в Литовской ССР (1944–1991 гг.)»*

